# ПАМЯЦЬ

## СЕННЕНСКІ РАЁН

Мінск
ПК "Паліграфафармленне"
2003

# 1941

# 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

22 чэрвеня 1941 г. жыццё ўсяго савецкага народа перайшло на іншыя, ваенныя рэйкі. Фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзе, пачала вайну супраць СССР. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне байцоў Чырвонай Арміі, войскі Заходняга фронту не маглі стрымаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія імкліва рваліся на ўсход. Вогненны вал вайны дакаціўся і да Сенненшчыны. Ужо ў ліпені 1941 г. яна стала арэнай жорсткіх баёў.

Танкавыя злучэнні генерала Гота прарваліся ў раёне Лепеля, Улы і дзейнічалі на левым беразе Заходняй Дзвіны. Гэта стварала сур'ёзную пагрозу злучэнням правага крыла Заходняга фронту. Вораг збіраўся фарсіраваць Заходнюю Дзвіну, захапіць Полацк і Віцебск, а затым абыйсці з поўначы войскі Заходняга фронту і знішчыць іх. У адпаведнасці з указаннем Стаўкі Галоўнага Камандавання войскам Заходняга фронту быў аддадзены загад стойка абараняць лінію Полацкага ўмацаванага раёна, а таксама рубеж Заходняя Дзвіна—Сянно, не дапусціць прарыву праціўніка на паўночным і ўсходнім напрамках.

6 ліпеня, зламаўшы супраціўленне нашых часцей, перадавыя падраздзяленні 17-й танкавай дывізіі з групы Гудэрыяна занялі Сянно і пачалі рухацца ў бок Віцебска. У гэты дзень па ўказанню камандуючага Заходнім фронтам войскі 20-й арміі, якой камандаваў генерал-лейтэнант П. А. Курачкін, правялі контрудар з паўночнага і заходняга боку Оршы ў фланг войскам 3-й танкавай групы праціўніка. У контрудары ўдзельнічалі прыбыўшыя з Сібіры 7-ы і 5-ы механізаваныя корпусы, якія мелі каля тысячы танкаў старых тыпаў. У жорсткіх баях праціўніку былі нанесены вялікія страты і да поўдня 8 ліпеня яго адкінулі на 30—40 км у напрамку Лепеля.

Найбольш упартыя і цяжкія баі з 6 па 9 ліпеня разгарэліся на поўдзень ад Сянна. У раёне Сянна наступаўшыя войскі 20-й арміі натыкнуліся на моцнае супраціўленне злучэнняў 47-га матарызаванага нямецкага корпуса і выкінутага буйнога паветранага дэсанта. 7-ы механізаваны корпус быў спынены на паўночнаўсходніх подступах да горада, а 5-ы вёў цяжкія абарончыя баі амаль у поўным акружэнні. 10 ліпеня па загаду камандуючага 20-й арміяй войскі корпуса выйшлі з акружэння ў раён Оршы.

У гэтых баях узоры стойкасці і масавага гераізму паказалі воіны часцей 153-й дывізіі. Два батальёны фашысцкіх аўтаматчыкаў 7 ліпеня атакавалі пазіцыі, якія займала рота старшага лейтэнанта М. Ф. Герасімчука. На акопы абрынуўся шквал артылерыйскага і мінамётнага агню, пайшло 20 танкаў. Іх сустрэла аддзяленне знішчальнікаў танкаў, якімі камандаваў сяржант І. Ф. Шостак. Калі першыя машыны з крыжамі на вежах наблізіліся да акопаў, знішчальнікі пачалі закідваць іх звязкамі гранат і бутэлькамі з гаручай сумессю. Атакі працягваліся адна за другой.

Але байцы трымаліся стойка. Варожую пяхоту спынілі кулямётным агнём, а ў бой з танкамі зноў уступілі знішчальнікі. Сяржант Шостак запаліў галаўную машыну. Хутка яшчэ тры танкі ахапіла полымя. Аднак пяць танкаў прарваліся ў размяшчэнне роты. Два з іх наблізіліся да акопа, дзе знаходзіўся камандзір роты. Ён узняўся ва ўвесь рост са звязкай гранат і ўдалым кідком спыніў машыну. У другі танк паляцела бутэлька з гаручай сумессю. Прыкладу камандзіра паследавалі байцы. Страціўшы некалькі машын, фашысты і на гэты раз вымушаны былі адыйсці.

У той дзень сяржант І. Ф. Шостак падбіў і запаліў чатыры танкі, па дзве машыны падбілі радавы Уладзімір Зубко, камандзір роты М. Ф. Герасімчук, камандзір батальёна капітан Е. Е. Лабкоў.

У баях пад Сянном у цяжкія ліпеньскія дні 1941 г. вызначыўся механік-вадзіцель 18-га асобнага разведвальнага батальёна сяржант І. Д. Безбародаў, які смела ўступіў у бой з 16-ю танкамі праціўніка. Умела манеўруючы машынай, ён даў магчымасць камандзіру гарматы знішчыць тры нямецкія танкі. Механік-вадзіцель быў паранены, але працягваў кіраваць танкам. Ён пакінуў палаючую машыну толькі тады, калі былі выкарыстаны ўсе боепрыпасы.

Геранчна змагаліся з ворагам воіны 17-га мотастралковага палка на чале з камандзірам маёрам Д. Ф. Міхайлоўскім і палкавым камісарам Л. Ю. Эйхманам.

Радзіма высока ацаніла мужнасць удзельнікаў баёў пад Сянном. Сотні воінаў былі ўдастоены ордэнаў Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалёў «За адвагу» і «За баявыя заслугі». Сярод прадстаўленых камандаваннем да ўзнагароджання быў і камандзір батарэі старшы лейтэнант Якаў Джугашвілі — сын І. В. Сталіна.

Нямецкі генерал Гудэрыян пасля вайны ў сваёй кнізе «Воспоминания солдата» (М., 1954) пісаў: «Нас моцна білі пад Сянном».

Пасля вымушанага адступлення нашых войск у Сенненскай раённай бальніцы засталося звыш 300 цяжка параненых воінаў. У надзвычай цяжкіх умовах гітлераўскай акупацыі іх ратавалі ад смерці ўрач А. Я. Ушацкая, медсёстры Вольга Хадыка, Ганна Серабро-Хадыка, санітаркі. Яны рабілі ўсё магчымае, каб нашы параненыя не былі адпраўлены ў лагеры ваеннапалонных.

З лета і восені 1941 г. у раёне пачалі арганізоўвацца і дзейнічаць партызанскія групы В. С. Лявонава, П. І. Кірылава, А. Дз. Клячына, А. Ф. Бардадына, Л. І. Сяліцкага. З іх вясной 1942 г. было створана некалькі партызанскіх атрадаў. Група Л. І. Сяліцкага ў сакавіку злучылася з атрадам К. С. Заслонава. У маі групы П. І. Кірылава і А. Ф. Бардадына злучыліся ў атрад, які ўвайшоў затым у склад Багушэўскай брыгады В. У. Бойкі («Баці»), што дзейнічала на тэрыторыі Багушэўскага, Аршанскага і Гарадоцкага раёнаў. У кастрычніку была створана Сенненская партызанская брыгада (камандзір В. С. Лявонаў, камісар П. В. Сырцоў).

У былым Багушэўскім раёне пад кіраўніцтвам сакратара райкома КП(б)Б А. К. Стэльмаха і Я. М. Прахарэнкі ў ліпені – жніўні 1941 г. было створана пяць партызанскіх груп, аб'яднаных затым у атрад, які ў пачатку верасня пачаў праводзіць баявыя аперацыі.

З кожным днём узмацнялася барацьба ў тыле ворага супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асабліва актыўнымі дзеяннямі ў гэты час на Сенненшчыне вызначаліся заслонаўцы. Толькі ў ліпені 1942 г. партызаны-заслонаўцы знішчылі чатыры валасныя ўправы.

Па меры таго, як расла баявая слава партызан-заслонаўцаў, у іх рады ўліваліся ўсё новыя і новыя сілы. Днём нараджэння брыгады Заслонава лічыцца 15.7.1942 г., калі на базе пяці атрадаў, ядром якіх з'яўляўся атрад «дзядзькі Косці», было створана гэтае партызанскае фарміраванне. Усяго налічвалася 252 чалавекі. На ўзбраенні яны мелі станковы і 40 ручных кулямётаў, 8 аўтаматаў і 173 вінтоўкі.

Памнажаліся баявыя справы брыгады. Заслонаўцы пускалі пад адхон варожыя эшалоны, падрывалі рэйкі, масты,

станцыйныя збудаванні, знішчалі аўтатранспарт, варожую тэхніку, грамілі фашысцкія гарнізоны. Воля да перамогі была велізарнай. Але не хапала боепрыпасаў.

У адным з баявых данясенняў у ЦК КП(б)Б, датаваным 7 кастрычніка, К. С. Заслонаў пісаў: «...прашу больш, як мага больш толу і падрыўнога матэрыялу. Людзі дзейнічаюць. Сёння знішчылі Раснянскую валасную ўправу. Частку захопленых дакументаў накіроўваю Вам, магчыма скарыстаеце...».

У кастрычніку заслонаўцы ажыццявілі смелы рэйд па тылах праціўніка. Якраз у гэты час на К. С. Заслонава было ўскладзена камандаванне ўсімі партызанскімі сіламі Аршанскай зоны. 5 лістапада, здаўшы брыгаду камісару Л. І. Сяліцкаму, Канстанцін Сяргеевіч прыступіў да выканання новых абавязкаў.

У гэты час брыгада знаходзілася ў лясах пад Алексінічамі, а яе штаб з невялікім атрадам размясціўся ў вёсцы Купаваць. Па задуме Заслонава, паблізу гэтай глухой вёскі меркавалася стварыць зімовы партызанскі лагер. Але пра месца размяшчэння заслонаўцаў даведаліся фашысты і наладзілі буйную карную экспедыцыю. 14 лістапада ў 10 гадзін раніцы карнікі пачалі наступленне. Партызаны чатыры гадзіны адбівалі атакі карнікаў. К. С. Заслонаў змагаўся на пярэднім краі абароны. У гэтым баі легендарны камбрыг загінуў. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7.3.1943 г. Канстанціну Сяргеевічу Заслонаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На месцы гібелі камбрыга ў Купаваці і на чыгуначнай станцыі Орша ўзведзены помнікі легендарнаму «дзядзьку Косцю».

Па ўказанню Беларускага штаба партызанскага руху 23.9.1943 г. з шасці атрадаў, выдзеленых з 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава, была створана 2-я партызанская брыгада, якой таксама было прысвоена яго імя. Гэтыя буйныя фарміраванні народных мсціўцаў унеслі вялікі ўклад у агульную перамогу над ворагам. Нямала баявых аперацый правялі яны на тэрыторыі Сенненскага раёна.

Хутка пашыраўся партызанскі рух. Ужо не асобныя патрыёты, а сотні і тысячы людзей уліваліся ў рады народных мсціўцаў. Бесперапынна папаўняліся новымі байцамі 1-я і 2-я брыгады імя К. С. Заслонава, Сенненская брыгада. Павышалася баявое майстэрства партызанскіх камандзіраў і арганізатараў падпольных груп.

У маі 1943 г. быў створаны Сенненскі падпольны райком партыі. Узначаліў яго ўдзельнік грамадзянскай вайны, член партыі з 1928 г. М. Ц. Любімцаў, другім сакратаром быў М. І. Мізоўцаў. Адначасова М. Ц. Любімцаў быў прызначаны камісарам Сенненскай партызанскай брыгады.

З сярэдзіны 1943 г. актывізаваў сваю работу Сенненскі падпольны райком камсамола (сакратары П. І. Нікіцін, Л. С. Кацар). 28 ліпеня выйшаў у падполлі першы нумар раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна». З лістапада 1943 г. пачала выходзіць і газета «Сталінскі шлях» — орган Багушэўскага падпольнага райкома партыі. Падпольны друк адыграў важную ролю ў разгортванні масава-палітычнай работы сярод насельніцтва, у актывізацыі баявых дзеянняў партызан. Актыўна дзейнічалі прапагандысцкія групы, створаныя пры райкоме, і агіткалектывы пры партызанскіх атрадах. Былі выдзелены спецыяльныя групы партызан, якія распаўсюджвалі літаратуру ў вёсках, кантралюемых гітлераўцамі, а таксама паштальёны, у абавязкі якіх уваходзіла рэгулярная дастаўка ў атрады газет, лістовак, расклейванне іх у людных месцах, а таксама распаўсюджванне ў гарнізонах праціўніка.

З дня арганізацыі Сенненскай брыгады і да поўнага выгнання акупантаў яна не пакідала раён і толькі выходзіла за яго межы на разгром варожых гарнізонаў і для правядзення дыверсій. Партызаны кантралявалі чыгункі Орша — Мінск, Орша — Віцебск, Орша — Лепель, праводзілі дыверсіі на шасейных дарогах Віцебск — Сянно, Лепель — Віцебск, Сянно — Багушэўск.

У снежні 1943 г., лютым і сакавіку 1944 г. Сенненская брыгада вяла абарончыя баі каля в. Новая Беліца Сенненскага раёна, дзе праціўнік спрабаваў захапіць партызанскі аэрадром.

У баях за партызанскі аэрадром асабліва вызначыліся камандзіры атрадаў Ю. К. Каракетаў, А. М. Захараў, А. Дз. Клячын, М. Дз. Капчэеў.

Беліцкі партызанскі аэрадром меў вялікае стратэгічнае значэнне. Праз яго народныя мсціўцы атрымлівалі з «Вялікай зямлі» зброю, боепрыпасы, медыкаменты, газеты, зводкі Саўінфармбюро, лісты ад родных і блізкіх, адпраўлялі ў савецкі тыл цяжка параненых, хворых.

У студзені 1944 г. з мэтай правядзення буйных баявых аперацый і арганізацыі адпору карным экспедыцыям фашыстаў супраць партызан і мірнага насельніцтва была актывізавана дзейнасць 13-і брыгад Сенненска—Аршанскай партызанскай зоны, у тым ліку Сенненскай, Багушэўскай, 1-й і 2-й імя К. С. Заслонава, а таксама брыгад, якімі камандавалі Ф. Ф. Дуброўскі, С. М. Нарчук, Н. П. Гудкоў. У зоне налічвалася звыш 8 тыс. партызан, яна ахоплівала каля 300 населеных пунктаў, у якіх пражывала 35 тыс. чалавек. Каардынацыя дзеянняў партызанскіх брыгад была даручана В. С. Лявонаву.

У партызанскіх атрадах змагаліся з ворагам прадстаўнікі многіх народаў Савецкага Саюза. У пакоі баявой славы, створаным вучнямі Ульянавіцкай сярэдняй школы, захоўваюцца дакументы, што расказваюць аб тым, як бясстрашна і мужна змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі намеснік камандзіра Сенненскай партызанскай брыгады карачаевец Кічы-Батыр Алімуразаевіч Хаіркізаў. Свой апошні бой ён прыняў каля вёскі Латыгаль. Тут Лёнька-карачаевец, як называлі яго сябры, загінуў смерцю храбрых. Яго імем быў названы адзін з атрадаў Сенненскай партызанскай брыгады.

На тэрыторыі Сенненскага раёна ажыццяўлялі баявыя аперацыі таксама партызанскія брыгады 1-я Беларуская, 16-я Смаленская, «Аляксея», Смаленскі полк і іншыя. Асабліва актыўна яны дзейнічалі вясной і летам 1943 г. Брыгада «Аляксея», якой камандаваў А. Ф. Данукалаў, за пяць дзён жніўня разграміла фашысцкія гарнізоны ў вёсках Обаль, Рубежніца, Паршні. Партызаны 16-й Смаленскай брыгады зрабілі ўдалы налёт на гарнізон у вёсцы Тухінка. Смаленскі полк І. Ф. Садчыкава расправіўся з гітлераўскімі гарнізонамі ў Чарэі, вёсках Гарывец і Латыгаль.

З восені 1943 г. партызаны амаль бесперапынна вялі баі з акупантамі. Акупацыйныя ўлады і гітлераўскае камандаванне наладжвалі карныя экспедыцыі супраць партызан. У такіх выпадках народныя мсціўцы, адбіўшы атакі фашыстаў, альбо адыходзілі ў глыб лясоў, альбо пасля абыходнага манеўра наносілі нечаканыя ўдары па тылах і флангах карнікаў.

Нямецкае камандаванне кінула ўсе сілы, каб ліквідаваць партызан брыгады, якія дзейнічалі ў Мінскай і Віцебскай абласцях. Партызаны атрада В. С. Лявонава па ўказанню Беларускага штаба партызанскага руху выступілі ў напрамку Ушачаў, каб дапамагчы злучэнням Полацка—Лепельскай зоны, якія вялі крывапралітныя баі з карнікамі. Выкананне гэтага загада было ўскладзена на В. І. Ванцеева. Народныя мсціўцы разграмілі варожыя гарнізоны ў вёсках Залессе, Матырына.

Партызаны Сенненшчыны актыўна ўдзельнічалі ў аперацыі «рэйкавая вайна». На чыгунках Орша—Віцебск і Орша—Лепель яны падарвалі і пашкодзілі больш за тысячу рэек. На рахунку Сенненскай партызанскай брыгады 85 пушчаных пад адхон варожых эшалонаў, 84 знішчаных паравозы, тысячы забітых і параненых фашысцкіх салдат і афіцэраў, разбураныя масты, падарваныя танкі, бронемашыны, склад з боепрыпасамі.

Важкі ўклад у агульную перамогу над ворагам унеслі падпольныя патрыятычныя групы, якія актыўна дзейнічалі ў Сянне, Багушэўску, Беліцы, Ульянавічах, Латыгалі, Нямойце, Баяршчыне, Оўсішчы, Кажамяках і іншых населеных пунктах. Падпольшчыкі знішчылі нямецкага каменданта г. Сянно, узарвалі электрастанцыю, склад са зброяй і іншыя аб'екты. Работай падпольных груп кіраваў падпольны райком партыі.

Ранкам 23.6.1944 г. пачалася наступальная аперацыя Чырвонай Арміі па вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая атрымала кодавую назву «Баграціён». Характэрнай асаблівасцю гэтай аперацыі з'явілася цеснае ўзаемадзеянне з партызанамі ў ходзе наступлення.

Каб выканаць пастаўленую задачу, камандуючы 3-м Беларускім фронтам генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі рашыў стварыць дзве ўдарныя групы: паўночную — у саставе 39-й і 5-й армій і конна-механізаванай групы для наступлення на багушэўскім напрамку, паўднёвую — у саставе 11-й гвардзейскай і 31-й армій для дзеянняў на аршанскім напрамку.

Падтрымліваючы наступленне рэгулярных армейскіх часцей, з 20 па 23 чэрвеня партызанскія брыгады правялі масавыя акцыі на чыгунцы, каб перашкодзіць перавозцы жывой сілы і тэхнікі праціўніка.

Напярэдадні агульнага наступлення на франтах была праведзена разведка боем сіламі перадавых батальёнаў, каб удакладніць дадзеныя аб стане абароны праціўніка. Ранкам 23 чэрвеня, пасля моцнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі, войскі 3-га Беларускага фронту перайшлі ў наступленне. Найбольшага поспеху дасягнулі 39-я і 5-я арміі, якія ў першы ж дзень прарвалі абарону праціўніка на глыбіню 10—11 кіламетраў і да 50 кіламетраў па фронту. 25 ліпеня ў ходзе наступлення 5-й арміі нашы войскі штурмам авалодамі Багушэўскам.

Прадстаўнік Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі пісаў аб гэтым дні: «Пад Віцебскам, як і прадугледжвалася планам, наспяваў «кацёл», у якім павінна была аказацца буйная варожая групоўка. На паўднёвы захад знаходзіліся нямецкія рэзервы. Не дапусціць іх да Віцебска можна было пры ўмове хутчэйшага руху нашых войскаў у раён... Сянно. Мы вырашылі паскорыць наступленне 5-й арміі, каб не пазней вечара 24 чэрвеня ўвесці ля Багушэўска ў прарыў конна-механізаваную групу генерал-лейтэнанта М. С. Аслікоўскага». Перад гэтай групай была пастаўлена задача адбіць у ворага Сянно, Халопенічы, выйсці да ракі Бярэзіна, заняць плацдарм на яе заходнім беразе.

З прычыны таго, што на багушэўскім напрамку войскі 5-й арміі і конна-механізаванай групы хутка выйшлі на аператыўны прастор, а на аршанскім напрамку наступленне развівалася больш марудна, па ўказанню А. М. Васілеўскага 5-ю гвардзейскую танкавую армію П. А. Ротмістрава было вырашана ўвесці ў бой таксама на багушэўскім напрамку. Ранкам 25 чэрвеня яна сканцэнтравалася на захад ад Лёзна. Падтрымліваць яе павінны былі галоўныя сілы 1-й паветранай арміі генерала Ц. Ц. Хрукіна*.

Пазней А. М. Васілеўскі ўспамінаў: «Штурмавікі ўдала суправаджалі пяхоту і танкі, паражаючы агнявыя сродкі і жывую сілу фашыстаў. А калі 5-я армія сустрэла сур'ёзнае супраціўленне каля Багушэўска і я патрабаваў ад камандавання паветранай арміі (праз камандуючага фронтам) дапамагчы ёй, ні дождж, ні нізкія воблакі, што слаліся над намі на вышыні 100 м, не перашкодзілі масіраванаму бомбаваму ўдару па апорнаму пункту праціўніка. У час маёй тэлефоннай размовы з Ц. Ц. Хрукіным самалёты знаходзіліся ўжо ў паветры, накіроўваючыся да Оршы. Камандуючы арміяй тэрмінова перанацэліў іх. 90 ПЕ-2 і 180 ІЛ-2, змяніўшы маршрут, павярнулі на Багушэўск і выдатна выканалі заданне, аблегчыўшы наземным войскам авалоданне раёнам».

На другі дзень конна-механізаваная група М. С. Аслікоўскага, абагнаўшы стралковыя злучэнні, выйшла ў раён на захад ад Багушэўска і працягвала імкліва рухацца ў бок Сянна. Вораг паступова адводзіў свае войскі за рэчку Абалянка. Коннагвардзейцы нанеслі моцны ўдар па праціўніку, прарвалі яго абарону і рушылі ў напрамку Алексінічы — Вейна. Тым часам выйшлі на аператыўную прастору

*Хрукін Ц. Ц. — на час апісваемых падзей Герой Савецкага Саюза, генерал-палкоўнік авіяцыі, удзельнік вызвалення Беларусі.

часці 3-га механізаванага корпуса. Змятаючы асобныя ачагі супраціўлення ворага, яны 25 чэрвеня авалодалі горадам Сянно, 5-я гвардзейская танкавая армія ў той дзень выйшла на аўтамагістраль Масква — Мінск ля Талачына. Поўнасцю развалілася варожая абарона паміж Заходняй Дзвіной і Дняпром.

У баях за вызваленне Сенненшчыны многія воіны паказалі ўзоры мужнасці і гераізму. Пасмяротна звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены разлік баявой устаноўкі «кацюша» ў складзе гвардыі радавога С. А. Барадуліна, гвардыі сяржанта Ц. І. Святлічнага, гвардыі старшага сяржанта П. І. Назаранкі, якія выканалі заданне, аднак згарэлі разам з «кацюшай», каб не трапіць у рукі ворага. Гэтага ж звання пасмяротна ўдастоены камандзір танкавага разведузвода гвардыі лейтэнант М. А. Аніскін.

У лагеры, які выявілі разведчыкі лейтэнанта М. Ф. Маскаева з 97-й стралковай дывізіі, у лесе недалёка ад Багушэўска знаходзілася 8 тысяч мірных жыхароў. З усіх бакоў лагер абкружаў глыбокі роў, аплятаў калючы дрот, а подступы да ўзлесся былі замініраваны. Рашэнне ў разведчыкаў знайшлося імгненна: знішчыць патруль ворага, пранікнуць на тэрыторыю лагера і вывесці вязняў. Нечаканым налётам разведчыкі знішчылі ахову. Усе вязні былі выведзены на волю. Калі гітлераўцы апамяталіся і адкрылі артылерыйскі агонь па тэрыторыі лагера, там ужо не было нікога.

На ўскраіне Багушэўска ў чэрвені 1944 г. загінуў экіпаж нашага штурмавіка. У той дзень савецкія самалёты «апрацоўвалі» пярэдні край праціўніка. Калі загарэлася машына, камандзір В. М. Гарбуноў павёў самалёт прама на ўмацаванні ворага. Разам з адважным камандзірам загінуў борт-стралок І. Е. Чырвоў. Праз 26 гадоў чырвоныя следапыты з дапамогай мясцовых жыхароў адшукалі месца гібелі адважных лётчыкаў. Ім былі аддадзены апошнія ўшанаванні, а ў Багушэўску з'явіліся вуліцы Гарбунова і Чырвова.

Пры вызваленні Сенненшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Чырвонай Арміі актыўна дапамагалі партызаны. Каб адрэзаць шляхі адступлення праціўніка, брыгада пад камандаваннем В. С. Лявонава рабіла завалы на дарогах. Шосты атрад, якім камандаваў А. І. Красавін, у паўднёвай частцы раёна разбіў з засады варожую калону. Камандзір атрада «За Радзіму» В. Дз. Кацар правёў савецкую танкавую часць ад Чарэі да Бярэзіны. Партызаны вылоўлівалі і знішчалі ў лясах разрозненыя групы гітлераўцаў.

Партызаны Багушэўскай брыгады, сустрэўшыся 23 чэрвеня з перадавымі армейскімі часцямі, павялі савецкіх танкістаў у абыход абароны гітлераўцаў. Нечакана з'явіўшыся на беразе возера Дзевінскае, танкі з чырвонымі зоркамі на вежах выклікалі перапалох у стане ворага. Больш за тысячу фашысцкіх ваяк здаліся ў палон.

Гераічна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны многія ўраджэнцы Сенненшчыны. Усёй краіне вядома імя лётчыка Героя Савецкага Саюза А. К. Гараўца, які ў небе над Курскай дугой у адным паветраным баі збіў дзевяць варожых самалётаў. Адважны лётчык загінуў, але імя яго жыве ў назвах вуліц у Мінску, Віцебску, Сянне, Багушэўску, у сэрцах яго землякоў.

Подзвіг Аляксандра Матросава паўтарыў у 1945 г. ураджэнец вёскі Ульянавічы С. А. Каваленка, якому пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Гэта званне прысвоена пасмяротна і начальніку штаба стралковага палка А. Дз. Мацюшову, а таксама лётчыкам І. І. Камінскаму і І. Г. Тамашэўскаму, камандзіру танкавай роты А. Ф. Пятаковічу. Званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена П. М. Машэраву.

Помнікі і абеліскі каля дарог, брацкія магілы яшчэ і яшчэ раз напамінаюць пра тое, што Сенненшчына была арэнай жорсткіх баёў з фашыстамі, што тут было здзейснена нямала подзвігаў у імя нашай Бацькаўшчыны, у імя шчаслівай будучыні.

*У. Р. Скапа.*

# 153-я стралковая дывізія ў баях на Сенненшчыне

**З успамінаў гвардыі палкоўніка Сцебунова, былога намесніка начальніка штаба дывізіі**

18 верасня 1941 г. — дзень нараджэння савецкай гвардыі. У гэты дзень па рашэнню Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання за масавы гераізм, мужнасць асабовага саставу, высокае воінскае майстэрства загадам № 308 Народнага камісара абароны СССР І. В. Сталіна чатыры дывізіі былі перайменаваны: 100-я ў 1-ю гвардзейскую, 127-я ў 2-ю, 153-я ў 3-ю, 161-я ў 4-ю гвардзейскія.

«У шматлікіх баях за нашу Савецкую Радзіму супраць гітлераўскіх орд фашысцкай Германіі, — указвалася ў загадзе, — 100-я, 127, 153 і 161-я стралковыя дывізіі паказалі ўзоры мужнасці, адвагі, дысцыпліны і арганізаванасці. У цяжкіх умовах барацьбы гэтыя дывізіі неаднаразова наносілі жорсткія паражэнні нямецка-фашысцкім войскам, прымушаючы іх да ўцёкаў, наводзячы на іх жах. Гэтым нашым стралковым дывізіям удавалася біць ворага і гнаць перад сабою хвалёныя нямецкія войскі».

Загад Народнага камісара абароны СССР гвардзейцам чыталі ў верасні 1941 года. Але гэта было потым. А спачатку падзеі развіваліся так.

У чэрвені 1941 г. 153-я стралковая дывізія перадыслацыравалася ў Заходнюю асобую ваенную акругу і ўвайшла ў склад 62-га стралковага корпуса 22-й арміі.

На світанні 22 чэрвеня першыя эшалоны дывізіі прыбылі ў Віцебск. Часці размясціліся ў Мазурынскіх лагерах на беразе Заходняй Дзвіны. У гэты дзень фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз.

Вайна! Гэтае суровае слова пранеслася па дывізіі. Прайшлі мітынгі. Словы заявы ўрада: «Наша справа справядлівая. Вораг будзе разбіты. Перамога будзе за намі!», — сталі баявым дэвізам асабовага саставу. Часці дывізіі спешна займаліся баявой падрыхтоўкай і папаўняліся асабовым саставам, узбраеннем, баявой тэхнікай.

У канцы чэрвеня 153-я стралковая дывізія атрымала задачу падрыхтаваць абарону на рубяжы 35 км на паўднёвы захад ад Віцебска.

Па рашэнню камандзіра дывізіі палкоўніка Н. А. Гагена часці абсталявалі ў інжынерных адносінах паласу абароны з пярэднім краем Гнядзілава, усходні бераг возера Саро, Ходцы, Парнева, Машканы, Александрова даўжынёй па фронту ў 42 км. Пярэдні край паласы перадполля праходзіў уздоўж чыгункі Лепель — Орша на ўчастку Жасцянка — Камарова, другі рубеж — на лініі Паташня — Углы — Канева — возера Багданаўскае — Сянно — Каменка. Сюды былі накіраваны стралковыя батальёны: у Вярхоўе — 1-ы стралковы батальён 666-га палка, у Сянно — 1-ы стралковы батальён 505-га палка.

Батальён, які знаходзіўся ў Сянне, знішчыў разведку праціўніка, якая спрабавала пранікнуць у прамежкі паміж апорнымі пунктамі абароны перадполля.

6 ліпеня ў перадполлі працягваліся баі з разведкай і перадавымі падраздзяленнямі ворага. Перадавыя атрады папаўняліся пераходзячымі праз лінію фронту падраздзяленнямі розных часцей, у тым ліку 50-й стралковай дывізіі. Сумесна з батальёнам 505-га палка ў Сянне дзейнічалі нешматлікія падраздзяленні 18-й танкавай дывізіі.

Перад фронтам 435-га і 505-га палкоў дзейнічала наша разведка. Чатыры варожыя самалёты былі збіты на працягу дня. У гэты ж дзень дывізія панесла першыя страты. Загінулі дзесяткі маладых людзей. Параненыя поля бою не пакідалі. Перадавы атрад у Сянне вёў бой з праціўнікам, які спрабаваў акружыць горад. Танкі і пяхота вымушаны былі адступіць.

У напрамку Сянна быў высунуты 3-і стралковы батальён 435-га палка, які сумесна з 3-м батальёнам 36-га танкавага палка 18-й дывізіі разграміў калону мотапяхоты праціўніка і завязаў бой з іншымі ягонымі мотачасцямі. Батальён замацаваўся ў вёсцы Войлева, скоўваючы дзеянні танкаў і мотапяхоты гітлераўцаў.

9 ліпеня ў 14 гадзін праціўнік, наносячы ўдар на ўчастку Сянно—Ходцы, атакаваў абарончыя пазіцыі 666-га і 435-га стралковых палкоў, адначасова падвяргаючы ўдарам з паветра пазіцыі 505-га стралковага палка ў раёне Станькі—Платоны. Групоўкі праціўніка развівалі наступленне на ўсходнім напрамку, атакавалі нашы войскі на паўднёвым захадзе ад Віцебска.

153-я стралковая дывізія, скаваная агнём ворага з фронту, аказалася пад пагрозай акружэння. У 21 гадзіну штаб дывізіі атрымаў загад камандуючага 20-й арміяй генерал-маёра П. А. Курачкіна аб адыходзе дывізіі ў ноч з 10 на 11 ліпеня на ўсходні бераг ракі Лучоса.

435-ы і 505-ы палкі пакінулі па аднаму батальёну для сумесных дзеянняў з часцямі 7-га механізаванага корпуса ў раёнах Астроўна і саўгаса "Ходцы". Асноўныя сілы дывізіі да раніцы 11 ліпеня выйшлі на ўсходні бераг Лучосы, маючы задачу прыкрыць віцебска-смаленскі напрамак.

Затым дывізія ваявала пад Лёзнам, трапіла ў акружэнне. Нямецкае радыё 14 ліпеня нават паспяшалася перадаць паведамленне аб разгроме 153-й савецкай дывізіі. Але мы з баямі вырваліся з акружэння, вялі баі на Дняпры.

За арганізаванасць, мужнасць, адвагу, праяўленыя ў баях, Ваенны Савет Заходняга фронту аб'явіў асабоваму саставу дывізіі падзяку. Дзесяткі байцоў, камандзіраў і палітработнікаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Ганаровае найменне "гвардзейскай" дывізія заваявала ў цяжкіх умовах барацьбы з захопнікамі.

## Імя яго невядома

Гэта адбылося летам 1941 г., калі нямецка-фашысцкія захопнікі напалі на нашу Радзіму. Прыкладна ў першай палавіне ліпеня ў нашым раёне, недалёка ад вёскі Ходцы, быў падбіты савецкі самалёт, які ўпаў на беразе возера Сосна, каля вёскі Соіна. Адзін з лётчыкаў загінуў разам з самалётам, двое ж паспелі выкінуцца на парашутах. Адзін з іх прызямліўся ў вёсцы Рубежніца, якая была захоплена немцамі. Убачыўшы гэта, наш лётчык забег у адзін з дамоў, які аказаўся пустым, і, зачыніўшыся ў ім, пачаў адстрэльвацца. Гітлераўцы хацелі захапіць яго жывым, але на ўсе іх спробы лётчык адказваў трапнымі выстраламі, якія каштавалі жыцця некальнім фашыстам. Тады гітлераўцы рашылі падпаліць дом.

Але адважны лётчык не разгубіўся. Ён закідаў нямецкіх ваяк паленнямі дроў, якія былі складзены ў сенцах, і, скарыстаўшы іх часовае замяшанне, кінуўся з палаючай хаты ў бок лесу.

Цяжка змагацца аднаму патрыёту, у якога застаўся толькі адзін патрон, супраць некалькіх дзесяткаў узброеных салдат, якія на матацыклах кінуліся яму наперарэз. Калі, здавалася, фашысты вось-вось схопяць героя, ён апошнім патронам выстраліў сабе ў грудзі і ўпаў мёртвым...

Мужнага савецкага лётчыка потым пахавалі жыхары вёскі Рубежніца, а пасля вайны ён быў перазахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Ходцы. Імя гэтага лётчыка так і засталося невядомым. Другі лётчык спусціўся на парашуце на нейтральную паласу каля вёскі Мелехава.

*А. Бабкоў.*

## Мой першы бой — ён цяжкі самы

### З успамінаў генерал-маёра А. М. Быкава

Калі я слухаю песню М. Ножкіна са словамі ў прыпеве «Последний бой — он трудный самый», у маёй свядомасці паўстаюць эпізоды апошніх баёў нашай танкавай гвардыі ва Усходняй Памераніі. Пакінуў глыбокі след у памяці і мой першы бой у ваколіцах беларускага горада Сянно. Менавіта ён, гэты самы першы бой, быў для мяне і самым цяжкім.

А было гэта так. Пасля цяжкіх бітваў першых дзён вайны войскі Заходняга фронту ў пачатку ліпеня 1941 года аказалі праціўніку рашучае супраціўленне на рубяжы Дзісна—

Віцебск—Орша. Характэрнай асаблівасцю разгарнуўшыхся тут баёў з'явілася нанясенне па войсках праціўніка магутных контрудараў з боку стратэгічных рэзерваў савецкага Галоўнага камандавання.

У адным з гэтых контрудараў, ажыццёўленых войскамі 20-й арміі генерал-лейтэнанта П. А. Курачкіна, удзельнічаў і наш 34-ы танкавы полк. Ён знаходзіўся ў першым эшалоне баявых парадкаў 17-й танкавай дывізіі, якая ўваходзіла ў склад 5-га механізаванага корпуса, прыбыўшага на Заходні фронт у апошнія дні чэрвеня з Забайкальскай ваеннай акругі.

Я быў тады камандзірам танка Т-26. Складанай была абстаноўка на нашым участку фронту. Вораг працягваў прасоўвацца ўперад, авалодаў Лепелем. Тут перад нашымі войскамі была пастаўлена задача: знішчыць групоўку ворага, якая прарвалася, авалодаць Лепелем, аднавіць зыходнае становішча. Рыхтуючы нас да першых у нашым жыцці баявых дзеянняў, камандзіры і палітработнікі гаварылі, што галоўныя сілы Чырвонай Арміі яшчэ не ўступілі ў бой, што яны толькі падыходзяць да фронту і таму нашым войскам трэба спыніць і адкінуць ворага, даць камандаванню магчымасць выйграць час для разгортвання і ўводу ў бой свежых сіл.

Наш 34-ы танкавы полк, якім камандаваў маёр Е. А. Юрэвіч, выгрузіўшыся на поўнач ад Оршы і зрабіўшы марш, да вечара 5 ліпеня сканцэнтраваўся ў вызначаным раёне. Вялікі сасновы бор, здавалася, надзейна схаваў нас і нашу тэхніку.

У той памятны для нас вечар, напярэдадні бою, нашы начальнікі — камандзір роты старшы лейтэнант Грыневіч, яго намеснік па палітчастцы лейтэнант Стаўбун, камандзір узвода лейтэнант Дземчанка знаходзіліся з намі. Зноў і зноў тлумачылі нам баявую задачу, нагадвалі, як дзейнічаць пры сустрэчы з танкамі, што рабіць для падаўлення процітанкавых гармат, як паступаць у выпадку, калі танк загарэўся або атрымаў прабоіну ад варожага снарада... Словам, рыхтавалі нас да бою і практычна, і маральна-псіхалагічна.

Упэўненыя ў поспеху, раніцай 6 ліпеня мы зняліся з зыходных пазіцый і пайшлі ўперад. Шырокае калгаснае поле з няўбраным жытам стала месцам нашага баявога хрышчэння. Спачатку нас сустрэлі нямецкія мотастралковыя падраздзяленні. Мы збілі іх і прайшлі на 3—5 км уперад. Аднак радавацца было рана. Хутка немцы кінулі супраць нас танкі. Іх было многа, вельмі многа... Браніраваныя машыны з чорнымі крыжамі на бартах грозна рухаліся на нас. Цяжка перадаць той душэўны стан, які ахапіў у той момант нас, маладых, неабстраляных яшчэ байцоў, з кожнай хвілінай бой узмацняўся. Сталі гарэць адзін за другім і варожыя і нашы танкі. Аб дзеяннях нашага экіпажа магу сказаць так: стараліся, як патрабуе прысяга, не шкадуючы самога жыцця. Не памятаю, колькі мы зрабілі па танках выстралаў, пакуль яны былі ад нас на значнай адлегласці...

Але вось чую голас механіка-вадзіцеля Сашы Хітрова: «Глядзі, камандзір, прэ гад прама на нас!..» Не паспеў я даць каманду, а вежавы стралок Коля Жукаў ужо выцягваў з боеўкладкі бранябойныя і пасылаў іх у казённік. Бяру нямецкі танк у прорэзь прыцэла. Націскаю на спуск. Гулка аддаўся ў вежы выстрал, здрыганулася, адкацілася ў нішу гармата... А танк ідзе. Промах! Зноў зараджаем. Зноў націскаю на спуск. І... голас Хітрова: «Парадак! Закруціўся на адной гусеніцы. Палі яшчэ!» Адразу пасылаем чарговы снарад ужо па ахопленым полымем танку. Думаю, хтосьці дапамог нам. Магчыма, памочнік камандзіра ўзвода старшы сяржант Міхаіл Малашонак, які знаходзіўся ў баявых парадках справа ад нас.

Сярод асабовага саставу нашай роты старшы сяржант Малашонак яшчэ да вайны, у час нашай службы ў Забайкаллі, вылучаўся сваім майстэрствам і смеласцю. А ў тым першым для нас баі з нямецкімі танкістамі ён пацвердзіў свае якасці ўмелага і мужнага воіна. У тым баі ён падбіў нямецкі танк. Але і яго машына загарэлася. Мужны камандзір захаваў вытрымку і здолеў, здавалася б, у бязвыхадным становішчы эвакуіраваць з загарэўшагася танка праз люк увесь састаў экіпажа жывым.

Страты ў тым баі ў нас былі вялікія. Аднак і немцам дасталося. Да ночы напружанне бою спала. Карыстаючыся зацішшам, нашы камандзіры (ды і мы пад іх кіраўніцтвам) прымалі меры па аднаўленні баяздольнасці падраздзяленняў. Камандзір роты, старшы лейтэнант Грыневіч і палітрук лейтэнант Стаўбун сабралі камандзіраў узводаў і экіпажаў танкаў. Былі падведзены вынікі нашага першага бою, адзначаны лепшыя байцы. У іх ліку, акрамя М. Малашонка, А. Хітрова, Н. Жукава, былі названы таксама механік-вадзіцель Пётр Мельнікаў, камандзір танка Віктар Бокаў, вежавы стралок Васіль Глазаў.

У памяці ад першага бою ў мяне засталіся не толькі мужныя паводзіны маіх баявых сяброў, але і след першага ранення, якое, на шчасце, аказалася не цяжкім. Павязку на галаве я насіў як сведчанне пройдзенага намі першага выпрабавання агнём.

Наш першы бой, натуральна, стаў значнай падзеяй у франтавой біяграфіі кожнага байца і камандзіра нашай роты. Аднак у маштабе і на фоне буйнейшай танкавай бітвы ён быў усяго толькі эпізодам. Мы тады яшчэ не ведалі, што з'яўляемся ўдзельнікамі адной з першых сустрэчных танкавых бітваў пачатковага перыяду вайны. І толькі пазней ужо, у час вучобы ў ваеннай акадэміі, я даведаўся аб тым, што гітлераўскае камандаванне кінула тады на нашым напрамку праз гарады Лепель і Сянно магутную браніраваную армаду, якая па сіле намнога пераўзыходзіла два нашых корпусы, узброеныя лёгкімі танкамі.

І ўсё ж у ходзе контрудару нашы войскі нанеслі праціўніку значныя страты і прасунуліся на 30—40 км у бок Лепеля. Аднак каля Віцебска наша наступленне сустрэла моцнае супраціўленне праціўніка. Наш 5-ы механізаваны корпус, аказаўшыся амаль у поўным акружэнні, на працягу двух сутак вёў цяжкія абарончыя баі. Праціўнік прадпрыняў 15 атак у дзень, але разграміць акружаныя войскі яму не ўдалося. Я добра памятаю гэтыя гарачыя, у прамым і пераносным сэнсе, ліпеньскія дні 1941-га.

І тым не менш, тыя першыя баі і нашы першыя, хоць і нязначныя эпізадычныя перамогі ў іх, былі для нас вялікай справай. Яны ўсялялі ўпэўненасць і надзею на перамогу ў той страшнай вайне.

## Да апошняга снарада

**З успамінаў А. Асяльедкі**

З узлеску Казюцінскай пушчы, які ляжыць на пагорках, віднеецца Сянно, занятае ўчора фашыстамі. Наша група з семнаццаці лёгкіх танкаў 35-га палка 6 ліпеня 1941 года прайшла за вёскамі Казлоўка і Папоўка да Нямойтаўскай шашы і, падавіўшы варожую артылерыю каля Рахальскага лесу, выбіла гітлераўцаў з горада. Адначасова з танкамі ў Сянно ўвайшла наша пяхота.

Тут, у горадзе, мы захапілі першых палонных фашыстаў. Паўсюль віднеліся сляды іх рабункаў і марадзёрства. Валяліся раскіданыя кніжкі каля магазінаў, біты посуд, дзіцячыя цацкі.

Адступіўшыя варожыя падраздзяленні акапаліся на вышынях каля вёскі Горкі. Наша пяхота замацоўвалася на заходняй ускраіне горада. Раніцай наступнага дня фашысты спрабавалі атакаваць нас. Згубіўшы некалькі танкаў, адыйшлі.

У сінім ліпеньскім небе няспынна кружаць варожыя самалёты. Каб ратаваць свае машыны ад бомбавых удараў з паветра, мы часта мяняем баявыя пазіцыі. Нейкі час стаім пад соснамі могільніка, потым хаваемся ў засені ліпавай алеі гарадскога парку. Кароткае зацішша сведчыць, што хутка бой загрыміць з новай сілай.

І ён загрымеў, гэты бой, на досвітку 8-га ліпеня. Сканцэнтраваўшы пад Сянном буйныя сілы, гітлераўцы абыйшлі горад з поўдня, з трох напрамкаў разгарнулі наступленне. Падтрымліваючы пяхоту, якая мужна абараняла занятыя рубяжы, пайшлі ў контратаку танкі.

У складзе экіпажа агнямётнага танка я быў механікам-вадзіцелем. Акрамя ўстаноўкі для выкідвання вогненнага струменю, на ўзбраенні баявой машыны меліся два кулямёты. Узначальваў экіпаж былы трактарыст з-пад Барысава Іван Бокій, радыстам быў яго зямляк Ілля Дзялендзік.

Нашаму экіпажу было загадана тэрмінова заняць раскрыжаванне дарог, што выходзяць з горада на Віцебск і Багушэўск, да падыходу машын, узброеных гарматамі, утрымліваць яго.

Аб'ехаўшы каля возера круты спуск з Касцельнай гары, мы перасяклі ручай, калі камандзір заўважыў на яўрэйскім могільніку тры фашысцкія танкі, якія прарваліся сюды. Але гітлераўцы першымі ўбачылі нас і адкрылі агонь. Бранябойны снарад трапіў у бак з вогнесумессю, забіты наш радыст Ілля Дзялендзік. З камандзірам выскокваем з машыны і скочваемся ў ручай. Чорны дым з языкамі барвовага полымя ўзвіўся над нашым танкам.

Бяжым да камандзіра роты, які назіраў за боем з пагорка Чырвонай Слабады.

— Садзіцеся ў мой танк, — загадвае ротны. — Контратакуйце фашыстаў!

Аднак у камандзірскай машыны перабіта гусеніца. Рамантаваць часу няма. Уладкаваўшыся ля гарматы, лаўлю ў прыцэл фашысцкі танк. Вось між сосен паказваецца бартавая браня танка з намаляваным на ёй чорным крыжам. Не памятаю ўжо, колькі зрабіў стрэлаў, але хутка слуп агню ўзвіўся над фашыстам.

Па алешніку, што падступаў да могільніка ад поля, прабіраецца яшчэ адна варожая ма-

шына. Першым жа стрэлам па ёй удалося перабіць гусеніцу. Гітлераўцы імкнуцца выправіць пашкоджанне, аднак чарговыя снарады нашай гарматы падпалілі і гэты танк.

Фашысты насядаюць з усіх бакоў. Ад возера з-за павароту, на раскрыжаванне абараняемых намі дарог, выскоквае матацыкліст. Чарга вежавага кулямёта — і матацыкл з седаком звальваецца ў канаву.

Некалькі хвілін перадышкі. Вежавы стралок мяняе перагарэлы ствол кулямёта. У мяне — апошні снарад з танкавага боекамплекта.

На дарозе зноў варожая машына. Гэта бронетранспарцёр з мотапяхотай. Заўважыўшы наш танк, гітлераўцы гарохам пасыпаліся на зямлю. Задняй хадой бронетранспарцёр спрабаваў адыйсці, аднак не паспеў. Апошні наш снарад дагнаў яго.

У гарачцы бою мы не заўважылі гітлераўцаў, якія з буйнакаліберным кулямётам падпаўзлі да нашага танка. Град куль забарабаніў па брані. Пабялелі разбітыя трыплексы глядзельных шчылін. Пад машынай узарвалася звязка гранат. Танк ахутаны едкім дымам, няма чым дыхаць. Механік Руснак выскоквае з люка і хаваецца за бліжэйшымі дамамі.

Выкаціўшыся з танка, я некалькімі скокамі дасягнуў сцяны дома, што стаяў справа. За мной кінуўся і вежавы стралок. Не дабегшы да дома, ён быццам бы спатыкнуўся і ўпаў тварам у дарожны пыл. Калі я падцягнуў башнёра да сцяны, ён быў мёртвы.

Спадзеючыся ўбачыць Руснака, выглядваю з-за дома. На вуліцы зялёныя мундзіры фашыстаў. Рашыў перабегчы ў горад. Там віднеліся шчыліны акопаў. І ў гэты момант рэзкі боль апёк цела. Павярнуўшыся інстынктыўна, заўважыў стрэліўшага ў мяне гітлераўца.

Над верхняй часткай жывата кроў афарбавала гімнасцёрку. Толькі цяпер зразумеў, што паранены. Зрабіўшы некалькі крокаў, упаў на высыпаную ў нейкім двары бульбу.

Выцягнуў мяне адтуль чырвонаармеец. А назаўтра разам з іншымі параненымі абаронцамі горада я ўжо ляжаў у мясцовай бальніцы, дзе сенненскія медыкі-патрыёты вярталі нас да жыцця, для новых баёў з акупантамі.

## У баях за Сянно

З першага дня вайны Таіса Міхайлаўна Леанцюк атрымлівала ад мужа пісьмы, поўныя веры ў перамогу. «...Еду на фронт,— пісаў старшы лейтэнант Аляксандр Цярэнцьевіч Леанцюк,— Ты не бядуй, у цябе на руках сын. Выхавай яго мужчынам. А мая мэта — нанесці жорсткі ўдар па ворагу... Маё жыццё патрэбна Радзіме...»

Старшы лейтэнант А. Ц. Леанцюк, які незадоўга да вайны быў назначаны начальнікам штаба 2-га батальёна 35-га танкавага палка 18-й танкавай дывізіі, меў поўнае маральнае права пісаць так. Мужна змагаліся танкісты за горад Сянно. У гэтым баі старшы лейтэнант А. Ц. Леанцюк быў забіты асколкам варожага снарада. Так паведаміў яго жонцы ў г. Херсон механік-вадзіцель І. Карпаў. Амаль адначасова з яго лістом Таіса Міхайлаўна атрымала афіцыйнае паведамленне, што яе муж «праявіў геройства і мужнасць і загінуў 7 ліпеня 1941 года ў раёне Сянно».

У гарадскім парку раённага цэнтра, дзе пахаваны астанкі савецкіх воінаў і партызан, аддаўшых жыццё ў імя нашай перамогі, на адной з мармуровых пліт помніка ў шэрагу многіх прозвішчаў высечана: «Леанцюк Аляксандр Цярэнцьевіч, ст. л-нт».

*П. І. Ермашкевіч.*

## Лячылі і ратавалі

### З успамінаў Я. Юдзіна

Памятаецца нам, былым абаронцам Сенненшчыны, трагічнае лета 1941 года. Многія з нас апынуліся пасля гарачых баёў пад пагрозай палону і смерці. Параненыя байцы лёгка маглі трапіць ворагу ў рукі. Аднак ратавалі нас ад фашыстаў і вырывалі з кіпцюроў смерці сенненскія медыкі.

Не памятаю, як я аказаўся ў бальнічным падвале разам з чатырма параненымі чырвонаармейцамі. Дні праз два нас перанеслі ў перапоўненыя палаты хірургічнага аддзялення. Побач са мной ад цяжкіх ран паміраў малады маёр Мікалай Маслаў. Асколак варожага снарада прабіў яго навылёт, калі маёр узнімаў свой парадзелы мотастралковы батальён у чарговую атаку пры абароне Сянна.

Фашыстам удалося тады прарвацца на ўсход. Больш трохсот байцоў і камандзіраў падабралі на палях баёў і прывезлі ў бальніцу мясцовыя сяляне. У надзвычай цяжкіх умовах гітлераўскай акупацыі ратавалі нас тут ад смерці сапраўдныя савецкія патрыёткі ўрач Антаніна Яўстафаўна Ушацкая, медыцынскія сёстры Ганна і Вольга Хадыкі, іх добраахвотныя памочніцы — сенненскія дзяўчаты Валянціна Бярозка, Зоя Касабуцкая і іншыя.

Паланёнай была зямля, аднак не скарыліся людзі фашыстам. Гэта мы адчувалі не толькі ў клопатах работнікаў бальніцы, многіх жыхароў горада і раёна аб нашым хутчэйшым выздараўленні. Нам, адарваным лёсам вайны ад сваіх баявых падраздзяленняў, перадавалася непахісная вера людзей, якія акружалі нас, у абавязковую перамогу над ворагам, і гэта вера многім дапамагла зноў стаць у шэрагі байцоў за вызваленне Радзімы.

Антаніна Яўстафаўна Ушацкая, Аня Хадыка, многія дзяўчаты, якія дапамагалі ім, рабілі ўсё магчымае, каб перашкодзіць гітлераўцам вывозіць параненых байцоў у лагеры ваеннапалонных. Рызыкуючы жыццём, яны пад выглядам радавога чырвонаармейца хавалі ў бальніцы камуніста Аляксандра Фёдаравіча Бардадына, які пазней стаў адным з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі.

Здагадваючыся аб задуме многіх з нас згуртавацца ў партызанскі атрад, дзяўчаты ўсімі магчымымі для іх сродкамі садзейнічалі ажыццяўленню гэтай задумы. Памятаю, як аднойчы Антаніна Яўстафаўна прывяла да нас у палату сярэдніх гадоў жанчыну. Прывітаўшыся, жанчына паклала на табурэт невялікі пакунак, разгарнула яго і запрасіла:

— Частуйцеся, хлопцы. Сабрала вось, што было ў доме.

Хлеб, гародніну, малако, іншы раз сала, яйкі прывозілі і прыносілі ў бальніцу многія жыхары раёна. Толькі на гэты раз самым найлепшым «пачастункам» для нас аказаліся свежыя зводкі Саўінфармбюро, ружовыя аркушы лістовак з заклікам партыі ўзнімацца на ўсенародную Айчынную вайну супраць фашысцкай навалы. Яны ляжалі ў пакунку пад караваем пахучага хлеба і дзесяткам яек.

Неаднойчы прыходзіла ў бальніцу потым тая жанчына, настаўніца з вёскі Трубаносы Марыя Генрыхаўна Пракаповіч. Яна стала сувязной групы, якая гуртавалася вакол камісара Бардадына. Неўзабаве наша група вырасла ў партызанскі атрад. Калі фашысты ўзмацнілі кантроль за бальніцай і нават выставілі вартавых, Марыя Генрыхаўна цераз Ушацкую, Аню Хадыка, а іншы раз і цераз Валю Бярозка працягвала дастаўляць нам лістоўкі, важныя звесткі аб падзеях у раёне.

Часта наведваліся ў бальніцу родныя і сябры Марыі Генрыхаўны Пракаповіч, жыхары Сянна Алесь Васілеўскі, Сцяпан Латышаў, Кацярына Арлёнак. З іх дапамогай Ушацкая ўладкоўвала вылечаных байцоў у гасцінных сем'ях гараджан, сялян навакольных вёсак. Пётр Казлоўскі з вёскі Машкі, яго браты Сяргей, Мікалай і Уладзімір ажыццяўлялі сувязь паміж групай камісара Бардадына і будучымі байцамі яго атрада, забяспечвалі нас зброяй.

Заўважыўшы, што бальнічныя палаты пусцеюць, гітлераўцы наведаліся з праверкай. Антаніна Ушацкая спаслалася на высокую смяротнасць параненых з-за адсутнасці неабходных лекаў, прад'явіла «рэвізорам» карткі ўліку хворых, у якіх усе, хто пакінуў бальніцу, значыліся памерлымі. Гэта, відаць, задаволіла гітлераўцаў, і яны нейкі час бальніцу не турбавалі.

У канцы першай ваеннай зімы, крыху падлячыўшыся, пакінулі бальніцу Аляксандр Бардадын, я, Апанас Кірычэнка, Мікалай Лаўкоўскі і іншыя. Пазней была кінута ворагам у лагер смерці ўрач Ушацкая, пагроза арышту навісла над многімі медыцынскімі сёстрамі. Ані Хадыка ўдалося выратавацца ад расправы фашыстаў. Яна пайшла да народных мсціўцаў, дзе змагалася супраць ворага да вызвалення раёна.

Мужныя жанчыны-медыкі, рызыкуючы жыццём, ратавалі нас, ставячы на ногі параненых байцоў і камандзіраў, рыхтавалі выступленне ў баявы паход першага сенненскага партызанскага атрада.

## За родную зямлю

1941-ы. Лета. Калосіцца, наліваецца збажына, спялее, здаецца, увачавідкі. А над палямі, над вясковымі хатамі, нізка пралятаюць самалёты з крыжамі на крылах. Скінуць бомбу, другую і знікаюць у мірнай, на першы погляд, смузе далягляду.

...Лявон Фёдаравіч Цуран да вайны быў старшынёй Будскага сельскага Савета Багушэўскага раёна. Жыў з жонкай і дзецьмі. Старэйшай дачцэ, Лідзе, споўнілася шаснаццаць, Валодзю — трынаццаць, Міколку — толькі тры, а самай малодшай, Валечцы, паўтара годзіка.

Фашысты ірваліся наперад.

— Не можа быць такога, каб ворага не спынілі,— гаварыў Цуран вяскоўцам.— Але каб хлеб акупантам не дастаўся, трэба спаліць збажыну.

Ці лёгка хлебаробу знішчаць плён сваёй працы? Але іншага выйсця не было. І вось полымя ахапіла амаль што імгненна пажоўклую ўжо, з цяжкім калоссем, ніву. Людзі не саромеліся сваіх слёз.

З дапамогай аднавяскоўцаў Лявон Фёдаравіч адагнаў грамадскую жывёлу ў Багушэўск. Потым разам з усімі капаў процітанкавы роў у Янове. Тады ўсё яшчэ здавалася, што ворага вось-вось спыняць.

А немцы знаходзіліся ўжо не далей, як за два дзесяткі кіламетраў. Лявон Цуран адвёз сваю сям'ю ў родную вёску Курэйшына, дзе жылі яго маці і сястра. Вёска знаходзілася воддаль ад буйных дарог і здавалася больш-менш бяспечнай.

Сам пачаў згуртоўваць вакол сябе надзейных людзей. Начаваў то ў адной вёсцы, то ў другой. Яго ведалі амаль усе, ахвотна адчынялі перад ім дзверы. Падпольшчыкі збіралі зброю, надзейна яе прыхоўваючы да пары.

Неяк вечарам да Цурана прыйшоў сакратар Багушэўскага райкома партыі Адам Стэльмах. Адбылася паміж імі важная размова, пасля якой падпольная арганізацыя прыкметна вырасла колькасна.

Байцам і камандзірам Чырвонай Арміі, трапіўшым у акружэнне, Цуран дапамагаў змяніць адзенне, размяркоўваў па вёсках, даваў даручэнні.

Дырэктар сельскай школы Павел Шорап быў беспартыйным, таму акупанты прызначылі яго бургамістрам вёскі Буда. Павел адразу ж звязаўся з падпольшчыкамі і пачаў выконваць іх заданні. На спіртзаводзе ў Янове пасля выбуху застаўся адзін кацёл, які пасля рамонту яшчэ мог бы працаваць. Шорапу немцы давяралі і прапанавалі заняцца рамонтам катла. Але за дзень да пуску і ён узарваўся. Камендант даручыў паліцаям вёскі Тур'ева, бо ў самім Янове паліцыі не было, адшукаць вінаватых.

Начальнікам паліцыі ў Тур'еве быў Іван Сушчынскі, які не раз сядзеў у турме пры савецкай уладзе. Ва ўсіх сваіх бедах ён лічыў вінаватым у першую чаргу старшыню сельскага Савета. Ён ведаў, што Цуран ходзіць па вёсках, стварае нейкую арганізацыю.



Л. А. Цуран з дачкой Лідай.

«Няйначай гэта ён узарваў кацёл,— рашыў Сушчынскі.— Ну, цяпер я з ім паквітаюся».

Увогуле, Лявон Фёдаравіч рэдка прыходзіў дадому. Але ўсё ж аднойчы адведаў сям'ю і, стомлены, заснуў. Тут якраз і наляцелі паліцаі. Цурана звязалі, біў яго сам Сушчынскі. Напаўжывога, яго ўскінулі на падводу і павезлі. Па дарозе заехалі ў Буду, зазірнулі да бургамістра. Шорап сустрэў іх вельмі гасцінна, напіліся да бяспамяцтва, а падвода са звязаным Цураном знікла ў невядомым кірунку. Пад час п'янкі Сушчынскі прагаварыўся, што з дня на дзень збіраецца пералавіць усіх падпольшчыкаў. І ў тую ж ноч Цуран, выратаваўшыся ад паліцаяў, адправіў сваіх таварышаў на базу ў лес, дзе ўжо загадзя былі падрыхтаваны зямлянкі.

А ў Курэйшына на наступны дзень прыбылі паліцыі разам з немцамі. Пачалі з Цурановай хаты, якая стаяла на ўскрайку.

— Дзе твой сын?— прычапіліся да старой. Затым пачалі яе збіваць, перапа-

лохалі дзяцей, паднялі хворую жонку Цурана. А Ліда заявіла, што яе маці хворая на тыф. Немцаў як ветрам здзьмула.

Лявона Цурана шукалі паўсюль. У той дзень у Курэйшыне расстралялі васемнаццаць чалавек, і ён быў упэўнены, што яго сям'ю таксама знішчылі. Калі сцямнела, Цуран вярнуўся дахаты...

Сушчынскі адыграўся на дзецях. На вачах у Міколкі ён застрэліў маленькую Валю Цуран...

Супраціўленне акупантам у Багушэўскім раёне арганізаваў і каардынаваў падпольны райком партыі, другім сакратаром якога з'яўляўся Цуран. У яго было шмат паплечнікаў, сапраўдных патрыётаў. Нямала баявых заданняў і дзёрзкіх аперацый правялі народныя мсціўцы пад кіраўніцтвам Цурана.

Пры выкананні аднаго з заданняў па падрыву чыгуначнага моста каля Оршы Лявон Фёдаравіч загінуў. Гэта было ў 1942 годзе.

Не дачакалася светлага дня вызвалення і Ліда Цуран. Яна трапіла ў рукі ворага ў час аднаго з заданняў, у тым жа 1942 годзе. Фашысты расстралялі яе пад Багушэўскам разам з іншымі патрыётамі.

*І. Е. Лазука.*

## Дакументы сведчаць

### З ПРАТАКОЛА № 69 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО ЦК КП(Б)Б АД 22 ЧЭРВЕНЯ 1941 г.

Присутствовали: члены бюро ЦК КП(б)Б тт. Пономаренко, Калинин, Былинский, Ванеев, Цанава, Матвеев, Наталевич, Эйдинов, Крупеня.

Кандидат в члены бюро ЦК КП(б)Б т. Бударин.

Секретари ЦК КП(б)Б тт. Авхимович, Прохоров, Ганенко, Тур.

Уполномоченный КПК т. Захаров.

Вопросы, рассмотренные 22 июня 1941 г.

1. Слушали о нападении Германии на СССР.

Постановили: 1. Поручить членам бюро и секретарям ЦК КП(б)Б немедленно связаться и поддерживать беспрерывную связь с областями и районами, в первую очередь областями и районами полосы начавшихся военных действий.

Передать указания ЦК КП(б)Б:

а) о немедленной перестройке работы парторганизаций на военные рельсы;

б) установление связи с воинскими частями;

в) введение угрожаемого положения в городах и районах Белоруссии, организации боевой службы ПВО;

г) об усилении охраны промышленных предприятий, узлов, транспорта, складов, средств связи, постов силами групп по борьбе с авиадесантами, вооруженными коммунистами, рабочими и колхозниками;

д) о помощи военкоматам в проведении всей работы...

2. Слушали: О задачах и мероприятиях в связи с выступлением по радио заместителя председателя СНК СССР т. Молотова В. М.

Постановили: Обязать все партийные, советские, профсоюзные и комсомольские органы широко популяризировать речь т. Молотова в народе, мобилизуя весь белорусский народ на борьбу и разгром немецкого фашизма.

Созвать в Минске и в других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки. На Минском партийном активе (созвать на 3 часа дня) выступление поручить тов. Пономаренко.

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии.

Поручить редакциям газет «Советская Белоруссия» и «Звязда» опубликовать речь товарища Молотова, передовую и другие материалы по указанию отдела пропаганды ЦК КП(б)Б с призывом к Отечественной войне против немецких фашистов.

5. Слушали: О мерах в связи с введением в Белорусской ССР военного положения.

Постановили:

а) Предложить всем партийным, профсоюзным и комсомольским организациям, директорам заводов, руководителям учреждений — немедленно перевести работу учреждений и предприятий на условия военного времени, в связи с введением военного положения.

б) Обеспечить быстрое и организованное проведение мобилизации. Предупредить всех руководителей наркоматов, предприятий и учреждений об их ответственности за сдачу транспортного и автопарка, тягла в совершенно исправном состоянии.

в) В целях организованного проведения мобилизации и обеспечения бесперебойной работы всех партийных и советских органов в связи с военной обстановкой поручить тов. Прохорову согласовать с Военным советом оставление на посту первых и вторых секретарей обкомов, горкомов и райкомов КП(б)Б, председателей облисполкомов, гор. и райисполкомов.

6. Слушали: О работе железнодорожного транспорта.

Постановили: Обязать секретаря ЦК КП(б)Б т. Тур вместе с работниками его отдела установить контроль за немедленным переводом работы всех железных дорог на военные условия...

7. Слушали: Об эвакуации детей из городов, подвергающихся бомбардировке противником в полосе военных действий и г. Минска.

Постановили: Обязать СНК БССР (т. Былинского), Наркомпрос (т. Уралову), ЦК ЛКСМБ (т. Зимянина) и председателя Минского горисполкома (т. Бударина) в двухдневный срок вывезти детей из детских домов, садов, лагерей, из городов, подвергающихся бомбардировке в полосе военных действий и г. Минска.

8. Слушали: Об эвакуации ценностей и денежных знаков из Государственного банка БССР.

Постановили: 1. Обязать зам. управляющего Госбанка БССР т. Кузнецова в суточный срок эвакуировать в Москву ценности, денежные знаки и архив банка.

2. Обязать тт. Миронова и Карасева немедленно обеспечить эвакуацию банка вагонами.

9. Слушали: Об организации вооруженных рабочих отрядов для усиления охраны предприятий и порядка в городе.

Постановили: 1. В целях усиления охраны предприятий и порядка в городе обязать Минский обком и горком КП(б)Б создать по районам отряды вооруженных рабочих и трудящихся.

2. Просить Военный совет Западного фронта выделить для этой цели 5000 винтовок и соответственное количество патронов...

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 2—5.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак.*

## ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б АБ МЕРАХ У СУВЯЗІ З УВЯДЗЕННЕМ У БЕЛАРУСКАЙ ССР ВАЕННАГА СТАНОВІШЧА І ПРАВЯДЗЕННЕМ МАБІЛІЗАЦЫІ

**23 чэрвеня 1941 г.**

а) Предложить всем партийным, профсоюзным и комсомольским организациям, директорам заводов, руководителям учреждений немедленно перевести работу учреждений и предприятий на условия военного времени в связи с введением военного положения.

б) Обеспечить быстрое и организованное проведение мобилизации. Предупредить всех руководителей наркоматов, предприятий и учреждений об их ответственности за сдачу тракторного и автопарка, тягла в совершенно исправном состоянии.

в) В целях организованного проведения мобилизации и обеспечения бесперебойной работы всех партийных и советских органов в связи с военной обстановкой поручить тов. Прохорову согласовать с Военным советом оставление на посту первых и вторых секретарей обкомов, горкомов и райкомов КП(б)Б, председателей облисполкомов, гор- и райисполкомов.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 4.*

## З ДЫРЭКТЫВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) ПАРТЫЙНЫМ І САВЕЦКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПРЫФРАНТАВЫХ АБЛАСЦЕЙ АБ МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСІХ СІЛ НА БАРАЦЬБУ З ГЕРМАНСКІМ ФАШЫЗМАМ

**29 чэрвеня 1941 г.**

Вероломное нападение фашистской Германии на Советский Союз продолжается. Целью этого нападения является уничтожение советского строя, захват советских земель, порабощение народов Советского Союза, ограбление нашей страны, захват нашего хлеба, нефти, восстановле-

ние власти помещиков и капиталистов. Враг уже вторгся на советскую землю, захватил большую часть Литвы с гор. Каунас и Вильнюс, захватил часть Латвии, Брестскую, Белостокскую, Вилейскую обл. Советской Белоруссии и несколько районов Западной Украины. Опасность нависла над некоторыми другими областями. Германская авиация расширяет территорию бомбежки, подвергая бомбардировкам гор. Ригу, Минск, Оршу, Могилев, Смоленск, Киев, Одессу, Севастополь, Мурманск.

В силу навязанной нам войны наша страна вступила в смертельную схватку с опасным и коварным врагом — немецким фашизмом. Наши войска героически сражаются с врагом, вооруженным до зубов танками, авиацией. Красная Армия, преодолевая многочисленные трудности, самоотверженно бьется за каждую пядь советской земли.

Несмотря на создавшуюся серьезную угрозу для нашей страны, некоторые партийные, советские, профсоюзные и комсомольские организации и их руководители еще не осознали значения этой угрозы и не понимают, что война резко изменила положение, что наша Родина оказалась в величайшей опасности и что мы должны быстро и решительно перестроить всю свою работу на военный лад.

Совнарком СССР и ЦК ВКП(б) обязывают все партийные, советские, профсоюзные и комсомольские организации покончить с благодушием и беспечностью и мобилизовать все наши организации и все силы народа для разгрома врага, для беспощадной расправы с ордами напавшего германского фашизма.

Совнарком Союза ССР и ЦК ВКП(б) требуют от вас:

1) В беспощадной борьбе с врагом отстаивать каждую пядь советской земли, драться до последней капли крови за наши города и села, проявлять смелость, инициативу и сметку, свойственные нашему народу.

2) Организовать всестороннюю помощь действующей армии, обеспечить организованное проведение мобилизации запасных, обеспечить снабжение армии всем необходимым, быстрое продвижение транспортов с войсками и военными грузами, широкую помощь раненым предоставлением под госпитали больниц, школ, клубов, учреждений.

3) Укрепить тыл Красной Армии, подчинив интересам фронта всю свою деятельность, обеспечить усиленную работу всех предприятий, разъяснить трудящимся их обязанности и создавшееся положение, организовать охрану заводов, электростанций, мостов, телефонной и телеграфной связи, организовать беспощадную борьбу со всякими дезорганизаторами тыла, дезертирами, паникерами, распространителями слухов, уничтожать шпионов, диверсантов, вражеских парашютистов, оказывая во всем этом быстрое содействие истребительным батальонам. Все коммунисты должны знать, что враг коварен, хитер, опытен в обмане и распространении ложных слухов, учитывать все это в своей работе и не поддаваться на провокации.

4) При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки его в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно, безусловно, уничтожаться.

5) В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Т. 1. Мн., 1967. С. 49—51.*

## З ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б ПАРТЫЙНЫМ ОРГАНАМ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПЕРАХОДУ НА ПАДПОЛЬНУЮ РАБОТУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ РАЁНАЎ, ШТО ЗНАХОДЗІЛІСЯ ПАД ПАГРОЗАЙ ФАШЫСЦКАЙ АКУПАЦЫІ

**30 чэрвеня 1941 г.**

1. В целях руководства деятельностью партизанских отрядов и диверсионных групп в районах, занятых врагом, для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телеграфной связи, поджога складов, для создания невыносимых условий для врага и всех его пособников, для преследования и уничтожения врага на каждом шагу, для срыва всех его мероприятий, во всех городах, районных центрах, рабочих поселках, ж.-д. станциях, в совхозах и колхозах под ответственность первых секретарей обкомов, горкомов и райкомов КП(б)Б заблаговременно создать из лучших людей надежные подпольные ячейки и явочные квартиры.

2. При создании подпольных ячеек, в целях их большей конспирации, подбирать коммунистов, малоизвестных в городе, районе, допуская переброски из других районов, предприятий.

3. Для руководства работой подпольных ячеек первые секретари обкомов назначают секретарей ячеек, которые поддерживают связь и получают директивы от вышестоящих партийных органов.

4. В городах и районах для руководства работой подпольных ячеек первыми секретарями обкомов назначаются городские и районные тройки в составе секретаря райкома, горкома, военного работника, оргработника.

5. Оргвопросы. К переходу в подполье готовиться заблаговременно. В этих целях:

а) отобрать и утвердить состав районных и городских троек по руководству подпольными ячейками;

б) отобрать лучших и проверенных людей, направить в распоряжение троек для расстановки и внедрения на решающих участках работы;

в) товарищи, выделенные на подпольную работу, заблаговременно переходят на нелегальное положение, немедленно переводятся на нелегальные квартиры, снабжаются соответствующими документами-паспортами, получают клички;

г) всех товарищей, выделенных на подпольную работу, лично первый секретарь обкома инструктирует об условиях, формах и задачах нелегальной работы в фашистском тылу. Инструктаж проводится с каждым подпольщиком в отдельности либо с группой в 2—3 чел., не больше;

д) всех товарищей, переходящих на подпольную работу, тщательно ознакомить с условиями подпольной работы...

ж) в основных городских центрах, а также в крупнейших районах создать подпольные типографии в местах, особо законспирированных, и технику по изготовлению бланков, документов для снабжения товарищей, находящихся на нелегальном положении. Базой для подпольных типографий могут служить районные типографии, которые необходимо заблаговременно перевести в законспирированные места.

Связь с ЦК КП(б) Белоруссии. С целью постановки необходимой информации и получения указаний от ЦК обкомы устанавливают связь с ЦК через посылку связных с соответствующим паролем.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 11, 14, 15.*

## З ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ І КАМСАМОЛЬСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ АБ РАЗГОРТВАННІ ПАРТЫЗАНСКАЙ ВАЙНЫ Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

**1 ліпеня 1941 г.**

1. Фашистская Германия напала на Советский Союз для того, чтобы уничтожить советский строй, захватить советские земли, поработить народы Советского Союза, ограбить нашу страну, захватить хлеб, нефть, восстановить власть помещиков и капиталистов. Наши войска героически сражаются с врагом. Страна сейчас вступила в смертельную схватку со своим коварным врагом — немецким фашизмом. Враг, вероломно напав, захватил часть нашей родной Советской Белоруссии. Правительство Советского Союза объявило Отечественную войну. Необходимо действовать, не теряя ни минуты, и враг должен быть уничтожен.

2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

4. Подпольные организации и партизанские отряды должны иметь явочные квартиры, адреса которых сообщить военному отделу ЦК. Эти явки помогут держать связь, объединять [подпольщиков] и направлять [им] директивы и помощь.

5. Твердо помнить, что партизанская борьба не имеет ничего общего с выжидательной пассивной тактикой. Она имеет боевой наступательный характер. Не надо ждать врага — надо его искать и уничтожать.

6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать мосты, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолеты, устраивать крушения поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем ни ночью. Убивать их всюду, где застигнешь, убивать чем попало: топором, косой, ломом, вилами,

ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть ночью на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков...

7. Нельзя ждать ни минуты, начинать действовать сейчас же, быстро и решительно.

8. Для уничтожения врага не стесняйтесь прибегать к любым средствам: душите, рубите, жгите, травите фашистскую гадину. Пусть почувствует враг, как горит под ним наша земля.

Действуйте смело, решительно, победа за нами. Нет такой силы, которая могла бы покорить советский народ.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): Документы и материалы. Т. 1. Мн., 1967. С. 53—54.*

## З ДЫРЭКТЫВЫ СНК БССР І ЦК КП(б)Б УСІМ АБКОМАМ, ГАРКОМАМ, РАЙКОМАМ КП(б)Б, ВЫКАНКОМАМ АБЛАСНЫХ, ГАРАДСКІХ І РАЁННЫХ САВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ АРГАНІЗАЦЫІ АТРАДАЎ НАРОДНАГА АПАЛЧЭННЯ

**6 ліпеня 1941 г.**

I. Построение народного ополчения

1. При каждом предприятии, на транспорте, в совхозах, колхозах создаются отряды народного ополчения в составе мужчин и женщин, а также подростков, способных выполнять то или иное задание по обороне Родины. Отряды народного ополчения создаются на добровольных началах из патриотов нашей социалистической Родины. Отряды организовывать как пешие, так и конные.

2. Отряды ополчения объединяются в масштабе сельсовета, района, города, области, во главе которых стоят командиры отрядов и штабы сельсоветов, районов и областей.

3. Отрядами ополчения руководят назначаемые районными организациями командиры из состава командиров запаса РККА либо товарищей, имеющих военный опыт, а также политработники из числа [коммунистов] районных партийных организаций, которые зарекомендовали себя как люди опытные, храбрые, беззаветно преданные делу социалистической Родины.

4. Отряды ополчения в зависимости от количества разбиваются на роты, взводы и отделения.

5. Отряды ополчения создаются в следующем составе:

а) взводы бойцов с винтовками для истребления живой силы противника;

б) группы истребителей танков и самолетов, которые вооружаются гранатами и бутылками с бензином для уничтожения танков и самолетов;

в) группы по диверсиям в тылу противника для организации разрушения ж.-д. путей, крушений поездов, взрывов мостов, складов оружия, горючего, продовольствия и др.;

г) разведывательные группы для глубокой разведки в тылу врага;

д) группы пешей, конной и велосвязи, обеспечивающие связь в условленных местах между отдельными отрядами ополчения, руководством ополчения и частями Красной Армии.

II. Задачи народного ополчения

1. Отряды народного ополчения организуются из населения городов и деревень на борьбу против немецких фашистов на поддержку Красной Армии в проводимых ею операциях, в продвижении грузов, в организации связи, разведки, охраны городов, фабрик, заводов, колхозов, мостов, средств связи и т. д.

2. Отряды организуют борьбу с десантами и диверсионными группами противника.

3. Отряды сооружают военные укрепления в местах, которым угрожает противник.

4. Отряды ополчения хорошо знают свою местность, поэтому в случае угрозы занятия ее противником они уничтожают все запасы продовольствия, горючего, оборудования, не оставляя противнику ничего.

5. В случае появления противника отряды ополчения самостоятельно организуют отпор врагу, защищая всеми средствами города и селения, ведут уличные бои и уничтожают живую силу врага и его технику. Танки противника уничтожаются всеми средствами, бросают на танки бутылки с бензином из домов, чердаков, окон, на дорогах — из укрытий, из канав и т. д.

6. В случае оккупации местности врагом отряды народного ополчения переходят к методам партизанской борьбы, организации массовых диверсий на транспорте, в учреждениях связи, на базах снабжения и уничтожают технику врага: танки, самолеты, автомашины и т. д.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1209. Л. 28.*

## Акупацыя: рэжым гвалту і здзекаў

Акупацыйны рэжым, устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, распрацоўваўся загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Акупацыйная палітыка была дэталёва прадумана аднача́сова са стратэгіяй усходняй кампаніі і знайшла канкрэтнае ўвасабленне ў так званым генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі захопленых тэрыторый, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і Беларусі.

Гітлераўцы распрацавалі цэлую серыю розных дырэктыў, памятак, інструкцый, якія вызначалі акупацыйны рэжым на часова акупіраванай тэрыторыі Савецкага Саюза. Адным з такім дакументаў з'яўляецца сакрэтны мемарандум Гімлера, у якім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» у напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых дакументаў. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванне, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Яшчэ ў сакавіку 1941 г. вярхоўнае галоўнакамандаванне нямецкай арміі выдала Інструкцыю аб асобных абласцях да дырэктывы № 21 (варыянт плана «Барбароса»), з якой вынікала, што савецкая дзяржава павінна быць ліквідавана, а яе тэрыторыя расчленена.

Восенню 1941 г. быў у асноўным завершаны падзел тэрыторыі Беларусі, часова акупіраванай гітлераўцамі. Яе этнаграфічна цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк — Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — возера Чырвонае — на поўдні, па р. Зальвянка і ўсходняму ўзлессю Белавежскай пушчы — на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі склала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стану на 4.12.1941 г.). Паўднёвыя раёны Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей з абласнымі цэнтрамі Мазыр, Пінск, Брэст былі далучаны да рэйхскамісарыяту «Украіна», мяжа якога праходзіла прыкладна за 20 км на поўнач ад чыгункі Брэст — Гомель. Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Частку Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую вобласць, у тым ліку і Сенненскі раён, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці аднеслі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр». Уся ўлада на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў руках ваенных і паліцэйскіх органаў[1]. Вышэйшым органам быў штаб групы армій «Цэнтр». На гэтай тэрыторыі ваенна-адміністрацыйныя функцыі выконвалі створаныя вермахтам палявыя і мясцовыя камендатуры, якія былі надзелены ўсёй паўнатой улады ў зоне сваёй дзейнасці. Ім падпарадкоўваліся шматлікія воінскія гарнізоны, каманды жандармерыі, групы тайнай палявой паліцыі (ГФП), якіх на тэрыторыі армейскага тылу групы армій «Цэнтр» дзейнічала 8 (у Полацку, Віцебску, Оршы, Барысаве, Лепелі, Бабруйску, Старых Дарогах, Магілёве). Яны мелі 20 перыферыйных груп. Адна з іх размяшчалася ў Сянне. Толькі група ГФП, якая дзейнічала ў Оршы, з верасня 1941 г. па верасень 1942 г. павесіла і расстраляла 17 500 савецкіх патрыётаў.

Узброенай апорай фашысцкага рэжыму з'яўляліся войскі вермахта. Гарнізо-

[1] Яе ўзначальваў камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» генерал пяхоты фон Шэнкендорф.

ны і ўмацаваныя пункты ахоўных дывізій, палкоў, батальёнаў гітлераўцы размясцілі на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Устаноўлены каланіяльны рэжым, у тым ліку і на тэрыторыі Сенненскага раёна, падтрымліваўся густой сеткай усялякіх карных органаў, такіх, як паліцыя бяспекі і СД, СС, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя парадку, жандармерыя і іншых. Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі, выхаванымі ў нацысцкім духу бесчалавечнага абыходжання з людзьмі іншых нацыянальнасцей, дзейнічалі самастойна альбо разам з часцямі вермахта.

Савецкія законы на часова акупіраванай тэрыторыі фашысты абвясцілі несапраўднымі, пазбавіўшы насельніцтва ўсялякіх правоў. Замест іх акупацыйныя ўлады кожны дзень выдавалі загады пра «новы парадак», якія заканчваліся адной і той жа фразай: «Вінаватыя будуць пакараны смерцю». Цывільнаму насельніцтву забаранялася мяняць месца жыхарства без спецыяльнага дазволу; выходзіць на вуліцу, калі сцямнее; прымаць на жыхарства асоб не з мясцовага насельніцтва; падыходзіць да чыгуначнага палатна на адлегласць бліжэй за 100 м. За захоўванне зброі, дапамогу партызанам і падпольшчыкам пагражала смяротная кара.

Сурова рэгламентавалася ўсё жыццё людзей. Абсалютнае палітычнае бяспраўе павінна было, па задумцы гітлераўцаў, ператварыць мясцовых жыхароў у пакорных рабоў нямецкіх каланістаў, вытравіць волю да барацьбы за свабоду і незалежнасць.

«Калі мы хочам стварыць нашу вялікую нямецкую імперыю, мы павінны перш за ўсё выцесніць і знішчыць славянскія народы — расіян, палякаў, чэхаў, славакаў, балгар, украінцаў, беларусаў. Няма ніякіх прычын не зрабіць гэтага»,— так заяўляў Гітлер. І гэта легла ў аснову палітыкі фашысцкага рэйха на акупіраваных яго войскамі тэрыторыях, у тым ліку і Сенненскага раёна.

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Нашэсце нямецкіх войск на нашу краіну павінна было садзейнічаць «канчатковаму вырашэнню яўрэйскага пытання», што азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў. Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў ажыццяўленне гэтай «праграмы», было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што склала 1/3 частку яўрэяў усяго свету (Нюрнбергский процесс...: Сб. документов. Т. 7. М., 1961. С. 401—402).

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з нечуванай жорсткасцю ажыццяўлялі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Сенненшчыне.

Для больш эфектыўнага правядзення сваёй злачыннай палітыкі акупанты жадалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для надання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную так званую «мясцовую ўладу» — раённую ўправу пры шэфе раёна на чале з бургамістрам, на тэрыторыях былых сельсаветаў былі створаны валасныя ўправы, якія ўзначальвалі бургамістры, ці валасныя старшыны, як іх іншы раз называлі, у кожную вёску прызначылі старасту.

Германскія ўлады імкнуліся арганізаваць эфектыўную сістэму каланізацыі Беларусі. Быў дазволены дробны бізнес, індывідуальная практыка медыцынскім і некаторым іншым работнікам, дапускалася прыватнае валоданне саматужнымі прадпрыемствамі, майстэрнямі, крамамі, абвяшчалася ўласнасць на зямлю. Нерухомасць і зямля абяцаліся ў першую чаргу тым, хто падтрымліваў «новы парадак», нямецкую армію і адміністрацыю.

У мэтах ажыццяўлення эканамічных планаў уводзілася працоўная павіннасць, якая была распаўсюджана на ўсіх мужчын ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў і жанчын ад 18 да 45 гадоў. За ўхіленне ад працоўнай павіннасці прадугледжваліся цяжкія пакаранні, аж да смяротнай кары.

Каб перацягнуць на свой бок частку насельніцтва, акупацыйныя ўлады пад сваёй апекай спрабавалі стварыць шэраг арганізацый.

Для падтрымання свайго «парадку» і барацьбы супраць партызан і падпольшчыкаў гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, так званую дапаможную паліцыю парадку. Гарнізоны з такой паліцыі былі створаны амаль ва ўсіх буйных вёсках раёна. Разам з акупацыйнымі ўладамі і пад іх кіраўніцтвам яны пачалі наводзіць «новы парадак». У раёне праводзіліся масавыя вобыскі, арышты, расстрэлы.

Дзеля абалваньвання насельніцтва ў розны час за гады акупацыі Беларусі гітлераўцамі выдавалася каля 50 беларускамоўных і больш за 50 рускамоўных газет, часопісаў, інфармацыйных бюлетэняў, зборнікаў інструкцый. У горадзе Сянно і раёне распаўсюджваліся газеты «Беларуская старонка», якая выдавалася ў Оршы, «Боевой путь», «Голас народа», «Новый путь», «Утро», што выдаваліся ў Лепелі. На старонках гэтых лісткоў прапагандаваўся нацыяналізм, вёўся паклёп на ўсё савецкае, усхваляўся лад жыцця ў «новай Германіі», прадказвалася хуткая перамога фашыстаў. Гэтым самым акупанты спрабавалі падарваць маральную стойкасць савецкіх людзей, прывіць ім рабскую пакору. Але прафашысцкая прапаганда не мела поспеху сярод жыхароў Сенненскага раёна, як і ў іншых акупіраваных раёнах Беларусі.

Гітлераўскія ідэолагі яшчэ задоўга да нападу на нашу краіну падрыхтавалі праграму рабавання багаццяў нашага народа, якая складала неад'емную частку агульнага плана агрэсіі супраць Савецкага Саюза. У гэтай праграме захопнікі ўлічвалі матэрыяльныя рэсурсы і людскія рэзервы Беларусі, імкнучыся паставіць іх на службу сваёй агрэсіўнай вайне.

Акупанты абкладалі насельніцтва непасільнымі падаткамі — натуральнымі і грашовымі. Адзіных норм не існавала. Памер падаткаў залежаў ад жадання мясцовых улад.

У Віцебскай вобласці ў 1941 г. даведзены да кожнага двара план хлебаздачы ўтрая пераўзыходзіў даваенны і, зверх таго, 60 працэнтаў ад агульнай сумы, налічанай па падатку зерневых, сяляне павінны былі ўнесці ў так званы мясцовы фонд, які ішоў на ўтрыманне адміністрацыйнага апарату, паліцыі, стараст.

У 1942 г. селянін павінен быў здаць 200 л малака з кожнай каровы , 50 кг мяса і 100 штук яек з гаспадаркі, незалежна ад наяўнасці курэй і, акрамя таго, па 25 яек з кожнай курыцы.[1]

У 1943 г. падаткі ўсіх відаў былі значна павялічаны. Фашысцкія захопнікі, праводзячы сваю рабаўнічую палітыку, не лічыліся з элементарнымі патрэбамі насельніцтва, давялі сялянскія гаспадаркі да крайняй ступені эканамічнага заняпаду. Супраціўленне жыхароў Сенненскага раёна рабаўнічай палітыцы акупантаў прыняло масавы характар з развіццём партызанскага руху ў рэгіёне.

Каб надаць найбольш арганізаваны характар катаванням і знішчэнню савецкіх людзей, на тэрыторыі Беларусі была створана сістэма канцлагераў. Дзесяткі тысяч мірных грамадзян адпраўляліся ў гэтыя лагеры разам са сваімі сем'ямі без суда і вызначэння тэрмінаў зняволення. Умовы зняволення ў лагерах былі свядома разлічаны на тое, каб давесці вязняў да пакутлівай смерці.

Усяго на акупіраванай тэрыторыі Беларусі было створана 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў для ваеннапалонных, для грамадзянскага насельніцтва, жаночых лагераў, існавалі перасыльныя лагеры СС і інш.

З мэтай падаўлення супраціўлення насельніцтва, застрашэння яго, ізаляцыі ад актыўна змагаўшайся часткі народа, а таксама падрыву эканамічнай базы партызан і падпольшчыкаў, пастаянна праводзіліся карныя экспедыцыі, была ўведзена сістэма заложнікаў. Гэтыя меры адначасова з'яўляліся сродкам загадзя запланаванага гітлераўцамі знішчэння насельніцтва. З мноства прычын, якія прыводзіліся нямецка-фашысцкімі захопнікамі для апраўдання прымянення зброі супраць мірнага насельніцтва, было спачуванне партызанам ці падпольшчыкам, аказанне ім падтрымкі. «Рускія ў цяперашні час аддалі загад аб партызанскай вайне ў нашым тыле. Гэта партызанская вайна мае і свае перавагі: яна дае нам магчымасць знішчаць усіх, хто паўстае супраць нас»[2], заяўляў Гітлер.

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 3. Спр. 98. Л. 27.

[2] «Совершенно секретно! Только для командования!» Стратегия фашистской Германии в войне против СССР. Документы и материалы. М., 1967. С. 105.



Дэлегацыя Сенненшчыны каля помніка в. Марозаўка ў Хатыні.

Нябачныя зверствы і гвалт над мірным насельніцтвам здзяйснялі гітлераўцы ў час правядзення карных экспедыцый. Пад выглядам барацьбы з партызанамі карнікі ператваралі ў зоны пустэчы цэлыя раёны, дзесяткі вёсак змяталіся з твару зямлі, жыхары іх знішчаліся, уганяліся ў канцлагеры ці ў фашысцкае рабства ў Германію.

Бачачы немагчымасць ліквідаваць партызанскі рух, фашысты па-зверску распраўляліся з мясцовым насельніцтвам. Яны знішчалі сем'і і родных партызан і асоб, якія былі звязаны з партызанамі. Так, гітлераўскія карнікі поўнасцю спалілі вёску Марозаўку Багушэўскага раёна. Яны зачынілі ў хляве і спалілі жывымі больш за 85 мірных жыхароў: старых, жанчын і дзяцей. Спалілі дзесяткі іншых вёсак і пасёлкаў. Жывымі спалілі сям'ю аб'ездчыка В. Разумоўскага. У гарадскім пасёлку Багушэўск расстралялі і павесілі больш за 400 мірных жыхароў. У грамадзянскіх лясных лагерах каля возера Ордзеж гітлераўскія каты расстралялі каля 200 чалавек — старых, жанчын і дзяцей.

Усяго за час акупацыі ў Сенненскім раёне фашысты поўнасцю знішчылі 9 вёсак, 3477 двароў, расстралялі, павесілі, закатавалі і спалілі жывымі 2505 мірных жыхароў.

У доўгім спісе злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі асобае месца займае прымусовы вываз мірных жыхароў на фашысцкую катаргу ў Германію. Для ажыццяўлення злачыннай праграмы быў створаны спецыяльны апарат на чале з прызначаным Гітлерам «галоўным упаўнаважаным па выкарыстанню рабочай сілы» Заўкелем.[1] Агенты Заўкеля стваралі «вярбовачныя» пункты, бралі на ўлік працаздольных людзей і прапаноўвалі ім «добраахвотна» паехаць на работу ў Германію. Але добраахвотнікаў амаль не аказалася. Тады нямецкія ўлады пачалі праводзіць разверстку па гарадах і сельскіх раёнах, рассылаць загады аб абавязковай адпраўцы рабочай сілы ў Германію.

[1] На Нюрнбергскім працэсе над галоўнымі нямецкімі злачынцамі Заўкель быў асуджаны на пакаранне смерцю і павешаны.

Гаспадарчай інспекцыі групы армій «Цэнтр» і генеральнай акрузе «Беларусь» прадпісвалася кожны дзень пасылаць у рэйх 500—1000 рабочых.

Для ажыццяўлення злачынных планаў масавага вывазу савецкіх людзей на катаргу нямецка-фашысцкія захопнікі станавіліся на шлях падману, пагроз, правакацый. Каб заманіць ахвяры ў сваю пастку, фашысцкая прапаганда не скупілася на абяцанкі, паказваючы ў ружовым святле нямецкі «рай». Людзей запэўнівалі, што ў рэйху яны будуць мець добры заробак, жыллё, магчымасць «пабачыць Захад» і г. д. Але поспеху гэтыя абяцанкі не мелі. Убачыўшы, што «добраахвотная» кампанія сарвалася, акупанты пачалі літаральнае паляванне на людзей. Фашысты ішлі на ўсё, каб выканаць план «мабілізацыі» рабочай сілы. Паліцыя праводзіла масавыя аблавы, арыштоўвала працаздольных і гвалтоўна адпраўляла іх у Нямеччыну.

На асобым рахунку ў фашысцкіх захопнікаў былі жыхары, якія жылі ў партызанскіх зонах. Яны аб'яўляліся «бандытамі» ці «саўдзельнікамі бандытаў», ставіліся па-за законам і падлягалі знішчэнню ці пагалоўнаму ўгону ў рабства.

Усяго з Беларусі гітлераўцам удалося захапіць і вывезці ў Германію звыш 380 тыс. грамадзян, у тым ліку з Сенненскага раёна 992 чалавекі.

Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю жыхароў Сенненскага раёна, як і ўсёй Беларусі, у гады нямецка-фашысцкай акупацыі. Гітлераўцы іх забівалі, палілі, рабавалі, катавалі. Але нішто не змагло зламаць горды дух свабодалюбівых людзей. Яны не сталі на калені перад акупантамі, не схілілі галовы ў пакоры. Яны змагаліся.

*У. І. Лемяшонак.*

## Дакументы сведчаць

### З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

Пераклад з нямецкай мовы
7.7.1941 г.


ANORDNUNG
über Sperrstunden

Mit Zustimmung des Reichskommissars für das Ostland setze ich die Sperrzeit im Generalbezirk Weissruthenien in den Städten auf die Zeit vom Dunkelwerden bis zum Hellwerden fest.

Zivilpersonen, die während der Sperrzeit ohne zwingende Gründe auf der Straße betroffen werden, werden sofort standgerichtlich erschossen.

Für die Besucher von Theatern und sonstigen kulturellen Veranstaltungen ergeht eine Sonderregelung.

Diese Anordnung tritt am 1. November 1941 in Kraft.

WILHELM KUBE

РАСПАРАДЖЭНЬНЕ
аб абмежаваньні хадзіньня вячэрняю парою

ROZPORZĄDZENIE
o ograniczeniu ruchu cywilnego w czasie od początku zmierzchu do świtania

Za zgodą Komisarza Rzeszy Ostlandu zarządzam ograniczenie czasu chodzenia po ulicach Generalnego Okręgu Białoruś od zmierzchu do świtania.

Osoby cywilne, które w zabronionym czasie spotka się chodzące bez powodu na ulicy, będą natychmiast doraźnym sądem rozstrzelane.

Dla odwiedzających teatr i inne kulturalne imprezy wydane zostanie odrębne uregulowanie.

Rozporządzenie wchodzi w życie z dniem 1 listopada 1941 r.

Generalny Komisarz Białoruś
WILHELM KUBE

РАСПОРЯЖЕНИЕ
об ограничении хождения вечерней порой

Адно з распараджэнняў акупацыйных улад аб абмежаванні знаходжання на вуліцах у гарадах вечарам і ноччу.

### I. Аб прызначэнні бургамістраў у валасцях

1. На пасады бургамістраў у першую чаргу павінны быць прызначаны палітычна надзейныя і кваліфікаваныя асобы, па магчымасці з ліку беларусаў.
2. Бургамістр з'яўляецца прадстаўніком воласці.
3. Ён з'яўляецца службовым начальнікам над усімі асобамі, якія працавалі ў воласці. Ён прымае іх і звальняе з працы.
4. Бургамістр нясе адказнасць за фінансавыя справы воласці.
5. Усе жыхары, якія пражываюць у воласці паводле становішча на 21.6.1941 г., павінны быць нанова ўлічаны і перапісаны бургамістрам.
6. Бургамістры неадкладна павінны паклапаціцца аб тым, каб усе жыхары былі забяспечаны адпаведнымі дакументамі, якія засведчваюць іх асобу: прозвішча і імя, час і месца нараджэння, месца жыхарства, склад сям'і, прафесія, прабыванне і род заняткаў, сацыяльнае паходжанне, веравызнанне, нацыянальнасць, падданства.
7. Бургамістры прыцягваюць да адказнасці вінаватых за ўчыненыя акты сабатажу ў даверанай ім воласці. Яны павінны ўсімі сродкамі прадухіляць акты сабатажу. У іх абавязкі ўваходзіць ахова прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі воласці, асабліва жыццёва важных.
8. Бургамістраў і іх намеснікаў у населеных пунктах, якія налічваюць да 20 000 жыхароў, прызначае мясцовы камендант, а ў населеных пунктах, у якіх звыш 20 000 жыхароў, прызначае камендант палявой камендатуры.

### II. Аб забароне пакідання кватэр у начны час

1. У перыяд з 21.00 да 5.00 раніцы насельніцтву забараняецца пакідаць кватэры.
2. Выключэнні дапускаюцца па пісьмовым дазволе мясцовага каменданта для асоб, якія працуюць у начны час на жыццёва важных прадпрыемствах, дактарамі, акушэркамі, на машынах хуткай дапамогі.
3. Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам карацца мясцовымі камендантамі. Мерамі пакарання могуць быць часовы арышт з абмежаваным харчаваннем, насільнае затрыманне і прыцягненне да працы.

### III. Адметныя знакі для яўрэяў і яўрэек

1. Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнулі 10-гадовага ўзросту, абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіяніцкай зоркай, або жоўтую павязку шырынёй да 10 см.
2. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі.
3. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітацца.
Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам карацца мясцовым камендантам па месцы жыхарства.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

### VIII. Стварэнне дапаможнай паліцыі

1. Для правядзення паліцэйскіх мер бяспекі бургамістрам даручана прыцягнуць у дапаможную паліцыю надзейных «фольксдойчэ», беларусаў, а калі такіх няма, тады палякаў, і выкарыстоўваць гэту паліцыю са згоды з начальнікамі каманд паліцыі бяспекі.
2. Служачыя дапаможнай паліцыі, якія працуюць у цесным кантакце з мясцовымі айнзацкамандамі паліцыі бяспекі і СД, могуць падтрымліваць сувязь толькі з мясцовымі начальнікамі паліцыі бяспекі і СД або прызначанымі імі органамі.
3. Служачыя дапаможнай паліцыі носяць белую нарукаўную павязку з надпісам «Дапаможная паліцыя».
4. Мясцовыя камендатуры да 20-га чысла кожнага месяца, а ўпершыню да 20.7.1941 года, паведамляюць пра колькасць і ўзбраенне дапаможнай паліцыі.

Камандуючы тылам групы армій «Цэнтр»
фон Шэнкендорф, генерал пяхоты.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1, 2, 4–5.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак.*

## Трагедыя вёскі Прыветак

Слёзы засцілалі вочы. У грудзях сціскала, быццам цяжкім каменем. Нясцерпна балюча ўспамінаць тыя жудасныя дні, дні пакут і здзекаў нямецка-фашысцкіх акупантаў над савецкімі людзьмі. Горка ад таго, што з дзевяці год не ведала яна, Мальвіна Кацар, бацькоўскай ласкі. Як, дарэчы, і нямала іншых прывецкіх дзяцей, у якіх гітлераўцы адабралі бацькоў і маці, дзядуль і бабуль. Не ведалі літасці каты ні да каго, ні да малых, ні да старых.

Уварваўшыся на досвітку 13 верасня 1942 года ў Прыветак, фашысты і іх памагатыя не міналі ніводнага дома. Падштурхоўвалі вінтоўкамі, выганялі на вуліцу мужчын і жанчын. Дзеці кідаліся ўздагон бацькам. Ад крыку і плачу, здаецца, дрыжэла вёска.

У цэнтры вёскі па загаду фашыстаў з правага боку выстраілі мужчын, з левага — жанчын. І вось над шарэнгамі вяскоўцаў раздаецца:

— Брат партызана Кацара Савелія! Выйсці наперад!

Супраціўляцца не было сэнсу. Атрад карнікаў, прыбыўшых з боку Чашнікаў, быў даволі шматлікі, добра ўзброены.

Ледзь толькі Міхаіл Дзмітрыевіч выйшаў уперад, раздаўся стрэл. Праўда, фашысты выстралілі ўверх, разлічваючы запалохаць людзей, дабіцца таго, каб паказалі яны дарогу да партызан. Але памыліліся.

Не дасягнуўшы мэты, гітлераўцы адпусцілі жанчын дамоў. Толькі Фядоссі Дзмітрыеўне Бярозка, сястры партызана Савелія, загадалі застацца. І пагналі яе разам з мужчынамі ў Канева. Там усіх зачынілі ў свіран. Пачаліся бясконцыя здзекі над ні ў чым невінаватымі людзьмі.

На другі дзень гітлераўцы «злітаваліся»: дазволілі прынесці людзям ежу. Была ў іх каварная задума: расстраляць як мага больш людзей. Таму тых, хто прыйшоў наведаць родных, таксама зачынілі ў свірне. Гэта было апошняе спатканне многіх, апошнія гадзіны жыцця.

15 верасня фашысты падагналі да свірна машыну. «Пэўна, на новыя здзекі адправяць куды далей» — думалі вяскоўцы. Не ведалі яны, што іх чакала ўжо выкапаная за Каневам магіла.

Са стогнам, быццам развітваючыся з людзьмі, расчыніліся дзверы. Гітлераўцы нахабна рагаталі: жыццё, маўляў, ваша скончылася. Не выдзяляючы ні старых, ні маладых, хапалі ўсіх без разбору і кідалі ў машыну. Не многім удалося ўцячы, пазбегнуць кары фашысцкай. А яна была надзвычай цяжкай. Аднаго за адным падводзілі яны да ямы вяскоўцаў. Раз за разам раздаваліся стрэлы. І некаторыя яшчэ паўжывымі траплялі ў яму. Жыхары Канева, што былі сведкамі гэтых нечалавечых здзекаў, расказваюць, што шавялілася зямля, калі закопвалі яму.



Абеліск на магіле ахвяр фашызму ў в. Прыветак.

У той вераснёўскі дзень сталі сіротамі Настасся, Софія, Зінаіда, Мальвіна, Галіна Кацары, трое дзяцей Ціхана Дуброўскага, многія іншыя дзеці. У гэты дзень многія прывецкія жанчыны сталі ўдовамі. 43 смерці ў адзін дзень — хіба гэта не жах?

Распраўляючыся так з мірным насельніцтвам, гітлераўскія акупанты спадзяваліся задушыць партызанскі рух. Менавіта такая мэта стаяла і перад атрадам карнікаў, кінутым у Прыветак. У гэтай і навакольных вёсках у той час дыслакавалася партызанская брыгада Лявонава. Фашысты кідалі ўсё новыя і новыя групоўкі, каб разбіць народных мсціўцаў...

У верасні 1970 г. на адкрыццё помніка ахвярам фашызма, устаноўленага на месцы паразахавання жыхароў вёскі Прыветак, расстраляных 15.9.1942 г., прыбылі жыхары ўсіх навакольных вёсак, прыехалі родныя загінуўшых.

Не, той дзень ніколі не змогуць забыць жыхары вёскі Прыветак. У іх памяці заўсёды будуць жыць 14-гадовы Аркадзь Кузьміневіч, Уладзімір Бярозка, які развітаўся з жыццём на дванаццатым годзе, Іван і Васіль Дзмітраковічы, браты Іван і Пётр Корсакі і ўсе астатнія землякі.

*Л. Падаляк.*

## Лічбы на сэрцы

### З успамінаў Марыі Еўдакімаўны Латышавай

Нарадзілася я ў вёсцы Савінічы ў 1924 годзе. Сярэднюю школу ў Сянне закончыла ў 1941 годзе. Атэстат сталасці ўручылі мне ў першы дзень Вялікай Айчыннай вайны. Як камсамолка, разам з іншымі калгаснікамі, пагнала кароў далей ад наступаючага ворага. Са статкам дайшлі некуды, ледзь не пад самы Ленінград. Кароў здалі вайсковай часці, ад якой атрымалі адпаведны дакумент.

Дамоў вярнуліся, калі немцы ўжо акупіравалі наш раён. Дапамагала партызанам. Аднаго з іх, Анатоля Бярозку, двое сутак хавала ў хаце, пакуль ён не здолеў прабрацца ў атрад.

Па заданню партызан наведала 14 кастрычніка 1943 года Сянно.

Я вярталася ўжо ў родную вёску, як мяне дагналі немцы, арыштавалі і пасадзілі ў турму.

Праз два дні выклікалі на допыт. На ім прысутнічаў паліцай Ф. Зяньковіч, які даказваў маю сувязь з партызанамі і першы ўдарыў мяне па твары. Потым мяне білі яшчэ. Як апынулася ў камеры, не памятаю.

Яшчэ не паспела ачуняць ад пабояў, як нас з Марыяй Лісецкай адправілі на машыне ў Віцебск у суправаджэнні шасці паліцаяў. Пратрымалі там некалькі дзён, затым пасадзілі на цягнік і адвезлі ў лагер смерці Асвенцым.

Адразу ж адабралі дзяцей, у каго яны былі. Нас адправілі ў лазню, абстрыглі і вытатуіравалі нумары. Мой нумар — 69144. Лічбы гэтыя ўсё жыццё са мной, пякуць і сэрца, і памяць. Выдалі яшчэ паласатыя сукенкі, драўляныя абутак і накіравалі ў каранцінны барак.

Кожны дзень ранкам і вечарам — пастраенне і праверка. Немкі на кожнай праверцы збівалі вязняў.

У лагеры было два крэматорыі, трубы якіх дымілі кругласутачна. У лагеры меўся барак смерці, адгароджаны каменнай сцяной, дзе знаходзіліся донары, скалечаныя нямецкімі ўрачамі. Адтуль чуліся галасы, якія на розных мовах выказвалі толькі адну просьбу: піць, піць...

Вязням давалі па сто грамаў хлеба і адзін раз на дзень баланду. Вечарам баракі зачыняліся, ніхто не мог выходзіць за дзверы.

Са мной разам знаходзілася Марыя Лісецкая з вёскі Горкі. Яе спалілі ў крэматорыі. Засталіся сіротамі трое яе дзяцей.

Усё, што давялося там перажыць, гэта страшэнны жах. Кожны дзень чакалі смерці. У лагер штодня прыбываў транспарт з усё новымі вязнямі. І нярэдка бывала так, што іх усіх адразу ж адпраўлялі ў крэматорый. Успамінаць аб усім перажытым сіл не хапае.

У лагеры ўтрымліваліся яўрэі, палітвязні з усіх краін, акупіраваных фашысцкай Германіяй.

Аднойчы ўсіх тых, хто яшчэ заставаўся ў жывых, спешна вывелі з лагера і пагналі невядома куды. Але 2 красавіка 1945 года нас вызвалілі савецкія войскі.

Два месяцы я працавала ў воінскай часці. Затым знаходзілася ў Брэсце, у размеркавальніку, пакуль не прыйшоў адказ на запыт з месца жыхарства. 15 чэрвеня я была ўжо дома.

# Дакументы сведчаць

## З АДКАЗУ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА РАСІЙСКАЙ ФЕДЭРАЦЫІ ВІЦЕБСКАМУ АБЛВАЕНКАМАТУ

**Ад 6 сакавіка 2001 г.**

Сообщаем Вам, что в фонде Р-7021 «Чрезвычайной Государственной Комиссии по расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков...» (ЧГК), находящемся на хранении в ГА РФ, в материалах «Документов о злодеяниях немецких захватчиков по Сенненскому району Витебской области» имеется «Протокол осмотра № 13 от 16 сентября 1944 года», в котором имеются сведения о двух могилах, где «...расстреляно 960 человек евреев немецко-фашистскими оккупантами 30 декабря 1941 года». Протокол заверен подписями начальника ВУС Сенненского РО НКВД, понятых и гербовой печатью.

В деле имеется неполный «Поименный список расстрелянных, повешенных, замученных гр-н СССР гор. Сенно».

В материалах дела имеется «Протокол допроса Шелуха Е. М., 1904 г. рождения, жителя гор. Сенно от 23 марта 1945 г.», в котором содержатся следующие сведения:

«...В 1941 году было собрано евреев в одно место около 800 человек... По фамилии я всех знать не мог, а некоторых знаю, так, например, Шмид П. с 1927 года, Дворкин М. Р. 1903 года, Мысик Шлемка 1900 г., Равин Либо 1904 года, все проживали в гор. Сенно. А также производился расстрел приписников (так в деле) в количестве около 100 человек...».

В материалах дела имеется «Протокол допроса Шелухо К. С., 1876 г. рождения, уроженца гор. Сенно от 22 марта 1945 г.», в котором содержатся дополнительные сведения о расстрелянных в гетто.

В деле имеется «Протокол допроса...», в котором количество расстрелянных определяется в «...965 человек».

Других сведений в документах не имеется.

Основание: ГА РФ, Ф. Р-7021. Оп. 84. Д. 11. Л. 17, 37–40.

## ВЁСКІ СЕННЕНШЧЫНЫ, ЗНІШЧАНЫЯ ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ

### ЗНІШЧАНЫ РАЗАМ З ЖЫХАРАМІ І НЕ АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| Вёска | Было да вайны | | Знішчана | | Дата знішчэння |
|---|---|---|---|---|---|
| | двароў | жыхароў | двароў | жыхароў | |
| Марозаўка | 11 | 42 | 11 | 28 | 22.08.1942 г. |

### ЗНІШЧАНЫ РАЗАМ З ЧАСТКАЙ НАСЕЛЬНІЦТВА І НЕ АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| Вёска | Было да вайны | | Знішчана | | Дата знішчэння |
|---|---|---|---|---|---|
| | двароў | жыхароў | двароў | жыхароў | |
| Іўчанкі | 15 | 67 | 15 | | 03.1943 |
| Касцялішча | 12 | 63 | 12 | 10 | 10.1942 |
| Купаваць | 7 | 36 | 7 | | 03.1943 |
| Мар'янова | 13 | 56 | 13 | | 03.1944 |
| Навасёлкі | 9 | 45 | 8 | | 12.1943 |
| Пасёлак Зорка (Камуна) | 12 | 45 | 12 | | |
| Піліпаўшчына | 6 | 24 | 6 | 3 | 12.1943 |
| Сінянка | 16 | 80 | 16 | 6 | 03.1944 |

## ЗНІШЧАНЫ З ЧАСТКАЙ НАСЕЛЬНІЦТВА І АДНОЎЛЕНЫЯ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

| Вёска | Было да вайны | | Знішчана | | Дата знішчэння |
|---|---|---|---|---|---|
| | двароў | жыхароў | двароў | жыхароў | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Адамава | 43 | 172 | 43 | 18 | 06.1944 |
| Алексінічы | 195 | 780 | 195 | 56 | 10.1942 |
| Барок | 48 | 352 | 48 | 9 | 09.1942 |
| Бікава | 47 | 129 | 40 | 7 | 06.1944 |
| Вейна | 56 | 212 | 53 | 1 | 03.1942 |
| Вялікае Сяло | 64 | 320 | 57 | | 11.1943 |
| Галашчакіна | 16 | 73 | 7 | | 07.1941 |
| Галоўск | 43 | 148 | 28 | 16 | 06.1942 |
| Гарнакі | 15 | 96 | 13 | 2 | 09.1943 |
| Гарывец | 37 | 167 | 31 | 11 | 06.1943 |
| Даганаўка | 28 | 168 | 24 | | 03.1944 |
| Заазер'е | 31 | 131 | 23 | 3 | 08.1943 |
| Заполле | 49 | 281 | 47 | 2 | 04.1944 |
| Заслонаўка | 59 | 236 | 59 | 5 | 09.1942 |
| Зямковічы | 86 | 344 | 86 | 29 | 09.1942 |
| Кадукова | 15 | 68 | 12 | 2 | 07.1941 |
| Каменка | 69 | 276 | 69 | 24 | 09.1942 |
| Кімейка | 42 | 168 | 42 | 11 | 09.1942 |
| Кішуроўшчына | 10 | 48 | 10 | 1 | 12.1943 |
| Лапатнікі | 38 | 197 | 34 | 4 | 05.1944 |
| Леснікова | 84 | 336 | 84 | 6 | 09.1942 |
| Луг | 53 | 222 | 53 | 16 | 09.1942 |
| Малая Беліца | 12 | 58 | 12 | 2 | 04.1944 |
| Марозаўка | 53 | 148 | 31 | 3 | 09.1943 |
| Оўсішча | 72 | 319 | 37 | 11 | 04.1944 |
| Партызаны (Торбінка-2) | 12 | 55 | 11 | 4 | 12.1943 |
| Пількавічы | 36 | 230 | 10 | 2 | 10.1943 |
| Пляцы | 38 | 190 | 33 | 3 | 10.1943 |
| Пожанькі | 41 | 159 | 9 | 23 | 08.1942 |
| Полымя | 22 | 396 | 18 | 14 | 04.1944 |
| Прыветак | 70 | 263 | 70 | 53 | 06.1944 |
| Пуцішча | 27 | 52 | 24 | 2 | 10.1943 |
| Сіманаўка | 19 | 144 | 19 | 3 | 09.1943 |

*Окончание*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Серкуці | 80 | 375 | 75 | | 10.1943 |
| Слабада | 38 | 96 | 25 | 2 | 10.1943 |
| Станюкі | 26 | 106 | 20 | 2 | 08.1941 |
| Утрылава | 64 | 256 | 64 | 12 | 09.1942 |
| Цеплякі | 30 | 64 | 25 | 16 | 08.1943 |
| Шынкава | 39 | 156 | 39 | 14 | 09.1942 |
| Юдзенічы (Савецкая) | 9 | 36 | 8 | | 10.1943 |
| Яхімоўшчына | 26 | 93 | 26 | | 03.1944 |

*Фонды Сенненскага краязнаўчага музея.*

## АБАГУЛЬНЕНЫЯ ЗВЕСТКІ АБ АХВЯРАХ ФАШЫЗМУ ПА БАГУШЭЎСКАМУ РАЁНУ

| Наименование сельсоветов | К-во актов | Расстреляно | | | Повешено всего | Сожжено всего | Убито, замучено военнопленных | Угнано в немецкое рабство | | Погибло в результате воздушных бомбардировок | Всего расстреляно, повешено и угнано в рабство |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | всего | в том числе: женщин | детей | | | | мужчин | женщин | | |
| Богушевский | 1 | 162 | 78 | 27 | 7 | — | 112 | 36 | 48 | 11 | 365 |
| Будский | 1 | 146 | 57 | 30 | — | — | — | 39 | 77 | — | 262 |
| Замосточский | 1 | 62 | 24 | 2 | 2 | — | — | 25 | 40 | — | 129 |
| Стайковский | 1 | 59 | 21 | 5 | 1 | — | 4 | 79 | 106 | 4 | 249 |
| Коковчинский | 1 | 102 | 41 | 7 | — | — | 8 | 22 | 23 | — | 155 |
| Осиновский | 1 | 36 | 13 | 1 | — | — | — | 41 | 31 | — | 108 |
| Ледневичский | 1 | 54 | 29 | 15 | — | 27 | 17 | 9 | 27 | — | 134 |
| Мошканский | 1 | 40 | 9 | 1 | — | — | — | 18 | 39 | — | 97 |
| Остапенский | 1 | 46 | 13 | 6 | — | — | 2 | 35 | 24 | — | 107 |
| Клюковский | 1 | 26 | 11 | — | — | — | 2 | 14 | 32 | — | 74 |
| Старобобыльский | 1 | 95 | 36 | 5 | — | — | — | 26 | 29 | — | 150 |
| Новосельский | 1 | 19 | 4 | 2 | 1 | — | 3 | 31 | 37 | — | 91 |
| Застадольский | 1 | 28 | 11 | 1 | — | — | — | 16 | 12 | — | 56 |
| Всего по району | 13 | 875 | 347 | 102 | 11 | 27 | 148 | 391 | 525 | 15 | 1977 |

Круглая гербовая печать Богушевского районного Совета депутатов трудящихся 1944 год

Подписи

Примечание: всего по району расстреляно, замучено, повешено и сожжено 1061 человек и 15 погибло при бомбардировке

## АКТ РАЁННАЙ КАМІСІІ АБ ВЫЯЎЛЕННІ І РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЫЛОГА БАГУШЭЎСКАГА РАЁНА

31 марта 1945 г., гор. пос. Богушевск Витебской обл. Белорусской ССР.

Мы, районная чрезвычайная комиссия по Богушевскому району, в лице председателя чрезвычайной комиссии секретаря райкома КП(б) т. Прохоренко Ефима Николаевича, членов: председателя исполкома Богушевского райсовета Семашко Семена Евдокимовича, начальника Богушевского РО НКВД ст. л-нта гос. без. Щеглова Семёна Гавриловича, старшего оперуполномоченного Богушевского РО НКГБ ст. л-нта гос. без. Муслимова, секретаря чрезвычайной комиссии Гнитковской, в присутствии врачей Колодовского, Шахмейстер Варвары Ильиничны, учителей Гаранова Фёдора Сергеевича, Яковлева составили настоящий акт о немецко-фашистских зверствах, чинимых над гражданами БССР и угнанных г-нах Богушевского р-на БССР в немецкое рабство.

В период временной оккупации Богушевского р-на немецко-фашистскими войсками с июля месяца 1941 года по июнь 1944 года были учинены последними над мирными гражданами и военнопленными красноармейцами неслыханные в истории белорусского народа зверства и издевательства. По имеющимся материалам допрошенных свидетелей-очевидцев чинимых зверств немецкими войсками и командованием, а также заявлениям граждан по зверствам немецко-фашистских войск, чрезвычайная комиссия установила, что немецко-фашистские войска в период оккупации Богушевского р-на по указке главной ставки Гитлера в целях грабежа и личной наживы ставили своей целью уничтожить славян, белорусов, а оставшихся сделать своими покорными рабами. Для достижения своей цели немецко-фашистские изверги по Богушевскому району:

расстреляли — 875 человек, из них женщин — 347, детей — 102;
повесили ни в чем не повинных граждан 11 человек;
сожгли живьем 27 человек;
убили и замучили пленных красноармейцев — 148 человек;
угнали под силой оружия в немецкое рабство мужчин — 391, женщин — 525 человек;
погибло от бомбежки немецко-фашистских пиратов-самолетов 15 человек.

Общее количество расстрелянных, повешенных, сожженных и угнанных в немецкое рабство по Богушевскому району составляет 1977 человек. Истребляя ни в чем не повинных граждан Богушевского р-на, немецко-фашистские изверги прибегали к своим изощренным методам зверского уничтожения славянских народов и евреев.

Свидетельница Брызгунова Агриппина Ермолаевна, жительница д. Морозовка Ледневичского сельсовета о сожжении 27 человек мирных жителей д. Морозовка 30 марта 1945 года показала:

«22 августа 1942 года утром к нам в деревню Морозовку прибыло пять автомашин с немецкими солдатами в количестве около 120 человек, вооруженных винтовками, автоматами и гранатами, требуя выдачи имеющихся в деревне партизан. Получив от населения отрицательный ответ, собрали ни в чем не повинное население в количестве 27 человек, в числе которых было 15 детей в возрасте от 1 года до 12 лет. Закрыли в покрытый соломой сарай и подожгли. Душераздирающие крики детей и плач матерей, проклинающих немецких извергов доносился до моих ушей, а пламя и обгоревшие трубы были видны мне, поскольку я от этого страшного зрелища находилась метрах в 80—100».

Об изощренных методах издевательства над мирными жителями немецко-фашистских извергов дает показания свидетельница из деревни Цыпки Богушевского сельсовета Вакар Мария Фёдоровна от 30 марта 1945 года:

«Вечером 23 июня 1944 года в период отступления немецких войск последние подожгли наш дом зажигательными пулями. Когда мы стали вытаскивать имущество из горящего дома, то немцы в это время по нам открыли огонь. Я сумела после этого скрыться в лес, но моя мать и два брата оказались в руках немецких солдат, которые матери нанесли несколько ударов ножом в грудь, разрезали живот, нанесли сквозные удары в оба бока. Старшему брату, 1927 года рождения, на руках и теле вырезали пятиконечные звезды, вывернули обе руки, нанесли ножевые удары в голову и шею. Младшему брату, 1929 года рождения, нанесли ножевые удары в живот, изрезали правый бок, вывернули руки, выкололи глаза. Вместе с ними была поймана и истерзана моя соседка Козлова Мария Павловна, 1910 года рождения, которой изрезали все тело ножами, вывернули ноги и изуродовали лицо. Вышеуказанные издевательства я видела сама лично».

Свидетель Муха Александр Малахович, житель д. Буда Будского сельсовета, в своих показаниях от 30 марта 1945 года о расстреле 74 мирных жителей д. Буды показал:

«12 октября 1942 года, примерно в 11 часов дня, когда я был дома, нашу деревню оцепили немецкие солдаты, вооруженные винтовками и автоматами. Часть немецких солдат расположилась на горке возле нашей деревни. Они были вооружены пулеметами. Группа солдат ходила по домам и имеющихся жителей собирали на улице, а затем строем повели по направлению д. Посад. Но, отведя метров пятьсот от деревни, по идущим мирным жителям открыли огонь из автоматов и пулеметов. Мне и еще восьми человекам по случаю легкого ранения удалось убежать. Когда вели нас, то старики, женщины, идущие с детьми, упрашивали солдат отпустить их и получали на это удары прикладами. На другой день после расстрела я и еще несколько жителей пришли хоронить убитых. Там оказалось 74 трупа мирных жителей, в числе которых были старики, много женщин и детей. Какая причина расстрела указанного количества мирных жителей, мне не известно».

Свидетель Жиганов Иван Афанасьевич, житель деревни Скоr Богушевского сельсовета, в своих показаниях от 30 марта 1945 года показал:

«24 июня 1944 года в деревню Скоr приехали немецкие солдаты, количество которых не помню, забрали две семьи в количестве 10 человек, в числе которых был и я, вывели на окраину деревни вблизи болота, приказали нам лечь на землю вниз лицом, после чего открыли по нам огонь из автоматов. В результате было убито 9 человек, я был тяжело ранен, и наши части, освободившие деревню, меня подобрали. Причина расстрела указанных 9 человек мне не известна».

Отмеченные факты зверских издевательств и расстрелов мирных жителей немецко-фашистскими войсками имели место в ряде других населённых пунктов, как-то: д. Савчёнки Замосточского сельсовета, г. п. Богушевск — расстрел 60 евреев и других.

Виновниками неслыханных зверств и массовых расстрелов мирного населения, военнопленных красноармейцев и увода мирного населения в немецкое рабство в Германию по Богушевскому району являются:

1. Комендант горпосёлка Богушевск капитан Горбарзак, по приказу которого немецкими солдатами производились избиения, издевательства и расстрелы мирного населения;

2. Заместитель коменданта горпосёлка Богушевск капитан Бодэ, по приказу которого производились аресты и расстрелы мирного населения;

3. Начальник гестапо горпосёлка Богушевск капитан Курт, по приказу которого проводились аресты, избиения и повешения мирного населения;

4. Начальник жандармерии горпосёлка Богушевск оберлейтенант Теориэ, по приказу которого проводились аресты, избиения и повешения мирного населения;

5. Начальник карательного отряда горпосёлка Богушевск лейтенант Отто, который лично участвовал и по приказу которого избивалось, сжигалось и расстреливалось мирное население;

6. Комендант с/х комендатуры горпосёлка Богушевск Бертольд, по приказу которого грабилось и избивалось мирное население.

Несмотря на неслыханные жестокости со стороны указанных немецко-фашистских главарей и немецких солдат, население Богушевского района не встало на колени перед немецко-фашистскими извергами. Неслыханные издевательства над мирными жителями и массовые расстрелы породили в жителях презрение и ненависть к немецким извергам и волю к победе. Население Богушевского района твердо уверено, что советское правосудие подвергнет жестокому наказанию виновников массовых расстрелов, зверств и увода мирного населения в немецкое рабство. Не может быть пощады извергам-немцам, час расплаты настал.

*Фонды Сенненскага краязнаўчага музея.*

## Дакументы абвінавачваюць...

### З ГАДАВОЙ СПРАВАЗДАЧЫ КАЛГАСА ІМЯ КАЛІНІНА (в. МАСОРЫ) МАШКАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА БАГУШЭЎСКАГА РАЁНА ЗА 1944 ГОД

Налічваецца двароў на 1 студзеня 1945 года — 125.

У іх наяўнага насельніцтва — 398 чалавек, у тым ліку: жанчын — 110, працаздольных мужчын — 12, падлеткаў ад 12 да 16 год — 38.

Маецца галоў жывёлы на 1 студзеня 1945 года:

буйной рагатай жывёлы — 11, у тым ліку кароў — 2, авечак — 22, коней — 11, у тым ліку рабочых — 4.

Атрымана за год малака (літраў) — 544.

Маецца сельскагаспадарчых механізмаў і прылад на 1 студзеня 1945 г.: плугоў конных — 35, барон — 15, малатарняў простых — 2, сартыровак зерневых — 1, павозак на драўляным ходзе — 7, саней — 11; камплектаў збруі — 12, вагаў — 1.

**СА ЗВЕСТАК АБ ЖЫЛЛЁВЫМ ФОНДЗЕ г. СЯННО ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ ДА АКУПАЦЫІ, ЯГО РАЗБУРЭННІ І АДНАЎЛЕННІ ПА СТАНУ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1945 г.**

Мелася да акупацыі жылых пабудоў — 186 плошчай 21491 кв. м.

Разбурана поўнасцю жылых пабудоў — 123 плошчай 17237 кв. м.

Разбурана часткова жылых пабудоў — 63 плошчай 4254 кв. м.

**СА ЗВЕСТАК АБ СТАНЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў КАЛГАСАХ СЕННЕНСКАГА РАЁНА ДА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ І НА ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ РАЁНА АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ**

...1. Да Вялікай Айчыннай вайны ў раёне было:

коней усяго — 7587, з іх рабочых — 5421..., буйной рагатай жывёлы ўсяго — 19552, з іх кароў — 11729..., авечак — 20593..., курэй — 62000, коз — 438.

2. На дзень вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў засталося: коней усяго — 1626, з іх рабочых — 1077. Буйной рагатай жывёлы ўсяго — 938, з іх кароў — 902. Авечак — 78, свіней — 64, коз — 102, курэй — 786...

*Фонды Сенненскага краязнаўчага музея.*

**РАШЭННЕ № 86**
**ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СЕННЕНСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ**
**ад 3 чэрвеня 1969 г.**

**г. Сянно**

Об утверждении уточненных данных о злодеяниях немецко-фашистских захватчиков в 1941—1945 годах на территории Сенненского района

Рассмотрев представленные комиссией материалы, исполком районного Совета депутатов трудящихся отмечает, что накануне войны на территории района было 363 населенных пункта, 12821 двор, 56660 чел. населения (без г. Сенно и г. п. Богушевск).

За время войны в районе полностью уничтожено 9 населенных пунктов, 3477 дворов, 2505 чел. населения убито и сожжено, 922 угнано в Германию, 4808 погибло на фронтах Великой Отечественной войны, 1066 погибло в партизанских отрядах и подполье.

В населенных пунктах Головск, Поженьки, Канево — Горивецкого сельсовета, Морозовка — Каковчинского сельсовета массово уничтожено 84 человека мирного населения, в г. Сенно — 800 чел.

Исполнительный комитет районного Совета депутатов трудящихся РЕШАЕТ:

1. Утвердить уточненные данные о злодеяниях немецко-фашистских захватчиков в 1941—1945 годах на территории Сенненского района, согласно приложению.

Председатель исполкома районного Совета депутатов трудящихся В. Браминский
Секретарь исполкома районного Совета депутатов трудящихся Т. Кубаровская

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 752. Л. 45.*

# Падпольны і партызанскі рух

**БОГУШЕВСКИЙ**
**подпольный райком КП(б)Б**
**10.7.1941—10.1941**
**8.1942—29.6.1944**

В Богушевском районе на подпольную работу остались все три секретаря райкома КП(б)Б: А. К. Стельмах, П. П. Макаренко и Е. Н. Прохоренко, а также партизанский отряд из партийно-комсомольского и советского актива под командованием А. К. Стельмаха. Подпольный райком КП(б)Б и отряд действовали в своем районе с 10 июля до осени, по октябрь 1941 года. Теснимые карательными частями гитлеровцев, они вышли из района, а потом и из Белоруссии в Смоленскую область, где 2 февраля 1942 года перешли линию фронта.

В мае 1942 года секретари райкома КП(б)Б А. К. Стельмах и Е. Н. Прохоренко вновь были направлены в тыл врага.

3 августа 1942 года Витебский обком КП(б)Б утвердил состав Богушевского подпольного райкома КП(б)Б во главе с первым секретарем райкома А. К. Стельмахом и вторым секретарем Л. Ф. Цураном. С января 1943 года секретарем райкома КП(б)Б являлся Е. Н. Прохоренко, который с мая 1943 года стал первым секретарем райкома партии.

Богушевский райком КП(б)Б базировался вначале в партизанском отряде Б. Т. Горнака (комиссар Е. Н. Прохоренко), затем в партизанской бригаде Н. П. Кресика (комиссар А. К. Стельмах), с сентября 1943 года в Богушевской партизанской бригаде (комбриг Е. Н. Прохоренко и комиссар П. М. Шарипо).

*Состав подпольного райкома КП(б)Б*

Секретари: **Стельмах Адам Константинович**
10.7.1941–10.1941
3.8.1942–3.1943
**Макаренко Петр Павлович**
10.7.1941–10.1941
**Цуран Леон Федорович**
3.8.1942–23.9.1942 — **второй секретарь**
**Прохоренко Ефим Николаевич**
10.7.1941–10.1941
30.1.1943–29.6.1944

**Члены райкома:** **Дятловский Михаил Мартынович**
3.8.1942–23.9.1942
**Игнатенко Фекла Митрофановна**
3.8.1942–9.3.1943
**Ликсо Петр Павлович**
3.8.1942–23.9.1943
**Кресик Николай Петрович**
30.1.1943–9.3.1943
**Шарипо Павел Маркович**
3.8.1942–29.6.1944
**Барковский Семен Федорович**
5.5.1943–29.6.1944
**Астровнев Мирон Артемьевич**
30.8.1943–29.6.1944

**Печатный орган подпольного райкома КП(б)Б — газета «Сталінскі шлях»**
**Редактор — Хвощ Дмитрий Герасимович**

## СЕННЕНСКИЙ
### подпольный райком КП(б)Б
### 5.4.1943—26.6.1944

Витебский обком КП(б)Б направил в Сенненский район в качестве первого секретаря подпольного райкома КП(б)Б М. Т. Любимцева.

Перейдя с группой партизан линию фронта, он 5 апреля 1943 года достиг деревни Куповать Сенненского района, где находился тогда штаб партизанской бригады им. К. С. Заслонова. 11 апреля 1943 года М. Т. Любимцев приступил к исполнению обязанностей комиссара этой бригады.

3 мая 1943 года состоялось общее собрание коммунистов партизанской бригады им. К. С. Заслонова. Собрание избрало состав Сенненского подпольного райкома КП(б)Б: секретарем М. Т. Любимцева, членами райкома: командира бригады Л. И. Селицкого и комиссара партизанского отряда им. К. Е. Ворошилова Л. Н. Анкиновича, кандидатом в члены райкома партии Ф. П. Сплошного.

8 июня 1943 года Витебский обком КП(б)Б перевел Л. И. Селицкого, Л. Н. Анкиновича и Ф. П. Сплошного в организуемый им Оршанский подпольный райком партии. В состав Сенненского подпольного райкома КП(б)Б были введены М. И. Мизовцев и В. С. Леонов и кандидатом в члены райкома В. А. Осинский. (М. Т. Любимцев с июня 1943 г. — комиссар Сенненской бригады — *Ред.*).

Количество членов райкома КП(б)Б 25 августа 1943 года было увеличено с трех до пяти человек. Дополнительно в состав райкома партии введены В. Д. Жигаловский и В. А. Осинский.

В декабре 1943 года из состава райкома КП(б)Б выбыл М. И. Мизовцев. Подпольный райком партии 10 апреля 1944 года ввел в состав райкома Ф. И. Политика.

Подпольный райком партии базировался вначале в 1-й им. К. С. Заслонова партизанской бригаде, а с июня 1943 года — в Сенненской партизанской бригаде (комбриг В. С. Леонов, комиссар М. Т. Любимцев).

*Состав подпольного райкома КП(б)Б*

Секретари: Любимцев Михаил Тихонович
5. 4.1943—26.6.1944
Мизовцев Михаил Иванович
8.6.1943—12.1943 — второй секретарь
Члены райкома: Анкинович Леон Никифорович
3.5.1943—8.6.1943
Селицкий Людвиг Иванович
3.5.1943—8.6.1943
Леонов Василий Сергеевич
8.6.1943—26.6.1944
Житаловский Владимир Демидович
25.8.1943—26.6.1944
Осинский Василий Александрович
25.8.1943—26.6.1944
Политик Филипп Иванович
10.4.1944—26.6.1944

Печатный орган подпольного райкома КП(б)Б — газета "Бальшавіцкая трыбуна"
Редакторы: Пашкевич Калина Адамович
Солохо Аким Нестерович (с 1.1944)

*Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. 1941—1944. Мн., 1975. С. 103—104, 119—120.*

**БОГУШЕВСКИЙ**
**подпольный райком ЛКСМБ**
**10.7.1942—29.6.1944**

В июле 1941 года Витебский обком комсомола и Богушевский райком партии оставили в тылу противника 115 комсомольцев, которые ушли в подполье. По заданию секретаря Богушевского подпольного райкома КП(б)Б А. К. Стельмаха комсомольскими организаторами в районе с июля 1941 года до июля 1942 года работали С. И. Белковский и Д. Г. Хвощ.

Подпольный райком комсомола был создан Витебским подпольным обкомом ЛКСМБ 10 июля 1942 года. Его основная база находилась в партизанском отряде Б. Т. Горнака и в Богушевской партизанской бригаде (командир Е. М. Прохоренко, комиссар П. М. Шарипо) в Богушевском районе.

*Состав подпольного райкома ЛКСМБ*

Секретари: Белковский Степан Иванович
10.7.1942—10.3.1943 (погиб)
Хвощ Дмитрий Герасимович
10.3.1943—29.6.1944
Костюченко Ольга Сергеевна — секретарь по пропаганде
1.9.1942—1.11.1942
Дятловский Михаил Мартынович — секретарь по пропаганде
1.7.1943—1.9.1943
Черкасова Зинаида Федоровна — секретарь по пропаганде
1.9.1943—29.6.1944
Члены райкома: Хвощ Дмитрий Герасимович
10.7.1942—10.3.1943
Дятловский Михаил Мартынович
1.8.1942—1.7.1943
1.9.1943—29.6.1944
Закусова Галина Семеновна
1.11.1942—30.12.1942

Рудаков Николай Михайлович
1.7.1943–5.11.1943 (погиб)
Шерстнев Николай Васильевич[1]
1.11.1943–29.6.1944
Горнак Мария Тимофеевна
28.2.1944–29.6.1944
Лукашев Петр Артемьевич
28.2.1944–29.6.1944
Рыжиков Владимир Трофимович
28.2.1944–29.6.1944
Сапежко Анна Максимовна
28.2.1944–29.6.1944

## СЕННЕНСКИЙ
**подпольный райком ЛКСМБ**
**11.6.1942–26.6.1944**

В июле 1941 года Витебский обком комсомола и Сенненский райком партии оставили на подпольную работу секретаря райкома комсомола О. Ф. Пузыревскую и 69 комсомольцев. О. Ф. Пузыревская осталась в тылу противника, но по состоянию здоровья и семейным обстоятельствам не смогла приступить к работе. Комсомольским организатором в районе до июня 1942 года работала Л. С. Кацер. Подпольный райком комсомола был создан Витебским подпольным обкомом комсомола 11 июня 1942 года. Его основная база находилась в 1-й партизанской бригаде им. К. С. Заслонова и в Сенненской бригаде (командир В. С. Леонов, комиссары П. В. Сырцов, М. Т. Любимцев) в Сенненском районе.

*Состав подпольного райкома ЛКСМБ*

Секретари: Кацер Лидия Савельевна
11.6.1942–15.3.1943
23.6.1943–25.8.1943,
секретарь по пропаганде –
15.3.1943–23.6.1943
25.8.1943–10.3.1944
Никитин Петр Иосифович
25.8.1943–26.6.1944
Свирид Петр Дмитриевич
15.3.1943–26.6.1943

Члены райкома: Майзит Майя Яновна
1.12.1942–1.2.1943
Мурашкевич Андрей Степанович
1.8.1942–9.11.1942
Чумаков Михаил Сергеевич
1.8.1942–9.11.1942
Цуран Николай Минович
1.8.1942–6.1944
Шишкин Семен Петрович
1.8.1942–9.1942
Горнакова Эльвира Константиновна
1.7.1943–26.6.1944
Кацер Петр Васильевич
1.7.1943–26.6.1944
Хиревич Петр Никифорович
1.7.1943–26.6.1944
Гаралева Галина Ивановна
10.7.1943–26.6.1944

*Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. 1941–1944. Мн., 1976. С. 139–140, 154–155.*

[1] Н. В. Шерстнев, М. Т. Горнак и А. М. Сапежко работали инструкторами по подпольной работе Богушевского подпольного райкома комсомола.

# Палала зямля Бугушэўская

**З успамінаў Адама Канстанцінавіча Стэльмаха, былога першага сакратара Багушэўскага падпольнага райкома КП(б)Б**



А. К. Стэльмах.

У першыя дні ліпеня 1941 года ўжо не прыходзілася сумнявацца ў тым, што вайна дакоціцца да Багушэўска. Райком партыі і райвыканкам разгарнулі работу па стварэнні падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый, баявых груп, якім належала дзейнічаць у тыле ворага. А ў савецкі тыл паспелі адагнаць звыш 3500 кароў, каля 2 тыс. авечак, 1500 коней, 40 трактароў і 20 аўтамашын.

Жыхары раёна ўдзельнічалі ва ўзвядзенні абарончых збудаванняў. Было выкапана больш за 10 тыс. пагонных метраў процітанкавых іграоў, 5 тыс. метраў акопаў. Так, у Будскім сельсавеце мясцовыя жыхары выкапалі больш за 1,5 тыс. пагонных метраў процітанкавых іраоў. Тут работы ўзначальваў старшыня сельскага Савета Лявон Фёдаравіч Цуран.

У райцэнтры ў першыя дні вайны мы стварылі знішчальны батальён, у які ўвайшло каля 170 чалавек. Для яго ўзбраення ў насельніцтва сабралі 120 паляўнічых стрэльбаў. Гэтае фарміраванне ахоўвала Багушэўск, нафтабазу, ільнозавод, МТС, іншыя аб'екты, вылоўлівала нямецкіх парашутыстаў, дыверсантаў. Потым батальён рэарганізавалі і на яго базе стварылі некалькі партызанскіх груп, у тым ліку і падпольную дыверсійную групу з 18 чалавек, якая дзейнічала ў гарадскім пасёлку. Частка байцоў пайшла разам з адступаючымі часцямі Чырвонай Арміі.

У ноч з 9 на 10 ліпеня 1941 года, калі ў Багушэўску заставацца ўжо было нельга, бо немцы ўшчыльную падыйшлі да яго, партыйныя і савецкія актывісты пайшлі ў лес. У тыле ворага для партызанскай і падпольнай дзейнасці засталіся сакратары райкома партыі Адам Стэльмах, Пётр Макаранка, Яфім Прахарэнка, члены бюро райкома Пётр Ліксо, Іосіф Шквор, Іван Леўдзікаў, Лявон Цуран, члены райкома Алена Лабаноўская, Архіп Ільюшэнка, Ганна Ігнаценка, Сямён Трус, Мірон Астраўнёў, Кузьма Астраўнёў, Пётр Воранаў, Даніла Плаксуноў, Варвара Кайдо, Рыгор Румо.

У вёсках Арэшкі, Буда, Замасточча, Навасёлкі, Старабабылле, Какоўчына былі створаны падпольныя партыйныя арганізацыі, па 5—10 чалавек у кожнай, а ў вёсках Свістуны, Замасточча, Ледневічы, Клюкаўка, Астапенкі, Дзевіна і ў самім Багушэўску —падпольныя камсамольскія арганізацыі.

Варта дадаць, што яшчэ да падполля па ініцыятыве райкома партыі было арганізавана восем баявых партызанскіх груп, кожная колькасцю ад 8 да 18 чалавек. Яны павінны былі стаць асновай стварэння партызанскіх атрадаў.

Падпольную дыверсійную групу ў Багушэўску ўзначальваў чыгуначнік Сямён Гаўрылавіч Філіповіч. Група распаўсюджвала сярод насельніцтва савецкія лістоўкі, перадавала партызанам звесткі аб дыслакацыі нямецкіх часцей, зверскіх расправах гітлераўцаў над мірным насельніцтвам, выводзіла са строю тэлеграфную і тэлефонную сувязь, падрывала варожыя аўтамашыны.

Спачатку ў яе ўваходзіла 5 чалавек, а ўжо ў верасні 1941 года яна значна ўзрасла. Актыўна дзейнічалі Мікалай Горб, Нічыпар Хадунькін, Мікалай Мацецкі, Барыс Гарнак, Раман Хрушч, Вера Прыстаўка, Ліда Цуран, Надзея Берашэвіч, Каця Ціханская, Марыя Сушкова і іншыя.

У канцы верасня падпольшчыкі замініравалі мост на шашы Віцебск—Орша. У выніку былі падарваны дзве нямецкія

грузавыя аўтамашыны і выведзены са строю мост. Сямён Філіповіч і Мікалай Горб збіралі толавыя шашкі, устанаўлівалі ў іх узрывальнікі і загружалі разам з вуглём у паравозы, што выводзіла іх са строю. Дапамагала тое, што Філіповіч працягваў і пры немцах працаваць на чыгуначнай станцыі Багушэўская.

У чэрвені 1942 года багушэўскія падпольшчыкі перадалі партызанам 23 ручныя і 3 станковыя кулямёты, шмат вінтовак і патронаў.

Падпольшчыца Марыя Сушкова працавала ў аптэцы і дапамагала партызанам медыкаментамі. 2 чэрвеня 1942 года яна перадала народным мсціўцам усе аптэчныя медыкаменты і сама пайшла ў партызанскі атрад.

Даведаўшыся, што ў майстэрні былой машынна-трактарнай станцыі палонныя чырвонаармейцы рамантуюць танкі, Сямён Філіповіч разам з Мікалаем Горбам і Васілём Забяжайлам звязаліся з ваеннапалоннымі і дамовіліся аб перадачы браніраваных машын партызанам. У выніку аперацыі Смаленскаму партызанскаму палку Садчыкава былі перададзены 3 танкі, 200 снарадаў, 7 кулямётаў, 22 гранаты, 4 стужкі з патронамі. А яшчэ полк папоўніўся на сем чалавек — былых палонных танкістаў...

Нямала гераічных спраў здзейснілі багушэўскія падпольшчыкі. А калі над імі навісла смяротная пагроза, яны ў канцы 1943 года пайшлі ў Багушэўскую брыгаду[1], якой камандаваў Яфім Мікалаевіч Прахарэнка. Сямёна Філіповіча прызначылі камісарам атрада № 4 імя Чапаева.

Падпольная партарганізацыя ў Будскім сельсавеце, якую ўзначальваў Лявон Фёдаравіч Цуран, праводзіла сярод насельніцтва работу па зрыву ўсіх мерапрыемстваў акупацыйных улад. Сабраны з былых калгасных палёў ураджай быў раздзелены сярод мясцовых жыхароў. Падпольшчыкі стараліся ратаваць людзей ад угону ў фашысцкае рабства, дапамагалі партызанам харчаваннем.

У падпольную камсамольскую арганізацыю Ледневіцкага сельсавета ўваходзіла 10 чалавек. Яе ўзначальваў настаўнік Дзмітрый Герасімавіч Хвошч. Арганізацыя дапамагала партызанам у забеспячэнні прадуктамі харчавання, распаўсюджвала лістоўкі, заклікала насельніцтва не выконваць распараджэнні нямецкіх улад. У верасні 1943 года Дз. Хвошч быў прызначаны камандзірам трэцяга атрада Багушэўскай партызанскай брыгады.

Увогуле, на пачатак верасня 1941 года на тэрыторыі Багушэўскага раёна, улічваючы партызанскія групы, дзейнічала ўжо 120 народных мсціўцаў. Тады ж было вырашана падрыхтаваць аперацыю па разгрому нямецкага гарнізона ў Багушэўску. Узгаднілі час нападу. Але па невядомай прычыне атрад Івана Бяляева самастойна, на суткі раней, у ноч з 4 на 5 верасня напаў на гарнізон.

У выніку гэтага налёту былі разгромлены камендатура і салдацкая казарма, знішчаны дзесяткі гітлераўцаў, у тым ліку і камендант гарнізона гаўптман фон Ульбрыхт. Каля дзесятка немцаў было паранена. На 6 мінах, якія паставілі падпольшчыкі С. Філіповіч, М. Берашэвіч, Я. Крывашэеў, падарваліся дзве аўтамашыны з салдатамі, якія спяшаліся з Оршы на дапамогу Багушэўскаму гарнізону. Партызаны і падпольшчыкі страт не панеслі.

Раніцой 5 верасня ў Багушэўск прыйшлі танкі і буйны карны атрад. У той жа дзень азвярэлыя фашысты расстралялі 67 чалавек з яўрэйскага гета. Дзяцей жывымі закопвалі ў зямлю. А ў чарговым нумары фашысцкай газеты, якая выдавалася ў Віцебску, немцы паведамлялі: «Бандыты ў колькасці тысячы чалавек, маючы на ўзбраенні аўтаматы, кулямёты і артылерыю, у ноч на 5 верасня напалі на Багушэўск. Але дзякуючы храбрасці каменданта гаўптмана фон Ульбрыхта і яго ўменню весці бой, бандыты былі разгромлены, пры гэтым яны панеслі вялікія страты...» Пэўна, гітлераўцы здорава перапалохаліся, прыняўшы трыццаць партызан за тысячу.

[1] Багушэўская партызанская брыгада стваралася двойчы. Брыгада першага складу (чэрвень 1942 года — сакавік 1943 года). Яе камандзіры: В. У. Бойка, П. І. Кірылаў, М. П. Крэсік; камісары: В. А. Манохін, С. А. Дзятлоўскі, А. К. Стэльмах. Выйшла ў савецкі тыл і была расфарміравана. Брыгада другога складу (верасень 1943 — чэрвень 1944 гадоў). Камандзіры: Я. М. Прахарэнка, П. М. Шарыпа; камісары: В. П. Ляўкоў, С. Б. Лісецкі (заўвага рэдакцыі).

Даведаўшыся, што на тэрыторыі Багушэўскага раёна дзейнічае падпольны райком, фашысты за галаву кожнага сакратара прызначылі вялікую ўзнагароду — ад 20 да 15 тысяч марак, паабяцаўшы ў дадатак выдаць шмат прадуктаў і шнапсу.

Па шашы Орша—Віцебск немцы перакідвалі жывую сілу і тэхніку. 12 верасня мы ўзарвалі жалезабетонны мост на аўтамагістралі.

Раніцой каля ўзарванага моста сабралася за сотню аўтамашын, цягачоў, іншай тэхнікі. Утварыўся затор. Абстрэльваючы лес з кулямётаў і гармат, немцы пачалі ўзводзіць пераправу. І ў гэты час у паветры з'явіўся савецкі самалёт-разведчык. Прыкладна праз гадзіну над месцам скаплення варожай тэхнікі былі ўжо нашы бамбардзіроўшчыкі. Дзевяць самалётаў без перашкод скінулі бомбы.

Пасля гэтай падзеі немцы пераключылі перамяшчэнне сваёй тэхнікі і жывой сілы на дарогу Орша—Бабінавічы—Віцебск. 20 ці 21 верасня на гэтай дарозе партызаны ўзарвалі мост цераз раку Лучоса, правялі яшчэ некалькі баявых аперацый, пасля чаго немцы расправіліся з жыхарамі бліжэйшых вёсак. Нарэшце, каля 150 карнікаў асмеліліся ўвайсці ў лес. Яны напалі на атрад Бяляева. Партызаны, вымушаныя разбіцца на дробныя групы, пакінулі Сафіёўскія лясы і адышлі да лініі фронту.

24 верасня гітлераўцы паспрабавалі разграміць наш атрад, камандзірам якога быў Павел Гапонцаў. Ля возера Ордзеж мы загадзя зрабілі засаду і абстралялі карнікаў. Такая нечаканая сустрэча разладзіла намеры фашыстаў і яны, не прымаючы бою, уцяклі, пакінуўшы 20 чалавек забітымі.

У баявых аперацыях вельмі мужна паводзілі сябе камандзір атрада капітан Павел Сцяпанавіч Гапонцаў і яго намеснік лейтэнант Валерый Віктаравіч Панкоў. Яны ўласным прыкладам натхнялі партызан на баявыя дзеянні, усялялі ў народных мсціўцаў і насельніцтва веру ў нашу перамогу над акупантамі.

Тады нямецкае камандаванне выбрала іншы шлях барацьбы з партызанамі. Фашысты блакіравалі вёскі, што прылягалі да лесу, каб адарваць нас ад населеных пунктаў і пазбавіць магчымасці харчавацца.

У сваёй бездапаможнасці перад партызанамі захопнікі па-зверску распраўляліся з захопленымі народнымі мсціўцамі. За садзейнічанне партызанам яны ў 1941 годзе спалілі ў Багушэўскім раёне вёскі Стрыгі, Навязкі, Цясы, Вакары і шэраг іншых населеных пунктаў, пакінуўшы жыхароў без даху над галавой і без хлеба. Яны ж спалілі большую частку Багушэўска, многіх жыхароў расстралялі ці павесілі.

У сувязі з такой абстаноўкай мы вырашылі пакінуць Багушэўскі раён. Частку партызан з мясцовых жыхароў пакінулі ў падполлі, а самі ў колькасці 18 чалавек, у тым ліку ўсе сакратары райкома 23 кастрычніка 1941 года перабраліся ў Касплянскі раён Смаленскай вобласці.

У лютым 1942 года мы, знаходзячыся ў Прачысценскім раёне Смаленскай вобласці, сустрэліся з часцямі Чырвонай Арміі і наладзілі сувязь з Віцебскім абкомам партыі і ЦК КП(б)Б.

У маі 1942 года на тэрыторыі Багушэўскага раёна дзейнічала 5 партызанскіх атрадаў, якія 12 чэрвеня былі аб'яднаны ў асобую партызанскую брыгаду. Камандзірам яе Віцебскі абком прызначыў В. У. Бойку.

Недзе каля 10 ліпеня 1942 года нам стала вядома, што вакол Сафіёўскіх лясоў сканцэнтравалася шмат нямецкіх войскаў і спецыяльных карных атрадаў і што яны рыхтуюцца да прачосвання лясоў. 14 ліпеня ўзвод партызан з атрада імя Суворава, якім камандаваў Міхаіл Дзятлоўскі, на шашы Орша—Віцебск разбіў тры легкавыя аўтамабілі ворага, захапіў карту Багушэўскага раёна, на якой былі адзначаны шляхі наступлення на партызан.

Наша брыгада на зручных рубяжах заняла кругавую абарону. Былі закрыты ўсе асноўныя падыходы да брыгаднага лагера. 15 ліпеня нямецкі полк уклініўся ў Сафіёўскія лясы. Завязаўся бой. На працягу дня карнікі тройчы атакавалі нас,

але беспаспяхова. Бой працягваўся да 22 гадзін. Было забіта каля 150 нямецкіх салдат і афіцэраў. Нашы страты былі нязначнымі. Гераічна загінулі камандзір узвода Ф. І. Ткачэнка і два кулямётчыкі.

У ліпені 1942 года было створана партызанскае злучэнне Аршанскай зоны. У яго ўвайшлі наша Багушэўская партызанская брыгада і брыгада, якой камандаваў Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў. Камандаваў злучэннем Бойка ("Баця"), яго намеснікам быў Заслонаў, камісарам — Рэзнікаў.

У выніку баявых дзеянняў народных мсціўцаў і шырокай агітацыйнай работы захопнікі ні днём, ні ўначы не ведалі спакою. Мы ўзрывалі масты, пускалі пад адхон нямецкія эшалоны, грамілі варожыя гарнізоны. Летам 1942 года у выніку нашых баявых дзеянняў надоўга былі выведзены са строю шаша і чыгунка Орша — Віцебск.

Нямала баявых аперацый партызаны праводзілі на шашы Багушэўск — Сянно. Так, у жніўні 1942 года на ёй быў разгромлены карны атрад, які накіроўваўся на машынах у Сянно. У гэтай баявой аперацыі нам дапамог жыхар вёскі Казлы Максім Куксёнак са сваімі непаўналетнімі сынамі.

У самы крытычны момант бою, калі два нашы кулямёты выйшлі са строю, з тылу па немцах застрачыў кулямёт Максіма Куксёнка. Але хутка Максім быў забіты. За кулямёт лёг яго старэйшы сын, здаецца, яго звалі Мікалаем, гадоў 14—15.

У сярэдзіне жніўня наша разведка ўстанавіла, што з вёскі Курэйшына ў лес супраць нас ідзе буйны карны атрад. Мы наладзілі засаду. Калі карнікі ўзышлі на мост, мы з трох бакоў адкрылі агонь. Было забіта 26 гітлераўцаў і некалькі дзесяткаў паранена. Па аператыўных звестках нашай разведкі і па расказах вяскоўцаў, у гэтым баі быў забіты камандзір карнага атрада ў чыне палкоўніка.

Летам таго ж 1942 года мы разграмілі паліцэйскі гарнізон у вёсцы Янова, на тэрыторыі спіртзавода.

На світанні 5 верасня Міхаіл Дзятлоўскі, Сяргей Бірыч і Мікалай Хорань узарвалі эшалон з жывой сілай і тэхнікай ворага.

Пад адхон звалілася 38 вагонаў. Загінула не меней за 300 фашыстаў. Гэта пацвердзілася таксама і тым, што назаўтра на мэблевай фабрыцы ў Багушэўску немцы заказалі трыста дамавін, а шпіталь у Оршы быў перапоўнены фрыцамі.

10 верасня партызанскія падрыўнікі ўзарвалі нямецкі эшалон на 59-м кіламетры гэтай чыгункі, 22 верасня — на 55-м. У 1942 годзе летам і восенню Міхаіл Дзятлоўскі асабіста спусціў пад адхон пяць воінскіх эшалонаў праціўніка.

10 сакавіка 1943 года Дзятлоўскі разам з брыгадай выйшаў за лінію фронту. А 15 жніўня 1943 года разам з групай у колькасці 17 чалавек ён быў перакінуты ў Багушэўскі раён для стварэння новага партызанскага атрада.

Самаахвярна змагалася з ненавіснымі захопнікамі моладзь. З ліку маладых народных мсціўцаў назаву Уладзіміра Рыжыкава, Мікалая Рыжыкава, Сяргея Марозава, Адама Бязлюдава, Леаніда Машарскага. Многія з тых, хто дачакаўся Перамогі, і хто аддаў жыццё ў жорсткай барацьбе за свабоду і незалежнасць Радзімы, заслугоўваюць і цёплых слоў, і памяці.

У тым ліку і дзяўчаты. Раскажу пра подзвіг адной з іх, Шуры Грышанавай. Ёй было даручана даведацца, што сталася ў Багушэўску з нашай разведкай, а таксама перадаць пісьмо кіраўніку падпольшчыкаў Філіповічу. Шура ў 1941 годзе закончыла сярэднюю школу, была камсамолкай, а калі пачалася вайна, стала спачатку сувязной, а потым партызанкай атрада Гарнака.

Шура перадала пісьмо Філіповічу, а ён ёй шыфроўку аб тым, што немцы рыхтуюць буйныя сілы супраць партызан у трохкутніку Орша — Віцебск — Смаленск. Яна ўжо вярталася ў атрад, як яе схапілі фашысты, знайшлі шыфроўку. Над ёй здзекваліся, катавалі жорстка. Дзяўчына гераічна прыняла смерць, але не выдала нікога з падпольшчыкаў і месцазнаходжанне партызан. Народныя мсціўцы, даведаўшыся аб подзвігу Шуры Грышанавай, пакляліся адпомсціць за яе ворагу.

І адпомсцілі. Праз некалькі дзён кулямётчыкі Іван Барысаў і шаснаццацігадовы Сцёпа Сянкевіч знішчылі ля вёскі Янова каля дзесятка фашыстаў, у тым ліку нямецкага палкоўніка, камандзіра карнай дывізіі. На шашы Багушэўск — Сянно, ля вёскі Галашчакіна, партызаны разбілі 2 аўтамашыны, забілі 18 гітлераўцаў. Пад Багушэўскам пусцілі пад адхон фашысцкі эшалон з танкамі і жывой сілай.

Фашысты аказаліся бездапаможнымі ў барацьбе з партызанскім рухам. Яны спрабавалі адыграцца на мірным насельніцтве. Акупанты знішчалі сем'і народных мсціўцаў. Яны спалілі дашчэнту вёску Марозаўка разам з жыхарамі, разбурылі і спалілі дзесяткі іншых вёсак, расстралялі і павесілі больш за 400 жыхароў Багушэўска, ля возера Ордзеж забілі каля 200 жанчын, дзяцей і старых.

У адказ на гэта партызаны ўзмацнялі свае ўдары па ворагу, наносячы захопнікам вялікія страты.

## Райком партыі аднавіў сваю работу ў падполлі

**З успамінаў Міхаіла Ціханавіча Любімцава, першага сакратара Сенненскага падпольнага райкома партыі**

Другая мая камандзіроўка ў партызанскую зону ў ролі інструктара Віцебскага абкома партыі прайшла больш-менш удала. Я пабываў у Віцебскім, Гарадоцкім, Сіроцінскім і Лёзненскім раёнах, сустрэўся з кіраўнікамі партызанскіх атрадаў і брыгад, сакратарамі падпольных райкомаў партыі.

У маю задачу ўваходзіла ўдакладніць, як ідзе аб'яднанне невялікіх партызанскіх груп і атрадаў, фарміраванне брыгад, што робіцца па стварэнню шырокай сеткі падпольных партыйных, камсамольскіх і патрыятычных арганізацый, па разгортванню палітыка-масавай работы сярод насельніцтва.

За час маёй вандроўкі змянілася абстаноўка ў Суражскай партызанскай зоне, дзе знаходзіліся знакамітыя «Суражскія вароты», праз якія партызаны мелі магчымасць хадзіць за лінію фронту за зброяй, боепрыпасамі, перапраўляць раненых, навабранцаў у рады Чырвонай Арміі, падтрымліваць сувязь з Цэнтральным штабам партызанскага руху. Фашыстам усё ж удалося паставіць тут свае заслоны. З групай партызан, якія ішлі за зброяй, давялося шукаць другое месца, прабівацца да сваіх з боем.

Абком партыі размяшчаўся недалёка ад лініі абароны нашых войск, у в. Бор Калінінскай вобласці. Першы сакратар абкома Іван Андрэевіч Стулаў з вялікай увагай і цікавасцю выслухаў маю інфармацыю, папрасіў падрыхтаваць справаздачу, папярэдзіўшы, што ў мяне мала часу, чакае новае заданне. На гэты раз мне даручалася ўзначаліць Сенненскі падпольны райком партыі. Такое рашэнне прыняло бюро абкома партыі.

У першыя дні кастрычніка 1942 года я адправіўся ў дарогу з групай добра ўзброеных партызан. Першую і другую лінію абароны ворага пашчасціла прайсці незаўважанымі. Далей не пашанцавала — натыкнуліся на артбатарэю. Узнялася страляніна. Пачалася пагоня. Дапамагла снежная завіруха, якая ўзнялася і замятала нашы сляды. Нейкім цудам мы адарваліся ад пагоні і дабраліся да партызанскай зоны. Але і тут нас чакала непрадбачанае. Вораг распачаў шырокамаштабную карную экспедыцыю, спадзеючыся ачысціць прыфрантавую паласу ад партызан.

Толькі ў сярэдзіне снежня я ступіў на зямлю Сенненшчыны. І тут тое ж самае — карная экспедыцыя супраць партызан, размешчаных у Аршанска-Сенненскай партызанскай зоне. Асноўныя сілы Заслонаўскай і Сенненскай партызанскіх брыгад перабраліся ў лепельскія лясы. У

раёне вёскі Купаваць я натрапіў на партызанскі атрад Заслонаўскай брыгады, якім камандаваў Валянцін Емяльянавіч Бяляеў. Ён параіў мне зрабіць часовы прыпынак у яго атрадзе. Неўзабаве сюды пачалі вяртацца іншыя атрады. Прыбыў і камбрыг Людвіг Іванавіч Сяліцкі, якога я з нецярпеннем чакаў. Ён адзін з арганізатараў падполля на Сенненшчыне. Яго інфармацыя аб абстаноўцы, якая склалася ў раёне, меркаванні і парады наконт састава бюро райкома былі вельмі дарэчы. Але ў сувязі з тым, што абком партыі прыняў рашэнне аб стварэнні Аршанскага падпольнага райкома партыі, прапанаваныя ім кандыдатуры ўвайшлі ў яго састаў. Сам жа Сяліцкі быў выбраны першым сакратаром Аршанскага падпольнага райкома партыі.

Згодна з указаннем абкома партыі маё месцазнаходжанне было вызначана ў зоне дзеяння Сенненскай партызанскай брыгады, пад кантролем якой знаходзілася ўжо значная частка тэрыторыі Сенненскага і суседніх — Чашніцкага і Бешанковіцкага раёнаў. Ад партызан, якія хадзілі за лінію фронту, каб устанавіць сувязь з Беларускім штабам партызанскага руху, я ведаў, што камандзір брыгады Васіль Сяргеевіч Лявонаў быў камісарам палка. У 1937 годзе ён закончыў Палтаўскае ваенна-палітычнае вучылішча. Удзельнік вайны з белафінамі. За паспяховае ажыццяўленне адной баявой аперацыі ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Першы і апошні бой полк, у якім ён служыў, прыняў каля Вільнюса. Яго спасціг такі ж лёс, як і многія часці Чырвонай Арміі ў першыя дні вераломнага нападу фашыстаў. У кастрычніку 1941 года Лявонаў арганізаваў партызанскую групу, якая вясной 1942 года пераўтворана ў атрад. Створаная ў кастрычніку 1942 года Сенненская партызанская брыгада на чале з В. С. Лявонавым стала адной з буйнейшых партызанскіх брыгад на Віцебшчыне.

Васіль Сяргеевіч з вялікай зацікаўленасцю аднёсся да фарміравання падпольнага райкома партыі, які быў створаны ў маі 1943 года. Напачатку састаў бюро райкома быў невялікі. Мяне выбралі першым сакратаром, а ў чэрвені я стаў адначасова камісарам брыгады. Другім — Міхаіла Іванавіча Мізоўцава, начальніка штаба аднаго з атрадаў, а членам бюро — камбрыга Васіля Сяргеевіча Лявонава. Крыху пазней — Васіля Аляксандравіча Асінскага, камісара атрада, члена партыі з 1920 года, Уладзіміра Дзямідавіча Жыгалоўскага — інструктара падпольнага райкома партыі, партызана Піліпа Іванавіча Палітыку. Загадчыкамі аддзелаў райкома сталі Аляксей Рыгоравіч Масаловіч і Каліна Адамавіч Пашкевіч. Рэдактарам падпольнай газеты «Бальшавіцкая трыбуна» спачатку быў А. Р. Масаловіч, пазней Акім Несцеравіч Салоха, інструктарамі райкома зацвердзілі Фёдара Мяцеліцу і Сафію Гаралёву.



М. Ц. Любімцаў.



М. І. Мізоўцаў.

Абставіны склаліся такія, што даваенны Сенненскі райком партыі не змог напярэдадні наступлення немцаў і баёў за Сянно падабраць і пакінуць давераных людзей для арганізацыі і кіраўніцтва падполлем. Тым не менш з першых дзён акупацыі ў многіх населеных пунктах пачалі дзейнічаць падпольныя арганізацыі, якія запасаліся зброяй, рыхтавалі людзей да актыўнай барацьбы з акупантамі.

Адна з першачарговых задач, якая стаяла перад утворанымі падпольнымі рай-



Сенненский РК КП(б)Б №6 10 января 1944 г.

Удостоверение

Дано настоящее т. Шерло Адольфу Антоновичу Рожд. 1909 г. урож. г. Сенно Сенненского р-на Витебской обл. в том, что он является связным Сенненского РК КП(б)Б с июля 1943 г. Просьба по всем соединениям п/бригад и отрядов не задерживать и не препятствовать в р...

Действительно по „15" февраля 1944 г.

Секретарь Сенненского РК КП(б)Б [signature] /Лобиницев/

комамі партыі і камсамола — наладзіць цесныя кантакты з гэтымі арганізацыямі, накіраваць іх дзейнасць у агульнае рэчышча ўсенароднай партызанскай барацьбы. Адначасова вялася работа па стварэнню новых падпольных арганізацый ва ўсіх тых населеных пунктах, дзе былі для гэтага рэальныя магчымасці.

У асноўным уся работа па стварэнню новых падпольных арганізацый была ўскладзена на інструктарскі састаў райкомаў партыі і камсамола. У абавязкі інструктараў уваходзіў падбор людзей, здольных узначаліць падпольныя арганізацыі, вызначыць канкрэтныя заданні, паклапаціцца аб рэгулярнай дастаўцы газет, лістовак, зводак Савецкага інфармбюро і іншай друкаванай прадукцыі, неабходнай для арганізацыі масава-палітычнай работы сярод насельніцтва.

Неўзабаве колькасць падпольных арганізацый у раёне вырасла да 89. У вёсцы Нямойта працавалі аж тры падпольныя групы, якімі кіравалі Марыя Гутаровіч, Трафім Зайцаў і Нічыпар Занько. Гутаровіч і Зайцава гітлераўцы арыштавалі. Але групы працягвалі дзейнічаць. Падпольныя партыйныя арганізацыі ўзначальвалі: у Новай Беліцы — Павел Васільеў, пасёлку Відокі — Міхаіл Каламеец, саўгасе «Полымя» — Апанас Хадорык, вёсцы Малішы — Кандрат Гарбачоў, у вёсцы Клімавічы — Лідзія Мізаўцова.

Сваю задачу райком партыі бачыў у тым, каб наладзіць узаемадзеянне падпольных арганізацый і партызанскіх атрадаў. Ён арыентаваў падпольныя арганізацыі весці збор інфармацыі пра наяўнасць сіл ворага ў гарнізонах, аб плануемых карных экспедыцыях, прымусовай мабілізацыі жыхароў раёна на работу ў Германію, нарыхтоўцы збожжа, мяса для нямецкай арміі і рэйха, а таксама рыхтаваць рэзервы для папаўнення партызанскіх атрадаў, арганізоўваць пошукі зброі і боепрыпасаў, што засталіся на месцах баёў, збор медыкаментаў, перавязачных матэрыялаў, якіх заўсёды не хапала ў партызанскіх атрадах.

У гэтых адносінах нямала рабілі падпольшчыкі Сянно, дзе знаходзіўся буйнейшы нямецка-фашысцкі гарнізон. Тут адной з першых пачала дзейнічаць падпольная партыйная арганізацыя, якую ўзначаліў Фядот Яфімавіч Кудрашоў. У яе ўваходзілі Васіль Лубенка, Мацвей Мурашка, Захар Кучка і іншыя камуністы.

Маладыя патрыёты групаваліся ў асноўным вакол шасці падпольных камсамольскіх і патрыятычных арганізацый. Кожная з іх несла адказнасць за пэўны ўчастак работы. Для камсамольцаў Лідзіі Варанёвай, Уладзіміра Алейнікава, Надзеі і Пятра Берастаўых, Лідзіі Гарнак адным з галоўных клопатаў стала падрыхтоўка маладых хлопцаў і дзяўчат у партызаны, збор зброі і боепрыпасаў, медыкаментаў.

Медсёстры Ганна і Вольга Хадыкі, Аляксандра Пракаповіч, Вольга Бельчанка, нядаўнія дзесяцікласніцы Валянціна Бярозка, Зося Касабуцкая і многія іншыя сталі надзейнымі памочнікамі ўрача Сенненскай бальніцы Антаніны Ушацкай, якая лічыла сваім абавязкам хутчэй вылечыць, паставіць на ногі афіцэраў і салдат Чырвонай Арміі, раненых у баях за Сянно, якія збіраліся папоўніць рады партызан. Ёй удалося схіліць бургамістра райуправы Бароўскага працаваць на партызан.

Валянціна Тышкевіч, якая ўзначальвала камсамольска-маладзёжную падпольную арганізацыю, наладжвала сувязі з паліцэйскімі ў Сянне. Яна падрыхтавала спіс паліцэйскіх і служачых усіх акупацыйных устаноў раёна, які дапамог савецкім праваахоўным органам пасля вызвалення раёна.

Падпольшчыкі Сянна арганізоўвалі дыверсіі, якія давалі вялікі рэзананс, дэмаралізоўвалі акупантаў і іх паслугачоў. Удалося падарваць склад з боепрыпасамі. Гэта была адна з першых такіх акцый. 2 жніўня 1943 г. у Доме культуры ад выбуху падкладзенай міны загінулі 2 афіцэры і паранена некалькі салдат. У верасні ў будынку гарадской паліцыі быў узарваны сейф, дзе захоўваліся важныя дакументы, забіты следчы і ранена чацвёра нямецкіх салдат. У кастрычніку вывелі са строю электрастанцыю і забілі ваеннага каменданта. У снежні 1943 г. былі падкладзены магнітныя міны пад дзве аўтамашыны, адна ўзарвалася у двары райуправы, другая ў дарозе.

Падпольшчыкі схілялі да пераходу на бок партызан паліцэйскіх і байцоў так званай «рускай народна-вызваленчай арміі», у прыватнасці, брыгады Камінскага, якая прыбыла ў Лепель і Сянно з Арлоўскай вобласці. Падпольшчыкі дапамаглі некаторым афіцэрам брыгады ўстанавіць сувязь з камандаваннем Сенненскай партызанскай брыгады. 12 верасня 1943 г. рота пад камандаваннем капітана Праватарава першай далучылася да партызан.

Камандзір 2-га стралковага палка маёр Тарасаў у ноч на 13 верасня назначыў узняць паўстанне, перабіць немцаў і захапіць Сянно. Па яго просьбе камбрыг Лявонаў на ўсякі выпадак размясціў каля Сянна некалькі сваіх атрадаў. Але Тарасаў не змог ажыццявіць свой план. Па віне яго ад'ютанта ён быў раскрыты. Немцы паспелі да выступлення арыштаваць Тарасава і яго бліжэйшых паплечнікаў. Удалося толькі артдывізіёну капітана Малахава далучыцца да брыгады Лявонава, пашчасціла і аднаму батальёну, які выйшаў у размяшчэнне Лёзненскай партызанскай брыгады П. І. Кірылава.

Сумесна з некаторымі кіраўнікамі падпольных арганізацый камандаванне брыгады распрацоўвала баявыя аперацыі па разгрому нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў. Так было ў Латыгалі, Новай Беліцы, мястэчку Чарэя.

У першай палове ліпеня 1943 г. пачала выходзіць падпольная газета «Бальшавіцкая трыбуна». Першыя яе нумары рэдагаваліся А. Масаловічам, потым К. А. Пашкевічам, А. Н. Салохам. Адказным сакратаром рэдакцыі з'яўляўся Анатоль Стук.

Газета выходзіла адзін раз на тыдзень. Попыт жа на праўдзівую інфармацыю быў надзвычай вялікі. Райком партыі прыняў рашэнне аб выданні зводак Савецкага інфармбюро, лістовак, якія інфармавалі аб падзеях на фронце, аб аперацыях саюзнікаў.

Падпольшчыкі расклейвалі газеты, зводкі Савецкага інфармбюро і іншыя выданні ў самых людных месцах, арганізоўвалі калектыўныя чыткі найбольш важных матэрыялаў у асяроддзі надзейных людзей. Часам газеты і зводкі трап-

лялі на стол каменданту Сянна, бургамістру раённай і сельскіх валасных упраў, а то аказваліся і ў кішэні паліцэйскага.

Па прызнанню многіх паліцэйскіх і «народнікаў», газеты і лістоўкі, з якімі іх пазнаёмілі падпольшчыкі, дапамаглі знайсці выйсце з сітуацыі, у якой яны аказаліся — павярнуць зброю супраць акупантаў, усвядоміць сваю віну перад Радзімай, сваім народам.

У тых, хто папаўняў рады падпольшчыкаў і народных мсціўцаў, было з каго браць прыклад, на каго раўняцца. Адвага і вынаходлівасць, праяўленыя ў час разгрома нямецкіх гарнізонаў Юнусам Каракетавым, сталі своеасаблівым эталонам высокай годнасці партызана. Камандаванне брыгады даручыла яму ўзначаліць атрад. Увосень 1943 г. ён са сваімі байцамі нечакана для ворагаў уварваўся ў Новую Беліцу, якая знаходзілася доўгі час у асадзе, умацаваўся тут, пакуль не падышла падмога. Разгром нямецкага гарнізона даў магчымасць адкрыць партызанскі аэрадром.

У снежні 1943 г. бюро райкома партыі адзначыла дзейнасць атрада імя Суворава, якім камандаваў Аляксандр Дзмітрыевіч Клячын. Яго байцы прымалі ўдзел у разгроме 13 гарнізонаў, вызначыліся пры абароне Беліцы, якая прыкрывала подступы да партызанскага аэрадрома. Падрыўныя групы атрада актыўна дзейнічалі на шасэйных дарогах, на адрэзку чыгункі Талачын — Коханава — Орша, спусцілі тут пад адхон два нямецкія эшалоны з тэхнікай. У атрадзе ваявалі ў асноўным маладыя хлопцы з вёсак Талачынскага і Сенненскага рёнаў.

У кастрычніку 1943 г. на бюро райкома заслухалі справаздачы некалькіх камандзіраў атрадаў. Многае з таго, што давялося пачуць, парадавала. Атрад, якім камандаваў Мікалай Кашчэеў, у верасні спусціў 2 эшалоны з ваеннай тэхнікай і жывой сілай, падарваў 1 танк, 2 аўтамашыны. У ліку захопленых трафеяў — 2 аўтамашыны, кулямёт, нямала боепрыпасаў і іншай зброі. Забіта 98 гітлераўцаў. Сабрана грошай і аблігацый на суму 7000 рублёў. Атраду пад камандаваннем Анатоля Захарава давялося весці два абарончыя баі, у час якіх 38 варожых салдат забіта і 20 ранена. Падрыўныя групы ўзарвалі 3 аўтамашыны і спусцілі пад адхон 1 эшалон. Сярод насельніцтва сабрана аблігацый і грошай на суму 16 000 рублёў.

Дарэчы, насельніцтва раёна горача адгукнулася на зварот Беларускага штаба партызанскага руху і абкома партыі арганізаваць збор сродкаў на будаўніцтва танкавай калоны «Савецкая Беларусь». У снежні мы адправілі на Вялікую зямлю аблігацый і грошай на суму 760 тысяч рублёў, а таксама некалькі кілаграмаў золата і серабра.

Справаздачы камандзіраў атрадаў, якім папярэднічалі сустрэчы і гутаркі з байцамі, ставілі таксама на мэце ўдакладніць, як ідзе ў атрадах ваенная падрыхтоўка, вывучэнне тактыкі партызанскай барацьбы, на якім узроўні знаходзіцца палітыка-выхаваўчая работа. Хацелася, каб кожны партызан добра ўсведамляў сваё месца і ролю ў бітве з фашызмам. Аддзел прапаганды і агітацыі ў адпаведнасці з пажаданнямі, выказанымі ў атрадах, распрацоўваў тэматыку гутарак і дакладаў на кожны месяц. Вось тэматыка на красавік 1944 г.: 1. Вынікі зімовага наступлення Чырвонай Арміі, ход баявых дзеянняў у вясновы перыяд. 2. Ваеннае і гаспадарча-палітычнае становішча нашых саюзнікаў, іх уклад у барацьбу супраць гітлераўскай Германіі. 3. Лета 1944 г. і нашы надзеі. 4. Аб дапамозе насельніцтву ў правядзенні веснавой сяўбы.

Арганізацыяй палітыка-выхаваўчай работы займаліся партыйныя арганізацыі, якія былі створаны ва ўсіх атрадах. Яны падбіралі з найбольш падрыхтаваных партызан палітінфарматараў і прапагандыстаў, на якіх была ўскладзена таксама адказнасць за правядзенне масава-палітычнай работы сярод насельніцтва. І не толькі там, дзе размяшчаліся іх атрады, а і ў населеных пунктах, што знаходзіліся пад кантролем немцаў. У райкоме партыі ў сувязі з гэтым павялічыліся клопаты, звязаныя з арганізацыяй семінараў для прапагандыстаў і палітінфарматараў інструктыўных нарад.

Самі работнікі райкома выкарыстоўвалі кожны зручны выпадак для сустрэчы і гутарак з насельніцтвам, выступленняў з дакладамі. Цікавасць да таго, што адбываецца на фронце, як жыве савецкі тыл, была настолькі вялікай, што нярэдка

даводзілася выступаць у адзін і той жа дзень па некалькі разоў у розных месцах. Загадчык аддзела прапаганды Аляксей Рыгоравіч Масаловіч у адной са сваіх дакладных паведамляў, што з 14 па 17 студзеня ён правёў інструктыўныя нарады ў трох атрадах, выступіў там з дакладам аб міжнародным становішчы, а таксама ў трох вёсках — Замошша, Янаўшчына, Чараўкі.

У маі, калі мы стаялі ў вёсцы Сяргейкі, Аляксей Рыгоравіч адправіўся на чарговую сустрэчу з жыхарамі навакольных вёсак. У адну з іх, калі ён выступаў, нечакана ўварваліся немцы. Яму ўдалося на сваім кані вырвацца з вёскі, якую немцы ўзялі ў паўкальцо. Але асколак міны насціг Масаловіча непадалёку ад лесу. Ён быў цяжка паранены. Урачы не змаглі яго выратаваць.

Островский Сергей Михайлович
октябрь 1943 — июнь 1944

### 11-й отряд

Сформирован в октябре 1943 г. из партизан, выделенных 2-м отрядом им. И. П. Спиридонова.
Командир отряда — Соловьев Родион Иванович
октябрь 1943 — июнь 1944
Комиссары: Ефремов Борис Васильевич
ноябрь 1943 — декабрь 1943
Лавыш Владимир Фомич
май 1944 — июнь 1944
Начальник штаба — Киселев Иван Федорович
октябрь 1943 — июнь 1944

### 12-й отряд

Организован в октябре 1943 г.
Командир отряда — Кащеев Петр Кузьмич
октябрь 1943 — июнь 1944, погиб
Комиссар — Енисейский Иван Власович
декабрь 1943 — июнь 1944
Начальники штаба: Михайличенко Иван Иванович
Третьяков Семен Федорович
май 1944 — июнь 1944

## СМОЛЕНСКИЙ ПАРТИЗАНСКИЙ ПОЛК

Создан в июле 1942 г.

В мае 1942 г. по распоряжению штаба Западного фронта в тыл противника, в район дислокации партизанского соединения «Бати» (командир — Коляда Н. З.) Смоленской области, прибыла группа командного состава (8 чел.) во главе с И. Ф. Садчиковым для организации партизанского полка особого назначения. Он был сформирован 27 июля 1942 г. из личного состава, выделенного соединением «Бати», в составе отрядов 1, 2, 3, 4-го, позже организованы 5, 7, 8, 9, 10, 12, 13, 14-й. 6-й отряд влился в полк в октябре 1942 г. В 1943 г. отряды объединены в батальоны. До марта 1943 г. полк действовал на территории Смоленской области, затем перебазировался в Белоруссию. В октябре 1943 г. приказом начальника ЦШПД передан в подчинение БШПД.

Полк действовал в Касплянском, Демидовском районах Смоленской, Сенненском, Чашникском, Толочинском, Ушачском — Витебской и Куренецком районе Вилейской областей.

Соединился с частями Красной Армии 3 июля 1944 г. в составе 13 отрядов общей численностью 942 партизана.

Командир полка — Садчиков Иван Федорович
июль 1942 — июль 1944
Комиссар — Юрьев Андрей Федорович
июль 1942 — июль 1944
Начальники штаба: Доморацкий Геннадий Павлович
июль 1942 — апрель 1943
Миняев Петр Георгиевич
апрель 1943 — июль 1944

### 1-й батальон

Создан 24 марта 1943 г. В его состав вошли 5-й и 8-й отряды.
На день соединения с частями Красной Армии включал отряды 1, 2 и 3-й.
Командиры батальона: Кадушин Матвей Арсентьевич
март 1943 — сентябрь 1943
Коныпдиков Моисей Герасимович
сентябрь 1943 — июль 1944
Комиссары: Кумбарг Константин Соломонович
март 1943 — май 1944
Вороняев Илиодор Митрофанович
май 1944 — июль 1944
Начальники штаба: Ершов Иван Ильич
март 1943 — сентябрь 1943
Кураленков Петр Артемович
сентябрь 1943 — июль 1944

### 1-й отряд

Организован в июле 1942 г. на базе инициативной группы П. А. Кураленкова.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 71 партизана.
Командиры отряда: Кураленков Петр Артемович
июль 1942 — март 1943
Калмыков Виктор Иванович
март 1943, погиб
Шаробыров Михаил Николаевич
— август 1943
Тимофеев Яков Васильевич
август 1943 — май 1944, погиб
Крестьянинов Иван Васильевич
май 1944 — июль 1944
Комиссары: Борисов Иван Михайлович
июль 1942 — март 1943
Макаренко Максим Трофимович
апрель 1943 — август 1943
Краснов Тимофей Панкратович
август 1943 — ноябрь 1943
Ходосов Василий Андреевич
ноябрь 1943 — май 1944
Лепесский Франц Иосифович
май 1944 — июль 1944
Начальники штаба: Петров Иван Романович
июль 1942 —
Матвейкин Гавриил Терентьевич
сентябрь 1942 — март 1943

### 2-й отряд

Образован в июле 1942 г. на базе инициативной группы И. И. Ершова.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 55 партизан.
Командиры отряда: Ершов Иван Ильич
июль 1942 — март 1943
Дрюков Григорий Петрович
март 1943 — август 1943
Рыжиков Григорий Михайлович
август 1943 — июль 1944
Комиссары: Баранов Дмитрий Сергеевич
июль 1942 — сентябрь 1942
Буниш Яков Федорович
сентябрь 1942 — июль 1944
Начальник штаба — Дрюков Григорий Петрович
июль 1942 — ноябрь 1942



0. Зак. 2999

### 3-й отряд

Сформирован в июле 1942 г. на базе инициативной группы С. М. Бабакевхяна.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 54 партизана.

Командиры отряда: Бабакевхян Семен Михайлович
июль 1942 — сентябрь 1942
Андрианов Михаил Сергеевич
сентябрь 1942 — март 1943
Ширкунов Василий Федорович
апрель 1943 — июль 1944

Комиссары: Конюхов Николай Евстафьевич
июль 1942 — март 1943
Аверьянов Николай Михайлович
апрель 1943 — август 1943
Воропаев Аркадий Иосифович
август 1943 — май 1944
Ходосов Василий Андреевич
май 1944 — июль 1944

Начальник штаба — Кадушкин Матвей Арсентьевич
июль 1942 — декабрь 1942

### 2-й батальон

Создан 24 марта 1943 г. В его состав вошли 2, 3, 6-й отряды.
На день соединения с частями Красной Армии включал отряды 4-й, 5-й, 6-й, 10-й.

Командир батальона — Борисов Иван Михайлович
март 1943 — июнь 1944

Комиссары: Ковындиков Моисей Герасимович
март 1943 — сентябрь 1943
Какошин Василий Устинович
сентябрь 1943 — июль 1944

Начальник штаба — Андрианов Михаил Сергеевич
март 1943 — июль 1944

### 4-й отряд

Организован в июле 1942 г. на базе инициативной группы А. И. Птюшкина.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 63 партизана.

Командиры отряда: Птюшкин Александр Иванович
июль 1942 — август 1942, погиб
Анисимов Павел Михайлович
август 1942 —
Рыжиков Григорий Михайлович
март 1943 — август 1943
Дрюков Григорий Петрович
август 1943 — июль 1944

Комиссары: Лагерев Самуил Арсентьевич
июль 1942 — сентябрь 1942
Баранов Дмитрий Сергеевич
сентябрь 1942 —
Ковындиков Моисей Герасимович
январь 1943 — март 1943
Конюхов Николай Евстафьевич
март 1943 — октябрь 1943
Липко Константин Павлович
октябрь 1943 — июль 1944

Начальники штаба: Ковындиков Моисей Герасимович
июль 1942 — январь 1943
Родионов Иван Иванович
январь 1943 — март 1943
Елизаров Константин Иванович
— июль 1944

## 5-й отряд

Образован 15 сентября 1942 г. из мелких разрозненных партизанских групп, действовавших в Касплянском районе.

На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 76 партизан.

Командиры отряда: Исупов Борис Ульянович
сентябрь 1942 — декабрь 1942
Кадушин Матвей Арсентьевич
декабрь 1942 — март 1943
Анисимов Павел Михайлович
апрель 1943 — июнь 1944
Лобачев Алексей Дмитриевич
июнь 1944 — июль 1944

Комиссары: Чуркин Иван Николаевич
сентябрь 1942 — ноябрь 1942, погиб
Краснов Тимофей Панкратович
ноябрь 1942 — март 1943
Туманов Андрей Ерофеевич
март 1943 — август 1943
Макаренков Максим Трофимович
август 1943 — май 1944, погиб
Животков Василий Георгиевич
май 1944 —
Крижицкий Бронислав Антонович
— июль 1944

Начальники штаба: Шаробыров Михаил Николаевич
сентябрь 1942 — январь 1943
Пантюхов Михаил Захарович
январь 1943 —
Блинов Афанасий Леонович
— июль 1944

## 6-й отряд

Сформирован в конце 1941 г. в Богушевском районе из жителей дд. Новая Земля, Кисели, Ольша и группы военнослужащих во главе с Н. И. Талерко, не вышедших из вражеского тыла. До конца октября 1942 г. действовал самостоятельно.

На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 65 партизан.

Командиры отряда: Талерко Никанор Иванович
1941 — март 1943
Вороняев Илиодор Митрофанович
июль 1943 — сентябрь 1943
Волчков Григорий Захарович
сентябрь 1943 — декабрь 1943
Костенко Георгий Александрович
декабрь 1943 — июль 1944

Комиссары: Мельников Евдоким Николаевич
— октябрь 1942, погиб
Куров Иван Сергеевич
октябрь 1942 — март 1943
Баранов Дмитрий Сергеевич
март 1943 — июль 1944

Начальники штаба: Шуков Александр
Исупов Борис Ульянович
декабрь 1942 — январь 1943
Туманов Андрей Ерофеевич
февраль 1943 — март 1943
Кулаков Иван Трофимович
июль 1943 — июль 1944

## 10-й отряд

Организован в мае 1943 г.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 43 партизана.
Командир отряда — Еремин Степан Алексеевич
май 1943 — июль 1944
Комиссары: Елисеев Дмитрий Андреевич
— июль 1943, погиб
Белявский Владимир Николаевич
август 1943 — сентябрь 1943

## 3-й батальон

Создан 24 марта 1943 г. В его состав вошли 1, 4 и 7-й отряды.
На день соединения с частями Красной Армии включал отряды 7, 8, 9-й.
Командир батальона — Ершов Иван Ильич
сентябрь 1943 — июль 1944
Комиссары: Куров Иван Сергеевич
март 1943 — октябрь 1943
Николаенков Артем Максимович
ноябрь 1943 — июль 1944
Начальники штаба: Кураленков Петр Артемович
март 1943 — сентябрь 1943
Вороняев Илиодор Митрофанович
сентябрь 1943 — май 1944
Андреев Иван Федорович
май 1944 — июнь 1944
Анисимов Павел Михайлович
июнь 1944 — июль 1944

## 7-й отряд им. Д. Д. Соловьева

Образован в 1942 г. В марте 1944 г. ему присвоено имя комиссара отряда Д. Д. Соловьева (погиб 19 марта 1944 г.).
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 48 партизан.
Командиры отряда: Белкин
— февраль 1943
Бзыков Хасанбек Кафарович
февраль 1943 — октябрь 1943
Комиссары: Туманов Андрей Ерофеевич
— январь 1943
Какошин Василий Устинович
январь 1943 — август 1943
Соловьев Дмитрий Дмитриевич
август 1943 — март 1944, погиб
Зубаков Алексей Петрович
март 1944 — июль 1944

## 8-й отряд им. П. М. Самойленко

Сформирован в ноябре 1942 г. из партизан разукрупненного 2-го отряда. В марте 1944 г. ему присвоено имя командира отряда П. М. Самойленко (погиб 19 марта 1944 г.).
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 83 партизана.
Командиры отряда: Дрюков Григорий Петрович
ноябрь 1942 — март 1943
Матвейкин Гавриил Терентьевич
март 1943 — декабрь 1943
Самойленко Петр Михайлович
декабрь 1943 — март 1944, погиб
Зверев Владимир Николаевич
март 1944 — май 1944
Бурлет Михаил Кузьмич
май 1944 — июль 1944

Комиссары: Андреев Иван Федорович
март 1943 — май 1944
Иванов Михаил Никитович
май 1944 — июль 1944

### 9-й отряд

Организован в марте 1943 г.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 67 партизан.
Командиры отряда: Родионов Иван Иванович
март 1943 — июль 1943, погиб
Костенко Георгий Александрович
июль 1943 — октябрь 1943
Мальковский Степан Ильич
октябрь 1943 — май 1944, погиб
Жугалев Яков Елисеевич
июнь 1944 — июль 1944
Комиссары: Соколов Михаил Федорович
март 1943 — июль 1943
Макаренков Денис Михайлович
июль 1943 — июль 1944

### 4-й батальон

Создан в октябре 1943 г.
На день соединения с частями Красной Армии включал отряды 12, 13 и 14-й.
Командиры батальона: Кадушин Матвей Арсентьевич
октябрь 1943 — декабрь 1943
Бзыков Хасанбек Кафарович
декабрь 1943 — июль 1944
Комиссар — Конюхов Николай Евстафьевич
октябрь 1943 — июль 1944
Начальники штаба: Бзыков Хасанбек Кафарович
октябрь 1943 — декабрь 1943
Матвейкин Гавриил Терентьевич
декабрь 1943 — июль 1944

### 12-й отряд

Образован в сентябре 1943 г.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 48 партизан.
Командиры отряда: Пустовинский Василий Никифорович*
сентябрь 1943 — октябрь 1943, погиб
Бесчастнов Виктор Иванович
ноябрь 1943 — май 1944, погиб
Дредун Иван Михайлович
май 1944 — июль 1944
Комиссар — Демин Семен Сидорович
сентябрь 1943 — июль 1944

### 13-й отряд

Организован в октябре 1943 г.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 59 партизан.
Командир отряда — Бобров Анатолий Павлович
октябрь 1943 — июль 1944
Комиссары: Дредун Иван Михайлович
октябрь 1943 — май 1944
Громыко Виктор Александрович
май 1944 — июль 1944

*По другим данным — В. Н. Пустовицкий.

### 14-й отряд

Сформирован в октябре 1943 г.
На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 47 партизан.
Комиссары отряда: Лаврик Александр Савельевич
октябрь 1943, погиб
Лабезин Николай Антонович
ноябрь 1943 — июнь 1944, погиб

### ОТДЕЛЬНЫЙ ОТРЯД И. Ф. БЕЛЯЕВА

Сформирован в июле 1941 г. из групп военнослужащих, попавших в окружение. До конца 1941 г. действовал в Богушевском районе, затем вышел в советский тыл.
Командир отряда — Беляев Иван Федорович

### ОТДЕЛЬНЫЙ БОГУШЕВСКИЙ ОТРЯД

Организован в августе 1941 г. в Богушевском районе из местных коммунистов и комсомольцев во главе с секретарем Богушевского райкома КП(б)Б А. К. Стельмахом. В сентябре объединился с прибывшей сюда группой П. С. Гапонцева, образованной из попавших в окружение военнослужащих.

В октябре 1941 г. отряд вышел в Смоленскую область, где в начале февраля 1942 г. соединился с частями Красной Армии.
Командиры отряда: Стельмах Адам Константинович
Гапонцев Павел Степанович
Комиссар — Агейчик Владимир Лукьянович

### ОТДЕЛЬНЫЙ ОТРЯД «МЕЧ»

Организован 22 мая 1942 г. ЦК КП(б)Б в советском тылу и направлен в Осиповичский район Могилевской области. По пути следования отряд проводил боевые действия в Лиозненском, Сенненском и Богушевском районах Витебской области. В августе 1942 г. в боях с карателями в Богушевском районе был рассеян, группа партизан в октябре 1942 г. вышла в советский тыл.
Командир отряда — Синяков Карп Архипович
Комиссар — Стрижаков Емельян Евграфович
Начальник штаба — Бутремеев Василий Михайлович

*Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, 1941—1944. Мн., 1983. С. 248—251, 259—267, 285—288, 301—306, 317—328, 344—358, 366, 368.*

## Спачатку нас было 14, потым стала амаль 2000

### З успамінаў В. С. Лявонава, камандзіра Сенненскай партызанскай брыгады



В. С. Лявонаў.

Вайна застала мяне кадравым ваенным. Родам я з Данбаса, сын патомнага шахцёра. Першае баявое хрышчэнне атрымаў на вайне з фінамі ў 1939 г. Быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Вялікую Айчынную вайну сустрэў у Вільнюсе на пасадзе камісара 294-га літоўскага нацыянальнага палка, які напаткаў такі ж лёс, як і многія вайсковыя часці, калі гітлераўскія войскі нечакана перасеклі граніцу і ўварваліся на савецкую тэрыторыю. Апынуўшыся ў тыле ворага, я адразу ж уключыўся ў партызанскую барацьбу.

У пачатку мая 1942 г. наш атрад спыніўся на кароткі адпачынак у вёсцы Сяргейкі. Сюды

прыбыў пасланец атрада, які знаходзіўся ў Прывецкім лесе. Гэтым пасланцом быў Міхаіл Марціновіч, ураджэнец Чашніцкага раёна. Яму камандзір атрада Васіль Захарчанка даручыў дамовіцца са мной аб сустрэчы.

У суправаджэнні Марціновіча я са сваім атрадам рушыў у Прывецкі лес. Карнікі не абышлі сваёй «увагай» і атрад Захарчанкі, што, дарэчы, насіў назву горада, у якім нарадзіўся камандзір — «Ташкент». За зіму яму таксама давялося вытрымаць нямала цяжкіх баёў. Тым не менш, напярэдадні нашай сустрэчы атрад разграміў нямецкі гарнізон у в. Ульянавічы. У атрадзе Захарчанкі налічвалася 35 чалавек. Як і ў нашым, былі тут жыхары навакольных вёсак, былі і кадравыя ваенныя, якія апынуліся ў акружэнні і вырашылі ў тыле ворага працягваць барацьбу.

Мы з Захарчанкам разумелі, што толькі аб'яднаўшы свае сілы, зможам супрацьстаяць ворагу. Параіліся са сваімі байцамі. Усе пагадзіліся аб'яднацца. Мяне выбралі камандзірам атрада, камісарам — Васіля Захарчанку, намеснікам камандзіра Кічы-Батыра Хаіркізава, начальнікам штаба Івана Пашчанку. Усе мы ўжо набылі пэўны вопыт партызанскай барацьбы.

Першае, што мы вырашылі зрабіць насля аб'яднання — гэта правесці рэйд па Сенненскаму і Чашніцкаму раёнах. Мелася на ўвазе, што ён будзе насіць больш прапагандысцкі характар. Акупацыйныя ўлады зрабілі ўсё, каб насельніцтва мела толькі іх інфармацыю. Рэквізавалі радыёпрыёмнікі. У каго знаходзілі лістоўку ці газету, скінутыя нашымі самалётамі, таго чакала турма або расстрэл.

У час сустрэч з насельніцтвам мы пераканаліся, як людзі згаладаліся па праўдзіваму слову, як хочацца ведаць, што адбываецца на фронце. Нязменна іх хвалявала адно і тое ж пытанне: калі вернуцца нашы, калі настане, нарэшце, час вызвалення. Сустрэчы з тымі, хто ўзяў у рукі зброю, каб змагацца з акупантамі, бараніць свой край, былі для іх сапраўдным святам. Многім яны дапамагалі ўсвядоміць і вызначыць сваё месца ў гэтыя невыносна цяжкія і пакутлівыя дні акупацыі.

У час рэйда мы пастараліся выкарыстаць кожны зручны выпадак, каб напомніць акупантам і іх паслугачам, хто тут гаспадар, які чакае іх лёс. Вельмі ўдалай аказалася засада на шашы Лукомль — Старажэвічы. Было забіта 7 паліцэйскіх чарэйскай паліцыі. Акрамя зброі, была захоплена вялікая сума грошай, якія мы адправілі за лінію фронта. Потым адбыўся бой з кашчынскім карным атрадам, у час якога было забіта 17 паліцэйскіх і 2 нямецкіх салдат.

Ва ўсіх вёсках, праз якія пралягаў наш маршрут, нас сустракалі з вялікай радасцю, са слязамі на вачах. Многія хлопцы і дзяўчаты выказвалі жаданне стаць байцамі атрада. Але ўзяць усіх, на вялікі жаль, мы не маглі. Не хапала зброі, бралі тых, хто аказаўся больш прадбачлівым, прыбярог вінтоўку ці кулямёт, знойдзеныя на месцы баёў у час наступлення немцаў. Тым не менш на зыходзе лета наш атрад ператварыўся ў адну з буйнейшых па тым часе партызанскіх брыгад.

У жніўні 1942 г. мы аб'ядналіся з талачынскімі партызанамі і стварылі брыгаду. Аднак у хуткім часе адбылося раздзяленне, і ў кастрычніку 1942 г. афармілася самастойная Сенненская брыгада на чале з камандзірам В. С. Лявонавым, камісарам Т. В. Сырцовым, начальнікам штаба В. Д. Сыценкам.

У канцы жніўня ў Казённы лес, які мы выбралі для свайго лагера, прыбылі партызанскія брыгады К. Заслонава і Багушэўская В. Бойкі («Баці»), супраць якіх немцы арганізавалі карную экспедыцыю, выкарыстаўшы рэгулярныя вайсковыя часці. Сілы былі няроўныя. Бойка, які выконваў абавязкі камандуючага зонай, вырашыў вывесці брыгады з-пад удару. Ён запрасіў да сябе і загадаў — заняць паўночную ўскраіну Казённага лесу і прыкрыць адыход асноўных сіл, у тым ліку і нашай брыгады. Я застаўся з узводам Уладзіміра Ванцеева. Мы мелі на сваім узбраенні, акрамя аўтаматаў і вінтовак, 12 кулямётаў. Агонь адкрылі па карніках, падпусціўшы іх прыкладна на 50—60 м. Для 70 варожых салдат гэта быў апошні бой. Тады фашысты адкрылі агонь з гармат і мінамётаў, спадзеючыся ўзяць рэванш. Мы ж патаемнымі сцежкамі выйшлі на след брыгад. Спыніліся ў Церабенскім лесе. Тут чакала нас вестка, якая глыбока ўзрушыла ўсіх. У многіх вёсках немцы арыштавалі нашых сувязных, а таксама бацькоў партызан — усяго 80 чалавек. У іх ліку і чатырнаццацігадовага хлапчука Мішу Шыбеку, які аказаў немалую паслугу, калі фарміраваўся атрад. Са сваімі сябрамі, такімі ж хлапчукамі, як і ён, сабраў на месцы баёў з немцамі 30 тысяч патронаў, зняў з падбітых нашых танкаў 20 кулямётаў і ранняй вясной 1942 г. перадаў нам.

Арыштаваныя знаходзіліся ў Вятненскім гарнізоне. Многіх з іх, як стала вядома, немцы збіраліся на наступны дзень расстраляць. Марудзіць было нельга. Жаданне ісці вызваляць арыштаваных выказаў увесь састаў брыгады. Я выбраў 20 чалавек, у тым ліку ветэранаў брыгады В. Шаўцова, П. Кацара, І. Грыцкіх. Узначаліць групу даручыў майму намесніку



Сустрэча былых народных мсціўцаў на месцы былой партызанскай базы.

Хаіркізаву. Задача была не з лёгкіх. Вятненскі гарнізон быў добра ўмацаваны і ўзброены.

У каменных будынках, на вадакачцы ўстаноўлены кулямёты... Разлічвалі на нечаканасць, раптоўнасць нападу. Разлік апраўдаўся. Раніцай Хаіркізаў са сваёй групай даставіў усіх вызваленых у партызанскі лагер, а заадно 13 здраднікаў, узятых у палон.

В. Бойку выклікалі ў Беларускі штаб партызанскага руху. Камандаванне Аршанска-Сенненскай зоны перайшло да Канстанціна Заслонава. У кастрычніку ён запрасіў мяне да сябе, давёў да ведама рашэнне Віцебскага абкома партыі аб забароне выхаду партызанскіх атрадаў і брыгад за лінію фронту. Тэмай нашай гаворкі, абмеркавання сталі праблемы, звязаныя з надыходам зімы — што трэба зрабіць, каб пазбегнуць пралікаў, якія былі дапушчаны ў першую зімоўку, як лепш наладзіць узаемадзеянне брыгад, актывізаваць і ўзмацніць іх баявыя дзеянні. З Заслонавым у мяне ўстанавіліся добрыя, прыязныя адносіны з першай жа нашай сустрэчы, якая адбылася ранняй вясной 1942 г.

Ён меў пастаянную сувязь з Вялікай зямлёй, быў добра інфармаваны аб падзеях на фронце. Ахвотна згадзіўся сустрэцца з байцамі нашага атрада, зрабіць інфармацыю, а заадно падарыў радыёпрыёмнік.

Гэта была мая апошняя сустрэча з Заслонавым. Праз некалькі дзён да нас у брыгаду прыбыў Людвіг Іванавіч Сяліцкі, камісар Заслонаўскай брыгады. Ён паведаміў горкую для ўсіх нас вестку. У вёсцы Купавацъ у няроўным баі з карнікамі загінуў Заслонаў. Брыгаду даручана ўзначаліць яму, Сяліцкаму. Ён папрасіў парэкамендаваць з саставу нашай брыгады кампетэнтнага кадравага ваеннага на пасаду начальніка штаба брыгады. Я прапанаваў памочніка начальніка штаба Віктара Нічыпаравіча Смірнова. З ім Сяліцкі адразу знайшоў узаемаразуменне, у яго асобе ўбачыў патрэбнага чалавека, які валодаў неабходнымі дзелавымі і прафесійнымі якасцямі. Сяліцкі не раз гаварыў мне пра гэта пры сусрэчах.

Карная экспедыцыя, у час якой загінуў Заслонаў, была адной з акцый, арганізаваных камандаваннем тылу армейскай групы «Цэнтр», з удзелам вайсковага падраздзялення так званай «рускай народна-вызваленчай арміі». Сенненскі раён значыўся ў ліку тых, дзе немцы аказаліся ў тупіковым становішчы. Тут пад кантролем партызан знаходзілася шмат населеных пунктаў, а раённы цэнтр, па сутнасці, быў у партызанскай асадзе. За лета 1942 г. мы змаглі разграміць найбольш важныя для немцаў апорныя пункты, якімі сталі створаныя імі паліцэйскія гарнізоны.

Баявыя аперацыі такога роду мы перанеслі на суседнія раёны. У лістападзе 1942 г. быў разгромлены гарнізон у вёсцы Забор'е Бешанковіцкага раёна, а ноччу, 22 снежня, у мястэчку Чарэя Чашніцкага раёна. Вялікая заслуга тут належала падпольшчыкам на чале з М. Я. Браслаўцавым, з якім я падтрымліваў сувязь праз Вольгу Сіўцову. Па яго просьбе на дапамогу падпольшчыкам я накіраваў памочніка начальніка штаба С. Камягіна з 75 добра ўзброенымі партызанамі. Аперацыя прайшла паспяхова. Былі захоплены склады

са зброяй і боепрыпасамі, іншай ваеннай маёмасцю, зернем. Больш за 100 жыхароў мястэчка папоўнілі рады байцоў брыгады.

У ходзе баёў за авалоданне бальшаком Чашнікі—Чарэя разграмілі гарнізоны ў вёсках Граеўшчына, Слідцы, Закур'е, Прыдвор'е. Лукомль Чашніцкага раёна, крыху пазней — гарнізоны ў Ходцах, Ладзікаве, Лядзічах, Крыльцове, яшчэ ўцалелыя ў Сенненскім раёне.

Беларускі штаб партызанскага руху і Віцебскі абком партыі, якія падтрымлівалі цесную сувязь з прыфрантавымі часцямі Чырвонай Арміі, лічылі адной з важнейшых задач узяцце пад свой кантроль шасэйных дарог стратэгічнага значэння, больш актыўнае правядзенне дыверсій на чыгунцы, зрабіць усё магчымае, каб перашкодзіць ворагу перавозіць жывую сілу і тэхніку ў раёны баявых дзеянняў на фронце.

Ва ўсіх атрадах былі створаны падрыўныя групы, арганізавана вучоба. Вялікую дапамогу тут аказала падрыўная група Я. Шарахоўскага, якая прыбыла з-за лініі фронту і далучылася да брыгады. Неўзабаве яна перарасла ў дыверсійны атрад. Дыверсіі праводзіліся на чыгунцы Орша—Мінск, Орша—Віцебск, на шасэйных і грунтовых дарогах: Сянно—Віцебск, Сянно— Багушэўск, Лепель—Віцебск, Халопенічы—Барысаў, Абчуга—Бор, Валосава—Талачын, Орша—Смаляны, Бешанковічы—Чашнікі і іншыя.

У сувязі з актывізацыяй баявой дзейнасці адной з сур'ёзных і надзённых праблем стала забеспячэнне атрадаў брыгады боепрыпасамі, узрыўчаткай, зброяй.

Мы ўжо не маглі, як гэта было на пачатку фарміравання брыгады, абыходзіцца тым, што ўдавалася здабыць у баях з ворагам. Колькасць байцоў у брыгадзе на зыходзе 1943 г. ужо даходзіла да 2000. Увосень 1941 г., калі мы толькі пачыналі, нас было ўсяго 14 чалавек.

Штаб партызанскага руху параіў падабраць пляцоўку для пасадкі самалётаў. Гэта дало б магчымасць арганізаваць дастаўку патрэбнага грузу. Каля в. Новая Беліца да вайны фарсіраванымі тэмпамі вяліся работы, каб адкрыць тут запасны аэрадром. Падрыхтаваная пляцоўка, як мы ўдакладнілі, была ў добрым стане. Але ў вёсцы знаходзіўся нямецкі гарнізон. У верасні 1943 г. гарнізон быў блакіраваны, а затым і разгромлены. Пачаліся рэгулярныя рэйсы самалётаў. Гэта дало нам магчымасць адпраўляць цяжка параненых партызан за лінію фронту. Камандзір эскадрыллі Герой Савецкага Саюза Фядотаў, лётчыкі Тарасаў, Патапаў, Дзюба, Паўзуноў, Кузняцоў, Варанцоў і іншыя нярэдка за ноч паспявалі зрабіць па два рэйсы, нягледзячы на праследаванне нямецкімі знішчальнікамі. Аэрадром выкарыстоўваўся пастаянна 9 партызанскімі брыгадамі.

Летам 1943 г. у зону нашых дзеянняў прыбыла група прадстаўнікоў Віцебскага абкома партыі на чале з сакратаром абкома Іванам Барысавічам Пазняковым. У яе ўваходзілі інструктары абкома А. Н. Радкевіч, І. Капіца, сакратар абкома камсамола А. Жаўнерка. Былі створаны падпольныя райком партыі і райком камсамола. Іх дзейнасць значна ажывіла работу з насельніцтвам, у партызанскіх атрадах.

З-за лініі фронту была дастаўлена партатыўная друкарня. Пачала выходзіць падпольная газета «Бальшавіцкая трыбуна», рэгулярна друкаваліся зводкі Савецкага Інфармбюро, лістоўкі. Насельніцтва такім чынам атрымлівала інфармацыю, якая давала рэальную карціну падзей, што адбываліся на фронце, у свеце.

Гэта быў перыяд бурнага росту брыгады, папаўнення яе новымі байцамі. У атрады прыходзілі сем'ямі. З вёскі Прыветак у 1942 г. байцамі атрада сталі настаўніца Лідзія Кацар і яе дзве сястры Тамара і Аляксандра, з вёскі Замошша — Павел Гаралёў і яго сёстры Софія і Галіна, з вёскі Ульянавічы — актыўная ўдзельніца падпольнай арганізацыі Ніна Паўлоўская і яе два браты Міхаіл і Віктар, жыхар мястэчка Чарэя Нічыпар Рыдлеўскі і яго дочкі Вольга і Зінаіда.

У сувязі з вялікім папаўненнем брыгады ў нас узнікла яшчэ адна праблема: не хапала камандзіраў, асабліва малодшага саставу. Памеркавалі і вырашылі адкрыць школу па іх падрыхтоўцы. Яе начальнікам стаў лейтэнант Сяргей Камягін, які меў ужо немалы вопыт партызанскай вайны.

У сваёй барацьбе з партызанамі немцы не абмяжоўваліся толькі карнымі экспедыцыямі. Відаць, няўдачы вымусілі фашыстаў пайсці на акцыі, якія ставілі сваёй мэтай скампраметаваць партызан, падарваць іх аўтарытэт сярод насельніцтва. Яны пачалі ствараць спецыяльныя групы са злачынцаў, якія выдавалі сябе за партызан і сталі паяўляцца час ад часу ў некаторых вёсках, учыняць рабункі, расправы над насельніцтвам.

Увялі немцы ў практыку засылку сваіх агентаў да нас. Ад іх патрабавалі інфармацыі аб дыслакацыі партызанскіх атрадаў, іх камандзірах, наяўнасці ўзбраення, пры зручных выпадках учыняць забойствы камандзіраў.



Н. Рыдлеўскі і яго дочкі Вольга і Зінаіда.

Начальнік штаба брыгады В. Сыценка стаў адным з тых, на жыццё каго быў зроблены замах. Цяжка паранёнага, яго адправілі самалётам на лячэнне за лінію фронту. Усё гэта прымусіла падумаць аб тым, каб узмацніць і актывізаваць нашу разведвальную дзейнасць. Намеснікам па разведцы стаў Павел Сырцоў. Яго намаганнямі было зроблена нямала па наладжванню як агентурнай, так і вайсковай разведкі. Мы мелі сваіх людзей у нямецкіх установах, ва ўсіх гарнізонах. Ад іх атрымлівалі інфармацыю, якая мела выключнае значэнне, у тым ліку і аб агентах, якіх немцы збіраліся засылаць да нас. Удалося схіліць працаваць на нас бургамістра Сенненскай раённай управы В. Бароўскага.

Мы загадзя даведваліся аб многіх карных экспедыцыях, якія планаваліся немцамі, у тым ліку аб іх спробе ў лютым 1944 г. захапіць наш аэрадром каля Новай Беліцы. У выніку падрыхтаваліся, сумесна з камандаваннем Заслонаўскай і Багушэўскай партызанскіх брыгад сплавалі маючую адбыцца сустрэчу з карнікамі такім чынам, каб заманіць іх у мяшок. Так і атрымалася. Вораг быў разгромлены. Страціў 31 салдата забітымі, 47 было ранена, 7 салдат мы ўзялі ў палон.

Тэрыторыя Сенненскага раёна была ў той час месцам базіравання ці часовага прыпынку 7 партызанскіх брыгад. Каардынацыю іх баявых дзеянняў на Беларусі штаб партызанскага руху ў студзені 1944 г. усклаў на мяне. Маім намеснікам быў прызначаны камбрыг 2-й Заслонаўскай брыгады Васіль Паўлавіч Комлеў.

Ранняй вясной 1944 г. пачалася карная экспедыцыя супраць партызан Ушацкай зоны, якімі камандаваў Уладзімір Елісеевіч Лабанок. Камандаванне армейскай групоўкі «Цэнтр» накіравала сюды вялікія сілы: 12 палкоў СС і паліцыі, часці 10-і пяхотных і ахоўных дывізій.

Ішлі жорсткія, кровапралітныя баі. У сярэдзіне красавіка мне было загадана тэрмінова прыбыць у Беларускі штаб партызанскага руху. Намеснік начальніка штаба І. І. Рыжыкаў і першы сакратар Віцебскага абкома партыі І. А. Стулаў паставілі задачу дапамагчы партызанам Ушацкай зоны. Згодна плана, распрацаванага ў штабе аперацыі, нашай брыгадзе прадугледжвалася нанесці ўдары па тылах немцаў. На выручку У. Е. Лабанку я накіраваў 1000 байцоў сваёй брыгады, 15 падрыўных груп на чале з Уладзімірам Ванцеевым. У ходзе баёў яны разграмілі гарнізоны ў вёсках Залессе і Матырына, дзе знаходзіліся значныя сілы немцаў. Было захоплена 30 аўтамашын з ваеннай маёмасцю. У Беларускім штабе партызанскага руху станоўча ацанілі дзеянні нашай і іншых брыгад Сенненскай зоны.

Нямецкае камандаванне распрацавала шырокамаштабны план баявых дзеянняў, якім прадугледжвалася ачысціць усю тэрыторыю Беларусі ад партызан. У маі баявыя аперацыі немцаў пачаліся ў Сенненскім і Чашніцкім раёнах. Супраць нашай, Багушэўскай, 1-й і 2-й Заслонаўскіх брыгад немцы накіравалі часці 4-й нямецкай арміі, 286-й ахоўнай дывізіі.

Іх наступленне падтрымлівала авіяцыя. У налётах штодзённа ўдзельнічала па 30 і больш самалётаў. Мы не маглі рызыкаваць, прынялі рашэнне адысці ў Дамжарыцкія балоты, куды

танкі і бронетранспарцёры не маглі падступіцца. Больш двух месяцаў вялі мы тут бaі. Сілы немцаў, якія знаходзіліся тут, не маглі супрацьстаяць Чырвонай Арміі, калі яна пачала наступленне за вызваленне Беларусі. 20 чэрвеня мы змаглі разграміць у некалькіх месцах зробленыя немцамі ўмацаванні вакол балот і вырвацца з акружэння.

Сустрэча з часцямі Чырвонай Арміі адбылася ў раёне Чарэя – Новыя Лаўкі. Многія партызаны сталі праваднікамі вайсковых падраздзяленняў Чырвонай Арміі, якія імкнуліся перарэзаць шляхі адступлення ворагу.

Няцяжка ўявіць, які ўзнёслы настрой быў у нас. І не толькі таму, што надышоў доўгачаканы час вызвалення. Вынікі баявой дзейнасці сведчылі, што мы таксама нямала зрабілі, каб наблізіць гэты дзень. Партызанамі брыгады было забіта 8328, ранена 5425, узята ў палон 2399 нямецкіх салдат і афіцэраў, паліцэйскіх. Нашымі падрыўнікамі спушчана пад адхон 85 эшалонаў, знішчаны 281 вагон з жывой сілай, 248 з тэхнікай, 114 з боепрыпасамі, 31 цыстэрна з бензінам. Акрыленыя, мы вярталіся на Сенненшчыну, дзе пачынаўся баявы шлях брыгады, гатовыя зрабіць справаздачу перад жыхарамі раёна, перад тымі, хто за нас непакоіўся, карміў, падтрымліваў усе гады барацьбы з нямецкай навалай, нярэдка рызыкуючы сваім жыццём.

Але вайна для нас яшчэ не закончылася. На тэрыторыі Сенненшчыны ў лясных масівах засталося каля 10 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў. Спатрэбілася каля месяца, каб ачысціць лясы ад блукаючых нямецкіх груп. Намі было ўзята ў палон 2000 салдат і афіцэраў і каля 1000 знішчана.

Многія партызаны апранулі салдацкія шынялі і пайшлі дабіваць ворага на тэрыторыі Польшчы і Германіі. Не ўсім маім паплечнікам, баявым сябрам пашчасціла дажыць да светлага дня Перамогі. Адны загінулі ў баях з акупантамі на роднай Сенненшчыне, другія на фронце, у чужых краях. Сярод іх мой намеснік К. Хаіркізаў, камандзіры атрадаў І. Радчонак, Ю. Каракетаў, М. Кашчэеў, А. Мілееў, камісары атрадаў А. Якушаў, С. Пляскач, П. Карунец, начальнікі штабоў В. Кляцкоў, У. Дземянцееў. У ліку загінуўшых было нямала ветэранаў брыгады: Сямён Цапцура, Рыгор Пракаповіч, казах Джура, Уладзімір Бяляеў. Аднаму з іх, Віталю Блажко, які трапіў у палон цяжка параненым, давялося прыняць пакутніцкую смерць. Яму абяцалі даравацъ жыццё, калі дасць патрэбную інфармацыю аб брыгадзе, назаве падпольшчыкаў, сувязных. Яго жорстка і бязлітасна білі, палілі на вогнішчы. «Партызанаў не купіш, яны не з племя прадажных здраднікаў, яны верныя сыны сваёй радзімы», — заявіў Віталь Блажко сваім катам.

Журботны спіс загінуўшых даволі вялікі. Іх намаганнямі, геройскімі ўчынкамі множылася баявая слава брыгады, яе перамогі ў баях з захопнікамі.

Памяць аб іх будзе вечна жыць у сэрцах нашчадкаў, напамінаць аб святым абавязку любіць і бараніць свой родны край, сваю Бацькаўшчыну.

*Успаміны запісаў А. І. Стук.*

## Апошні бой

**З успамінаў Валянціна Емяльянавіча Бяляева, былога камісара 2-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава**

302-і полк, у якім я служыў, уваходзіў у састаў 20-й арміі, якая ў 1941 г. вяла баі на галоўным напрамку Заходняга фронту. Пад Вязьмай наш полк трапіў у акружэнне. Вырвацца пашчасціла нямногім.

У снежаньскі сцюдзёны дзень я дабраўся да родных мясцін на Сенненшчыне. Трэба было як-небудзь перажыць зіму, якая выдалася вельмі суровай, дачакацца вясны. Як высветлілася, вясны чакалі многія, усе, хто вырашыў заняць сваё месца ў радах партызан. Клопат ва ўсіх быў адзін — запасацца зброяй, боепрыпасамі.



В. Е. Бяляеў.

У вёсках Свабоднае і Савінічы, дзе жыла мая радня, дзейнічалі падпольныя групы.

З Анатолем Стукам з Савінічаў устанавіў сувязь Людвіг Сяліцкі, адзін з арганізатараў падполля на Сенненшчыне. Па дамоўленасці з Заслонавым у красавіку ён правёў нас, 12 чалавек, у яго атрад, які ў той час знаходзіўся ў Лепельскім раёне.

Крыху пазней у раёне вёсак Купавадь і Каменка сустрэліся з групамі Рыгора Харламава і Уладзіміра Лебедзева. На аснове іх і нашай групы быў у маі 1942 г. утвораны атрад імя М. І. Кутузава, камісарам якога стаў Людвіг Сяліцкі.

Першае баявое хрышчэнне ён атрымаў пры разгроме паліцэйскага гарнізона ў Алексінічах. Кіраваў гэтай аперацыяй Людвіг Сяліцкі.

З надыходам вясны шэрагі партызан выраслі. У першай палове чэрвеня ў атрадах ужо налічвалася 800 байцоў. 15 ліпеня 1942 г. было аб'яўлена аб утварэнні партызанскай брыгады, якую Беларускі штаб партызанскага руху і Віцебскі абком партыі даручылі ўзначаліць яе арганізатару Канстанціну Заслонаву, камісарам быў прызначаны Людвіг Сяліцкі.

Да ліку атрадаў неўзабаве прыбавіўся яшчэ адзін — імя Лазо. Яго камандзірам спачатку стаў Сяргей Стасішын, які ў верасні 1942 г. трагічна загінуў. Узначаліць атрад камандаванне брыгады даручыла мне. Напачатку ў атрадзе было 25 чалавек, а к канцу 1942 года ўжо налічвалася 95. Папаўненне ў асноўным ішло з вёсак Сенненскага раёна, прычым партызанамі станавіліся людзі рознага ўзросту.

Абстаноўка ў зоне дзеянняў брыгады восенню складалася не вельмі спрыяльнай. Набліжалася зіма. Да яе мы не былі гатовы. Тыя базы, якія меліся, не маглі задаволіць. Трэба было паклапаціцца аб адзенні, прадуктах харчавання.

Некаторым атрадам было загадана перабазіравацца ў Талачынскі раён і заняцца абсталяваннем запасной базы.

У кастрычніку 1942 г. Канстанцін Заслонаў выклікаў да сябе ўсіх камандзіраў атрадаў, каб высветліць, як ідзе падрыхтоўка да зімы, абмяняцца думкамі.

Штаб брыгады знаходзіўся ў вёсцы Купавадь. Туды я прыбыў 13 лістапада. Для ўсіх нас было вялікай нечаканасцю, што немцы сканцэнтравалі вялікую сілу ў наваколлі вёсак Кузьміно, Серкуці, Утрылава. 14 кастрычніка немцы, якія занялі пазіцыі на вышыні, на ўскрайку лесу, адкрылі агонь з кулямёта па вёсцы. Напэўна, лепш было пакінуць яе, паколькі асноўныя сілы брыгады знаходзіліся далёка ад Купавадці і разлічваць на іх дапамогу не даводзілася. Тым не менш Заслонаў вырашыў прыняць бой.

Людвігу Сяліцкаму з групай байцоў ён даручыў заняць ускраек лесу каля вёскі Кузьміно, перагарадзіць шлях немцам і ўласаўцам, калі тыя рушаць у напрамку Купавадці. Другой групе камбрыг даручыў не дапусціць прарыву ў Купавадь немцаў і ўласаўцаў з боку вёскі Утрылава. На жаль, гэта група не змагла зрабіць тое, што зрабіла група Сяліцкага.

Менавіта адсюль, з Утрылава, немцы і ўласаўцы, прыкладна каля батальёна, не сустрэўшы належнага адпору, першымі дасягнулі ўскраіны вёскі, узялі пад свой кантроль усе гаспадарчыя пабудовы і адкрылі агонь па хатах. Усе партызаны, што знаходзіліся ў Купавадці, занялі баявыя пазіцыі, жыхары вёскі нахаваліся ў лесе.

Па загаду камбрыга я з кулямётным разлікам абараняў подступы на ўскрайку вёскі. Пад вечар да нас завітаў ад'ютант Заслонава Яўген Коржань. Ён заўважыў каля бліжэйшай пуні некалькі карнікаў, спрабаваў знайсці зручнае месца, каб узяць іх на прыцэл і тут быў паранены. Пра гэта стала вядома Заслонаву. Ён палічыў сваім абавязкам высветліць, як адчувае сябе яго ад'ютант, вырашыць, якую трэба аказаць дапамогу.

Адсюль камбрыг узяў кірунак на другі канец вёскі, перабягаючы ад аднаго дома да другога. У час гэтых перабежак ён быў смяротна паранены.

Фашысты абяцалі выдаць 5000 марак, выдзеліць надзел зямлі таму, хто даставіць жывога ці мёртвага Заслонава. Ніхто з жыхароў не пакваліўся на гэту прыманку. Карнікі так і не дазналіся, што сярод васьмі загінуўшых быў і Канстанцін Заслонаў. Усе яны наступным днём былі пахаваны на ўскраіне вёскі ў адной брацкай магіле. Брыгаду ўзначаліў Людвіг Сяліцкі.

На зыходзе лета 1943 г. у Заслонаўскай брыгадзе ўжо налічвалася 12 атрадаў, якія базіраваліся ў розных месцах. Гэта ўскладняла кіраўніцтва імі. Беларускі штаб партызанскага руху прыняў рашэнне правесці рэарганізацыю некаторых брыгад, у тым ліку і Заслонаўскай.

У верасні 1943 г. была ўтворана 2-я брыгада імя К. С. Заслонава. Яе камандзірам стаў Віталь Комлеў, адзін са старэйшых заслонаўцаў, які меў багаты вопыт партызанскай барацьбы. Камісарам брыгады прызначылі мяне.

Адна з першых баявых аперацый маладой брыгады — удзел у рэйкавай вайне пад кодавай назвай «Канцэрт».



Помнік на месцы гібелі Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонова ў в. Купаваць.

У другой палове кастрычніка пад агульным камандаваннем генерал-маёра Дуброўскага партызаны пачалі штурм Лепеля, наступленне на Чашнікі і Бачэйкава. Наша брыгада разам з брыгадай Аляксея Данукалава нанесла ўдар па Бачэйкаву.

У снежні 1943 г. наша брыгада разам з многімі іншымі прыйшла на дапамогу партызанам Ушацкай зоны. Там мы знаходзіліся, пакуль яны не выйшлі з акружэння.

У маі 1944 г. 3-я танкавая армія Рэйнгарда распачала наступленне супраць партызан Сенненска-Аршанскай зоны. Ёй удалося блакіраваць нашу і некалькі іншых партызанскіх брыгад у раёне возера Палік. Але ў чэрвені брыгада вырвалася з акружэння. Сустрэча з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі адбылася 27 чэрвеня ў Лукомлі.

Наша брыгада накіравалася ў Сенненскі раён, узяла пад свой кантроль дарогі і лясныя масівы, дзе патаемнымі сцежкамі прабіраліся на захад нямецкія салдаты і афіцэры разгромленых нямецкіх часцей. У час баёў з імі было знішчала 370 салдат і афіцэраў, 380 узята ў палон, у тым ліку камандзір 404-га пяхотнага палка 246-й дывізіі палкоўнік Гапнер.

Тут, на Сенненшчыне, брыгада была расфарміравана. Большасць яе байцоў папоўнілі рады Чырвонай Арміі.

*Успаміны запісаў А. І. Стук.*

## Лёнька-карачаевец

**ХАІРКІЗАЎ Кічы-Батыр Алімурзуевіч,** 1915 г. нараджэння, член ВКП(б), карачаевец, намеснік камандзіра партызанскай брыгады Лявонава, загінуў у баі каля вёскі Латыгаль Сенненскага раёна ў чэрвені 1943 года. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

На фасадзе будынка, занятага толькі што створанай акупацыйнымі ўладамі валаснай управы, наклеена аб'ява: «Камандаванне германскай арміі даводзіць да ведама насельніцтва. Хто зловіць і даставіць уладам партызана «Чорнага», атрымае ва ўзнагароду 5000 марак, хутар і карову.

За пасобніцтва партызанам — расстрэл!»

Лістападаўскім ранкам 1941 года каля ўправы прыпыніўся малады смуглатвары мужчына, апрануты ў пацёртую сінюю ватоўку і такога ж колеру штаны, запраўленыя ў ялавыя боты. Кепка-васьміклінка дапаўняла гарнітур мужчыны.

— Аб'явай цікавішся? Хутар, відаць, многім мець хочацца. Вось бы мне злавіць гэтага «Чорнага»! — з асалодай пазяхаў на ганку ўправы заспаны дзяцюк з мясцовай «самааховы».

— Ды я вось да пана бургамістра,— змерыў дзецюка халодным позіркам смуглатвары. — Магчыма, і для мяне ў вас справа знойдзецца?

— З акружэнцаў, значыць,— заўважыў паліцай, пачуўшы мову з характэрным акцэнтам горца.— Справа, вядома, у нас для цябе знойдзецца. Пан бургамістар хутка будзе, пачакай.

Смуглатвары адышоў у бок вёскі. Хутка ён збочыў з вуліцы і падаўся агародамі да парослай густым алешнікам лагчыны.

Апоўначы вёску Пуські, на водшыбе якой стаяў будынак валасной управы акупантаў, абудзіла страляніна з кулямётаў. Свінцовы лівень абрушыўся на фашысцкую ўстанову, з якой выбягалі і кідаліся ва ўсе бакі напаўраспранутыя гітлераўцы і паліцаі. Трапныя стрэлы многіх укладвалі тут жа, каля ганка.

Калі ж у вокнах сялянскіх хацін замітусіліся водблескі ахапіўшага будынак управы полымя, двое з ручнымі кулямётамі на плячах таропка крочылі ад вёскі вузкай палявой дарогай. Адзін з кулямётчыкаў, малады смуглаваты мужчына, быў апрануты ў пацёртую сінюю ватоўку і такога ж колеру штаны, запраўленыя ў ялавыя боты.

Разгром валасной управы ў Пуськах быў не першым баявым эпізодам у партызанскай біяграфіі Кічы-Батыра Хаіркізава. Ад самай заходняй граніцы, дзе трапіў у варожае акружэнне артылерыйскі полк, у якім служыў чырвонаармеец Хаіркізаў, прабіраўся ён на ўсход са сваім земляком Каракетавым.

З засад на дарогах Хаіркізаў і Каракетаў знішчалі невялікія групы варожых салдат і афіцэраў, закідвалі гранатамі адстаўшыя ад калоны машыны. У верасні 1941 года яны напалі на канвой фашыстаў і, перабіўшы яго, вызвалілі з палону 75 чырвонаармейцаў.

Вясной 1942 года Кічы-Батыр Хаіркізаў стаў байцом атрада, а потым і партызанскай брыгады Лявонава. Хутка яго прызначылі намеснікам камандзіра брыгады, і пад яго асабістым кіраўніцтвам ажыццёўлены шэраг смелых па задуме і дзёрзкіх па выкананні баявых аперацый супраць фашысцкіх акупантаў.

Актыўнымі баявымі дзеяннямі сустрэлі партызаны другое лета вайны. «Германскае камандаванне абяцае 10000 марак за галаву партызана «Чорнага», — стракацелі аб'явы на валасных управах. А яны гарэлі, гэтыя ўправы, адна за другой. За свой родны аул Джыбуту біўся з ворагам на паланёнай зямлі Беларусі і мужны карачаевец Кічы-Батыр Хаіркізаў.

Напярэдадні 25-й гадавіны Вялікага Кастрычніка партызанскія камандзіры раіліся ў штабе брыгады, як лепей адзначыць знамянальную дату. Хаіркізаў узяў на сябе знішчэнне Падворыцкага гарнізона.

У ноч з 6 на 7 лістапада 1942 года група партызан на чале з Кічы-Батырам Хаіркізавым увайшла ў вёску Падворыца. Без адзінага стрэлу былі зняты варожыя вартавыя, і ў вокны дамоў, дзе спалі фашысты, паляцелі гранаты. Менш чым за гадзіну яшчэ адзін гарнізон гітлераўцаў перастаў існаваць.

З вясны 1943 года партызанскі аэрадром паблізу Беліцы рэгулярна прымаў самалёты з-за фронту. Фашысты некалькі разоў спрабавалі прарвацца да аэрадрома. Разведчыкі ўстанавілі, што ў адзін з чэрвеньскіх дзён чакаецца чарговая вылазка фашыстаў на аэрадром. На дарозе Сянно — Беліца партызаны наладзілі засаду. Камандаваў імі Кічы-Батыр Хаіркізаў.

Хаіркізаў трапнай чаргой кулямёта падпаліў галаўны грузавік з фашыстамі. Астатнія машыны спрабавалі павярнуць назад, аднак і ў тыл калоне ўдарылі кулямёты народных мсціўцаў.

Апошнім быў гэты бой паблізу беларускай вёскі Латыгаль для Лёнькі-карачаеўца, як па-сяброўску называлі Хаіркізава байцы брыгады. Варожая куля абарвала яго жыццё.

*М. Марціновіч, А. Гаравы.*

## Свая зямля давала сілу

### Штрыхі да партрэта Аляксандра Дзмітрыевіча Клячына і яго партызанскага атрада



А. Дз. Клячын.

«Аляксандр Дзмітрыевіч Клячын у партызанах з 1941 года. Атрад, які ён узначальваў, удзельнічаў у разгроме 13 нямецкіх гарнізонаў. Пры абароне ў лютым 1944 года саўгаса «Беліца», які прыкрываў подступы да партызанскага аэрадрома, атраду было загадана зайсці ў тыл немцаў. Яго нечаканае нападзенне ўнесла разлад у баявыя парадкі карнікаў і забяспечыла паспяховую абарону Беліцы».

(З характарыстыкі камандавання брыгады, якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь.)

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны 24-я стралковая дывізія, у якой Аляксандр Дзмітрыевіч Клячын быў палітруком роты, вяла жорсткія баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў раёне Гродна—Ліда. Сілы былі няроўныя. Дывізія, несучы вялікія страты, вымушана была адыходзіць да Мінска, а затым трапіла ў акружэнне. З яго выбіраліся хто як мог. Спробы прарвацца за лінію фронту, да сваіх, так і не ўдаліся.

Знойдзеная выпадкова газета, скінутая нашымі самалётамі, з заклікам ствараць партызанскія атрады ў тыле ворага, падказала, што рабіць.

Месцам свайго прыстанку нядаўні палітрук выбраў лясны масіў «Казённік», што на мяжы Сенненскага і Талачынскага раёнаў. А хутка адбылася сустрэча з тутэйшай моладдзю. Аб сваім жаданні пайсці ў партызаны заявілі Мікалай, Аляксандр і Міхаіл Спаткаі, Мікалай Ухваронак, Аляксандр Апенкін, Валодзя Хірэвіч. Яны паведамілі, колькі ў іх зброі, гранат, патронаў...

Сувязны, якога ён чакаў, быў з вёскі Высокі Гарадзец, дзе знаходзілася нямецкая валасная ўправа. Ён прынёс вестку, якая не магла не выклікаць глыбокае абурэнне. Нямецкі паслугач, бургамістр гэтай управы з дапамогай паліцыі адабраў у мясцовых жыхароў цёплае адзенне і прадукты харчавання для нямецкай арміі, каб потым адправіць у Талачын.

Было вырашана ўсё нарабаванае вярнуць насельніцтву. Стварылі групу з моладзі навакольных вёсак. Ноччу патрыёты непрыкметна акружылі ўправу ў вёсцы Высокі Гарадзец. Знялі вартавых. Знішчылі абсталяванне малаказавода, забралі ўсю дакументацыю, прадукты харчавання. Нарабаванае акупантамі адзенне вярнулі людзям.

Раніцой талачынская камендатура накіравала ў Высокі Гарадзец карны атрад. Яго начальства ўчыніла допыт бургамістра і паліцаяў, што ахоўвалі ноччу малаказавод і ўправу. Тыя са страху паведамілі карнікам, што партызан было шмат, усе ўзброены кулямётамі і аўтаматамі і апрануты ў скураныя курткі. Вывад, да якога прыйшоў кіраўнік карнага атрада, такі — гэта дэсантнікі, і ён папярэдзіў сваіх служак, каб аб усім бачаным тыя нічога не расказвалі.

У хуткім часе пачалася падрыхтоўка да новай баявой аперацыі — разгрома валаснай управы ў Рыдамлі. Тут перакладчыкам працаваў свой чалавек — М. Дворнікаў. Ад яго партызаны даведаліся, дзе выстаўляюцца пасты, а ў той дзень, калі збіраліся выступаць, ён перадаў пароль.

Усё гэта дазволіла ноччу без перашкод падысці да хаты бургамістра і знішчыць вартавых. Было вядома, што нямецкі паслугач меў кулямёт, аўтамат і пісталет. Міхаіл Татарчук і яго хлопцы вырашылі не рызыкаваць. Яны пастукалі ў дзверы. Калі ж той падышоў і спытаў: «Хто там?», адкрылі агонь, а потым узламалі дзверы. Бургамістр быў ужо мёртвы. Партызаны забралі зброю, дакументы валаснай управы.

З такіх вось, пакуль што невялікіх, баявых аперацый пачыналася дзейнасць атрада, арганізатарам якога стаў Аляксандр Дзмітрыевіч Клячын. Але яны выклікалі вялікі рэзананс у наваколлі, акрылялі людзей, і не менш важна тое, што прымушалі многіх задумацца: а што ты робіш для хутчэйшага вызвалення роднай Бацькаўшчыны ад чужынцаў?

Жыхары вёсак Нізкі Гарадзец, Высокі Гарадзец, Шашалаўка лічылі атрад Клячына сваім. На пачатку адсюль ішло папаўненне. Гэта былі настаўнікі, старшакласнікі-камсамольцы, былыя чырвонаармейцы. Большасць з іх прыходзіла са зброяй, знойдзенай на месцах былых баёў 1941 года.

Сетка сувязных фарміравалася з жыхароў гэтых і многіх іншых населеных пунктаў. Былі сярод іх і зусім юныя, як, напрыклад, 15-гадовыя Валянціна і Дзіна Нароўскія, Таня Мікуліч. Яны здабывалі каштоўныя звесткі аб перамяшчэнні фашыстаў, умацаваннях і ахове гарнізонаў, прыносілі зброю і медыкаменты.

Праўда, Клячын не вельмі прыхільна ставіўся да просьбы дзяўчат прыняць іх байцамі ў атрад. Лічыў, што вайна — не жаночая справа, тым больш, што рэзервы з ліку мужчын пакуль былі неабмежаваныя. Аднак не заўсёды мог адмовіцца ад настойлівых просьбаў. Тыя ж дзяўчаты, якіх прымалі ў атрад, вельмі даражылі высокім і пачэсным званнем народнага мсціўца, імкнуліся даказаць, што могуць ваяваць не горш за хлопцаў, сваіх аднагодкаў.

Неяк атрад Клячына вёў бой з карнікамі каля вёскі Зарэкі Сенненскага раёна. Кулямётчыца Вольга Мяснікова падпускала варожых салдат на блізкую адлегласць і ва ўпор расстрэльвала. У гэтым баі яна была цяжка паранена. Лячылі адважную партызанку ў лесе, ля вёскі Дубавое. Калі атрад знаходзіўся на заданні, а ў лясных зямлянках засталіся толькі параненыя, нечакана напалі карнікі і захапілі іх. Сярод партызан была і Вольга Мяснікова. Усіх карнікі страшэнна катавалі, а потым застрэлілі. Байцы атрада цяжка перажывалі гэту страту і пакляліся адпомсціць за іх смерць.

Летам 1942 года ў вёсцы Сідорнікі адбылася сустрэча Клячына з Лявонавым, імя якога ўжо было добра вядома ў раёне. Гаворка ішла аб аб'яднанні. Атрад Клячына, як і атрад Захарчанкі, стаў састаўной часткай Сенненскай партызанскай брыгады. Пачатак фарміравання яе быў пакладзены крыху раней у Прывецкім лесе. З гэтага часу атрад Клячына разам з іншымі атрадамі брыгады пачаў актыўна дзейнічаць у Сенненскім, Талачынскім, Чашніцкім і Лепельскім раёнах. Цяпер многія баявыя аперацыі планаваліся ў штабе брыгады.

Неўзабаве атрад пад камандаваннем Аляксандра Клячына разграміў валасную ўправу ў Бешанковіцкім раёне, нанёс удар па Чарэйскаму гарнізону ў Чашніцкім раёне. У час засады на шасэйнай дарозе знішчыў 12 немцаў і 7 паліцэйскіх, якія абрабавалі навакольныя вёскі і вярталіся ў гарнізон. Былі захоплены ў ворага багатыя трафеі — зброя, боепрыпасы, прадукты харчавання, коні. Задаволеныя байцы атрада вярнуліся на сваю базу ў Лаўскі лес.

Пасля небагатай вячэры многія паляглі спаць. Аляксандру Дзмітрыевічу спаць не хацелася. Заўтра ў яго дзень нараджэння — споўніцца 30 гадоў. Успомніў бацькоў, родную вёску Халевічы ў Яраслаўскай вобласці. Там закончыў школу, затым працаваў цесляром, вучыўся ў будаўнічым тэхнікуме. Пасля яго заканчэння Сашу Клячына накіравалі на будоўлю. Там і працаваў, пакуль не прызвалі ў армію.

І вось вайна закінула яго ў Беларусь. Не аднаго яго напаткаў такі лёс. У атрадзе, акрамя беларусаў, ваявалі рускія, украінцы і яўрэі, татары і узбекі, нават тры французы, якія здаліся партызанам у час адной аперацыі.

Для камандзіра атрада Клячына стала няпісаным правілам заўсёды прыходзіць на дапамогу, выручку суседзям-партызанам, калі тыя аказваліся ў цяжкім становішчы. Так склалася, што немцы блакіравалі ў некалькіх населеных пунктах партызан Талачынскай брыгады Нарчука. Клячын з атрадам адправіўся туды. Тут здорава выручыла народных мсціўцаў 45-мілімятровая гармата, якую ахрысцілі «марфутай». З яе ў гэтым баі быў падбіты першы варожы танк, што выклікала ў карнікаў разгубленасць.

Неяк разведчыкі атрада паведамілі, што карнікі з фашысцкага гарнізона Валосава прыехалі ў Высокі Гарадзец і там рабуюць жыхароў вёскі. Забіраюць вопратку, курэй, масла, сала. Па камандзе Клячына ўстанавілі гармату на выгаднай пазіцыі і, як толькі карнікі выехалі на ўскрай вёскі, ударылі па абозу. Некалькі снарадаў трапіла ў цэль. Немцы і паліцаі кінулі свае фурманкі і пачалі ўцякаць у гарнізон. Жыхары вёскі былі вельмі ўдзячны народным мсціўцам, якія правучылі ахвотнікаў рабаваць насельніцтва.

Калі ў 1943 годзе планаваўся разгром Лепельскага гарнізона, атраду імя Суворава была пастаўлена задача перакрыць дарогу, па якой з Чашнікаў да гітлераўцаў магло прыйсці падмацаванне. Партызаны ведалі, што ў немцаў ёсць танкі, бронетранспарцёры, таму выбралі найбольш зручную пазіцыю для сваёй гарматы і бранябойшчыкаў з трыма супрацьтанкавымі ружжамі. Яны добра замаскіраваліся ў хмызняку непадалёку ад дарогі. І вось у поўдзень на дарозе з'явілася калона машын, уперадзе ішлі два танкі. Партызаны затаіліся, чакалі зручнага моманту. Нарэшце раздалася каманда А. Клячына:

— Агонь!

Разам з гарматай ударылі супрацьтанкавыя ружжы. У суцэльны гул зліліся стракатанне кулямётаў, аўтаматаў. Адзін з танкаў адразу задыміў, другі паспеў адысці. Тады артылерысты перанеслі агонь на ўсю варожую калону. Ёй ужо было не да Лепеля.

Быў яшчэ і такі выпадак. Брыгада Аляксея Данукалава пасля шматдзённага цяжкага пераходу з Бешанковіцкага раёна ніяк не магла адарвацца ад праследавання пераўзыходзячых сіл карнікаў. Але на шляху з вёскі Ульянавічы ў бок Лукомля данукалаўцы атрымалі падтрымку атрада імя Суворава. Каля вёскі Оўсішча зноў загрымела партызанская гармата. Артылерысты з групай кулямётчыкаў абстралялі карнікаў. Тыя спынілі праследаванне і павярнулі назад, у бок Бешанковічаў. Камбрыг А. Данукалаў выказаў А. Клячыну вялікую ўдзячнасць за баявую выручку.

Апрача перарobленай танкавай гарматы «саракапяткі» ў атрадзе мелася яшчэ адна трафейная гармата такога ж калібру. Але скарыстоўвалася яна ў баявых дзеяннях рэдка — не хапала снарадаў.

Нельга было выкарыстоўваць у поўнай меры з-за недахопу бензіну і бранявік. Ён стаяў у лесе, пакінуты пры адыходзе нашых войск у пачатку вайны. Замок з яго гарматы і іншыя часткі Валодзя Зябкін з вёскі Відокі знайшоў паблізу загорнутымі ў тканіну і закапанымі ў зямлю. Некалькі дэталяў давялося зрабіць у майстэрні дзеда Сідаровіча. Выкарыстоўваўся бранявік толькі тады, калі ўдавалася раздабыць паліва ў варожых гарнізонах.

З вялікай адказнасцю аднесліся ў атрадзе да рашэння Беларускага штаба партызанскага

руху распачаць «рэйкавую вайну» — адначасовае масавае разбурэнне чыгуначных камунікацый, дэзарганізацыю ваенных перавозак ворага. Ва ўсіх падраздзяленнях фарміраваліся групы падрыўнікоў. Было наладжана іх абучэнне.

Загадам штаба Сенненскай партызанскай брыгады атраду вызначаўся ўчастак чыгункі Мінск — Орша ў раёне станцыі Слаўнае і раз'езда Трацылава. На гэтым участку групы падрыўнікоў павінны былі нанесці канцэнтраваны ўдар у складзе ўсёй брыгады, а потым асобнымі дыверсіямі працягваць знішчэнне варожых эшалонаў, якія ішлі на фронт. У раён баявых дзеянняў атрад дабраўся ноччу. На падыходзе да шашы Мінск — Масква разведчыкі галоўнага дазору паведамілі, што па ёй назіраецца ўзмоцнены рух варожых машын. Пераходзіць шашу рашылі групамі і сабрацца потым ва ўмоўленым месцы паблізу Трацылава.

Былі высланы групы прыкрыцця ў бок чыгуначнай станцыі. Падрыўнікі звеннямі занялі зыходны рубеж для атакі, які праходзіў за некалькі метраў ад чыгункі. Камандзір атрада А. Клячын разам з камісарам П. Любагошчанскім праверылі гатоўнасць падрыўнікоў. У невысокім бярэзніку замаскіраваліся і пільна назіралі за чыгункай баявыя звенні партызан Івана Бяляцкага і Пятра Вышынскага з в. Глебаўск. Побач з імі Мікалай Марчанка з в. Заполле, Ігнат Бабацкі з Малой Беліцы. Ва ўсіх групах напагатове былі толавыя шашкі, узрывальнікі. Чырвоная ракета з каманднага пункта брыгады — сігнал для атакі. Збіваючы аўтаматным агнём патрульных гітлераўцаў, атрад дружна выбег на чыгунку. Пад рэйкі імгненна заклалі толавыя шашкі, падпалілі бікфордавы шнур. «Адыход», — перадалі па ланцугу каманду А. Клячына. Сотні выбухаў прагучалі адначасова над магістраллю.

Неаднойчы спадарожнічала ўдача падрыўнікам атрада і пазней, калі на чыгунку выходзілі асобныя дыверсійныя групы. Умелым падрыўніком быў камсамолец Цімафей Дзёмін. Былы студэнт інжынернага інстытута, ён наладзіў выраб мін непасрэдна ў атрадзе. У чэрвені 1943 года на міне яго ўласнай вытворчасці падарваўся эшалон з артылерыйскімі снарадамі і авіяцыйнымі бомбамі. Майстэрствам выдзяляўся і партызан Мікілуніч.




Былыя партызаны Сенненскай брыгады ў школьным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



Школьнікі ўручаюць хлеб-соль былым партызанам Сенненскай брыгады.



На адкрыцці помніка на месцы былога партызанскага аэрадрома каля в. Беліца.

У снежні 1943 года ён пусціў пад адхон непадалёку ад станцыі Талачын варожы эшалон. Былі знішчаны паравоз і два вагоны з нямецкімі салдатамі і афіцэрамі.

Абстаноўка ў зоне размяшчэння Сенненскай партызанскай брыгады зімой 1943—1944 гг. была напружанай. Немцы неадпаразова спрабавалі захапіць партызанскі аэрадром у Беліцы. У ліку абаронцаў аэрадрома быў і атрад А. Клячына. У лютым 1944 года, калі фашысты пачалі наступленне на Беліцу з трох напрамкаў — з Оршы, Сянна і Багушэўска, атрад паспяхова справіўся з пастаўленай яму задачай. Ён разам з байцамі атрада Захарава нанёс, як было і задумана камандаваннем брыгады, удар з тылу. Гэта ў поўнай меры перадвызначыла разгром карнай экспедыцыі.

У пачатку 1944 года байцы атрада сталі сведкамі, як у выніку адкрытага агню з вінтовак і ручнога кулямёта быў падбіты нямецкі самалёт. Ён зрабіў вымушаную пасадку ля вёскі Асінаўка на тарфяніішчы. Байцы на конях разам са сваім камандзірам Клячыным хутка прыбылі да месца здарэння. Двое нямецкіх лётчыкаў спрабавалі ўцячы ў лес, але іх дагналі партызанскія кулі. Трэці член экіпажа здаўся ў палон і быў перапраўлены за лінію фронту. А з самалёта знялі ўзбраенне, некаторыя прыборы і ўсё іншае, што магло спатрэбіцца. З бакаў злілі паліва, а самалёт падпалілі.

Вось тут А. Клячын і ўспомніў пра бранявік, які быў схаваны не так далёка ў лесе. Праўда, ненадоўга хапіла таго паліва, але эфект быў вялікі. З дапамогай браневіка партызаны атрада не раз адбіваліся ад нямецкіх захопнікаў, якія наладжвалі супраць народных мсціўцаў карныя аперацыі.

Вясной 1944 года, калі пачалася адна з буйнейшых карных экспедыцый, партызанская брыгада В. С. Лявонава пад моцнымі ўдарамі ворага вымушана была адысці ў балоцістыя лясы Лепельскага і Бягомльскага раёнаў. У гэтых лясах аказаліся заціснутымі некалькі партызанскіх брыгад. Фашысты з раніцы да вечара працягвалі абстрэльваць з гармат і мінамётаў зону размяшчэння партызан. Над лесам кружылі фашысцкія самалёты, бамбілі і абстрэльвалі з кулямётаў. У такіх абставінах камандаванне брыгады прыняло рашэнне тэрмінова з боем прарываць фашысцкую блакаду.

Пасля праведзенай разведкі было вырашана зрабіць прарыў блакады ў ноч з 7 на 8 чэрвеня 1944 года недалёка ад вёскі Замошша, на стыку Барысаўскага, Лепельскага і Чашніцкага раёнаў. Для штурму ўмацаванняў ворага былі выдзелены два атрады — А. Клячына і А. Захарава. Калі сцямнела, атрады пайшлі на прарыў. У небе засвяціліся сігнальныя ракеты і раздалося партызанскае «ура!». Немцы адкрылі частую страляніну. Завязаўся жорсткі бой. Агонь перагарадзіў дарогу атакуючым. Трасіруючыя кулі прачэрчвалі паветра, рваліся артылерыйскія снарады і міны, але партызаны падавілі агнявыя кропкі немцаў. Аляксандр Клячын вывеў большасць атрада і параненых у зацішнае месца за ракой Эсай, а затым у Чашніцкі раён. Толькі частка чацвёртага ўзвода і гаспадарнікаў былі адрэзаны па левым флангу ад асноўнага саставу і выходзілі затым з блакады невялікімі групамі.

Атрад размясціўся ў Лаўскім лесе, недалёка ад Лукомля. Па начах на ўсходзе грымела артылерыйская кананада, а 24 чэрвеня ў блакітным небе з'явіліся самалёты з чырвонымі зорачкамі. Якая гэта была радасць! Разведчыкі далажылі камандзіру атрада, што калоны акупантаў рухаюцца па шасэйнай дарозе Лукомль—Чарэя ў бок Халопенічаў. А ў хуткім часе на гэтай дарозе з'явіліся і першыя савецкія танкі. У Чарэі адбылася доўгачаканая сустрэча з воінамі Чырвонай Арміі. Былі моцныя абдымкі і пацалункі, мужчынскія слёзы і смачны абед з салдацкіх кацялкоў.

Праз некалькі дзён атрад перамясціўся ў Сенненскі раён. З групай байцоў Аляксандр Клячын у ліпені 1944 года прадстаўляў свой атрад на парадзе брыгад, які адбыўся ў Віцебску. Удзельнічаць у парадзе пашчасціла і аўтару гэтых радкоў. Неўзабаве партызанскі атрад быў расфарміраваны. Яго байцы папоўнілі вайсковыя часці, якія ішлі на фронт. Многія былі накіраваны на партыйную, савецкую і гаспадарчую работу ў раёне.

Аляксандр Дзмітрыевіч Клячын быў прызначаны намеснікам старшыні Сенненскага райвыканкома. Затым доўгі час працаваў у будаўнічых арганізацыях і сістэме райспажыўсаюза.

Радзіма высока ацаніла баявыя і працоўныя заслугі А. Дз. Клячына. Ён узнагароджаны ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга, Чырвонай зоркі, Айчыннай вайны I ступені, шматлікімі медалямі і граматамі. Са сваёй жонкай Марыяй Платонаўнай яны вырасцілі трох сыноў. У іх — сем унукаў.

*Дз. М. Марчанка.*

## Назвалі гармату «Марфутай»

Аднойчы раніцай Валодзя Зябкін ішоў у майстэрню. Спяшаўся расказаць дзеду Сідаровічу аб тым, што ноччу заязджаў Валодзя Хірэвіч, забраў адрамантаваны пісталет, прасіў перадаць падзяку партызан за зробленыя карабіны. Дзед сядзеў у майстэрні ля вакна ў нейкім задуменні, і Валодзя спытаў, ці не захварэў ён.

— Тут, браце, не да хваробы,— адказаў Браніслаў Іосіфавіч.— Работа ёсць вельмі важная. Бяжы, пакліч Жыгалоўскага, і будзем разам мазгаваць.

А мазгаваць і сапраўды было над чым. Камандзір атрада загадаў паставіць на саматробны лафет 45-мілімятровую гармату, знятую з падбітага танка. Спачатку меркавалі, што гармату можна паставіць на цялежку, зробленую з касілкі. Але перадумалі: не вытрымаюць спіцы. Потым Жыгалоўскі прапанаваў выкарыстаць колы ад лакамабіля. З гэтай думкай пагадзіліся і прыступілі да работы.

З дапамогай дамкратаў прыўзнялі лакамабіль, знялі пярэднюю вось разам з коламі. У поўдзень партызаны прывезлі ствол і замок гарматы. Каб забяспечыць сакрэтнасць работы і бяспеку майстроў, камандзір атрада загадаў размясціць у Відоках гаспадарчы ўзвод і малоць на млыне зерне, а да кузні прыцягнулі, нібы для рамонту, некалькі павозак. Па дарозе на Асінаўку быў выстаўлены партызанскі пост, а з боку Гарадца за дарогай назіралі Аляксей і Пётр Міснікі. Каля кузні ўвесь час стаяла запрэжаная павозка, каб у любы момант можна было вывезці гармату, калі ўзнікне якая небяспека.

Гармату ў кузні падвесілі да бэлькі, падкацілі пад яе вось ад лакамабіля. І тут пачаліся гарачыя спрэчкі, што рабіць далей. Зваркі ж, вядома, не было. Усё мацаванне дэталяў трэба было рабіць самаробнымі вінтамі ды заклёпкамі. Горш тое, што для станін не было падыходзячага жалеза. Нарэшце вырашана было выкарыстаць вугалковае жалеза з ферм, якія падтрымлівалі дах спіртзавода. Адзінае палатно пілкі затупілася дашчэнту, і тады апошні разрэз Валодзя Зябкін зрабіў назубленай касой.

Многа давялося працаваць кавалю Аляксею Жыгалоўскаму, пакуль вырабляў краништэйны, сцяжкі, хамуцікі і загатоўкі вінтоў. Валодзя Зябкін увесь час круціў махавік такарнага станка, пакуль Сідаровіч вытачваў утулкі, свідраваў адтуліны пад вінты. Нарэшце гармата была ўстаноўлена на лафет. Аляксандр Дзмітрыевіч Кдячын пахваліў майстроў за работу, але заўважыў:

— Якая ж гармата без шчыта?

— Дык можа, камандзір, для гэтага пазычыць у немцаў зварачны апарат? — адказаў Сідаровіч.— Як жа рэзаць 6-мілімятровае жалеза?

Жарты-жартамі, але за справу трэба было брацца. Для рэзкі кацельнага жалеза выкарысталі знойдзены ў заводскай майстэрні ручны вінтавы прэс, з аўтамабільнай рэсоры Жыгалоўскі адкаваў нож, загартаваў яго. Марудна ішла работа. Цяжэй за ўсё было выразаць праём для ствала. Нарэшце гэта работа была скончана. Партызаны прывезлі перадок ад нямецкай параконнай павозкі для мацавання гарматы, зрабілі сядзенне для ездавога.

Сярод партызан знайшліся ўмелыя артылерысты. Камандзірам разліку гарматы стаў Пётр Дзмітрыевіч Рачонак.

— Чым не «Кацюша»? — жартавалі партызаны, гледзячы на сваю гармату. — Але «Кацюша» граміць ворага на фронце, а нашу назавём інакш.

— Дык няхай будзе ў нас «Марфута».

З гэтым імем і пайшла па лясных дарогах партызанская гармата.

*П. І. Ермашкевіч.*

## І лячылі, і ваявалі

### З успамінаў былога ўрача Сенненскай партызанскай брыгады, заслужанага ўрача Беларускай ССР Н. В. Клікунец

Санітарная служба Сенненскай партызанскай брыгады, якой камандаваў Васіль Сяргеевіч Лявонаў, была арганізанавана ў 1942 годзе. Яе ўзначаліў П. І. Малішэўскі. Яго першым памочнікам стала ўрач Тамара Собалева.

У 1943 годзе калектыў медыцынскіх работнікаў значна папоўніўся. Яго членамі сталі ўрач Настасся Бярговіна, фельчар Уладзімір Галавач, медсёстры Ганна Хадыка, Лізавета Старавойтава, Аляксандра Бярговіна. У кожным атрадзе таксама ўжо меліся медсёстры, а ў некаторых — урачы альбо фельчары.

У час баявых аперацый усе ўрачы і медсёстры знаходзіліся побач з байцамі, каб ака-



Былыя партызанскія медработнікі В. Я. Сапяжынская, Н. П. Клікунец, В. П. Кучко (Гарбачова), А. П. Хадыка.

заць у патрэбную мінуту медыцынскую дапамогу, а калі ўзнікала неабходнасць, бралі ў рукі вінтоўку ці аўтамат і займалі месца на баявых пазіцыях.

Восенню 1943 года некалькі тыдняў я правяла ў лепельскіх лясах, дзе вялося будаўніцтва запасных баз. Увогуле 1943 год для нас, медыцынскіх работнікаў, быў вельмі напружаны. Сярод партызан і насельніцтва партызанскай зоны былі выяўлены выпадкі захворвання на тыф. Усе ўрачы былі замацаваны за партызанскімі атрадамі. Трэба было зрабіць прышчэпкі вакцынай, якую даставілі нам самалётам з «Вялікай зямлі».

Пачаліся карныя экспедыцыі, у час якіх актыўна выкарыстоўвалася авіяцыя. Нярэдка з раніцы да вечара віселі нямецкія самалёты над населенымі пунктамі, дзе па іх разведданых, знаходзіліся партызаны, падвяргаючы іх бамбёжцы, абстрэлу. Гэта вельмі ўскладняла работу медыцынскай службы. Прыходзілася да наступлення раніцы вывозіць параненых і хворых у лес, размяшчаць там у шалашах. Перад гэтым трэба было ўсіх накарміць, выдаць медыкаменты, выслухаць кожнага, паклапаціцца пра абед, пра тое, як яго даставіць у лес. Не заўсёды мы маглі ўсё прадбачыць, прадугледзець. Іншы раз траплялі ў складаныя, крытычныя сітуацыі.

У 1943 годзе і першыя месяцы 1944 года ў нашым інфекцыйным шпіталі лячылася 150 чалавек. Нягледзячы на цяжкія ўмовы, не было ніводнага выпадку смерці. Усіх мы змаглі выхадзіць, паставіць на ногі.

У блакадныя дні ўсе медыцынскія работнікі знаходзіліся разам з партызанамі сваёй брыгады, дзялілі з імі ўсе нягоды. У Домжарыцкіх балотах загінулі Пётр Іосіфавіч Малішэўскі і Тамара Собалева, намаганнямі якіх стваралася медыцынская служба брыгады. Мне ж пасля вызвалення раёна выпала даставіць усіх хворых і параненых у Сянно і ўладкаваць на лячэнне ў эвакашпіталь, які тут знаходзіўся.

## Партызаніла ўся сям'я

З 1 студзеня 1941 года Ларысе Малішэўскай пайшоў пятнаццаты год. Два гады ўжо іх сям'я жыла на Сенненшчыне, пераехаўшы з Чэрвеньскага раёна. Сюды, пасля заканчэння Мінскага медыцынскага інстытута, быў накіраваны ўрачом яе бацька Пётр Іосіфавіч Малішэўскі. Спачатку працаваў урачом Ульянавіцкай участковай бальніцы, потым яго перавялі ў Сянно. А сям'я пакуль што засталася ў вёсцы Ульянавічы.

На другі дзень вайны яе бацька пайшоў у ваенкамат. Адтуль — у дзеючую армію. Доўгі час ад яго не было звестак. У раёне ўжо некалькі месяцаў гаспадарылі акупанты. Нярэдка яны адпускалі палонных, калі сярод мясцовых жыхароў знаходзіліся родныя.

Неяк праз людзей даведалася Клаўдзія Паўлаўна Малішэўская, што нехта бачыў яе мужа сярод палонных у лагеры каля Полац-

ка, і адразу ж пусцілася ў далёкую і небяспечную дарогу. На шчасце, усё атрымалася найлепшым чынам, і Пётр Іосіфавіч вярнуўся ў родную сям'ю ў канцы 1941 года.

Некалькі часу Пётр Іосіфавіч жыў у вёсцы, чым мог, дапамагаў людзям. А па начах часта наведваліся партызаны. Пётр Іосіфавіч забіраў сваю сумку з інструментамі і лекамі і ішоў з імі ў лес. Аднойчы ў час адной з такіх адлучак у хату Малішэўскіх уварваліся немцы і паліцаі. Доўга дапытваліся, дзе гаспадар.

— Пайшоў у суседнюю вёску. Паклікалі да хворага,— адказвала Клаўдзія Паўлаўна. Дзеці таксама ў знак згоды ківалі галовамі.

— А да каго? — гучыць зноў пытанне. Жанчына без запінкі называе імя, прозвішча таго чалавека, з якім ужо загадзя было дамоўлена, што і як гаварыць у такім выпадку.

Паверылі, а пасля праверылі. Але ўсё ж падазрэнне ўзмацнілася.

А партызанам патрэбны былі бінты, медыкаменты. Запасы іх у Пятра Іосіфавіча скончыліся. Становішча паправілася, калі стаў працаваць у Сенненскай бальніцы. Сувязі з партызанамі былі наладжаны, і праз дачку Ларысу ён перадаваў у лес усё, што трэба.

Але і немцы сталі пільней прыглядацца і кантраляваць дзейнасць мясцовых медыкаў. Тады Пётр Іосіфавіч зразумеў, што рана ці позна яму, ды і ўсёй сям'і , не пазбегнуць арышту. Надта многа расходваў медыкаментаў, многа маладых людзей бракаваў па стану здароўя, каб не адпраўлялі іх у Германію. Нешта занадта даймала юнакоў і дзяўчат «трахома». Гэтыя «хворыя», параіўшыся з урачом, націралі вочы дробнай соллю і атрымлівалася падабенства хваробы.

І вось аднойчы, у жніўні 1943 года, Пётр Іосіфавіч папрасіў дазволу паехаць у вёску за прадуктамі. Разам з сынам Яўгенам запрог каня, у павозку паклалі мяшкі з зернем, у якіх былі прыхаваны медыкаменты і выехалі ў напрамку Ульянавіч. Жонцы і дачцэ Малішэўскі сказаў, каб прабіраліся ў гэты дзень да партызан па другой дарозе. У вёсцы Камінчшчына сустрэліся з лявонаўцамі.

Пётр Іосіфавіч Малішэўскі стаў начальнікам медыцынскай службы брыгады, жонка — фельчарам, сын — ардынарцам у бацькі, дачка — друкаром партызанскай друкарні.

Асабліва многа параненых было пасля баёў за Лепель. Цяжка параненых партызан пры першай магчымасці адпраўлялі самалётам за лінію фронту. Але ў цяжкія дні варожай блакады каля возера Палік многа партызан загінула. Параненага ў нагу куляй з буйнакалібернага кулямёта Пятра Іосіфавіча фашысты забілі выстралам ва ўпор.

А дзеці Малішэўскага выйшлі разам з групай партызан з акружэння і сустрэліся з наступаўшай Чырвонай Арміяй. Потым ужо даведаліся аб гібелі бацькі. Маці, моцна параненую, падабралі нашы салдаты, адправілі ў шпіталь, адкуль яна пасля лячэння вярнулася дадому.

*П. І. Ермашкевіч.*

## Баявая вахта разведчыкаў-лявонаўцаў

### З успамінаў Мацвея Папкова, былога намесніка камандзіра па разведцы атрада імя Аляксандра Неўскага

За два месяцы да акупацыі я перанёс цяжкую аперацыю. Застаўся без левага лёгкага. За гэты час ніяк не мог акрыяць. З Сянна, дзе я працаваў ветурачом, перасяліўся ў в. Смалоўка, да свайго бацькі.

6 ліпеня 1941 года каля вёскі Федэратыўная разгарэўся бой з наступаючымі нямецкімі войскамі. Гадзіны праз чатыры ў Смалоўку прыпоўз ранены танкіст Павел Комлеў. Я аказаў яму дапамогу.

У красавіку 1942 года ў нашых мясцінах пачаў дзейнічаць невялікі партызанскі атрад Васіля Захарчанкі, які неўзабаве аб'яднаўся з атрадам Лявонава.

У Сянне ў мяне было многа знаёмых і сяброў, якія жадалі ўключыцца ў барацьбу з акупантамі. Ад іх нярэдка паступала важная інфармацыя аб акцыях, якія планаваліся немцамі. У снежні 1942 года стала вядома, што вораг збіраецца накіраваць карны атрад у Прывецкі лес, дзе знаходзіўся атрад Лявонава. Пра гэта я праінфармаваў атрадную разведку.

У маі 1943 года, калі я прыйшоў у брыгаду, камбрыг Лявонаў прызначыў мяне намеснікам камандзіра па разведцы атрада імя Аляксандра Неўскага, якім камандаваў Іван Пашчанка.

Адна з важных задач, пастаўленых перада мною — падбор надзейных людзей у раённай управе, паліцыі, іншых органах нямецкай адміністрацыі. Камбрыг паведаміў, што з нашай

партызанскай разведкай дамагаецца сувязі шафёр начальніка паліцыі, Якаў Кондзікаў. Трэба высветліць, як лепш можна яго выкарыстаць. Сустрэчу з ім мне наладзіла наша сувязная Варвара Котава.

Кондзікаў заявіў, што ён гатовы выконваць любыя заданні, не можа больш заставацца ў баку ад барацьбы з акупантамі, нягаварыць сваё імя. Сваю гатоўнасць ён неўзабаве пацвердзіў справамі. Ён здабываў інфармацыю аб карных экспедыцыях, і аб нарыхтоўцы харчавання, адпраўцы нашых людзей на работу ў Германію. Да Кондзікава даводзілася звяртацца за дапамогай па розных пытаннях.

Камандаванне Смаленскага палка вырашыла разграміць нямецкі гарнізон у в. Гарывец. Наша брыгада павінна была прыкрываць баявыя дзеянні гэтага палка. Камандзір палка Садчыкаў меў намер выкарыстаць захоплены партызанамі танк. Не было толькі паліва.

— Гэта ўжо клопат нашых разведчыкаў, — запэўніў камбрыг Лявонаў.

Кондзікаў з вялікай адказнасцю аднёсся да гэтага задання. Хутка сувязныя паведамілі, што за палівам можна ехаць. Пад склад немцы выкарыстоўвалі сутарэнні разбуранай царквы. З бочкамі двое партызан на фурманцы пад'ехалі да месца па лагчыне. Я верхам на кані трымаўся наперадзе фурманкі. Тут жа, у лагчыне, сустрэўся з Кондзікавым, які сказаў, што ў яго ўсё падрыхтавана. Неўзабаве з цемры паявіліся дзве дзяўчыны з каністрамі ў руках. Як я даведаўся потым, адна з іх Вікторыя Бізюк, другая — яе сяброўка Валянціна Ракава. Яны таропка вылівалі ў бочкі паліва і зноў спяшаліся да склада. А ў будцы каля склада ў гэты час Кондзікаў забаўляў вартавога чарговым анекдотам. Аперацыя па разгрому гарнізона ў Гарыўцы прайшла паспяхова.

Групе Кондзікава я час ад часу перадаваў міны з гадзіннікавым механізмам. Яны ўстанаўліваліся на ваенныя грузавыя машыны.

Пасля разгрому гарнізона ў вёсцы Латыгаль камбрыг загадаў размясціцца там нашаму атраду. Гэта вёска знаходзілася за 6 кіламетраў ад Сянна. Камбрыг разлічваў на высокую баяздольнасць атрада, на тое, што мы заблакіруем дарогу з Сянна да станцыі Бурбін,



Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР М. Ф. Папкоў на выбарчым участку.

недалёка ад якой знаходзіўся партызанскі аэрадром. Знаходжанне тут атрада таксама давала магчымасць падтрымаць падпольшчыкаў Сянна.

Восем месяцаў атрад нёс тут баявую вахту, вытрымліваючы шматлікія атакі немцаў. З дапамогай сувязных вялася актыўная работа ў паліцэйскім гарнізоне ў Сянне. У канцы жніўня 1943 года прыбыло з Арлоўскай вобласці падраздзяленне брыгады Камінскага. Медсястра Сапяжынская пазнаёмілася з брыгадным поварам, які ахвотна ўзяўся распаўсюджваць сярод салдат і афіцэраў лістоўкі і падпольныя газеты. Тыдні праз тры двое афіцэраў выказалі жаданне сустрэцца з прадстаўнікамі камандавання атрада. На сустрэчу пайшоў я. Яны паведамілі, што рота Праватарава гатова перайсці на бок партызан. Я папрасіў узяць з сабой як мага больш мін. Яны прывезлі іх 3 фурманкі. Камандзір роты Праватараў і 60 яго байцоў звярнуліся з адозвай да салдат і афіцэраў брыгады Камінскага паследаваць іх прыкладу, нагадаўшы ім, што яшчэ не позна загладзіць сваю віну перад Радзімай.

*Запісаў А. І. Стук.*

# Камандзір атрада

Яго атрад пакідаў родныя мясціны толькі ў тых выпадках, калі камандаванне брыгады планавала буйнамаштабныя аперацыі, якія звычайна ажыццяўляліся аб'яднанымі сіламі.

Месцам дыслакацыі атрада Аляксей Піліпёнак выбраў невялікі лясны масіў, які тутэйшыя жыхары называлі Зялёнай пушчай. З ёй у яго з часоў дзяцінства звязана нямала незабыўных дарагіх успамінаў. Ён і яго сябры — вясковыя хлапчукі — амаль усё лета праводзілі тут. Хадзілі па ягады, грыбы, а надыходзіла восень — па арэхі. Вабіла яго сюды і ў юнацкія гады, калі прыязджаў у водпуск з Ленінграда, дзе працаваў.

Тут, у Зялёнай пушчы, Аляксей Піліпёнак знайшоў надзейны прытулак у першую суровую ваенную зіму. Шлях сюды ляжаў здалёку, з-пад Дзвінска (Даўгаўпілса), дзе ўдалося вырвацца з фашысцкага палону: батальён, у якім ён служыў, трапіў у акружэнне.

Дабіраўся да сваіх родных мясцін, на Віцебшчыну. У яго там нямала сяброў, знаёмых, на якіх можна разлічваць, спадзявацца. Быў упэўнены, што не будзе недахопу ў людзях, гатовых узяць у рукі зброю, змагацца з чужынцамі, за вызваленне роднай Бацькаўшчыны.

У сваіх меркаваннях Аляксей не памыліўся. Гэта стала відавочна, калі адбыліся першыя сустрэчы. Ён пасяліўся ў Зялёнай пушчы, знайшоў актыўную падтрымку і разуменне ў моладзі навакольных вёсак. Яны і сталі касцяком партызанскай групы, якая з цягам часу перарасла ў атрад.

Потым адбылася сустрэча з камбрыгам Сенненскай партызанскай брыгады, які лічыў вельмі неабходнай прысутнасць у гэтых мясцінах партызанскага атрада. Тут пралягае шаша Лепель—Віцебск. З надыходам вясны па ёй узмацнілася перамяшчэнне нямецкіх войск.

У задачу атрада ўваходзіла дэзарганізаваць рух на шашы, усяляк перашкаджаць акупантам перакідваць свае войскі на дапамогу франтавым часцям. Адсюль, з Зялёнай пушчы, адпраўляліся баявыя групы, якія наладжвалі засады. Начамі рабілі сваю справу падрыўнікі. Першым тут вызначыўся Іван Гляк. На ўчастку дарогі Бачэйкава—Свяча, дзе павінна была прайсці калона аўтамашын з нямецкімі салдатамі, ён уладкаваў на адхоне міну і ў дадатак да яе — дзве авіябомбы па 200 кг, каля 40 буйнакаліберных снарадаў. Ён любіў такі выраз: «Сетка пастаўлена, улоў павінен быць, толькі трэба набрацца цярпення».

Цярпенне сапраўды спатрэбілася немалое. Каля васьмі гадзін, пакуль паказалася двое мужчын з баронамі—валакушамі, услед за імі група салдат-разведчыкаў. Іван, канешне, іх прапусціў. Чакаў таго «ўлову», дзеля якога столькі сядзеў. Калі палова калоны прайшла рубеж міны, толькі тады ён прывёў у дзеянне механізм. Раздаўся аглушальны выбух, які ўшчэнт разнёс чатыры аўтамашыны з салдатамі. На другі дзень хлапчукі з вёскі Сасняны падабралі больш за 50 салдацкіх пілотак, што засталіся на месцы выбуху.

Памятаў Аляксей Піліпёнак і яшчэ аб адным наказе камбрыга: яны, партызаны, з'яўляюцца адзінымі сапраўднымі прадстаўнікамі савецкай улады на месцах і нясуць поўнасцю адказнасць за спакой і жыццё людзей, што жывуць там. Пасланец з вёскі Клешчына прынёс вестку, што немцы збіраюцца адправіць на работу ў Германію 20 юнакоў і дзяўчат. Амаль усе партызаны знаходзіліся на баявых заданнях. Тады камандзір сабраў тых, хто заставаўся ў штабе, у гаспадарчым узводзе, конных разведчыкаў, якія затрымаліся. Набралася 20 чалавек. Аперацыя прайшла ўдала. Партызаны атрада ўзялі пад сваю ахову і апеку ўсю моладзь вёскі. Многія сталі партызанамі.

Час ад часу ў Зялёнай пушчы, дзе дыслацыраваўся атрад Піліпёнка, паяўляўся пасланец са штаба брыгады. Было ясна, што камандаванне задумала баявую аперацыю, у якой патрэбен удзел атрада. Так было, калі грамілі гарнізоны ў Лукомлі, Беліцы і іншых месцах. Так было, калі спрабавалі выбіць немцаў з Лепеля.

Камандаванне брыгады было задаволена баявой дзейнасцю атрада і яго камандзіра Аляксея Піліпёнка. Ён належаў да ліку тых камандзіраў, якія ўмелі спакойна, упэўнена рабіць сваю справу, лічылі ганебным выхваленне, узнясенне сваёй асобы. Не любіў ён гаварыць і аб перажытым. Толькі аднойчы ён цярпліва паставіўся да маіх пытанняў. Відаць, добры настрой спакусіў на шчырасць. Тады я пачуў яго расказ пра службу ў арміі, пра тое, як трапіў у палон да немцаў, як збег, пра людзей, якія прытулілі, абагрэлі і выхадзілі, калі страціў прытомнасць і паралізавала ногі.

*А. І. Стук.*

# Разгром гарнізона ў Лукомлі

**З успамінаў Ананія Куіна, былога намесніка камбрыга Сенненскай партызанскай брыгады**

У лепельскіх лясах мы мелі некалькі запасных баз. Летам 1943 года вырашылі абсталяваць на ўсякі выпадак яшчэ адну, паколькі брыгада значна вырасла.

Пераход з Сенненскага раёна ў лепельскія лясы ажыццяўляўся па дарозе, што вяла на Чашнікі. Аднак у Лукомлі знаходзіўся добра ўзброены нямецкі гарнізон. Царкву немцы пераабсталявалі ў казарму, узвялі вакол яе сцяну з цэглы, зрабілі амбразуры. На званіцы ўстанавілі хуткастрэльныя кулямёты. На ўзбраенні гарнізона было дзве 45-мілімятровыя гарматы. З іх немцы заўсёды абстрэльвалі нашы абозы, якія накіроўваліся ў лепельскія лясы.

Натуральна, што мы не маглі не прыняць мер засцярогі. Вырашылі разграміць гарнізон. Гэту аперацыю камбрыг даручыў узначаліць мне, выдзеліўшы тры атрады. Атакаваць гарнізон прама ў лоб было рызыкоўна, непазбежна прывяло б да вялікіх страт. Прынялі рашэнне блакіраваць гарнізон.

Першую ноч і дзень гарнізон вёў абстрэл нашых пазіцый. У другую ноч байцы нашых атрадаў паўзком дабраліся да ўскраін мястэчка Лукомль і акапаліся там.

Па маёй просьбе камбрыг накіраваў да нас яшчэ два атрады на чале з начальнікам штаба брыгады Васілём Сыценкам. Гэта дало нам магчымасць узмацніць нашы заслоны на дарозе з Чашнікаў.

Кожную раніцу немцы і паліцаі знаходзілі нашы лістоўкі з прапанoвай здацца. Гэта ўзмацніла ўзнікшую ў гарнізоне паніку. Як стала нам вядома, камендант запрасіў падмогу з Чашнікаў. Адтуль немцы накіравалі атрад, узмоцнены танкамі і гарматамі. Яму ўдалося на зыходзе дня прарвацца ў Лукомль, панёсшы, праўда, немалыя страты.

Ноччу з Лукомля прыбыў наш сувязны. Ён паведаміў, што гарнізон рыхтуецца да эвакуацыі ў Чашнікі.

На працягу ночы я зрабіў перадыслакацыю атрадаў. Калі да гэтага засады былі размешчаны бліжэй да Чашнікаў, то цяпер яны перамясціліся да Лукомля. Засады былі ўзмоцнены ружжамі ПТР.

Коннаму атраду Юнаса Каракетава было загадана: як толькі калона праціўніка пакіне Лукомль, адразу ж заняць яго. Атрадам, што



В. Дз. Сыценка.

знаходзяцца ў засадзе, не адкрываць агню да таго часу, пакуль уся калона не выраўняецца перад фронтам нашых засад. Усё ў асноўным атрымалася так, як мы меркавалі.

Прыкладна ў 10—11 гадзін раніцы з Лукомля да нас данёсся гул матораў, а неўзабаве паказаліся танкі, якія рухаліся па абодвух баках дарогі. За танкамі ішла пяхота, услед за ёй — гарматы, рухаліся абозы, а за імі зноў — пяхота.

Агонь мы адкрылі, калі калона праціўніка аказалася заціснутай у паўкальцо, прычым ён вёўся з двух бакоў дарогі. Колькасць фашыстаў і паліцэйскіх пачала радзець. Заднія павярнулі назад, у Лукомль, але ён ужо быў заняты нашым конным атрадам. 36 немцаў і паліцэйскіх мы ўзялі ў палон, захапілі 2 гарматы, 6 кулямётаў, нямала другой зброі — вінтовак, аўтаматаў.

На другі дзень у Лукомль, дзе мы спыніліся, прыбыў сакратар Віцебскага абкома партыі Іван Барысавіч Пазнякоў. Ён загадаў аформіць дакументы на ўзнагароджанне тых, хто вызначыўся ў баях за Лукомль. Я за гэту аперацыю быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Гэта была трэцяя з ліку найбольш значных баявых аперацый, паспяхова завершаная пад маім камандаваннем, у дадатак да разгрому гарнізона ў Чарэі і коннага нямецкага батальёна ў в. Лука.

*Успаміны запісаў А. І. Стук.*

# Мы — падрыўнікі

### З успамінаў І. Радзішэўскага, былога падрыўніка

Партызаны да падрыўнікоў ставіліся з павагай. Кожны разумеў, што баявая «работа» падрыўнікоў мяжуе з вялікай рызыкай, патрабуе дакладнага разліку і вытрымкі.

Як і іншыя партызанскія дыверсійныя групы, наша аддзяленне з пяці чалавек — камандзір аддзялення Ягор Харошчанка, радавыя Міхаіл Мяснікаў, Іван Ерашэвіч, Павел Шышко і я — часцей за ўсё дзейнічалі самастойна. Задача наша адна — мініраваннем дарог нанесці як мага большыя страты гітлераўцам.

У баявых буднях здараецца ўсякае. На перагоне Крупкі — Талачын мы ўдала спусцілі пад адхон эшалон з боепрыпасамі, а вось міна, пастаўленая на шашы Сянно — Паршні, «спрацавала» толькі на аднаго паліцая, які наехаў на яе веласіпедам. А пяць грузавікоў з гітлераўцамі прайшлі па шашы бесперашкодна.

— Сорамна камандзіру дакладваць аб гэтай «аперацыі» — бядуе Харошчанка. Мы разумеем Ягора. Міны нам даводзіцца рабіць самім, таму і стараліся, каб праца наша як след «акуплялася».

Памятаю нашу атрадную мінную «майстэрню». Над агнём на дроце падвешаны буйнакаліберны артылерыйскі снарад. З яго выплаўляўся тол. У вадкім выглядзе тол разлівалі па драўляных скрынках розных памераў. У скрынцы рабілася адтуліна для запалу, і міна гатова.

Усё проста. Толькі абыходзілі нашу мінную «майстэрню» больш асцярожныя партызаны. Здаралася, што тол не плавіўся, а ўзрываўся.

Ставілі і звычайныя снарады з мінным узрывальнікам. У маі 1943 года такім чынам мы спусцілі пад адхон эшалон з баявой тэхнікай.

Чыгунка моцна ахоўвалася, аднак мы перахітрылі патруль. Як толькі вартаўнікі разышліся, падпаўзлі з Паўлам Шышко да чыгуначнага палатна і закапалі пад рэйку снарад. У галоўку ўзрывальнік уставілі, а ў чаку — кавалак шомпала, каб тырчэў ён вышэй рэйкі. Фашысты ў цемры тонкага шомпальнага прута не заўважылі, а калі магутны выбух асвяціў наваколле, ім нічога не заставалася, акрамя як збіраць абломкі паравоза і пакалечаную тэхніку.

Зімой 1943—1944 гадоў падабрацца да чыгункі было надзвычай цяжка. Іншы раз удавалася паставіць міну, а фашысты пусцяць на перагон гружаныя каменнем платформы — і ўся работа прапала.

У пачатку лютага 1944 года з запасам мін і ўзрывальнікаў да іх наша аддзяленне накіравалася з Сенненшчыны ў Крупскія лясы, якія блізка падступалі да чыгункі. На дзвесце метраў з абодвух бакоў палатна фашысты лес высеклі, аднак у многіх месцах прабіваўся ўжо малады падлесак, па якім можна было падпаўзці да рэек.

Пасля дзённага адпачынку выйшлі ў прыцемках да чыгункі. Група назірання ў складзе Івана Ярашэвіча і Паўла Шышко папаўзла на разведку абстаноўкі, а камандзір аддзялення, я і Міхаіл Мяснікаў пачалі рыхтаваць міну для ўстаноўкі. Узрываць рашылі з дапамогай шнура.

Па сігналу назіральнікаў за аховай чыгункі паўзём да рэек. Метраў за дваццаць ад іх Міхаіл Мяснікаў застаецца з матком тэлефоннага кабелю, канец якога я цягну за камандзірам. Месца паблізу станцыі выдалася такое, дзе чысцілі паравозныя каласнікі. Чорны шлак, рассыпаны па шпалах, дазваляў надзейна замаскіраваць міну.

Ягор Харошчанка рукой выграб жвір паміж шпал, уціснуў пад рэйку скрынку з толам, а я ўставіў узрывальнік з прымацаваным тэлефонным кабелем. Адпаўзлі, страхуючы шнур, і пачалі чакаць. Неўзабаве з боку Талачына пачуўся перастук вагонных колаў.

— Паражняк ідзе,— зазначыў Павел Шышко.

У Паўла слых быў адменны. Сапраўды, на Крупкі прайшоў састаў пустых цыстэрнаў, якія штурхаў перад сабой паравоз.

На досвітку прайшоў цягнік і з боку Крупак. Як і меркавалася, гэта быў гружаны баластам «кантралёр» перагона, за якім належала чакаць цягнік з больш важным грузам. Паказаўся ён на перагоне мінут праз пятнаццаць.

Удваіх з камандзірам ухапіліся за шнур, чакаем зручнага моманту. Вось ужо паравоз набліжаецца да міны, вось ён накаціўся над ёй. Тузаем што ёсць сілы за шнур. На момант заўважаю, як уздыбіўся адарваны ад паравоза пярэдні вагон, як палезлі адзін на другі астатнія, і бягу за камандзірам да выратавальнай сцяны нявысечанага лесу.

У сакавіку 1944 года зрабіў я свой апошні выхад на чыгунку. Зноў з дапамогай шнура нам удалося падарваць паблізу Бабра цягнік, які вёз на фронт гітлераўцаў.

Спачатку ўсё было добра. Абышлі паліцэйскія гарнізоны. Аднак каля возера Сялява напаткала нас бяда. Аддзяленне нарвалася на засаду.

Цяжка параніла ў тым баі мяне і Паўла Шышко. На руках прынеслі нас баявыя сябры ў лагер. 15 сакавіка 1944 года з партызанскага аэрадрома ў Новай Беліцы мяне адправілі самалётам у франтавы шпіталь.

## Камбрыг Васіль Комлеў

У жыцці кожнага бываюць сустрэчы, якія накладваюць адбітак на ўвесь далейшы шлях. У Васіля Комлева такой была сустрэча ў ліпені 1942 г. у адной з лясных вёсак з Канстанцінам Заслонавым. Здарылася так, што перад гэтым партызанскаму атраду Комлева давялося весці гарачы бой з карнікамі, дзе камандзір быў паранены ў нагу.

Камбрыг падышоў да павозкі, на якой ляжаў паранены Комлеў. Канстанцін Сяргеевіч усміхнуўся, зрабіў знак не рухацца, па-сяброўску пацісну́ў руку, сказаў як даўно знаёмаму:

— Ты ляжы, ляжы, Васіль. Чуў, ведаю пра твае баявыя справы. Здорава вы далі фашыстам пад Балбасавам і на хутары Лагі! Малайцы!

З верасня 1942 г. Заслонаў, пасля цяжкіх баёў з карнікамі, звярнуўся да камандзіра і камісара першага атрада:

«Добры дзень, дарагія таварышы Васіль і Лёша!

Накіроўваю вам сціплыя падарункі. Прашу не крыўдзіцца, бо майце на ўвазе, усяго атрымалі вельмі няммнога... Дзейнічайце папартызанску. Не сядзіце без справы, падбівайце аўтамашыны, забірайце трафеі і адразу ўзбройвайце зноў прынятых... Узмоцнена расціце нават за лік людзей без зброі...

Мініруйце шасэйныя дарогі, і мініраванае месца на шасэ суправаджайце кантролем, каб ведаць, а што зроблена. І калі ёсць магчымасць захапіць трафеі, дык каб захапілі. Там, дзе магчыма, як мага часцей рабіце засады. Гэта добра. Гэта ўмацоўвае нервы і характар партызан...

Ну, хлопцы, да пабачэння! Трымайце гонар і марку першага перадавога і самага баявога атрада нашай брыгады. Прывітанне ўсім камандзірам і байцам!

З прывітаннем К. Заслонаў».

Цэлая праграма баявой, а заадно і выхаваўчай дзейнасці.

Асабліва цяжкія баі ішлі ў верасні 1942 года ў раёне вёсак Васнева і Рындзева. Колькасная перавага карнікаў пагражала немінучай гібеллю трапіўшаму ў пастку атраду Комлева. Папярэдняя дамоўленасць з камбрыгам аб неабходнасці ў такіх выпадках праяўляць аператыўную ініцыятыву прымусіла камандзіра прыняць выключнае рашэнне аб вывадзе атрада за лінію фронту праз «Суражскія вароты». Даведаўшыся аб гэтым, Заслонаў адобрыў рашэнне Комлева, які смелымі і рашучымі дзеяннямі выратаваў баявую адзінку, і звярнуўся да кіраўніцтва БШПР з просьбай аказаць яму дапамогу, што і было зроблена.



В. П. Комлеў



К. С. Заслонаў

Зноў апынуўшыся ў варожым тыле, Комлеў развіў бурную баявую і арганізатарскую дзейнасць у складзе заслонаўскага злучэння, якое пасля гібелі свайго камандзіра атрымала назву брыгады імя К. С. Заслонава. У верасні 1943 г. В. П. Комлеў быў прызначаны камандзірам 2-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава. Першай баявой аперацыяй брыгады быў яе ўдзел у другім этапе «рэйкавай вайны».

Надаючы асаблівае значэнне падрыхтоўцы аперацыі, камбрыг накіроўваў пошукі разведчыкаў, якія дэталёва вывучылі падыход да таго месца непадалёку ад Багушэўска, дзе былі вызначаны дзеянні атрадаў брыгады. Выверылі і ўдакладнілі ўсё неабходнае. У ходзе аперацыі комлеўцы дзейнічалі зладжана, рашуча. Зарады тола пад рэйкі закладвалі хутка, без мітусні, бікфордавы шнуры падпальвалі па агульнай камандзе, групы падрыўнікоў адыходзілі ў прыкрыцце арганізавана. Асвятляючы ваколіцы, грымелі выбухі. Больш за 300 выбухаў прагрымела ў тую ноч пад Багушэўскам.

Нямецкае камандаванне, выконваючы загад стаўкі Гітлера, вымушана было перашываць сапсаваныя дарогі на адну каляю і адначасова ўзмацняць аўтамабільныя перавозкі, асабліва на шашы Віцебск—Лепель.

Не паспелі акупанты апомніцца ад удара па чыгунках, як злучаныя сілы 2-й Заслонаўскай ва ўзаемадзеянні з брыгадай «Аляксея» пад камандаваннем Васіля Комлева і Аляксея Данукалава разграмілі буйны гарнізон у мястэчку Бачэйкава. У засадных баях каля вёсак

Лізуны Багушэўскага, Мажулёва Сенненскага раёна зімой сорак чацвёртага 2-я Заслонаўская брыгада сарвала нарыхтоўку фуражу і прадуктаў для франтавых часцей акупантаў. Актыўна дзейнічалі комлеўцы на чыгунцы Орша – Мінск каля Талачына. Менш чым за год значна вырасла колькасна, узмацнела 2-я Заслонаўская брыгада, пусціла пад адхон дзесяткі воінскіх эшалонаў і паравозаў, вывела са строю звыш 200 кіламетраў чыгуначных шляхоў. А ў красавіку 1944 г. яна разам з іншымі брыгадамі аказала дзейсную баявую дапамогу партызанскаму злучэнню Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка.

У канцы мая 1944 г. буйная карная экспедыцыя пачалася супраць Барысаўска-Бягомльскай і Сенненска-Аршанскай зон. Разам з іншымі націск 330-й нямецкай дывізіі і сямітысячнай групоўкі карнікаў давялося адбіваць і заслонаўцам. У ходзе ўпартых няроўных баёў, знішчаючы жывую сілу і тэхніку ворага, партызаны вымушаны былі адыходзіць. Асабліва цяжкае становішча склалася для акружанай групоўкі партызан на правым беразе Бярэзіны, ля возера Палік.

Камбрыг Комлеў разумеў, што ў гэтых умовах вырвацца з смяротнага кола ў адкрытым баі нельга. Заставалася адно — старанна і дасканала вывучыўшы слабыя месцы ў ланцугу карнікаў, выкарыстаўшы іх упэўненасць, што партызаны не адважацца выйсці з лесу на адкрытую мясцовасць, разведаўшы месцы начлегу, рэжым аховы і патрулявання карнікаў у начны час, паспрабаваць, карыстаючыся цемрай, праслізнуць скрозь вузкія шчыліны ў іх баявых парадках. На гэта і рашыўся камбрыг Комлеў.

Кароткая чэрвеньская ноч нібы ахоўвала ідучых след у след заслонаўцаў і мірных жыхароў. І калі заружавеў ціхі ранішні золак, усе яны былі па-за небяспекай. Гэта быў сапраўдны подзвіг, хоць і без адзінага стрэлу. Таму і Васіль Паўлавіч ганарыцца ім больш, чым самымі жорсткімі пераможнымі баямі з ворагам.

Вярнуўшыся ў раён ранейшай дыслакацыі, 2-я Заслонаўская брыгада працягвала весці баі з акупантамі, а затым змагалася супраць ворага разам з часцямі Чырвонай Арміі.

30 ліпеня авеяныя славай заслонаўцы на чале з камбрыгам В. П. Комлевым прыбылі ў вызваленае Сянно.

Ураджэнец Урала, Васіль Паўлавіч захаваў добрыя ўспаміны аб родных месцах, пасля вайны многа разоў наведваў іх. Але жыць застаўся ў Беларусі, бо інакш пастпіць не мог: «Прыкіпеў да гэтай зямлі сэрцам, беларускі народ стаў мне родным».

*М. Тараткевіч.*

## «Паміраю, але не здаюся!»

Восенню 1942 года Васю Стаброўскаму давялося сустрэцца ў вёсцы Шэпетава з партызанамі. І хаця хлапчуку было тады ўсяго 14 гадоў, яго ўзялі падрыўніком у атрад «Дзядзькі Косці» 1-й партызанскай брыгады К. С. Заслонава.

У адну з восеньскіх начэй 1943 года дыверсійная група, у якую ўваходзіў Вася, заладжыла міну пад чыгуначнае палатно паблізу станцыі Талачын. Трэба было бачыць радасць Васі, калі варожы цягнік паляцеў пад адхон…

За мужнасць і адвагу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі піянер Вася Стаброўскі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У студзені 1944 года Васіль Стаброўскі разам з маладымі партызанамі пайшоў на чарговае заданне. Даведаўшыся, што па дарозе, недалёка ад вёскі Кулікі Какоўчынскага сельсавета, рухаецца аўтакалона з немцамі, рашылі арганізаваць засаду і прыняць бой. Але сілы, як высветлілася потым, былі вельмі няроўныя. Бой прыняў зацяжны характар. У партызан скончыліся боепрыпасы. Расстраляўшы свае патроны і знішчыўшы больш дзесяці варожых салдат, Вася і сам быў цяжка паранены: аўтаматнай чаргой яму перабіла абедзве нагі. Застаўся ўсяго адзін патрон. А вораг ужо зусім блізка, і партызан націснуў на спуск.

Разам з дзевяццю баявымі сябрамі адважны падрыўнік Васіль Стаброўскі пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Вароніна Расненскага сельсавета.

*Р. Майскі.*

## Радыстка Тамара

Восенню 1942 г. аддзел разведкі Заходняга фронту накіраваў у Багушэўскі раён спецгрупу. Тамара Калінка і тры разведчыкі павінны былі перадаваць на Вялікую Зямлю даныя аб канцэнтрацыі нямецкіх войск. Але самалёт страціў курс і скінуў іх каля вёсак Рай і Казадоі. Двое разведчыкаў адразу трапілі ў рукі фашыстаў і загінулі. Тамара не ведала гэтага. Замаскіраваўшы парашут і радыёстанцыю, без карты, зброі блукала яна па глухому лесу ў пошуках сяброў. Убачыла аднойчы вёску. Рашылася зайсці. Незнаёмку папярэдзіла мясцовая жыхарка: «Не хадзі сюды, дзіцятка, фашысты шукаюць усюды радыстку».

Тамара вярнулася назад. Немцы, прачэсваючы лес, прайшлі неяк зусім блізка ля яе, але, на шчасце, не заўважылі.

Прайшло каля тыдня. Аднойчы Тамара сустрэла на ўзлеску пастуха. Вечарам ён прынёс ёй бульбу, хлеб і малако. А потым дапамог звязацца з партызанамі аднаго з атрадаў Канстанціна Заслонава. Яе радыёстанцыя стала дапамагаць патрыётам падтрымліваць сувязь з галоўным камандаваннем.

Хутка атрад атрымаў загад выйсці за лінію фронту. Не магла Тамара вярнуцца, не выканаўшы заданне. Значыць, выйсце адно — прабірацца да Багушэўска.

Начальнік штаба Багушэўскай партызанскай брыгады Васіль Лаўкоў загадаў трымаць сувязь праз Сямёна Філіповіча.

За 5 кіламетраў ад пасёлка, ва ўрочышчы Звярынец, у зямлянцы сярод балота ўладкавалася Тамара са сваімі памочнікамі Мікалаем Шарснёвым, Марыяй Гарнак і Міхаілам Бондаравым.

Амаль цэлыя суткі сядзела сям'я С. Г. Філіповіча ля вакна, сачыла за рухам паяздоў. А ноччу ў штаб фронту ляцелі радыёграмы: «Гаспадару. На Оршу прайшло цыстэрн з палівам — 42, аўтамашын — 179, жывой сілы — 59 вагонаў. Невядомы груз — 193 вагоны, павозак 8 штук, узрыўгруз — 69 вагонаў, боепрыпасаў — 164 вагоны, аўтамашын з салдатамі — 22... Тамара».

Хтосьці з чыгуначнікаў перадаў Філіповічу, што немцы моцна ахоўваюць чыгуначную ветку за Стайкамі, вельмі надзейна замаскіраваную травой. І вось Тамара радзіруе:

«Гаспадару. 4.500 м на поўнач ад скрыжавання чыгункі Віцебск—Орша і магістралі Масква—Мінск у лесе размясціўся хімічны склад, знаходзіцца пад моцнай аховай...»

Неяк Сямён Гаўрылавіч прынёс у зямлянку касу з друкарскім шрыфтам, фарбу, валікі і паперу. У разведчыкаў прыбавілася клопату. Ноччу прымалі зводкі Саўінфармбюро і друкавалі іх, а раніцай С. Г. Філіповіч забіраў лістоўкі і разам з сябрамі распаўсюджваў на базары і ў іншых людных месцах. Калі на радыёстанцыі Тамары скончылася сілкаванне ад батарэй, Філіповіч дастаў акумулятар. У штаб фронту паступалі новыя і новыя звесткі.

Вельмі каштоўныя звесткі ішлі на Вялікую Зямлю з зямлянкі, што знаходзілася недалёка ад Багушэўска. Дзякуючы ім, савецкая авіяцыя знішчыла вялікую колькасць эшалонаў з тэхнікай, іншых стратэгічных аб'ектаў.

У пачатку ліпеня 1944 года, пасля вызвалення Багушэўскага раёна часцямі Савецкай Арміі, Тамара па заданню Масквы была перапраўлена ва Усходнюю Прусію, дзе працягвала сваю работу.

Пасля вайны яна жыла ў Растове-на-Доне.

*Л. Казлоў.*

## Слова, якое чакалі

### З успамінаў Анатоля Іванавіча Стука, былога сакратара падпольнай газеты «Бальшавіцкая трыбуна»

Праз адчыненае вакно цягне прахалодай. Пётр Яндукін, наш друкар, замацоўвае створкі акна, з асалодай удыхае водар лугавых траў, што ўрываецца разам са свежым паветрам у гасцёўню дома, які стаў часовым прыстанкам падпольнай рэдакцыі. Зроблена галоўнае — надрукаваны, нарэшце, увесь тыраж Сенненскай падпольнай газеты «Бальшавіцкая трыбуна». Можна было б зрабіць невялікі перапынак. Ды час прыспешвае. Неўзабаве пачнуць прыбываць пасланцы з усіх атрадаў, падпольных арганізацый. Пётр Яндукін далучаецца да наборшчыц, якія акуратна раскладваюць газеты, зводкі Савецкага Інфармбюро па стосіках кожнаму адрасату.

У нас з рэдактарам іншы клопат. Не паспелі на нашым друкарскім станку-качалцы адшалясцець апошнія старонкі газеты «Бальша-



Пролетарии всех стран, соединяйтесь! | Смерть немецким оккупантам!

БОЛЬШЭВІЦКАЯ ТРЫБУНА

ЕЖЕНЕДЕЛЬНАЯ ГАЗЕТА СЕННЕНСКОГО РК КП(б)Б и Н—ских ПАРТИЗАНСКИХ ОТРЯДОВ

Год издания XII | Четверг, 28 октября 1943 г. | № 14 (849)

25 лет ВЛКСМ

Приветствие ЦК ВЛКСМ
КОМСОМОЛЬСКИМ ОРГАНИЗАЦИЯМ

В день 25 летия комсомола ЦК ВЛКСМ шлет молодым партизанам и партизанкам от комсомольцев советского тыла — боевой привет. 4 месяца героическая Красная Армия под руководством великого Сталина ведет массовое изгнание врага с Советской земли. Героические победы наших войск обязывают каждого патриота усилить помощь наступающей Красной Армии.

Крепче удары по врагу с тыла! Проявить образцы мужества, храбрости и находчивости в наступающих решающих боях с врагом. Свято выполнить приказ товарища Сталина: „Все силы на борьбу с подлыми гитлеровскими поработителями!"

Да здравствуют отважные советские партизаны!

Да здравствует героическая Красная Армия!

Да здравствует лучший друг советской молодежи отец и полководец великий Сталин!

Секретарь ЦК ВЛКСМ МИХАЙЛОВ.

Приветствие обкома КП(б)Б и обкома ЛКСМБ
СЕКРЕТАРЮ СЕННЕНСКОГО РАЙКОМА КОМСОМОЛА

В день 25-летия Ленинско-Сталинского комсомола поздравляем комсомольцев, комсомолок и всю молодежь нашего района и желаем дальнейших успехов по изгнанию немецких захватчиков с нашей Родины!

Секретарь Витебского обкома КП(б)Б СТУЛОВ.
Секретарь Витебского обкома комсомола ЛУЗГИН.

Славный юбилей

Сегодня Ленинско-Сталинскому комсомолу исполняется 25 лет.

Славен и велик исторический путь, пройденный комсомолом. Его история неразрывно связана с историей создания Советского государства. Комсомол рос и закалялся в огне гражданской войны, в годы мирного социалистического строительства. Он ведет за собой миллионные массы советской молодежи. Два ордена, которыми награжден комсомол, свидетельствуют о его больших заслугах перед Родиной. Комсомол был и остался верным помощником и резервом большевистской партии.

Свой юбилей Ленинско-Сталинский комсомол отмечает в условиях Великой Отечественной войны. Уже третий год весь советский народ борется за свободу и независимость своего отечества.

Верные сыны и дочери своего народа — комсомольцы и комсомолки — с первых дней Отечественной войны встали на защиту своей любимой Родины. Сотни тысяч из них бесстрашно борются с ненавистным врагом на фронте и в тылу противника, проявляя отвагу, мужество и героизм.

Комсомольцы и комсомолки Сенненского района, находясь в тылу врага, свое первое слово любви посылают своему любимому учителю и другу — великому Сталину. Они заверяют партию и правительство, что не пощадят своих сил и жизни для священного дела освобождения нашей Родины от немецко фашистских захватчиков и обязуются свято выполнить приказ товарища Сталина: „Все силы на борьбу с подлыми гитлеровскими поработителями!"

БОЕВЫЕ ДЕЛА КОМСОМОЛЬЦЕВ

Партизаны комсомольцы отряда т. Ш. 25 летие комсомола встречают новыми боевыми показателями.

Подрывная группа во главе с Василием Б. к этому знаменательному дню взорвала 4 вражеских автомашины и танкетку. При этом убито 29 гитлеровцев.

— о —

Группа подрывников во главе с Василием К. уничтожила 7 автомашин и 49 немецких солдат. Комсомолец Владимир с двумя партизанами сжег 5 мостов на шоссейных дорогах.

* * *

Комсомольцы-подрывники В. и С. из отряда Саши во главе с Федором В. к дню 25 летия комсомола на шоссейных дорогах взорвали 3 автомашины. При этом убито 35 немецких солдат.

— о —

Подрывные группы комсомольцев М. и В. уничтожили 7 вражеских автомашин и 5 повозок. При взрывах убито 83 немецких солдата.

Указ
ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА

За успешное выполнение задания правительства по освобождению Таманского полуострова от немецко фашистских захватчиков наградить орденом Суворова 1-й степени — Маршала Советского Союза Тимошенко Семена Константиновича.

Председатель Президиума Верховного Совета СССР М. КАЛИНИН.

Секретарь Президиума Верховного Совета СССР А. ГОРКИН.

Москва, Кремль, 9 октября 1943 г.

Адзін з выпускаў падпольнай газеты.

віцкая трыбуна», як трэба брацца рыхтаваць матэрыялы для набора чарговага нумара Аршанскай падпольнай газеты «Ленинский призыв». Управімся — на чарзе Талачынская газета «Чырвоны хлебароб», потым Багушэўская — «Сталінскі шлях».

Мы стараемся строга прытрымлівацца ўстаноўленага графіка. На жаль, у папцы, дзе ляжаць матэрыялы для газеты «Ленинский призыв», усяго дзве заметкі. Ці не адправіцца мне ў заслонаўскую брыгаду, тым больш што я даўно там ужо не быў? Хацелася пабываць у сваім атрадзе імя Лазо, сустрэцца з камбрыгам Людвігам Іванавічам Сяліцкім, з якім звёў мяне лёс у канцы 1941 года, узяць у яго інтэрв'ю.

Сваімі планамі дзялюся з рэдактарам Акімам Несцеравічам Салохам. Двух яго папярэднікаў, у тым ліку Аляксея Рыгоравіча Масаловіча, з якім мы выпускалі першыя нумары газет, запрасілі на працу ў падпольны райком партыі.

Прызнацца, мяне крыху здзівіла назначэнне рэдактарам Акіма Несцеравіча, для якога журналістыка была справай новай, нязведанай. Ён настаўнік, выкладаў матэматыку. Да таго ж узрост не вельмі абнадзейваючы — без малога шэсцьдзесят. Але мае сумненні аказаліся дарэмнымі. Прыродная кемлівасць, багаты жыццёвы вопыт, абвостранае пачуццё адказнасці і энцыклапедычная эрудыцыя, якія прыкметна вылучалі яго, дапамаглі хутка ўвасці ў курс нязвыклых абавязкаў і стаць удумлівым рэдактарам.

Акім Несцеравіч не быў супраць таго, каб я, у свабодныя дні пасля выхаду газеты, наведваўся ў атрады, меў магчымасць прымаць удзел у іх баявых аперацыях. Была такая дамоўленасць. Ён разумеў, без гэтага нельга дамагчыся, каб нашы карэспандэнцыі насілі жывы, пераканаўчы характар. Але на гэты раз папрасіў мяне пакуль устрымацца.

— Пачакаем крыху, не можа быць, каб Барыс Канстанцінавіч не адправіў свайго пасланца.

Барыс Канстанцінавіч Іваноў — камісар 1-й Заслонаўскай брыгады. Аршанскі падпольны райком партыі ў дадатак усклаў на яго абавязкі рэдактара падпольнай газеты «Ленинский призыв». Нягледзячы на сваю занятасць, Барыс Канстанцінавіч узяў на сябе клопаты, звязаныя з арганізацыяй матэрыялаў для газеты.

Па яго просьбе ў кожным атрадзе былі падабраны інфарматары, якія выконвалі ролю ваенкораў: паведамлялі аб найбольш важных і цікавых фактах з жыцця і баявой дзейнасці партызан.

Звычайна пасланец камісара паяўляўся ў нас у рэдакцыі за два-тры дні да выхаду газеты.

На гэты раз здарылася вось што: карная экспедыцыя, у якой прынялі ўдзел вайсковыя часці рэгулярнай арміі, што прыбылі з фронту на адпачынак у Оршу, перакрылі шлях да вёскі Маргойцы, дзе знаходзілася рэдакцыя, і таму пасланцу камісара давялося нямала паблукаць, пакуль дабраўся да нас...

Ідэя аб выданні газеты на Сенненшчыне ўзнікла адначасова са стварэннем у раёне падполля. Адзін з яго арганізатараў, Людвіг Іванавіч Сяліцкі, яшчэ ў снежні 1941 года завітаў да майго бацькі, Івана Усцінавіча, з якім быў у сяброўскіх адносінах, і папрасіў мяне ўдакладніць, ці ўдалося захаваць абсталяванне раённай друкарні.

Для Людвіга Іванавіча было нечаканай навіной, калі даведаўся, што я апошнія два гады спалучаў вучобу ў сярэдняй школе з работай у рэдакцыі раённай газеты «Бальшавіцкая трыбуна».

Назаўтра пасля сустрэчы з Сяліцкім я адправіўся ў Сянно. Але мой паход аказаўся безвыніковым. Як высветлілася, пры першай жа бамбёжцы немцамі Сянна друкарня згарэла. Наборшчыца Бяленчыкава, якую я адшукаў, паведаміла, што абставіны склаліся такія, што нічога не ўдалося ні вывезці, ні схаваць.

Гэта вельмі засмуціла Людвіга Іванавіча, але не астудзіла яго энтузіязму.

І дапамога прыйшла з-за лініі фронту. Там, аказваецца, таксама думалі, непакоіліся пра тое, каб арганізаваць у тыле ворага выданне газет, зводак Савецкага Інфармбюро, лістовак. Група партызан, што хадзіла за лінію фронту за зброяй, прынесла паходную друкарню, якая была адрасавана Сенненскаму падпольнаму райкому партыі.

У Аршанскім, Талачынскім і Багушэўскім падпольных райкомах партыі таксама жылі надзеяй займець такія друкарні. Але, відаць, у запасе іх больш не было. Выйсце падказаў сакратар Віцебскага абкома партыі Іван Барысавіч Пазнякоў:

— А чаму б на базе гэтай друкарні не выдаваць усім свае газеты?

З яго парадай усе пагадзіліся. Людвіг Іванавіч успомніў пра мяне, прыехаў спецыяльна ў атрад імя Лазо, дзе я знаходзіўся. Размова была кароткай.

Рэдакцыю, якую я адшукаў на наступны дзень, прадставілі рэдактар Аляксей Масаловіч і наборшчыца Аксана Драбінка, якая закончыла кароткатэрміновыя курсы за лініяй фронту.

Сакратар Сенненскага падпольнага райкома партыі Міхаіл Ціханавіч Любімцаў паведаміў аб назначэнні мяне адказным сакратаром аб'яднанай рэдакцыі.

Першы нумар газеты «Бальшавіцкая трыбуна» выйшаў 11 ліпеня 1943 года. Я змог пабываць у некалькіх атрадах, пазнаёміцца з іх баявой дзейнасцю ў апошнія дні, ды і самому давялося прыняць удзел у засадзе з групай байцоў свайго атрада на шасейцы Сянно–Віцебск. Па просьбе рэдактара падрыхтавалі матэрыялы два камандзіры атрадаў. З Чашніцкага, Халопеніцкага раёнаў, многіх месц Сенненскага паступілі паведамленні аб жудасных зверствах акупантаў, якія яны ўчыняюць над мірным насельніцтвам. Гэтыя факты ляглі ў аснову карэспандэнцыі, якую падрыхтаваў Аляксей Масаловіч. Чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з паведамленнямі аб падзеях на фронце, баявых дзеяннях саюзнікаў. Другі нумар «Бальшавіцкай трыбуны» выйшаў роўна праз тыдзень.

Выданне газеты «Ленинский призыв» крыху затрымалася. Чытачы яе атрымалі 28 ліпеня. Яе першы нумар адкрываўся перадавым артыкулам «Еще сильнее удар по врагу». Ініцыятыва зыходзіла ад пераемніка Заслонава Людвіга Іванавіча Сяліцкага. Ён лічыў абавязковым у першым жа нумары аддаць належнае арганізатару падполля і партызанскай барацьбы ў Аршанскім і Сенненскім раёнах, падвесці вынікі таго, што ўдалося зрабіць заслонаўцам, вызначыць далейшую праграму дзеяння. Артыкул заклікаў партызан свята берагчы і памнажаць баявыя традыцыі брыгады, якая носіць імя яе арганізатара — легендарнага «дзядзькі Косці».

Услед за «Ленинским призывом» мы выдалі талачынскую газету «Чырвоны хлебароб» і багушэўскую — «Сталінскі шлях».

Але арганізаваць выданне чатырох газет аказалася не такой простай справай. Перад намі штодзень узнікала мноства розных праблем. Высветлілася, што па недагляду партатыўная друкарня была адпраўлена недаўкамплектаванай, не хапала шрыфта, асабліва для загалоўкаў. Тут выручылі аршанскія падпольшчыкі, яны перадалі каля 10 кг шрыфта, які вынеслі з гарадской друкарні.

Неўзабаве скончыліся запасы друкарскай фарбы. І тут знайшлося выйсце. Хтосьці параіў выкарыстаць пячную сажу, настоеную на газе. Папрабавалі. Атрымаліся нядрэнныя адбіткі.

У першыя ж дні работы стала ясна, што наборшчыца Аксана Драбінка адна не ўправіцца з той нагрузкай, якая выпала на яе долю. Ёй на дапамогу ўзялі чатырох вучаніц: Алу Мядзвецкую, Марыю Ходзюш, Ларысу Малішэўскую, Аляксандру Кацар, якія неўзабаве з поспехам асвоілі наборную справу і ні ў чым не саступалі сваёй настаўніцы.

Работа над першымі нумарамі газет прымусіла нас сур'ёзна задумацца аб памерах матэрыялаў, іх тэматычнай накіраванасці. Фармат газеты невялікі — крыху больш ліста вучнёўскага сшытка. Тут, як кажуць, не разгонішся. Перад намі стаяла задача разумна і эканомна выкарыстоўваць газетную плошчу, дамагацца таго, каб матэрыялы насілі дзелавы і канкрэтны характар, навучыцца пісаць сцісла і пераканаўча, каб газета сваім словам у гэтыя цяжкія дні акупацыйнага рэжыму дапамагала абуджаць патрыятычныя пачуцці, узнімаць баявы дух у людзей, умацоўваць веру ў непазбежнасць разгрому гітлераўскай Германіі, садзейнічала згуртаванню ўсіх патрыятычных сіл, разгортванню ўсенароднай барацьбы супраць акупантаў. Гэта і прадвызначыла змест газеты і тэматыку яе матэрыялаў.

Чалавеканенавісніцкая палітыка, палітыка генацыду ўвайшла ў паўсядзённую практыку акупантаў на Сенненшчыне. Сталі звычайнымі з'явамі масавыя расстрэлы, знішчэнне населеных пунктаў. Першымі ахвярамі сталі жыхары вёсак Пожанькі, Галоўск, Канева, Прыветак. Спалілі немцы і маю родную вёску Савінічы. Рэдакцыя лічыла сваім абавязкам даводзіць да ведама насельніцтва такія злачынныя факты.

У ліку праблем, якія займалі акупантаў, была адпраўка людзей на работу ў Германію. Паколькі добраахвотнікаў не знаходзілася, яны пачалі ствараць спецыяльныя каманды па захопу працаздольных людзей, маладых хлопцаў і дзяўчат. Рэдакцыя выдала лістоўку «У гітлераўскай няволі». У аснову былі пакладзены пісьмы родзічам ад тых, каго немцы ў прымусовым парадку змаглі адправіць у Германію. Гэта быў крык душы людзей, якіх напаткаў лёс не лепшы, чым лёс ваеннапалонных.

У сваіх пісьмах нашы падпольшчыкі, асабліва з нямецкіх гарнізонаў, прасілі больш адводзіць месца на старонках газеты баявым дзеянням партызан. Гэта ўваходзіла і ў нашы планы. Мы стараліся не прапусціць ніводнай важнай баявой аперацыі. Гэта разгромы гарнізонаў у Лукомлі, Гарыўцы, Падворыцы, Ладзікаве, Ходцах, Крыльцове, абарончыя баі ў в. Новая Беліца, якая прыкрывала подступы да партызанскага аэрадрома, нашумеўшая аперацыя па разгрому нямецкага коннага атрада, які спыніўся на адпачынак у в. Чырвоная Лука. Гэта ўдзел у засадах на шасейных дарогах, дыверсіях на чыгунках.

Хацелася, каб матэрыялы газеты сталі своеасаблівым летапісам баявых спраў брыгады. Праўда, мы не заўсёды маглі называць прозвішчы тых, хто найбольш вызначыўся ў той ці іншай баявой аперацыі, каб не даваць немцам падстаў для расправы над родзічамі ў час карных паходаў. Называліся першыя літары прозвішча, а ў атрадах добра ведалі, хто меўся на ўвазе.

Газета «Бальшавіцкая трыбуна» выходзіла адзін раз на тыдзень. Абставіны нярэдка складваліся такія, калі ўзнікала патрэба неадкладна звярнуцца да насельніцтва, выказаць адносіны да рознага роду акцый акупацыйных улад. Адна з іх абавязвала бургамістраў, старастаў, паліцыю забяспечыць здачу сялянамі хлеба для нямецкай арміі і рэйха.

Камандаванне брыгады дало ўказанне камандзірам атрадаў прыняць меры, каб сарваць намер ворага. Але без удзелу самога насельніцтва гэтага немагчыма было дабіцца. Ад імя падпольнага райкома партыі і камандавання брыгады мы выдалі адозву да насельніцтва. У штаб брыгады, у атрады пачалі з вёсак прыходзіць пасланцы-хадайнікі з просьбай забраць лішкі зерня, астатняе яны пастараюцца схаваць. Ад жыхароў вёсак, што знаходзіліся пад кантролем акупантаў, паступілі такія прапановы: яны арганізуюць абоз з зернем, давядуць да ведама, калі і па якой дарозе павязуць — няхай партызаны зробяць засаду, імітуюць нападзенне. У выніку здзейсніць свой намер немцам так і не ўдалося.

Так, у дадатак да газеты, зводак Савецкага інфармбюро, лістовак паявілася яшчэ выданне — адозвы да насельніцтва, якія сталі адной з аператыўных і эфектыўных форм сувязі з ім, дапамагаючы ў тых ці іншых сітуацыях вызначыць сваю пазіцыю, лінію паводзін і дзеянняў. Звычайна яны зыходзілі ад камандавання брыгады і падпольнага райкома партыі, якія былі па-сутнасці надзелены паўнамоцтвамі, уласцівымі органам савецкай улады на месцах. Яны неслі адказнасць не толькі за арганізацыю барацьбы супраць акупантаў, але і за вырашэнне ўсіх пытанняў, што мелі жыццёва важнае значэнне для насельніцтва ў кантралюемых населеных пунктах.

Летам 1943 года, калі ўскладнілася абстаноўка, камандаванне брыгады і райком партыі звярнуліся да партызан з заклікам аказаць актыўную дапамогу, каб хутчэй і без страт убраць вырашчаны ўраджай. Гэтаму, акрамя адозвы, быў прысвечаны перадавы артыкул. Пэўнае месца на старонках газеты адводзілася таму, што робіцца ў гэтым напрамку на месцах.

Паяўленне друкаванага слова, тым больш выданне раёнкі, якая палюбілася да вайны чытачам, стала неад'емнай часцінкай іх жыцця, расцэньвалася як знак добрага прадвесця. Адно, што не задавальняла, дык гэта малы тыраж, з чым не маглі ніяк зміры́цца.

— Калі мне перападзе 2—3 экземпляры, то я радуюся. Ёсць з чым ісці да людзей, — гаварыла мне пры сустрэчы адна з нашых акт. ўных падпольшчыц з г. Сянно Валянціна Тышкевіч. — І ўсё ж гэта так мала, попыт на газету такі вялікі. Няўжо немагчыма павялічыць тыраж?

Пра гэта мы і самі марылі, ды лімітавала папера. Тое-сёе ўсё ж удалося зрабіць. Камандаванне брыгады і райком партыі звярнуліся да камандзіраў і камісараў атрадаў, кіраўнікоў падпольных арганізацый з заклікам арганізаваць збор паперы сярод насельніцтва. Такім чынам змаглі крыху папоўніць нашы запасы. Але гэта была, як гаворыцца, кропля ў моры. Тут дарэчы аказалася дапамога жыхароў вёсак, размешчаных паблізу Чашніцкай фабрыкі, якая выраблялa абгортачную паперу. Перад прыходам немцаў яны змаглі вывезці са склада і схаваць некалькі рулонаў такой паперы.



Партызаны слухаюць радыё.

Калі даведаліся, што яна патрэбна для выдання газеты, ахвотна перадалі нам. Мы мелі цяпер магчымасць выдаваць газеты да 1000 экземпляраў, а зводкі аб баявых дзеяннях Чырвонай Арміі — да 2000–2500 экземпляраў.

Работа калектыва рэдакцыі і друкарні заканчвалася звычайна пад раніцу. Ніхто не лічыўся з часам, разумелі, што газету і зводкі чакаюць у партызанскіх атрадах, у вёсках, чакаюць падпольшчыкі ў нямецкіх гарнізонах.

*Анатоль Астрэйка*

Моладзь мая, аднагодкі мае,
Хіба ў нас сілы ў грудзях не стае?
Ўспомні, удумайся, родны мой брат,
Чым табе грозіць раз'юшаны кат!
Вызваліць хоча цябе ён на век
З гордага звання твайго — чалавек.
Хоча цябе ён пазбавіць жыцця,
Брата, сястру дарагую забіць,
Каб на крыві чалавечай, касцях
Стада шчанятаў сваіх узрасціць.
Хоча цябе ён зрабіць дзікаром,
Парабкам вечным, слугою сваім.
Ці можаш аддаць ты нямецкім звярам
Тое, што вечна завеш дарагім?
Хто-ж сваю волю святую і шчасце
Дасць разарваць гэтым злыдням на часці?
Выпрастай плечы і зброю вазьмі,
Шчасце сваё ты адстайвай грудзьмі.
Сцісні, таварыш, вінтоўку рукой,
Выйдзі на жорсткі, на праведны бой.
Хочаш быць вольным, шчаслівым, жывым, —
Куляй, гранатай, штыком баявым
Немца забі, закалі, ці зарэж,
Знішчыш яго — жыццё зберажэш!

*З асабістага архіва Дз. М. Марчанкі.*




Лістоўка ЦК ЛКСМБ у гады вайны.

## Не заўсёды спадарожнічала нам удача

### З успамінаў В. В. Лабанава, былога камісара атрада

У канцы 1942 года набыла шырокі размах дзейнасць падрыўных груп брыгады. Я таксама папрасіўся ў падрыўнікі.

Марозным снежаньскім вечарам адпраўляемся на сваё першае баявое заданне. Наш шлях ляжаў у раён Талачына, да чыгуначнай магістралі Мінск—Орша. За ноч адмерылі больш як 50 кіламетраў, пакуль дабраліся да аўтастрады Мінск—Масква. Тут, у лясным масіве, вырашылі перадняваць. Халадэча страшэнная. Ніяк не можам сагрэцца. Ніколі, здаецца, не быў такім працяглым дзень. Ледзь дачакаліся вечара.

У вёсцы Раманаўка сустрэліся з нашым сувязным, мясцовым жыхаром, які тут ведаў кожную сцяжынку і вывеў лясной прасекай да ўскрайку лесу, адкуль рукой падаць да чыгуначнай магістралі.

— Да паста нямецкіх салдат прыкладна 800 метраў. Ён злева. З правага боку, бачыце вогнішча — гэта метраў 200 адсюль — пост французаў, — тлумачыў праваднік.

Арон Разумоўскі і Юрка Кобзеў паўзком дабіраліся да чыгуначнага палатна і пачалі рыхтаваць месца для міны. Мы з Яшкам (прозвішча не ведаю) у крытычную мінуту павінны былі прыкрыць сваіх таварышаў, забяспечыць іх адыход. Задача ў іх складаная — зямля глыбока прамерзла. Выручылі спецыяльна зробленыя нажы. Імі рыхлілі зямлю, асцярожна выграбаючы яе рукамі. Работы яшчэ не былі закончаны, калі данёсся гул цягніка, які ішоў з-пад Мінска ў бок Оршы. Юрку Кобзеву і Арону Разумоўскаму пад гэты гул давялося ставіць шомпал на ўзрывальнік У-2 па ходу руху кола цягніка.

Да ўзлеску мы дабеглі ў той момант, калі раздаўся выбух. Адтуль мы назіралі, як з рэек сышоў паравоз, а следам за ім, насоўваючыся адзін на адзін, ляцелі пад адхон вагоны. У атрад мы вярнуліся тады, калі атрымалі вынікі кантрольнай праверкі. Пад адхон быў спушчаны эшалон з танкамі і двума вагонамі жывой сілы.

І вось новае заданне. Атраду загадана суправаджаць абоз і групу жыхароў Сенненска-Аршанскай зоны за лінію фронту. Заадно мы павінны былі праінфармаваць Беларускі штаб партызанскага руху аб дзейнасці Сенненскай партызанскай брыгады, паколькі яго камандаванне пастаяннай радыёсувязі з ім яшчэ не мела.

Мы ўдала пераправіліся цераз раку Заходняя Дзвіна, падышлі да чыгункі ў раёне Обалі і Лоўжы. Я з 20 партызанамі адправіўся ў разведку. Каля палатна чыгункі ўбралі нямецкі патруль. Але ў гэты час фашысты з Обалі адкрылі кулямётны агонь. Абоз павярнуў назад. Нас разам з іншымі групамі ў колькасці 700 чалавек перавёў праз лінію фронту праваднік з брыгады Дзячкова.

Беларускі штаб партызанскага руху знаходзіўся ў вёсцы Хварасцёва Калінінскай вобласці. Нас, партызан-лявонаўцаў, размясцілі ў бліжэйшай вёсцы, паклапаціліся аб харчаванні, абмундзіраванні. У штабе адбылася працяглая размова, у час якой мы з напарнікам Андрэем Кошалевым далажылі аб баявой дзейнасці брыгады, аб абстаноўцы ў нашай зоне, колькасці нямецкіх гарнізонаў. Тры тыдні, адведзеныя нам на адпачынак, праляцелі імгненна. Паступіла каманда: даць заяўку на зброю і боепрыпасы і быць гатовымі да пераходу ў тыл ворага.

Ва ўсіх нас была такая вялікая прага запасціся як мага большай колькасцю найноўшай зброі, што мы забыліся пра нашы сілы і магчымасці. Узялі два ротных мінамёты, міны да іх, па два віды стралковай зброі — па аўтамату ППШ і карабіну і па 700—800 патронаў. Я аддаў перавагу снайперскай вінтоўцы СВТ.

Нас даставілі да пярэдняга краю абароны нашых войск. Тут давялося чакаць тыдзень, пакуль армейская разведка знайшла «прарэху», праз якую правяла ў нямецкі тыл калону ў 200 чалавек. Але нашы спадзяванні, што неўзабаве сустрэнемся з баявымі сябрамі сваёй брыгады, аказаліся неапраўданымі. У гэты час пачалася карная экспедыцыя супраць партызан, што дзейнічалі ў прыфрантавой палосе. Разам з байцамі партызанскіх брыгад Захарава, Мельнікава, Біруліна, Дзячкова нам давялося перажыць блакаду, якая цягнулася некалькі тыдняў. Для нашай групы яна стала ракавой. У баях з ворагам з 19 чалавек загінула 16.

Пасля выхаду з блакады я сустрэў М. Ц. Любімцава, якому Віцебскі абком партыі даручыў аднавіць дзейнасць Сенненскага райкома партыі ў падполлі. Разам з ім мы і дабраліся да зоны дзеяння нашай брыгады.

Летам 1943 года мяне выклікалі ў штаб брыгады, які знаходзіўся ў той час у вёсцы Чараўкі. Камбрыг Васіль Сяргеевіч Лявонаў і Міхаіл Ціханавіч Любімцаў, які займаў пасаду камісара брыгады, прытрымліваліся адной і той жа думкі — назначыць мяне камісарам атрада. Для мяне гэта было нечаканасцю. Мне тады яшчэ не споўнілася 20 год. Так я, нядаўні камандзір узвода, стаў камісарам атрада, якім камандаваў Мікалай Кашчэеў.

## Самалёты вярнуліся на базу са спазненнем на суткі

### З успамінаў Анатоля Іванавіча Стука

Для камбрыга Сенненскай партызанскай брыгады Васіля Сяргеевіча Лявонава гэты дзень пачаўся з прыемнай навіны. З Беларускага штаба партызанскага руху прыйшла такая радыёграма: «5 лютага на 9 самалётах адпраўляем груз, згодна вашай заяўкі. Падрыхтуйце пасадачную пляцоўку».

Значыць, у штабе з заклапочанасцю і ўзважна аднесліся да сітуацыі, якая склалася ў брыгадзе. У апошнія два месяцы ёй давялося вытрымаць некалькі цяжкіх баёў з рэгулярнымі вайсковымі падраздзяленнямі нямецкай арміі, у задачы якіх уваходзіў калі не разгром, то выцясненне асноўных сіл партызан, што дзейнічалі недалёка ад прыфрантавой палосы, у тым ліку з Сенненскага, Багушэўскага і Аршанскага раёнаў. Натуральна, што на зыходзе былі боепрыпасы. Мелася вялікая патрэба ў медыкаментах. Да таго ж, было нямала цяжка параненых партызан, якіх трэба адправіць за лінію фронту.

Трывожна і неспакойна было на душы толькі ад думкі, што надвор'е можа ўнесці свае карэктывы, прымусіць адкласці назначаны рэйс ці перашкодзіць прыняць самалёты. Усю апошнюю ноч гуляла завіруха. Намяло вялікія сумёты снегу. Непакоіла і другое — упершыню павінна здзейсніць пасадку на аэрадроме аднačасова такая вялікая колькасць самалётаў. Але за пяць месяцаў, што дзейнічае аэрадром, ні разу не было збояў — ні пры пасадцы, ні пры ўзлёце самалётаў.

Што датычыць пасадачнай пляцоўкі, то тут пашанцавала. Роўная шырокая паласа з цвёрдым пакрыццём працягнулася на некалькі кіламетраў. Тут некалі збіраліся адкрыць запасны аэрадром, вяліся падрыхтоўчыя работы, якія прыпыніла вайна.

Камбрыг папрасіў начальніка штаба Васіля Сыценку ўзяць пад асабісты кантроль падрыхтоўку пасадачнай пляцоўкі. Неўзабаве і сам, калі ўправіўся з неадкладнымі справамі, адправіўся туды.

Падзеі ж тым часам развіваліся такім чынам, што ўзнікла пытанне: ці не адкласці назначаны рэйс самалётаў? У штабе брыгады камбрыга чакала данясенне агентурнай разведкі: на 5 лютага акупацыйныя ўлады, пры садзейнічанні франтавых часцей, прадугледзелі штурм саўгаса «Беліца». Мяркуецца, што наступленне будзе весціся з трох напрамкаў — з боку Сянна, Багушэўска і Оршы. Рашаючая роля ў гэтай аперацыі адводзіцца франтавой часці, што прыбыла на адпачынак у Оршу. У сваім распараджэнні яна мае танкі, бронетранспарцёры, гарматы, мінамёты.

У гэтай задуме немцаў не было нічога новага. Ужо неаднойчы рабіліся спробы выбіць партызан з саўгаса «Беліца», захапіць аэрадром. Апошняя — месяц таму.

І вось цяпер яшчэ адна спроба. Такая ўпартая настойлівасць, безумоўна, невыпадковая. Немцы добра разумелі, якую пагрозу ўяўляюць партызанскія сілы, сканцэнтраваныя на галоўных напрамках наступлення, у тым ліку ў трохкутніку Сянно—Багушэўск—Орша.

Паводле данясення агентурнай разведкі, немцы вырашылі кінуць на штурм Беліцы ўтрая большыя сілы, чым у мінулы раз. Камбрыг вагаўся, не ведаў, што і рабіць. За аэрадром брыгада з дапамогай суседзяў будзе змагацца. А вось як быць з назначаным рэйсам самалётаў?

— Бадай, не варта адмяняць, — вырашыў камбрыг. — Не можа быць, каб не асілілі праклятых чужынцаў.

У штабе брыгады сабраўся ўвесь партызанскі актыў. Тут жа і прадстаўнікі камандавання іншых партызанскіх брыгад. Лявонаў прыняў ужо некаторыя захады. Два атрады — Аляксандра Клячына і Анатоля Захарава былі падняты па трывозе і накіраваны ў абход асноўнай наступаючай групоўкі, каб ударыць з тылу ў патрэбны час.

З агульнай згоды прынялі такое рашэнне: на прыкрыццё аэрадрома з боку Сянна накіраваць пяць атрадаў. З боку Багушэўска подступы да аэрадрома даручылі прыкрываць Багушэўскай партызанскай брыгадзе пад камандаваннем Яфіма Прахарэнкі. Першая Заслонаўская брыгада на чале з камбрыгам Людвігам Сяліцкім брала на сябе задачу завязаць бой на далёкіх подступах з асноўнай сілай ворага і паступова адыходзіць у бок Беліцы, каб уцягнуць групоўку ў мяшок.

Ля стала начальніка штаба Васіля Сыценкі, перад якім ляжала разгорнутая карта, пачалі збірацца камандзіры, каб удакладніць месца размяшчэння іх атрадаў. Я цярпліва чакаў, калі ён закончыць з імі гутарку. У мяне намер такі — падрыхтаваць карэспандэнцыю для чатырох падпольных газет, выдаваемых намі на базе паходнай друкарні сенненскай падпольнай газеты «Бальшавіцкая трыбуна». Камбрыг і начальнік штаба брыгады параілі далучыцца да байцоў атрада Кашчэева.

Як і ў мінулы раз, калі немцы наступалі на Беліцу, партызаны Кашчэева размясціліся ў будынку кароўніка. Прывёў мяне сюды камісар атрада Васіль Васільевіч Лабанаў. Мы даўнія з ім знаёмыя. Гэта адзін са старэйшых партызан.

Камісар з групай байцоў палез на гарышча кароўніка. У іх задачу ўваходзіла весці прыцэльны агонь, калі немцы кінуцца на штурм кароўніка, будынка тэхнікума. Я застаўся ўнізе разам з камандзірам Мікалаем Кашчэевым. Ён мясцовы, сенненскі. У атрадзе амаль усе хлопцы з суседніх вёсак. Кашчэеў стаяў каля аднаго з праёмаў, адкуль сачыў за тым, як немцы групаваліся, падцягвалі свае сілы.

— Пачнуць з артылерыйскай падрыхтоўкі, — заўважыў ён. Так яно і адбылося. Гарматны агонь падтрымалі танкі.

Снарады немцаў лёгка прабівалі сцены кароўніка. Ад іх выбухаў утварылася густая пялёнка смуроднага дыму. У распараджэнні партызанскіх артылерыстаў было не так багата гармат — усяго пяць. Камандзір узвода Фёдар Гарбачоў устанавіў гарматы ў вaконных праёмах. Па яго камандзе артылерысты адкрылі агонь у адказ. Немагчыма было не звярнуць увагу на разлік, якім камандаваў высокі юнак з густой капою чорных валасоў. Перш чым загнаць снарад у казённік, ён прыцэльваўся праз жарало ствала гарматы. Гэта быў Цімафей Яленскі. Аказваецца, у яго гарматы не было прыцэла. Прыходзілася так лаўчыцца, весці агонь.

Пачатак штурму кароўніка і тэхнікума паслужыў партызанам сігналам для нанясення ўдараў па немцах з тылу. З гэтай задачай паспяхова справіліся атрады Аляксандра Клячына і Анатоля Захарава. З фланга навялі наступленне заслонаўцы, якія к гэтаму часу паспелі перагрупіравацца.

Немцы зразумелі, што могуць не выбрацца з мяшка, у якім апынуліся, пачалі паспешліва адыходзіць. Ім прыйшлося кінуць свой абоз. Страты ў жывой сіле склалі 78 забітых і параненых.

Самалёты прыляцелі ноччу, у дакладна вызначаны час. 9 самалётаў са зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі. Аэрадромная служба не падвяла, аказалася на вышыні, паспяхова справілася са сваёй задачай. Праўда, пакуль разгружалі самалёты, неба завалакло хмарамі, паваліў густы снег. Адпраўляць самалёты назад рызыкоўна. Іншага выйсця, як перачакаць, пакуль не наладзіцца надвор'е, ніхто не бачыў. На той выпадак, калі немцы паспрабуюць зрабіць вылазку, былі прыняты сур'ёзныя меры перасцярогі.

У другой палове дня вецер разагнаў хмары, выглянула сонца, усталявалася цішыня. Познім вечарам самалёты ўзняліся і ўзялі курс на ўсход, на сваю базу.

## Шпіталь на вадзе

### З успамінаў партызана В. Целяпнёва

Атрад «Кастрычнік» брыгады імя Заслонава летам 1943 года размясціўся ў вёсцы Касінічы. Аднойчы сувязны прынёс вестку, што фашысты прыедуць у вёску Ліцвякі рабаваць насельніцтва. У штабе рашылі паслаць у засаду роту Мікалая Новікава.

Пры падыходзе ворага дружна загаварылі партызанскія кулямёты і аўтаматы. Група фашыстаў на чале з афіцэрам была знішчана адразу, частка заняла абарону. Бой працягваўся ўвесь дзень.

Надвячоркам гітлераўцы адступілі, пакінуўшы забітых.

Нашых параненых прыйшлося везці за 35 кіламетраў у партызанскі шпіталь, які размяшчаўся ў вёсцы Грыбіна. Брыгадны ўрач Марыя Станіславаўна Завадская і медыцынская сястра Шура Пракаповіч рабілі ўсё магчымае, каб дапамагчы кожнаму. Але праз суткі на Грыбіна пачалі наступленне значныя сілы гітлераўцаў. Трэба было ратаваць раненых, даставіць іх у патаемны шпіталь.

Недалёка ад Грыбіна ёсць возера. Адзін бок яго забалоціўся, атрымаўся поплаў. У густым высокім чароце былі ўмела схаваны лодкі з сеннікамі, падушкамі, коўдрамі. Для медыцынскіх работнікаў быў зроблены будан. Сюды і даставілі раненых.

Ноч прайшла спакойна. Раніцой жа з процілеглага боку возера, ад вёскі Заазер'е, адчалілі дзве лодкі з гітлераўцамі. У шпіталі занепакоіліся. А калі ўбачылі, што фашысты апускаюць у возера сеткі, усё стала зразумелым. Амаль побач са шпіталем была «рыбная база» гітлераўцаў, куды яны наведваліся кожны дзень і зусім не здагадваліся пра непрыемнае суседства. А праца ў шпіталі ішла сваёй чаргой. Раненыя адчувалі клопат урачоў, сясцёр, братоў па зброі, што надзейна ахоўвалі іх, і адчувалі сябе лепш з кожным днём.

Праз 33 дні яны пакінулі «шпіталь на вадзе» і ступілі на цвёрдую зямлю.

# Венскі вальс

Па шашы з Сяпна ў бок вёскі Старая Беліца імчала легкавушка. Побач з шафёрам сядзеў маладзенькі лейтэнант у форме афіцэра, на заднім сядзенні месціліся тры салдаты з аўтаматамі. Аўтаматчыкі маўчалі, а лейтэнант насвістваў мелодыю венскага вальса аўстрыйскага кампазітара Іагана Штрауса. Над радыятарам калыхаўся пад ветрыкам чырвоны сцяжок, такі нязвыклы ў тутэйшых мясцінах для таго суровага ваеннага часу.

Выскачыўшы з лесу непадалёк ад чыгуначнай станцыі Бурбін, машына спынілася. Лейтэнант беражліва зняў сцяжок і схаваў яго ў сябе на грудзях. Паехалі далей. Раптам перад легкавушкай, быццам здані, вытыркнуліся з кустоў два нямецкія салдаты. Убачыўшы афіцэра, яны адступілі ўбок, рэзка ўскінулі ўверх рукі:

— Хайль Гітлер!

— Хайль...— лейтэнант вяла ўзмахнуў рукой, нават не паглядзеў на гітлераўцаў, якія выцягнуліся ў струну. Машына толькі злёгку прытармазіла, але не спынілася.

На вуліцы Старой Беліцы нікога не сустрэлі: у дварах стаялі грузавікі, але каля іх было бязлюдна. Спыняцца не сталі. На агародах каля гармат клапатліва мітусіліся нямецкія салдаты і афіцэры. Яны маскіравалі баявыя пазіцыі. «Лейтэнант» загадаў вадзіцелю ехаць цішэй, уважліва разглядаў усё, што рабілася ў вёсцы.

Праехаўшы Старую Беліцу, узялі кірунак да цэнтральнай сядзібы даваеннага саўгаса «Полымя». За некалькі соцень метраў ад першых дамоў машына раптам ускочыла ў глыбокую ямку, напоўненую вадой. Матор хліпнуў і заглох. Аўтаматчыкі ўслед за афіцэрам выскачылі, з'явіліся ўзброеныя паліцаі.

— Пастка, браткі, папаліся,— сутаргава сціскаючы ў кішэні гранату, зашаптаў адзін з аўтаматчыкаў, зусім яшчэ падлетак.— Іх, гадаў, тут процьма!..

— «Лейтэнант» моўчкі ўзяў таго за руку, адвёў яе ад гранаты і тут жа высыпаў на падаспеўшых паліцаяў цэлы ворах адборнай нямецкай лаянкі.

— Гер лейтэнант,.. мы тут ні пры чым. Гэта пан камендант загадаў выкапаць... на ўсялякі выпадак. Пан камендант там,— паказвае паліцай у бок цэнтра.— Там...

Астатнія ж тым часам выцягвалі машыну, вылузваючыся з усіх сіл.

Заракатаў матор. «Лейтэнант» і яго спадарожнікі адразу занялі свае месцы. Толькі рушылі наперад, як убачылі афіцэра, які выйшаў з муравапага дома і махаў ім рукой, загадваючы пад'ехаць.

«Лейтэнант» паказаў, што хоча спачатку развярнуцца, а тым часам кінуў шафёру: «Гані!» Легкавушка, пыхнуўшы дымам, ірванула ў бок Маргойцаў: там жа свае, партызаны!

Позна фашысты агледзеліся, чыя машына прайшла па іх размяшчэнню. Засакаталі кулямёты, разы са тры бабахнула гармата, але легкавушкі і след прастыў.

А вечарам камандзір асобнага Смаленскага партызанскага палка Іван Садчыкаў прыняў у сябе ўжо знаёмага нам «лейтэнанта». Праўда, формы цяпер на ім не было.

— За разведку, таварыш Стэег, вялікае дзякуй! — гаварыў Садчыкаў.— Цяпер мы ведаем варожыя сілы, а гэта вельмі важна для нашых будучых дзеянняў.

* * *

Франц Стэег нарадзіўся ў пасёлку Памхаген, недалёка ад Вены, у 1921 годзе. Бацька не меў зямлі, сталярнічаў, і з гэтага жыла ўся сям'я.

Рана зведаў смак працы і Франц. Як і ў бацькі, на яго далонях прыжыліся цвёрдыя мазалі.

У 1938 годзе Аўстрыю акупавалі фашысты. А як уварваліся ў Памхаген, адразу ж схапілі Роберта Стэега, бацьку Франца. Не далі нават развітацца з сям'ёй — накіравалі ў лагер смерці Дахау. Як камуніста, выдалі яго чужынцам мясцовыя багацеі.

У 1940 годзе Франца Стэега прымусілі служыць у гітлераўскай арміі. А летам 1942 года Франц трапіў на Усходні фронт. Балюча было перажываць тое, што ў Расію, да якой ён, дзякуючы бацькавым расказам, меў сімпатыю, прыехаў цяпер не як сябар, а як вораг.

...Орша, пасёлак Барань. Сапраўдны аэрадром быў на некалькі кіламетраў далей на захад, а тут гітлераўцы абсталявалі фальшывы, для падману савецкай авіяцыі. Сюды да аднаго з пражэктароў прыставілі і Франца Стэега.

Яму вельмі хацелася пазнаёміцца з тутэйшымі людзьмі. Але калі ішоў па вуліцы, яна нібы вымірала — нідзе ні душы. Разумеў усё, і ад гэтага было вельмі самотна.

Неяк трапіў на вечарынку. У хаце накурана, пілікаў гармонік. А калі сцямнела, выявілася, што ў лямпе няма газы. Хутка Франц прынёс бензіну. Назаўтра прыйшоў сюды ж, і зноў давялося бегчы за бензінам...

Не адразу мясцовыя жыхары пачалі лічыць маладзенькага аўстрыйца «сваім». І тут яго выклікаў гаўптман.

— Цацкаешся з бандытамі? Куды бензін цягаеш? Расстраляю!

І Стэега «за дружбу з рускімі» кінулі на 14 сутак у бункер.

Многа аб чым ён передумаў за тыя дні. Трэба было на нешта рашацца. Але ці паверадь яму, апранутаму ў чужую, ненавісную форму? Ці возьмуць у партызаны?

У партызанскі атрад ён трапіў у красавіку 1943-га. Дарогу сюды яму дапамагала знайсці дзяўчына з Барані Надзея Якушэвіч. І хоць размаўлялі яны пакуль на розных мовах, сэрца адважнай сувязной падказала, што яна не памыляецца, гэтаму аўстрыйцу можна паверыць.

А як ірваўся Стэег у першы бой! Цяпер ведаў Франц, хто яго ворагі, а хто сябры, чыя праўда святая, а чыя крывавая, захопніцкая.

Партызанскі полк Івана Садчыкава ў тыя дні вытрымаў цяжкія баі каля вёскі Купаваць на Сенненшчыне, нягледзячы на тое, што гітлераўцы кінулі на партызан артылерыю, танкі, самалёты. Вытрымаў і Франц Стэег. Вытрымаў і загартаваўся.

Неяк полк натрапіў на моцны заслон гітлераўцаў, якія прачэсвалі лясны масіў партызанскай зоны. Завязаўся бой. Цягнуўся ён трое сутак, сілы былі няроўныя. Першы і другі атрады ўсё ж вырваліся з акружэння, а трэці, дзе знаходзіўся Франц, апынуўся ў «мяшку».

«Што рабіць?» — гэта пытанне трывожыла кожнага. «Якія планы ў гітлераўцаў хаця б на надыходзячую ноч?»

Стэег папрасіўся ў разведку. Ён падпоўз настолькі блізка да варожага размяшчэння, што зусім выразна чуў, аб чым гавораць. Вярнуўся да сваіх усхваляваны:

— З раніцы лес будуць «прачышчаць» танкі...

Толькі прарывацца! Але дзе ў гітлераўцаў слабейшае месца? І такое месца «намацаў» Франц. Атрад з боем прарваў кальцо, злучыўся з асноўнымі сіламі.

Было потым яшчэ нямала баёў, у якіх удзельнічаў сын аўстрыйскага камуніста Франц Стэег. Нездарма гітлераўцы абяцалі за яго галаву ўзнагароду ў 25 тысяч марак. А калі яго схопіць салдат рэйха, адразу атрымае афіцэрскі чын.

А вось радкі з характарыстыкі, якую падпісаў камандзір асобнага Смаленскага партызанскага палка І. Ф. Садчыкаў:

«Франц Робертавіч Стэег, аўстрыец па нацыянальнасці, у 22 гады добраахвотна перайшоў з гітлераўскай арміі да савецкіх партызан. Мужна змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Асабіста знішчыў некалькі варожых салдат і афіцэраў».

* * *

Бываючы ў Аршанскім раёне, сустракаючыся і размаўляючы з людзьмі, я звярнуў увагу на нязвыклае для тутэйшых месц прозвішча — Стэег.

У калгасе імя Куйбышава пад Оршай мне расказалі пра Роберта Стэега. У шматтыражнай газеце «Чырвоны кастрычнік» у Оршы звярнуў увагу на фотаздымкі фотамайстра заводскай лабараторыі. І яшчэ пазнаёміўся з адным Стэегам — Валерыем. Ён тут жа, на заводзе. Працуе тэрмістам.

Як высветлілася, Роберт, Генрых і Валерый — сыны Франца Робертавіча Стэега, беларускага партызана родам з Аўстрыі. Пасляваенны лёс яго склаўся так, што родныя мясціны Надзеі Якушэвіч, адважнай партызанкі-сувязной, якая дапамагла знайсці яму сваё месца ў барацьбе з фашызмам, сталі назаўсёды блізкімі і роднымі для яго, сына аўстрыйскага камуніста. Яны пажаніліся, сталі жыць у Барані, пайшлі працаваць на аршанскі завод «Чырвоны кастрычнік».

Чалавек з адкрытым сэрцам, цікаўны, працалюбівы, Франц Робертавіч хутка асвоіў складаную рабочую прафесію, шмат гадоў працаваў майстрам, старшым майстрам.

Вялікая сям'я ў Стэегаў, інтэрнацыянальная. Усе тры нявесткі — беларускі. Падрастаюць шэсць унукаў. Любяць беларускія, рускія мелодыі і, вядома ж — венскі вальс. Праз усё жыццё пранёс яго ў сэрцы Франц Робертавіч.

*Л. Сузін.*

## Партызанскі ансамбль

### З успамінаў былога партызана-заслонаўца В. Целяпнёва

Пра гераічную барацьбу народных мсціўцаў напісана многа. Але не толькі ў баях і паходах праходзіла партызанскае жыццё.

Мне ўспамінаецца 1943 год. Набліжалася 20-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Партызаны брыгады Канстанціна Заслонава вялі ўпартыя баі з гітлераўцамі. Кожны стараўся зрабіць як мага больш для вызвалення Радзімы. Але ўсё ж свята Вялікага Кастрычніка і ў такіх абставінах хацелася адзначыць па-святочнаму. Але як? Нехта прапанаваў даць канцэрт мастац-

кай самадзейнасці. Тады і быў створаны партызанскі ансамбль, кіраўнікамі і ўдзельнікамі якога былі партызаны і партызанкі.

У часы адпачынку ў вёсках, дзе размяшчаліся атрады, паладжваліся сходы, чыталіся даклады для партызан і жыхароў вёсак. Сярод нас было некалькі артыстаў-прафесіяналаў. З іх дапамогай быў створаны хор, струнны аркестр, танцавальны калектыў. І, вядома, абавязкова ўдзельнічалі майстры мастацкага слова.

Пасля кожнай удалай баявой аперацыі можна было чакаць, што партызанскія пісьменнікі і артысты скажуць аб гэтым сваё трапнае слова. Гумар і сатыра браліся на ўзбраенне з вялікім поспехам.

Памятаю, як у час аднаго з выступленняў ансамбля перад насельніцтвам была прачытана аповесць «Сто дванцаты» (аўтар невядомы). У ёй расказвалася, як фашыст расстраляў сто дзевятнаццаць савецкіх грамадзян, але і яго самога спасцігла суровая кара. Уражанне было настолькі вялікае, што назаўтра каля дзесятка жыхароў вёскі далучыліся да народных мсціўцаў, каб помсціць ворагу.

Выступленні партызанскага ансамбля садзейнічалі падтрыманню баявога духа народных мсціўцаў, натхнялі іх на новыя подзвігі, умацоўвалі веру людзей у нашу непазбежную і хуткую перамогу.

## Партызанскія танкі

Партызанскі полк Садчыкава прайшоў па варожых тылах ад Смаленска праз усю Беларусь да заходняй граніцы, знішчыў многа жывой сілы і тэхнікі ворага. Адной з выдатных аперацый палка на Сенненшчыне быў захоп танкаў у Багушэўскім гарнізоне, які ажыццявілі партызанскія разведчыкі і багушэўскія падпольшчыкі Мікалай Горб і Сямён Філіповіч. Кіравалі аперацыяй намеснік камандзіра палка па разведцы Г. П. Дамарацкі і камісар атрада А. Е. Туманаў.

...Пагодным летнім днём на цэнтральную сядзібу Багушэўскай МТС, ператвораную акупантамі ў майстэрню для рамонту баявой тэхнікі, з'явілася конная група эсэсаўцаў. У начальніка раскаваўся конь — трэба падкаваць. Застаўшыся ўдвух з кавалём, «афіцэр» раптам спытаў па-руску:

— А сярэбранай падковы ў вас няма?

Гэта быў пароль.

— На шчасце, як талісман? — пытаннем на пытанне адказаў каваль.

— Слухай заданне,— не трацячы часу,— сказаў пераапрануты ў нямецкую форму партызанскі разведчык, чэх Герман Габлер, падпольшчыку Сямёну Філіповічу,— звяжыся з Мікалаем Горбам і ваентэхнікам Хварасцянкам. Перадай, каб тэрмінова рыхтавалі танкі да выхаду ў лес.

Хутка танкі Т-34 і Т-26, падбітыя на полі бою і захопленыя ворагамі, былі ў поўнай баявой гатоўнасці. Экіпажы з савецкіх ваеннапалонных, з якімі падпольшчыкі правялі вялікую агітацыйную і арганізатарскую работу, чакалі загад партызанскага камандавання. Такі загад паступіў 19 ліпеня 1943 года.

Пачатак аперацыі быў намечаны на пасляабедзенны час, калі гітлераўцы звычайна адпачывалі. Два спраўныя танкі, тайна запраўленыя Філіповічам і Горбам палівам і боепрыпасамі, павінны былі выехаць з гарнізона «на абкатку». Але здарылася непрадбачанае. У поўдзень у Багушэўск прыехала высокае начальства. Камендант маёр Бод аб'явіў танкістам-«добраахвотнікам», што ім аказваецца вялікі гонар: прадэманстраваць перад прадстаўнікамі германскага камандавання сваё майстэрства і баявыя якасці танкаў. Танкісты ж ужо самі вырашылі, што ім рабіць.

...І вось па дарозе на Сянно рухаецца калона. Уперадзе — «Мерседэс» з гітлераўскімі афіцэрамі, за імі танкі Т-34 і Т-26, потым грузавікі з салдатамі і супрацьтанкавымі гарматамі. Замыкаў калону цяжкі нямецкі танк... Як толькі першыя два танкі праехалі цераз мост, Аляксей Хварасцянка, высунуўшыся з люка, крыкнуў:

— Бі, даві гадаў!

Рыўком ён кінуў трыццацьчацвёрку ўперад, на «Мерседэс», потым, развярнуўшыся,— на машыны з гітлераўцамі і гарматамі, з якімі ўжо біўся лёгкі Т-26.

У гэты час амаль аднačасова раздаліся два выбухі. Адным быў знішчаны мост з уз'ехаўшым на яго нямецкім танкам, другім — майстэрня, у якой згарэлі два танкі Т-26 і грузавая аўтамашына.

Хутка нашы танкі прынялі на сваю браню партызанскіх разведчыкаў і камандзіраў Генадзя Дамарацкага, Андрэя Туманава, Міхаіла Салаўёва, Вікенція Гікаса і Міхаіла Ягорава, якія ўзарвалі мост, і паімчалі ўперад.

Потым танкісты партызанскага палка Садчыкава дапамагалі разграміць 13 умацаваных апорных пунктаў гітлераўцаў, у тым ліку Гарывецкі, Чарэйскі і Чашніцкі гарнізоны.

Як жа склаўся далейшы лёс удзельнікаў гэтай «танкавай» аперацыі? Чэх Герман Габлер загінуў смерцю храбрых у вулічных баях за Чашнікі 21 кастрычніка 1943 года. Камандзір «трыццацьчацьвёркі» Аляксей Хварасцянка разам са сваім экіпажам згарэў у танку ў верасні таго ж года пры штурме Чарэі. Разведчык Міхаіл Салаўёў загінуў у ноч з 4 на 5 мая 1944 года пры прарыве ўшацкай блакады.

Г. П. Дамарацкі закончыў вайну на ўзбярэжжы Ціхага акіяна намеснікам начальніка разведаддзела арміі. А. Е. Туманаў пасля злучэння партызан з войскамі Савецкай Арміі вярнуўся на партыйную работу ў Смаленскую вобласць. Пасля таго, як узарвалі майстэрню з танкамі, Сямён Філіповіч адразу далучыўся да партызан, а Мікалая Апанасавіча Горба схапілі гітлераўцы. Жорсткія катаванні і пагроза смерці не зламалі волю мужнага партызана. З дапамогай падпольшчыкаў яму ўдалося ўцячы ў лес да партызан.

М. Ягораў, які безліч разоў глядзеў смерці ў вочы ў партызанах і на фронце, дайшоў да Берліна і ўзняў над рэйхстагам сцяг Перамогі.

*Л. Каплін.*

## 16-я партызанская брыгада на Сенненшчыне

16-я партызанская брыгада прыняла першых байцоў у 1942 годзе ў лясах Смаленшчыны, свой баявы шлях закончыла ля сцен Вільнюса. На баявым рахунку партызан каля 12 тысяч знішчаных варожых салдат і афіцэраў, 128 пушчаных пад адхон эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, 113 танкаў, 350 аўтамашын, 40 цыстэрнаў з палівам, 49 самалётаў, 53 гітлераўскія гарнізоны ў раённых цэнтрах, сёлах і пасёлках.

Вясной 1943 года партызанская брыгада прыбыла на тэрыторыю Сенненшчыны і дзейнічала тут амаль да канца года. У саставе брыгады было сем атрадаў, ва ўсіх змагаліся з гітлераўскімі захопнікамі сенненцы.

### ПЕРАРВАНЫ АДПАЧЫНАК

24 сакавіка 1943 года наша брыгада прыбыла ў вёску Аўсеева Сідорніцкага сельсавета. Пасля вялікага пераходу адчувалі патрэбу ў адпачынку, і камандаванне аддало загад: выставіць варту, астатнім — адпачываць. Але адпачынак быў кароткім.

Праціўнік пачаў наступленне. Спачатку партызаны занялі абарону, разлічваючы на працяглы бой. Але атака ворага была слабай. Ён не вытрымаў на ўчастку трэцяга ўзвода атрада і адступіў. Адчуўшы слабасць ворага, і на другіх участках партызаны перайшлі ў наступленне. Праціўнік пачаў адыходзіць. У баку ад Аўсеева ёсць невялікі лясок. Вось тут падраздзяленне партызан поўнасцю разбіла ворага, захапіла яго абоз. На іншых участках гітлераўцы былі змяты, знішчаны, і толькі некаторым афіцэрам ды невялічкай групе салдат удалося ўцячы. У гэтым баі прынялі ўдзел і навічкі. Больш двух дзесяткаў мясцовых жыхароў папоўнілі брыгаду 24 і 25 сакавіка. У баі смеласць праявілі толькі што прыйшоўшыя Павел Печкуроў, Дзмітрый Новікаў і іншыя.

### БОЙ ЗА ВЁСКУ РАЙ

Ноччу партызанская брыгада размясцілася ў вёсках Рай і Сычэва. А раніцай 26 сакавіка раздалася каманда:

— Да баявой гатоўнасці! Трывога!

Да вёскі Рай праціўнік рухаўся двума калонамі, кожная прыкладна па 300 салдат і афіцэраў. Гітлераўцы такой сілай ішлі вольна, без разведкі, як на прагулцы.

Народныя мсціўцы не займалі абароны, а сходу пайшлі ў атаку, білі па ворагу з кулямётаў, аўтаматаў. Гітлераўцы разгубіліся. А партызаны ўсё набліжаліся і набліжаліся, цяпер ужо кароткімі перабежкамі, наносілі ворагу адчувальны ўдар. Гітлераўцы не вытрымалі і пачалі адступаць.

Немалую дапамогу брыгадзе аказалі жыхары вёскі Рай. Многія з іх пайшлі ў наступленне, іншыя былі праваднікамі, дапамагалі несці патроны. Гэта Леанід Капыткоў, Фёдар Міронька і іншыя. 13-гадовы Коля Капыткоў, жыхар вёскі Рай, заўважыўшы калону фашыстаў, узяў дзве гранаты «Ф-1» і разам з партызанамі пайшоў у бой. А потым, калі паранілі аднаго партызана, Коля замяніў яго ў страі.

## ПІСЬМО ПАРТЫЗАНАМ І ІХ АДКАЗ

З вёскі Рай народныя мсціўцы хадзілі граміць гарнізон фашыстаў у Сяльцы. Праз некалькі хвілін пасля пачатку бою ў гарнізоне панавала неразбярыха. Гарэлі склады, канюшні, артпарк, харчовыя базы. На агонь партызан гарнізон ужо не адказваў, а калі дзе з'яўлялася агнявая кропка, яна хутка падаўлялася.

Так паступова заціх бой. З боку Смалян у паветры засвяціліся некалькі ракет. Гэта нашы засады паведамлялі, што немцы спяшаюцца на дапамогу. Але партызаны ўжо пачалі адыход. Былі знішчаны два склады боепрыпасаў, забіта 89 салдат і афіцэраў, 68 паранена, з строю выведзена 12 гармат, спалена 70 коней.

Застаўся ў жывых камандзір артпалка фон Штрубе. Каб адпомсціць партызанам за Аўсеева, Рай, Сялец, ён сабраў рэшткі сіл, атрымаў падмацаванне і выступіў у напрамку вёсак Рай, Сычэва, Ляўкова, Кузьміно, Купаваць. Праціўнік на працягу аднаго дня акружыў партызан, але гэта далося яму цаной вялікіх страт.

Фон Штрубе паведамляў у Оршу, што партызаны акружаны, знішчэнне іх — справа бліжэйшых гадзін. Партызаны разумелі, якое цяжкае склалася становішча. Была фарсіравана рака Абалянка, прарвана кальцо акружэння, і народныя мсціўцы выйшлі да вёскі Багданава.

Разгадваючы задумы праціўніка, умела манеўруючы, партызаны пазбягалі «катлоў», а самі кожны дзень у сакавіку і красавіку наносілі ўдары па ворагу.

## ІНІЦЫЯТЫВА АЎСЯННІКАВА

Невысокага росту, каржакаваты, Сяргей Аўсяннікаў спрытна сядзіць у сядле, углядваецца ўдалеч. Потым, звярнуўшыся да сябра, гаворыць:

— Вунь, на шашы з Сянна рухаецца калона варожых машын...

Разведчыкі зварочваюць з дарогі, каб весці назіранне за праціўнікам.

Вечарэе. Хутка калона набліжаецца да вёскі Маліпаўшчына. Некалькі дзён назад разведчыкі другога атрада разбурылі мост ля гэтай вёскі, і нямецкая калона машын спыніцца перад воднай перашкодай.

— Ударым па ворагу,— прапаноўвае Сяргей.

— Не спяшайся, ацэнім абстаноўку і потым будзем дзейнічаць,— адказвае сябар.

Тым часам фашысты пачалі падцягваць да рэчкі бярвёны, каб за кароткую летнюю ноч зрабіць пераправу. Выбраўшы зручнае месца для магчымага адыходу на выпадак атакі, абодва разведчыкі адкрываюць агонь з аўтамата і СВТ па аўтамашынах і жывой сіле праціўніка.

Вораг у паніцы, бо не ведае, колькі перад ім партызан. А разведчыкі, хутка мяняючы адну пазіцыю за другой, уводзяць яго ў зман. Загарэлася некалькі машын...

Калі раніцай калона прайшла, а разведчыкі наблізіліся да Малінаўшчыны, мясцовыя жыхары паведамілі, што немцы ўсю ноч стаялі ў абароне, што ў іх былі параненыя і забітыя.

## КОННІКІ АТАКУЮЦЬ ГАРНІЗОН

Дзень 3 ліпеня выдаўся гарачым. Брыгада знаходзілася ў вёсцы Бесцвіна. Сюды яна прыйшла пасля моцных баёў у Бешанковіцкім раёне.

Летам дзень цягнецца доўга, а тым больш калі знаходзішся ў абароне. Праціўнік пераўзыходзіў брыгаду па жывой сіле і ўзбраенню. Але, нягледзячы на атакі, партызаны не кідалі сваіх пазіцый.

Увесь дзень кіпеў жорсткі бой. Калі ўжо набліжаўся вечар, партызаны адчулі сябе больш упэўнена, вораг жа, наадварот, цягнуў час, каб як-небудзь адступіць. У гэты момант чацвёрты атрад перайшоў у атаку.

Хутка быў падрыхтаваны атрад коннікаў, каб з ходу ўварвацца ў вёску Адамава, нанесці нечаканы ўдар. Партызаны, што знаходзіліся ў коннай групе, былі сведкамі таго, як разбіты за дзень полк фашыстаў уцякаў за горку.

Было зроблена некалькі выстралаў, але праціўнік быў ужо за гарой. У гэтым баі каля батальёна салдат і афіцэраў страцілі гітлераўцы.

## У НАВАГОДНЮЮ НОЧ

Была ў нашай брыгадзе разведчыца Вольга Іванаўна Кажэмская. Вельмі яна дапамагала партызанам. Магла прабрацца ў гарнізон, пагутарыць з паліцэйскімі, перадавала ад нас пісьмы, лістоўкі. Настаўніца дапамагла нам разведаць Вятна і потым разграміць гарнізон.

...Аглушальны выбух страсянуў вёску. Пачалася атака, атрад наступаў.

Знішчыўшы за некалькі хвілін увесь гарнізон, захапіўшы трафеі, партызаны збіраліся за мосцікам паблізу вёскі.

На санях, захопленых мсціўцамі каля дзяжурнага памяшкання гарнізона ворага, ехала Вольга Іванаўна. З яе дапамогай узялі ў якасці «языка» афіцэра, які займаўся выяўленнем партызан у раёне Сянно—Чашнікі і прыбыў у Вятна на навагодні вечар. Па загаду гэтага карніка знішчаны, расстраляны, павешаны, загублены сотні савецкіх грамадзян.

Кат ішоў за санямі і з нянавісцю глядзеў на бабульку, якую ён зусім нядаўна выпусціў з камеры смерці, бо не было ніякага доказу яе віноўнасці, а цяпер ён разумеў, што яго ашукалі.

Скончылася вайна. Вольга Іванаўна працавала настаўніцай у пачатковай школе. У 1959 годзе пайшла на пенсію. Яе месца ў школе заняла дачка — Алімпіяда Пятроўна.

## СПРАВЫ МОЛАДЗІ

Камандаванне пятага партызанскага атрада распрацавала аперацыю «Тухінка». У Тухінцы, пад Сянном, стаяў гарнізон ворага. Вёска размешчана на невялікім узгорку, побач — гарадскі гарнізон.

З'яўленне партызан у Тухінцы праціўнік сустрэў «мірна». Увесь асабовы склад гарнізона забраўся ў дзоты і сядзеў, не адкрываючы агню. Атрад, у якім была ў асноўным моладзь, забраў боепрыпасы, прадукты. Калі партызаны адышлі кіламетры на два, толькі тады запрацавалі варожыя кулямёты.

Дзесьці ў сярэдзіне лістапада памочнікаў камісараў атрадаў па камсамолу запрасілі ў штаб брыгады. Там падагульнялі вынікі выканання абавязацельстваў. Камсамольская арганізацыя пятага атрада была адзначана ў ліку лепшых.

Вось кароткі пералік таго, што зрабілі юнакі і дзяўчаты за паўмесяца. Галубоўская, Карпаў і Тарасенкаў на шашы Віцебск—Бешанковічы разбурылі мост, што заходней Задарожжа. Маладзёжная група ў складзе Кабанава, Радзюкова, Сухвалава, Дзятлава на чыгунцы Віцебск—Орша, паблізу Багушэўска, каля Навязак узарвала варожы эшалон з 30 крытымі вагонамі. Верамееў, Дарашкевіч і пяць партызан на шашы Бешанковічы—Віцебск разбурылі два масты і выразалі 1,5 кіламетра кабелю. Ля вёскі Мядзвецкі Сучкоў, Лепяшынская, Пазнякова падарвалі гітлераўскую аўтамашыну. На шашы Бешанковічы—Віцебск праведзены рад іншых дыверсій. За гэты час маладыя партызаны ўдзельнічалі не раз у баях з гітлераўцамі.

## ІМ АПЛАДЗІРАВАЛІ

Славілася 16-я партызанская брыгада сваёй мастацкай самадзейнасцю. У ёй удзельнічалі многія камандзіры, палітработнікі, радавыя партызаны. І заўсёды, калі яны выступалі перад насельніцтвам Сенненшчыны, ім апладзіравалі, збіралася шмат народу.

У вёску Вялікае Сяло па просьбах жыхароў прыбыла наша мастацкая самадзейнасць. На вечар сабралася каля 400 жыхароў, усе, ад малога да старога. Амаль усе нумары былі прысвечаны гераічным подзвігам савецкіх людзей, барацьбе нашага народа супраць фашысцкіх захопнікаў.

У самы разгар канцэрта Антаніна Чарняўская і Вера Пісарэнка, дзяўчаты з гэтай вёскі, паведамілі: гітлераўцы вырашылі зрабіць напад. Насустрач нязваным «гасцям» быў пасланы заслон народных мсціўцаў. Завязаўся бой, а канцэрт працягваўся. У баі было знішчана 12 салдат праціўніка, партызаны страт не мелі.

Партызанская мастацкая самадзейнасць карысталася поспехам у іншых партызанскіх атрадах і брыгадах. Актыўны ўдзел у ёй прымалі Таццяна Дзятлава (Сцяпанава), Станіслаў Шмуглеўскі, Васіль Будзюкін, Аляксандр Макушаў і многія іншыя.

## АДВАЖНЫЯ ЗЕМЛЯКІ

У 16-й партызанскай брыгадзе жыхары Сенненшчыны знаходзіліся ва ўсіх васьмі атрадах. Іван Марцінавіч Дунец з вёскі Падворыца, напрыклад, на сваім рахунку мае многа баявых подзвігаў: падарваны варожы эшалон, дзве аўтамашыны, мост, удзельнічаў у разгроме гарнізона ў вёсцы Гарывец. Адвагу і храбрасць праявіў ён у перыяд блакады партызан Лепельска-Ушацкай зоны. За ўмелае кіраўніцтва боем у час ранення камандзіра быў вылучаны на пасаду камандзіра ўзвода.

Таксама адважна змагаліся з ворагам Арцём Майсеевіч Доўгі, Дзмітрый Васільевіч Дубавец з вёскі Сычыкі, Іван Акімавіч Духовіч і многія іншыя.

## КУЛЯМЁТЧЫК ВАЛОДЗЯ АЛЕЙНІКАЎ

Нашаму атраду было загадана размясціцца ў вёсцы Свечы. У штабе мы дамовіліся, што збяром камсамольскі сход, абмяркуем

вынікі дзейнасці маладых мсціўцаў, паставім задачы на бліжэйшы час.

2. Уничтожение не менее двух воинских эшелонов противника, при этом первенство имеет тот отряд, который спустил наибольшее число эшелонов с живой силой врага.

3. Наиболее активное участие отряда в принятых открытых боях с противником и хорошие показатели этих боев.

4. За лучшую постановку в проведении массово-политической работы среди партизан и населения.

5. За точное и своевременное проведение боевой разведки и за хорошую постановку агентурной связи и работы в этой области.

6. За высокие показания дисциплины, создание сильной боевой единицы.

7. Знамя в первый раз присуждается за показатели в феврале и ежемесячно и хранится в штабе отряда.

Секретарь Богушевского РК КП(б)Б Прохоренко

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 210. Л. 23—23аб.*

## З ПРАТАКОЛА № 3 ПАСЯДЖЭННЯ БАГУШЭЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б

**27 лютага 1944 г.**

СЛУШАЛИ: О вручении переходящего Красного Знамени РК КП(б)Б.

ПОСТАНОВИЛИ: За боевые показатели за февраль месяц 1944 г. вручить переходящее Красное Знамя Богушевского райкома КП(б)Б отряду № 5, который спустил под откос за этот месяц 4 вражеских эшелона, убито 413 немцев. Кандидатами на получение переходящего Красного знамени зачислить отряды № 6 и 8.

СЛУШАЛИ: О переименовании отряда в комсомольско-молодежный.

ПОСТАНОВИЛИ: В связи с тем, что в 5-м отряде имеется 83% партизан, имеющих комсомольский возраст.

Удовлетворить ходатайство РК ЛКСМБ о переименовании 5-го отряда в комсомольско-молодежный. Поручить секретарю комсомола тов. Хвощу довести до сведения весь личный состав отряда о данном решении и мобилизовать активность партизан на усиление боевого действия отряда.

Секретарь Богушевского РК КП(б)Б Прохоренко

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 210. Л. 25.*

## З ПРАТАКОЛА № 23 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО СЕННЕНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б

**10 сакавіка 1944 г.**

Присутствовали члены РК Любимцев, Леонов, Осинский, Жигаловский

СЛУШАЛИ: О мерах сохранения в районе скота и экономного расходования продуктов питания.

ПОСТАНОВИЛИ: Сенненский РК КП(б)Б отмечает, что в районе осталось ограниченное количество скота, которое не в состоянии покрыть потребность партизанских отрядов и имеются случаи изъятия у гр-н коров от 5—7 душ семьи.

Такое положение ставит под угрозу партизанские отряды в ближайшее время остаться совершенно без мясных и молочных продуктов, что в свою очередь может привести к целому ряду нездоровых явлений в отрядах и создать недовольство среди населения.

В целях экономии продуктов и устранения в дальнейшем политических ошибок при заготовках, а также не дать возможности врагу в своей пропаганде обливать грязью партизан и спекулировать на грубых ошибках отдельных партизан, Сенненский РК КП(б)Б ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Обязать командиров и комиссаров бригад и отрядов, действующих в Сенненском районе:

а) организовать во всех партизанских отрядах питание партизан и командиров с общего котла и наладить учет продуктов питания;

б) ограничить норму мяса до 200 грамм в день на бойца и практиковать 2—3 дня в неделю приготовление пищи из молочных продуктов, жировых наваров от костей и рыбных блюд;

в) создать в отрядах при хоз. взводах необходимое стадо дойных коров, обеспечив их хорошим уходом и кормом.

г) отрядам, расположенным вблизи реки и озер, организовать из населения рыболовецкие группы.

Секретарь Сенненского РК КП(б)Б Любимцев

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 309. Л. 76—76ад.*

## З ПРАТАКОЛА № 25 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО СЕННЕНСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б

**10 красавіка 1944 г.**

Присутствовали тт. Любимцев, Осинский, Жигаловский, Леонов

СЛУШАЛИ: О мероприятиях помощи населению в весеннем севе.

ПОСТАНОВИЛИ: Сенненский РК КП(б)Б обращает внимание командиров, комиссаров и секретарей первичных парторганизаций о необходимости развертывания кампании борьбы за хлеб и отмечает, что ряд командиров и комиссаров отрядов района недооценивают значение помощи населению в проведении полевых работ лошадьми, рабочей силой и т. д. Имелись случаи, когда отдельные партизаны в период полевых работ отбирали у населения лошадей, повозки, упряжь, что в свою очередь приводило местами к срыву уборки урожая и осеннего сева 1943 г.

Во избежание срыва работ весеннего сева Сенненский РК КП(б)Б ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Обязать командиров, комиссаров и секретарей первичных парторганизаций бригад и отрядов, независимо от места нахождения, максимально уделять внимание вопросу помощи населению в проведении весеннего сева, тягловой силой, упряжью, рабочей силой и т. д.

2. Оказать населению помощь в ремонте сельхозинвентаря для весеннего сева и рекомендовать населению по окончанию сева прятать сельхозинвентарь.

3. Запретить партизанам своих отрядов в период весеннего сева отбирать у населения лошадей, повозки и вести решительную борьбу с потравами весенних посевов.

4. Практиковать населению производить вспашку и другие полевые работы на коровах.

5. Установить в партизанских отрядах учет помощи населению в весенних полевых работах и ежедневно представлять сведения в РК КП(б)Б.

Настоящее постановление довести до сведения всех бригад и отрядов, а также проработать в первичных партийных и комсомольских организациях.

СЛУШАЛИ: О мероприятиях по реализации обращения Президиума Верховного Совета, СНК и ЦК КП(б)Белоруссии*.

ПОСТАНОВИЛИ: Сенненский РК КП(б)Б отмечает, что несмотря на решение 5-го Пленума ЦК КП(б)Б, а также ряд указаний вышестоящих партийных органов, о широком развертывании партизанского движения и спасения населения от угона в фашистское рабство партизанские отряды района все же не выполняют полностью этих указаний, недостаточно помогают укрываться от гитлеровцев населению. Еще мало способствуют к расширению партизанского движения, в результате противнику удается угонять в фашистское рабство и вооружить против партизан и Красной Армии часть белорусского населения, например: взята часть населения противником в деревнях Овсище, Приветок, Латыголь, Большое и Малое Озерецкое и ряд других деревень района.

Обращение к белорусскому народу Президиума Верховного Совета СНК и ЦК КП(б)Б требует от нас, партизан и партизанок, приложить все силы к спасению населения от угона в фашистское рабство и еще большего развертывания партизанского движения, а также срывать мобилизации белорусского народа в германскую армию.

Исходя из этого, Сенненский РК КП(б)Б ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Обязать командиров и комиссаров бригад и отрядов проводить массово-политическую работу среди населения района, мобилизовывая их на срыв мероприятий немецких властей по мобилизации в «народную армию» и полицию мужского населения и спасать от угона в фашистское рабство. Привлекать в партизанские отряды здоровое мужское население, создавать резервы, коим выдать удостоверения о приписке к отряду, организовать обучение оружию и строевой службе. Все личные документы призванных сохранять при штабах бригад.

---

*Маецца на ўвазе зварот СНК БССР, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, ЦК КП(б)Б да беларускага народа аб зрыве мабілізацыі ў гітлераўскую армію ад 31 сакавіка 1944 г.



. Зак. 2999

Не позднее 25 апреля с. г. представить райкому партии сведения о проведенной работе и численном составе принятых в отряды и резерв.

Оказывать всемерную помощь семьям партизан и другим советским гражданам района и спасать от угона в фашистское рабство.

Усилить боевую деятельность отрядов, нападать на гитлеровские мобилизационные сборные пункты, на штабы, гарнизоны, разрушать связь, мосты, железные дороги, подрывать эшелоны и другую технику противника.

Обязать комиссаров, партийные и комсомольские организации отрядов широко развернуть агитационно-массовую работу среди партизан и населения по вопросу обращения Президиума Верховного Совета, СНК и ЦК КП(б)Б, помогая населению укрываться от гитлеровской мобилизации, разъясняя суть этой мобилизации и ее последствий, подымать весь народ на священную борьбу с врагом, разъясняя населению о скором освобождении нас нашей доблестной Красной Армией, о ее победах на фронтах и о крахе фашистской Германии. Распространять шире сводки, газеты и обращения Президиума Верховного Совета, СНК и ЦК КП(б)Б, в гарнизонах противника и среди населения.

Все силы на помощь наступающей Красной Армии и на спасение населения.

Настоящее постановление довести до сведения всех партизанских отрядов и бригад района.

Секретарь Сенненского РК КП(б)Б Любимцев

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 309. Л. 80, 81аб., 82, 82аб., 83.*

## З ПРАТАКОЛА № 27 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО СЕННЕНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б

**5 мая 1944 г.**

Присутствовали: Любимцев, Леонов, Осинский, Жигаловский, Политик.

СЛУШАЛИ: О фактах мародерства, пьянства, бытового разложения и т. д.

ПОСТАНОВИЛИ: Сенненский РК КП(б)Б признает, что постановление бюро Витебского обкома КП(б)Б о фактах мародерства, пьянства, очковтирательства, бытового разложения и других преступлений целиком и полностью относится к бригадам Сенненского района Леонова и Кириллова, указывающего на то, что в отрядах бригад имеются факты мародерства, пьянства и бытового разложения. В местах расположения отрядов процветает самогонокурение, отдельными партизанами допускаются грубости с мирным населением, изымаются незаконно продукты питания, одежда и другое имущество. Многие женщины и девушки партизанки не принимают участия в боевых операциях, не несут службы, в отрядах считаются женами командно-политического состава и удовлетворяют только их прихоти. Не всегда проверяются боевые операции диверсионных и боевых групп, что приводит к очковтирательству о количестве уничтоженной живой силы и техники противника. Некоторые командиры и комиссары оторвались от бойцов и не ведут воспитательной работы. В некоторых отрядах ослаблена партийно-массовая работа. Все это понижает дисциплину и боевую деятельность отрядов, ослабляет связь партизан с населением, тормозит развитие партизанского движения.

Сенненский райком партии отмечает, что в некоторых отрядах командование мало занимается боевыми вопросами и основное внимание уделяет вопросам личной роскоши, приобретению хорошей одежды, обуви для себя и своих жен, снабжению себя изысканным питанием и самогоном, не проявляя должной заботы о бойцах, не принимает решительных мер борьбы с преступлениями, что способствует распространению мародерства, пьянства и других явлений, в результате чего имеются следующие факты:

19 марта с. г. в дер. Углы партизанами 2-го батальона (командир Демин) бригады Кириллова, со взломом замков были взяты: корова у партизанских семей, при этом были избиты гражданки Шавель и Дементьева. Вместо наказания виновных командование батальона скрыло этот факт. Этого же числа в дер. Каменец партизанами этого же батальона у граждан Гамоша Егора, Позняка В., Скакуна Данила, Островского Алексея, ночью украдена рожь, овес, куры и белье, при этом угрожали расстрелом.

9 апреля партизаны отряда им. Кутузова (командир отряда Шевцов) бригады Леонова Саврат Г. И., Атращенко А. С., Талуй В. в дер. Старые Лавки взломали замок в склепе, раскопали яму и взяли у семьи партизана соль, подошву и зерно.

30 марта в дер. Вал партизан отряда им. Б. Хмельницкого (командир Пилипенок) Алексеев И. Е., будучи пьяным, избил Голубовского С. П. и его жену, произведя над головой несколько выстрелов.

19 апреля партизаны отряда им. Ал. Невского (командир отряда Пацепко) Шибеко Н. К. (старший группы) с 2 бойцами в дер. Бояры побоями и стрельбой в квартире вымогали у гражданки Ткаченко Феклы самогон. Командир партизанского отряда «Богдан Хмельницкий» тов. Пилипенок и комиссар т. Семеньков грубо и с нанесением побоев незаконно изъяли у двух граждан дер. Замочек некоторое имущество.

Партизаны отряда Захарова — Нечаев, Русково, Петракович и Дыманов в дер. Клипино, в пьяном виде насильным путем отняли у крестьян соль. Командир хоз. взвода партизанского отряда Чапаева Горбачев М. и старшина Горбачев Е. систематически пьянствуют. Горбачев Е., имея при себе законную жену, принудил к сожительству партизанку.

В м. Черея партизан бригадной разведки Мелеев Е. Е. взломал замок, украл личные вещи у гражданки Самодуровой.

Подобные явления могли распространяться лишь потому, что со стороны командиров и комиссаров не ведется должная партийно-политическая работа и не пресекаются строжайшими мерами виновники преступлений, отсутствует большевистская бдительность и недооценивается серьезность и ответственность переживаемого нашей родиной момента.

Исходя из этого Сенненский РК КП(б)Б ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Обязать командиров, комиссаров и секретарей парторганизаций бригад и отрядов устранить указанные выше недостатки, порочащие партизанское движение, ослабляющее борьбу партизан с оккупантами, пресекать эти явления самым строжайшим образом, от кого бы они не исходили.

Строжайше воспретить кому бы то ни было самогонокурение, изъять и уничтожить самогонные аппараты. У крестьян, занимающихся самогонокурением, изъять излишки зерна и картофеля, оставив необходимую норму для проживания и посева.

Сурово наказывать виновных партизан, как рядовых, так и командиров, за пьянство, мародерство, бытовое разложение и другие преступления, рассматривая их как пособников врага.

Тщательно проверять каждую боевую операцию диверсионных и боевых групп и жестоко карать за очковтирательство и обман.

Всех вооруженных женщин и девушек — партизанок из штабов, перевести в подразделения бойцами, диверсантками и разведчиками, дав им возможность проявить себя на боевой работе. Не вооруженных использовать на хозяйственных работах.

Перевести в диверсионные группы всех диверсантов мужчин и женщин, окончивших спец. школы.

Исключить всякие привилегии для жен командно-политического состава, дав им возможность выполнять свой долг перед родиной наравне со всеми партизанами. Изъять у них лошадей и передать для перевозки раненых, имущества отряда или разведки.

Считать обязательным для командиров и комиссаров вести скромную и простую личную жизнь, способствуя этим созданию подлинной военной дисциплины в отрядах, основанной на сознании своего долга перед родиной.

Беспощадно карать тех, кто по-тунеядски, под силой оружия или используя свой авторитет власти, занимается благоустройством своей личной жизни за счет населения.

Пересмотреть штаты хоз. взводов и укомплектовать их из числа проверенных честных партизан, сократив до минимума пассивный и обслуживающий ком. политсостав в отрядах, ординарцев, хозяйственников, кухарок и т. д.

Обязать комиссаров и секретарей парторганизаций бригад и отрядов не позднее 10 мая с. г. провести партийные и комсомольские собрания с вопросом реализации данного постановления и принять меры развертывания массово-воспитательной работы по изжитию указанных преступлений.

Сенненский РК КП(б)Б предупреждает командиров, комиссаров и секретарей парторганизаций бригад и отрядов, что они первые несут строжайшую ответственность перед коммунистической партией и советской властью за политическую и боевую деятельность своих бригад и отрядов:

Обязать зав. отд. пропаганды и агитации райкома партии не позднее 7 мая с. г. созвать партийный актив партизанских бригад и отрядов по указанным выше вопросам. Докладчиком утвердить комбрига тов. Леонова.

Обязать секретаря Сенненского РК ЛКСМБ тов. Никитина на основе данного постановления развернуть массово-политическую работу по воспитанию комсомольцев и несоюзной молодежи отрядов, изживая указанные выше недостатки.

Настоящее постановление довести до сведения всех коммунистов бригад и отрядов, нацелив их на устранение преступных явлений.

Секретарь Сенненского РК КП(б)Б — Любимцев

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 309. Л. 88, 88аб., 89, 89аб., 90.*

## ПАСТАНОВА СЕННЕНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б АБ ЗБОРЫ СРОДКАЎ НА ПАБУДОВУ ТАНКАВАЙ КАЛОНЫ «ПАРТЫЗАН ВІЦЕБШЧЫНЫ»

**10 красавіка 1944 г.**

Бюро Сенненского РК КП(б)Б обращает внимание командиров, комиссаров и секретарей первичных парторганизаций п/бригад и отрядов, что во всех районах Белоруссии развернулось массовое патриотическое движение по сбору средств на вооружение Красной Армии. Трудящиеся Витебской области отдают все свои сбережения на построение танковой колонны «Партизан Витебщины».

Исходя из этого Сенненский РК КП(б)Б постановляет:

1. а) обязать командиров, комиссаров, партийные организации п/отрядов Сенненского района развернуть массовый сбор средств среди партизан и населения на построение танковой колонны «Партизан Витебщины», широкую разъяснительную работу вокруг этого мероприятия, возглавив это важнейшее военно-политическое дело, подавая пример для всех партизан и населения в деле сдачи своих сбережений (денег, облигаций, ценных вещей) на вооружение Красной Армии...

в) практиковать добровольные отчисления из зарплаты партизан и партизанок на построение танковой колонны «Партизан Витебщины».

Все собранные средства сдавать в Сенненский РК КП(б)Б.

Секретарь Сенненского РК КП(б)Б — Любимцев

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 308. Л. 158.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМІСАРА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ КІРЫЛАВА АБ ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ за красавік 1944 г.

**1 мая 1944 г.**

...Собрано средств среди населения на сумму 13672 руб., которые переданы в Сенненский РК КП(б)Б для пересылки в обком, из них 75 руб. серебром, 4125 руб. облигациями и 9472 руб. деньгами.

Комиссар бригады — Кириллов

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 312. Л. 95.*

## З ПАЛІТДАНЯСЕННЯ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА СЕННЕНСКАЙ БРЫГАДЫ за красавік 1944 г.

**7 мая 1944 г.**

...Отряд за апрель м-ц имел три засады, с них одна не совсем удачная, было убитых и раненых, количество установить не удалось.

Группа, где старый Зелепуга Анатолий, спустила под откос один вражеский эшелон, взорван один паровоз, 10 вагонов с живой силой, 4 пулеметных площадок и платформ на дороге Крупки — Прияминск. Вблизи дер. Яроцкая его же группа взорвала 2 вражеские автомашины.

Группа тов. Луговцова Александра взорвала 2 вражеские автомашины. Этой же группой взорваны 2 пароконные повозки. Всего убито фрицев 15, ранено 16...

Проведено собраний в разных населенных пунктах 7 на разные темы...

В результате проведенной работы в д. Замочки население в порядке добровольности сдало нашему отряду 78 пудов хлеба и 5 пар белья. В дер. Лукомле 5 мая на собрании 2-х общин сдали 30 пудов хлеба. Такое отношение населения к партизанам.

Наш отряд развернул большую работу в проведении весенне-посевной кампании, в дер. Замочка посеяно 5 га огорода. Оставлено 4 коня для посевной в деревнях Волосовичи, Млын и др.

В местечке Лукомле приступили к посевной, разбиты взводы, которые будут помогать сеять. О количестве посеянного будет сообщено дополнительно.

Отношение населения к вражеской агитации отрицательное.

За апрель месяц нами распространено мало литературы, в связи с ее отсутствием. Всего распространено 12 номеров газет «Большевистская трибуна» и сводок Совинформбюро.

И. о. комиссара п/отряда им. А. Невского — Геллер

7/V-44 г.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 312. л. 85—87.*

## З ПРАТАКОЛА № 5 ПАСЯДЖЭННЯ БАГУШЭЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РАЙКОМА КП(б)Б

**30 кастрычніка 1944 г.**

СЛУШАЛИ: Постановление Витебского обкома о фактах мародерства, пьянства, бытового разложения и очковтирательства в среде партизан.

Высказались: т. Болотин, Шарико, Ходунькин, Черкасова, Рыжиков В. Т., Сос Д. М., Прохоренко.

ПОСТАНОВИЛИ: РК КП(б)Б отмечает, что постановление обкома КП(б)Белоруссии о фактах мародерства, самогонокурения, бытового разложения и очковтирательства целиком и полностью относятся до нашей бригады. Так, например, в 5 отряде имелись случаи пьянства отдельных партизан (Максак, Батылов и др.), в 3-м отряде группа бойцов в пьяном виде, находясь на задании, была окружена и уничтожена немцами. В этом же 3-м отряде имеют место воровство коров у крестьян, взлом замка, взлом буртов картофеля без разрешения командования и так далей. Во 2-м отряде есть случаи очковтирательства со взрывом автомашины. Все эти факты понижают боевую дисциплину в отрядах, ослабляют связь с местным населением, играя на руку врагу. И они явились только в результате слабости партийно-политической и массовой работы со стороны политаппарата бригады и партийной организации.

1. РК КП(б)Б предлагает всем первичным парторганизациям, комиссарам отрядов и всем коммунистам категорически прекратить пьянство, самогонокурение, очковтирательство, мародерство и бытовое разложение в отрядах. Лиц виновных, замеченных в этих безобразиях, от кого бы они не исходили, привлекать к суровой партийной и партизанской ответственности.

2. По примеру 1 и 3 отрядов, во всех отрядах бригады организовать боевые и диверсионные группы женщин и девушек, направляя их на боевые дела в борьбе с немецкими захватчиками, и не позже 1 июня доложить командованию бригады и РК КП(б)Б о проделанной работе по привлечению женщин-партизанок в активную борьбу против немецких бандитов.

3. Обязать командиров и комиссаров отрядов окончательно изжить имеющие случаи воровства партизанами у местного населения и неправильного взаимоотношения с ними, принимая строгие меры к тем партизанам, которые допускают несоветские отношения к местному населению.

4. Напомнить всем командирам и комиссарам, коммунистам и комсомольцам бригады, что за все их действия в тылу врага они несут ответственность перед партией Ленина—Сталина, перед советским народом, перед родиной.

СЛУШАЛИ: О дислокации бригады.

Высказались: Лисецкий, Рыжиков, Прохоренко, Шарипо, Хвощ.

ПОСТАНОВИЛИ: РК КП(б)Б считает необходимым, несмотря на тяжелые условия в Богушевском районе, держать 3 отряда в смену. Не позже 2 мая послать 5 отряд в район Каковка—Погребенка с действиями на шоссе Витебск—Орша и на железной дороге. Его через 3—4 недели сменяет 1-й отряд. В район Адамово-Узречье, Голошкино послать 4-й отряд, его заменяет 3-й отряд, 2-й отряд район Стэцево—Рындево, сменяет 3-й отряд.

Предложить уходящим отрядам обеспечить действующих партизан в вышеуказанных районах непрекосновенным запасом питания с расчета 2—3 недели не меньше, нападать на обозы противника и питаться за счет немцев.

Об успешных боевых делах доносить командованию бригады не реже чем 2—3 раза в неделю.

Секретарь Богушевского РК КП(б)Б Витебской области Прохоренко

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 210. Л. 26—26об.*

**ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА № 23 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО СЕННЕНСКАГА РАЙКОМА КПБ АБ ПРЫЗНАННІ ПАДПОЛЬНАЙ КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЙ ГРУПЫ ВЁСКІ СІМАКІ МАШКАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА**

**5 сакавіка 1969 г.**

...Бюро РК КПБ постановляет:

1. Считать установленной деятельность комсомольско-молодежной подпольной группы в деревне Симаки Мошканского сельского Совета Сенненского района с июля 1941 года по сентябрь—октябрь 1943 года.

2. Просить Институт истории партии при ЦК КПБ внести в списки подпольных групп комсомольско-молодежную группу, действовавшую в деревне Симаки Сенненского района в составе: Нахаева Анатолия Александровича, Ляховской Александры Никифоровны, Уткина Бориса Ивановича, Гормозова Константина Николаевича, Шандюкова Ивана Павловича, Гришанова Михаила Астаповича, Машеро Виктора Марковича, Шашкова Анатолия Ивановича, Ляховского Петра Мартыновича, Ляховского Леона Сергеевича, Ляховской Елены Никифоровны, Цветковой Евгении Павловны, Радюк Павла Максимовича, Гришанова Григория Федоровича, Кацера Алексея Ивановича, Винокурова Семена Афанасьевича, Шелухо Алексея Сергеевича, Нахаева Аркадия Александровича, Гришанова Дмитрия Федосовича, Шелухо Сергея Михайловича, Лебедева Сергея Куприяновича.

Секретарь Сенненского райкома КПБ Е. Радецкий.

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4843. Воп. 1. Спр. 1. Л. 2.*
*Дакументы падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак.*

# ВЫЗВАЛЕННЕ

## Спякотны чэрвень 1944-га

У гісторыю Вялікай Айчыннай вайны 1944-ы ўвайшоў як год выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў за межы Савецкага Саюза. Сярод грандыёзных падзей года асобае месца займае, як па стратэгічных і палітычных мэтах, так і па свайму размаху, Беларуская наступальная аперацыя.

План Беларускай аперацыі, распрацаваны Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання, меў галоўную мэту — разграміць адну з найбольш моцных груповак праціўніка на савецка-германскім фронце — групу армій "Цэнтр", вызваліць Беларусь і стварыць спрыяльныя ўмовы для далейшых аперацый па вызваленню Літвы, Латвіі, Польшчы.

Да пачатку летняга наступлення Чырвонай Арміі нямецка-фашысцкія войскі займалі ў Беларусі загадзя падрыхтаваную, добра арганізаваную абарону. Канфігурацыя фронту тут паўставала ў выглядзе вялізнага выступу на ўсход, які гітлераўскае камандаванне называла "беларускім балконам". Яно добра разумела стратэгічнае значэнне гэтага "балкона". Ён прыкрываў карацейшы шлях да Германіі і забяспечваў яе войскам галоўныя камунікацыі на ўсім Усходнім фронце. Вярхоўнае камандаванне вермахта прадпісвала абараняць рубяжы Беларусі, як рубяжы самой Германіі.

Да разгрому нямецка-фашысцкіх войск у Беларусі грунтоўна рыхтаваліся 1-ы Прыбалтыйскі (камандуючы генерал-арміі І. Х. Баграмян), 3-і Беларускі (камандуючы генерал-палкоўнік І. Д. Чарняхоўскі), 2-і Беларускі (камандуючы генерал-палкоўнік Г. Ф. Захараў), 1-ы Беларускі (камандуючы генерал арміі К. К. Ракасоўскі, 29 чэрвеня прысвоена званне маршала) франты.

Штабы франтоў у глыбокай тайне распрацоўвалі планы аперацыі. Іх прапановы ляглі ў аснову плана наступлення, які атрымаў кодавую назву "Баграціён".

На ўсіх чатырох франтах вялася напружаная работа па падрыхтоўцы маючай адбыцца аперацыі. Быў прыняты комплекс захадаў па павышэнню баяздольнасці аб'яднанняў, злучэнняў, часцей і падраздзяленняў. Ставілася мэта навучыць усіх — ад камандуючага арміяй да радавога байца — умела дзейнічаць у баях. Ад гэтага залежала ажыццяўленне стратэгічных і тактычных задум. Прыбылі прадстаўнікі Стаўкі: на 1-ы Прыбалтыйскі і 3-і Беларускі франты — маршал А. М. Васілеўскі, на 2-і і 1-ы Беларускія франты — маршал Г. К. Жукаў.

31 мая камандуючыя чатырох франтоў атрымалі дырэктывы Стаўкі.

Камандуючаму войскамі 3-га Беларускага фронту загадвалася:

"1. Падрыхтаваць і правесці аперацыю з мэтай ва ўзаемадзеянні з левым крылом 1-га Прыбалтыйскага фронту і 2-м Беларускім фронтам разграміць віцебска-аршанскую групоўку праціўніка і выйсці на р. Бярэзіну, для чаго прарваць абарону праціўніка, наносячы два ўдары:

а) адзін удар сіламі 39-й і 5-й армій з раёна на захад ад Лёзна ў агульным напрамку, на м. Багушэўск, Сянно, часткай сіл гэтай групоўкі наступаць у паўночна-заходнім накірунку, абыходзячы Віцебск з паўднёвага захаду, з мэтай ва ўзаемадзеянні з левым крылом 1-га Прыбалтыйскага фронту разграміць віцебскую групоўку праціўніка і авалодаць горадам Віцебскам;

б) другі ўдар сіламі 11-й і 31-й армій наўсцяж Мінскай аўтастрады ў агульным накірунку на Барысаў: часткай сіл гэтай групоўкі ўдарам з поўначы авалодаць горадам Оршай.

2. Найбліжэйшая задача войск фронту — авалодаць рубяжом Сянно, Орша. У далейшым развіваць наступленне на Барысаў..."[1].

Перад наступленнем войскі атрымалі загады і звароты ваенных саветаў франтоў і армій. З іх зместам быў азнаёмлены ўвесь асабовы склад часцей і злучэнняў. У апошні дзень перад пачаткам аперацыі адбыліся мітынгі, сходы і прыватныя гутаркі, на якіх савецкія воіны давалі клятву разграміць ворага, вызваліць родную Беларусь.

З лістоўкі-звароту Ваеннага савета 3-га Беларускага фронту да войск фронту ў сувязі з пачаткам Беларускай наступальнай аперацыі:

**22 чэрвеня 1944 года**

**ТАВАРЫШЫ ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ, СЯРЖАНТЫ І АФІЦЭРЫ!**

Войскі нашага фронту, выконваючы загад Вярхоўнага Галоўнакамандавання, сёння пераходзяць у рашучае наступленне на ворага.

Краіна ўсклала на нас слаўную і пачэсную задачу — давяршыць разам з усёй Чырвонай Арміяй справу поўнага ачышчэння савецкай зямлі ад гітлераўскай нечысці. Радзіма-маці, савецкі народ... далі нам свяшчэнны загад — наступаць, скрышальна граміць ворага і ісці толькі наперад і наперад!

Доблесныя воіны!

Наперадзе перад вамі зямля шматпакутнай, катаванай фашыстамі Савецкай Беларусі. Фашысцкія вылюдкі здзекваюцца над зняволенымі савецкімі людзьмі, па-зверску знішчаюць безабаронных жанчын, старых і дзяцей. У попел і руіны ператварылі фашысты квітнеўшыя гарады і вёскі Беларусі. Яны павысякалі сады і стварылі ў іх лагеры смерці для нашых сясцёр і братоў. Яны разбурылі гістарычныя помнікі і паставілі вісельні. Стогне пад фашысцкім прыгнётам родная Беларусь, просіць ратунку ў вас і кліча да бязлітаснай помсты.

Надышоў час суровай расплаты!

Мы ідзем наперад, на вызваленне Савецкай Беларусі. Перамога над ворагам зараз блізкая як ніколі.

<...>

Біце ворага без літасці і стомы! Помсціце ворагам за ўсё: за нашы разбураныя гарады і вёскі, за забітую маці, бацьку, за зганьбаваную жонку, сястру, нявесту; за расстраляных, спаленых, скалечаных безабаронных, ні ў чым не вінаватых дзяцей; за таварышаў, што загінулі ў баі. Помсціце фашыстам за кожны дзень пражытых нашым народам пакут і мук. Няхай вашы ўдары будуць імклівымі, дакладнымі і бязлітаснымі.

Наперад, на захад, доблесныя воіны!

Наперад на вызваленне роднай Беларусі!

<...>[2]

З палымяным заклікам да нашых войск звярнуліся ўрад Беларусі і ЦК КП(б)Б: "Ідзіце бясстрашна наперад, — гаварылася ў ім. — Вам акажуць падтрымку нашы вёскі і гарады з тылу... Наш народ сустрэне вас як вызваліцеляў".

Старанна рыхтаваліся да аперацыі і партызаны. Беларускі штаб партызанскага руху загадзя вызначыў задачы па аказанню ўсямернай дапамогі Чырвонай Арміі. Найважнейшымі з іх былі нанясенне ўдараў па тылах групы армій "Цэнтр",

[1] Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 3. Воп. 11556. Спр. 15. Л. 288—289.
[2] Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 241. Воп. 2656. Спр. 51. Л. 375.

дэзарганізацыя работы транспарту, сувязі, сістэмы забеспячэння, адцягненне як мага большай колькасці сіл ворага на ахову ваенных аб'ектаў, скоўванне яго аператыўных рэзерваў, разведка.

За дзень да пачатку аперацыі ў палосах дывізій першага эшалону перадавыя батальёны правялі разведку боем. У 16 гадзін 25 мінут, пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі, перадавыя батальёны перайшлі ў наступленне. На багушэўскім напрамку перадавыя батальёны 5-й арміі за дзень бою выканалі задачу — захапілі першую траншэю, авалодалі другой, а ў некаторых месцах і трэцяй траншэяй, прасунуўшыся на 2—3 кіламетры. У цэлым удалося ўдакладніць контур пярэдняга краю і сістэму артылерыйскага агню праціўніка. Па сведчанні ўзятага ў палон камандзіра 206-й пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнанта Хітэра, германскае камандаванне прыняло разведку боем за чарговае няўдалае наступленне нашых войск. Гэта быў яшчэ адзін пралік гітлераўцаў, з прычыны чаго ўдар на наступны дзень асноўных сіл савецкіх войск аказаўся для іх яшчэ больш нечаканым.

І вось наступіў доўгачаканы дзень у жыцці беларускага народа. 23 чэрвеня 1944 г. галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках. На наступны дзень па варожых пазіцыях на бабруйскім напрамку абрушылі ўдары войскі 1-га Беларускага фронту.

Ключавым апорным пунктам гітлераўцаў на напрамку галоўнага ўдару 3-га Беларускага фронту з'яўляўся гарадскі пасёлак Багушэўск. Каб развіць агульнае наступленне, неабходна было авалодаць ім у найкарацейшы тэрмін.

Да апоўдня другога дня наступлення 315-я і 144-я стралковыя дывізіі, пераадольваючы ўпартае супраціўленне праціўніка, падышлі да самага Багушэўска, які гітлераўцы ператварылі ў моцны вузел абароны, прыкрыты трыма лініямі траншэй, агароджамі з калючага дроту і міннымі палямі. Акрамя таго, на дарогах праз кожныя 100—150 метраў стаялі драўняна-земляныя брустверы ці бункеры, прыкрываўшыя штурмавыя гарматы. У самым гарадскім пасёлку, амаль у кожным доме і нават у развалінах, былі абсталяваны агнявыя кропкі.

Добра ўмацавалі гітлераўцы і ўсе населеныя пункты вакол Багушэўска і ўпарта змагаліся за іх. Напрыклад, на апошняй пазіцыі перад Багушэўскам Аляксандраўка—Заазёрнае, на якую наступаў 850-ы стралковы полк, гітлераўцы тры разы контратакавалі сіламі батальёна пры падтрымцы 12—15 танкаў. Але полк адбіў усе контратакі, а 3-і батальён пад камандаваннем маёра Мацвеева нават уварваўся ў Заазёрнае. Праўда, ноччу праціўніку ўдалося выбіць батальён з вёскі. Падцягнуўшы артылерыю, 850-ы полк раніцай 25 чэрвеня аднавіў атаку. Гітлераўцы не вытрымалі ўдару і пачалі адступаць, падпальваючы хаты.

У гэтых баях па-геройску змагаліся камандзіры батальёнаў І. П. Луеў і В. Г. Мацвееў, камандзіры рот А. Н. Старасценка, А. В. Юрчанка, В. С. Дзяменцеў і інш. У крытычны момант бою, калі гітлераўцы контратакай імкнуліся выбіць савецкіх воінаў з Заазёрнага, кулямётчык С. Абдурахманаў, радавы І. В. Міхайлаў і наводчык 45-мілімятровай гарматы А. П. Іваноў былі паранены, аднак не пакінулі поля бою, а змагаліся, пакуль не адбілі апошнюю контратаку ворага. За гэты подзвіг яны былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Нягледзячы на ўпартае супраціўленне гітлераўцаў, Багушэўск патрэбна было вызваліць неадкладна, таму што ён з'яўляўся ключавым апорным пунктам у абароне ворага на накірунку галоўнага ўдару 5-й арміі і 3-га кавалерыйскага корпуса. Сваім выгадным размяшчэннем Багушэўск трывала прыкрываў міжазер'е Кічына—Серакарытня, накірунак на Сянно.

Войскі 5-й арміі працягвалі наступленне на Багушэўск, пераадольваючы тут супраціўленне высунутых з тылу 14-й і 95-й пяхотных дывізій немцаў. А другой палове дня, 24 чэрвеня, калі паспяхова дзейнічаючыя войскі арміі сустрэлі ўпартае супраціўленне ворага перад Багушэў-




Карта-схема прарыву варожай абароны і вызвалення Сенненскага раёна

скам, на дапамогу чырвонаармейцам прыйшла авіяцыя. Удар па праціўніку тут нанеслі 90 самалётаў По-2 і 180 Іл-2. Пасля магутных удараў бамбардзіроўшчыкаў і штурмавікоў супраціўленне гітлераўцаў значна аслабела, і войскі 5-й арміі пайшлі на штурм Багушэўска: 215-я стралковая дывізія сумесна з 153-й танкавай брыгадай двума палкамі наносілі ўдар з раёна Бугаі на паўночную ўскраіну гарадскога пасёлка, а 144-я стралковая дывізія і 2-я гвардзейская танкавая брыгада наступалі на Багушэўск з усходу і паўднёвага ўсходу.

У баях за Багушэўск воіны гэтых часцей і злучэнняў праявілі выключную адвагу. Там, дзе праціўнік аказваў супраціўленне, пяхота, уварваўшыся ў размяшчэнне ворага, знішчала яго агнём і гранатамі ў рукапашных схватках. Ад пехацінцаў не адставалі і суправаджаўшыя іх разлікі супрацьтанкавых пушак.

Вось адзін з эпізодаў баёў за Багушэўск. Асабовы састаў 3-га стралковага батальёна (камандзір маёр І. І. Рудэнка) з 144-й стралковай дывізіі літаральна на плячах уцякаючых фашыстаў у вячэрнім змроку ўварваўся на ўсходнюю ўскраіну Багушэўска. Услед за перадавым батальёнам у пасёлак увайшлі ўсе падраздзяленні 499-га стралковага палка падпалкоўніка І. П. Сітко. Яго байцы і танкісты палкоўніка Я. Я. Духоўнага, ачышчаючы ад немцаў вуліцу за вуліцай, ужо ў цемры авалодалі чыгуначнай станцыяй Багушэўск. А з поўдня і паўднёвага ўсходу ў населены пункт увайшлі астатнія часці 144-й і 215-й стралковых дывізій.

У баях за Багушэўск асабліва вызначыліся авіятары: ўраджэнец вёскі Масоры Сенненскага раёна, намеснік камандзіра эскадрыллі старшы лейтэнант Іван Ілларыёнавіч Камінскі, які пазней быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза, камандзір штурмавога авіяпалка маёр І. М. Кухараў, камандзір эскадрыллі старшы лейтэнант А. Д. Асадыеў.

Сярод танкістаў узоры мужнасці паказалі старшы лейтэнант М. А. Фірсаў і капітан І. Я. Шапавалаў. Умела камандавалі пяхотай падпалкоўнік Р. Ф. Муславаў і капітан І. П. Луеў. Кавалерыст яфрэйтар С. І. Балгарын знішчыў кулямётнае гняздо і 25 гітлераўцаў. Усе яны былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Бой за Багушэўск працягваўся амаль усю ноч, толькі каля трох гадзін раніцы 25 чэрвеня 1944 г. гарадскі пасёлак поўнасцю ачысцілі ад гітлераўцаў. Было захоплена многа палонных і трафеяў, у тым ліку два эшалоны з харчаваннем, якія акупанты спрабавалі адправіць у Германію.

Авалоданне Багушэўскам мела вялікае аператыўнае значэнне: яно дазволіла паскорыць увод у прарыў конна-механізаванай групы пад камандаваннем генерал-лейтэнанта М. С. Аслікоўскага і 5-й



З. Фіглева.

гвардзейскай танкавай арміі пад камандаваннем маршала бронетанкавых войск П. А. Ротмістрава. Усяго ў прарыў уводзілася да 1000 танкаў і самаходных гармат.

Раніцай 25 чэрвеня, калі войскі 5-й арміі вялі паспяховыя баі на рубяжы возера Беразоўскае, лесу на захад ад Янава, механізаваныя брыгады 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса рушылі на штурм Сянна, кавалерыя 3-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса, прарваўшы фронт праціўніка ў раёне Узрэчча—Янава, рынуліся на Расна і Абольцы. У прарыў рушылі танкавыя карпусы 5-й гвардзейскай танкавай арміі.

Вакол Сянна гітлераўцы абсталявалі моцныя абарончыя пазіцыі. Тут яны мелі батальён пяхоты, батарэі палявых гармат і мінамётаў, штурмавыя гарматы, танкі.

Прыкрываючыся начной цемрай, танкавыя падраздзяленні 3-га механізаванага корпуса абышлі Сянно, выйшаўшы да яго паўднёвай, усходняй і заходняй ускраін. Яны ўварваліся ў горад і завязалі вулічныя баі. Нечаканая і імгненная атака, якая суправаджалася масіраваным агнём, зламала супраціўленне праціўніка. Раніцай 25 чэрвеня 1944 г. Сянно было поўнасцю ачышчана ад ворага, увесь нямецкі гарнізон разгромлены. Праціўнік страціў чатыры штурмавыя гарматы "пантэры", тры лёгкія танкі, артылерыйскую батарэю, каля 70 аўтамашын. Страты забітымі і параненымі склалі каля чатырохсот чалавек, у палон трапілі 26 салдат і афіцэраў. Нашы страты склалі 23 забітых, 58 параненых.

З поля бою шмат параненых вынеслі медсёстры 359-га медсанбата, сярод іх Зоя Фіглева (Сёміна).

Аб тым, як ацэньвала нямецкае камандаванне заняцце нашымі войскамі Сянна, можна меркаваць, у прыватнасці, па выказванню нямецкага вучонага Гахенгольца: "3-і Беларускі фронт дасягнуў сваёй першай аператыўнай мэты, авалодаўшы міжрэччам Заходняй Дзвіны і Дняпра, і скарыстаў утварыўшуюся расколіну на поўдзень ад Віцебска для таго, каб нанесці глыбокі ўдар сваімі рухомымі злучэннямі праз горад Сянно ў фланг 4-й арміі".



Гітлераўцы, узятыя ў палон у Сенненскім раёне. Чэрвень 1944 г.



Сустрэча ветэранаў 215-й стралковай дывізіі, якая вызваляла Сенненшчыну.

У паласе наступлення 5-й арміі актыўна дзейнічалі партызаны, якія з'яўляліся сапраўднымі гаспадарамі на гэтай вялізнай прасторы. Яны аказвалі дапамогу войску. Сустрэўшыся з перадавымі часцямі, партызаны разам з імі білі ворага, а потым многія ўліліся ў склад арміі.

25 чэрвеня, пасля ўзяцця Сянна, войскі 3-га Беларускага фронту працягвалі паспяховае наступленне. Конна-механізаваная група на зыходзе дня перарэзала чыгунку Орша—Лепель на паўднёвым захадзе ад Сянна. Выйшаўшы на аператыўную прастору, злучэнні 5-й арміі стварылі рухомыя перадавыя атрады, якія імкнуліся не адставаць ад конна-механізаванай групы. На працягу дня галоўныя сілы арміі прасунуліся яшчэ на 20 км.

Наступленне савецкіх войск на захад імкліва працягвалася.

*У. І. Лемяшонак, доктар гістарычных навук, Б. Дз. Даўгатовіч, кандыдат гістарычных навук.*

## Баі за Багушэўск

### З успамінаў А. Я. Крываротава

Было гэта 23 чэрвеня 1944 года на подступах да гарадскога пасёлка Багушэўск, які ўяўляў сабой магутны вузел абароны ворага. Багушэўск з'яўляўся той ключавой пазіцыяй праціўніка, пры страце якой парушалася ўся сістэма абароны гітлераўцаў на Віцебскім участку.

Пасля шматгадзіннага жорсткага бою 31-я гвардзейская стралковая дывізія генерал-маёра Шчэрбіна, часткай якой быў і наш асобны гвардзейскі стралковы батальён гвардыі капітана Кудраўцава, вымушана была заняць не зусім выгодную пазіцыю. Роты батальёна займалі ўскраек лесу ў самай нізіне шырокага, з кусцінамі і высокай травой, поля. Вораг умацаваўся на невялікіх узгорках, дзе былі траншэі, пануючыя над мясцовасцю.

У 18 гадзін камбата выклікалі ў штаб палка. Загад камандавання быў кароткі і канкрэтны: "Авалодаць другой пазіцыяй траншэй на ўзгорку, замацавацца і быць гатовымі да вызвалення Багушэўска. Пачатак наступлення — 20 гадзін 15 мінут 23 чэрвеня 1944 года".

Дакладна ў вызначаны час, пасля кароткай артылерыйскай падрыхтоўкі, па ўсяму полю разнеслася гучнае "Ура-а-а!". Перад байцамі бранявым шчытом ішла рота танкаў Т-34. Баявы парыў наступаўшых быў такі магутны, што ні густыя разрывы мін, ні кулямётны лівень не ў сілах былі спыніць байцоў. Думалася: яшчэ дзве-тры хвіліны, і вогненная лава залье, затопіць гітлераўцаў. Але Багушэўск аказаўся моцным арэшкам. Вораг паспеў замацавацца. З фланга па наступаючых танках ударыла самаходка. Хітра схаваны "фердынанд" біў прамой наводкай, без промаху, і танк загарэўся. Ад удару другой самаходкі ўспыхнуў другі танк, трэці. Імкнучыся змяніць манеўр, танкісты замарудзілі рух усяго на адну мінуту. І тут новы ўдар. І зноў страты. Баючыся загубіць роту, адстрэльваючыся, танкі адышлі ў лес.

А ў той час, калі праціўнік сканцэнтраваў увагу на танках, камбат, ацаніўшы абстаноўку, павёў батальён у атаку. У кароткай схватцы знішчыўшы больш паўсотні гітлераўцаў, батальён пасняхова, з малымі стратамі захапіў траншэі ворага на ўзгорках і заняў кругавую абарону.

Гітлераўцы, хутка акапаўшыся, адкрылі шквальны артылерыйскі і мінамётны агонь. Было адбіта шэсць атак. Раніцой, на самым світанні, вораг пачаў магутную контратаку пры падтрымцы танкаў і самаходак. Тут асабліва вызначыўся камсамолец-гаркаўчанін Косця Ражазахаў. Ён гранатамі падарваў два варожыя танкі.

У цэнтры абароны мужна ўтрымліваў пазіцыі ўзвод разведкі, якім камандаваў гвардыі лейтэнант Бакі Юсенаў, які двойчы быў паранены, але поля бою не пакінуў. Мужна змагаліся з пераважаючымі сіламі ворага ўсе байцы-гвардзейцы ўзводаў гвардыі лейтэнантаў Фёдарава, Абыдзеннага, Зюляева, Матросава.

І вось наступіў той момант, калі перавага сіл праціўніка абазначылася яўна. Вораг перайшоў у самую жорсткую контратаку. Пачаўся рукапашны бой. Усё пайшло ў гэтай кароткай кровапралітнай схватцы: і стралковая зброя, і гранаты, і штыкі, і прыклады, і рыдлёўкі. Знішчаючы гітлераўцаў, батальён пасняхова ўтрымаў свае пазіцыі і не адступіў ні на крок.

Выціраючы далонню ўпацелы лоб, кулямётчык Саша Гладкоў вылаяўся: "Ды што ж гэта за гады — быццам з-пад зямлі лезуць, як мурашкі!"

Выконваючы загады камандзіра батальёна Кудраўцава, байцы праявілі выключную стойкасць. Але не мог не бачыць камбат, што вораг значна павялічвае сілы, што слабеюць роты батальёна. Адзін-два штурмавыя кідкі з танкамі — і фашысты абыдуць, перарвуць так удала занятыя яго гвардзейцамі ключавыя пазіцыі перад Багушэўскам, акружаць яго людзей і тады... Хіба ён, гвардзейскі камандзір, камуніст з дваццатых гадоў, можа дапусціць такое? Рашэнне прыйшло само сабою...

— "Арол", "Арол", я "Сокал"! Вы чуеце? Бой вяду на занятых пазіцыях. Перавага фрыцаў шматразовая. Прашу залп гвардзейскіх мінамётаў (сваіх укрыю!) — па ўсяму квадрату! Прашу залп!"

І ўздрыгнула навокал зямля. Грымоты заглушылі ўсе галасы і водгукі бою. Усё гарэла асляпляльна белым полымем, у якім не было нічога бачна, акрамя шчыльнай кіпячай вогненай масы. Потым — ні грымот, ні полымя, ні зялёнага травянога поля.

Нават лес быў іншым — чорна-карычневым, у падпалінах.

— Малайцы артылерысты! — пахваліў камбат тых, хто кінуў на галовы ворага спапяляючыя маланкі.

Нямала потым было ў нашага батальёна цяжкіх дзён і начэй, але бai пад Багушэўскам былі асабліва цяжкімі і памятнымі.

## Наступае гвардзейская Віцебская

Другая гвардзейская Віцебская Чырванасцяжная ордэнаў Суворава і Кутузава танкавая брыгада ў складзе 5-й арміі ўдзельнічала ў прарыве абароны нямецкіх войск у раёне Багушэўска. Брыгадай камандаваў палкоўнік Яфім Яўсеевіч Духоўны.

Настрой асабовага саставу брыгады перад наступленнем быў бадзёры, прыўзняты. Напярэдадні 96 воінаў падалі заявы аб прыёме іх у члены і кандыдаты партыі.

Раніцой 23 чэрвеня пасля трох гадзін артпадрыхтоўкі брыгада пачала наступ-

ленне на вёску Александрова, авалодала населенымі пунктамі Панізоўе і Асіпова. Танкісты забяспечвалі перадавым атрадам дывізіі і плацдарм на паўднёвым беразе ракі Лучосы.

За дзень баёў праціўніку былі нанесены сур'ёзныя страты: знішчана каля 270 салдат і афіцэраў, 10 гармат, 33 кулямётныя кропкі, захоплена некалькі дзесяткаў немцаў у палон.

...25 чэрвеня разгарнуліся баі за вызваленне населеных пунктаў Цыпкі, Пасад, Забараўе, Янова, Сідорнічы, Лізуны, Куцькова, Тур'ева, Алексінічы і іншых прылеглых да іх вёсак. Асабліва жорсткі быў бой за Алексінічы, які працягваўся ўсю ноч з 25 па 26 чэрвеня.

Апынуўшыся ў акружэнні праціўніка, нашы воіны вымушаны былі весці не толькі агнявы, але і рукапашны бой, у ходзе якога было знішчана каля паўтысячы салдат і афіцэраў праціўніка і яшчэ больш узята ў палон. Вораг страціў тут 14 гармат, у тым ліку 3 самаходныя, 6 танкаў, 7 бронемашын, многа грузавых аўтамабіляў і іншай тэхнікі. У наступныя дні брыгада імкліва прасоўвалася на захад. Толькі за 26 чэрвеня яна прайшла наперад на 40 кіламетраў.

У гэтыя дні вызначыліся многія воіны і камандзіры падраздзяленняў.

*Р. Калінін.*

## Палкоўнік Аляксандр Данілавіч Чарняхоўскі

У баях за Сенненшчыну загінуў гвардыі палкоўнік Аляксандр Чарняхоўскі, малодшы брат праслаўленага палкаводца, двойчы Героя Савецкага Саюза Івана Данілавіча Чарняхоўскага.

Аляксандр Данілавіч нарадзіўся ў 1908 г. у сям'і селяніна-батрака сяла Аксаніна, што за 45 км ад горада Умані на Украіне. Сям'я была вялікая, шасцёра дзяцей, жылі яны бедна, рана спазналі нястачу, голад, прыгнёт.

Аляксандр працаваў рабочым на чыгунцы, дзе яго брат Іван — слесар чыгуначнай станцыі Вапнярка — быў адным з арганізатараў камсамольскай ячэйкі. У 1924 г. акруговы камітэт камсамола накіраваў Івана ў Кіеўскае артылерыйскае вайсковае вучылішча, якое ён закончыў на "выдатна" ў 1928 г. Ад камандзіра дывізіі да генерала арміі і камандуючага 3-м Беларускім фронтам — такі шлях Івана Данілавіча ў гады Вялікай Айчыннай.

Аляксандр пайшоў па шляху свайго старэйшага брата, ён скончыў бранятанкавае вайсковае вучылішча, папаўняў свае веды на курсах, стаў афіцэрам-танкістам яшчэ да вайны. З 1941 г. на фронце. Ён абараняў Маскву, удзельнік многіх бітваў, у тым ліку пад Курскам, на Украіне, у Беларусі. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І-й ступені, Аляксандра Неўскага, Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

...Чэрвень 1944 г. Пачалася вялікая Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён". Пад Віцебскам ідуць самыя жорсткія баі. У гэты час гвардыі палкоўнік А. Д. Чарняхоўскі — намеснік камандзіра 2-й гвардзейскай танкавай брыгады, якой камандаваў палкоўнік Я. Я. Духоўны.

25 і 26 чэрвеня 1944 г. каля вёсак Узрэчча і Алексінічы была акружана нямецкая групоўка войск.

На захад ад вёскі Алексінічы цячэ рэчка Абалянка. Вакол лясы, балоты, возера. Два дні тут ішлі жорсткія баі. У іх непасрэдна ўдзельнічаў гвардыі палкоўнік Аляксандр Данілавіч Чарняхоўскі. Ён кіраваў танкавымі падраздзяленнямі. У баях знішчана вялікая колькасць гітлераўцаў, падбіта шмат гармат і танкаў ворага. Групоўка была разгромлена. Перамога здабыта, і за яе аддалі жыццё 122 салдаты, сяржанты, афіцэры і партызаны. У ліку загінуўшых быў і гвардыі палкоўнік Аляксандр Данілавіч Чарняхоўскі.

*Л. Чванаў.*

## Лёс камандзіра

Пятнаццацігадовым юнаком сустрэў Сяргей Гарнак Кастрычніцкую рэвалюцыю. Ён вучыўся ў апошнім класе вышэйшага пачатковага вучылішча ў Сянне. Падлетак спадзяваўся, што рэвалюцыя для такіх, як ён, адчыніць дзверы ў новае, пязведанае жыццё. Але за яго



С. І. Гарнак.

трэба змагацца са зброяй у руках. Яго, як адукаванага хлопца, накіравалі ў 1918 годзе на працу ў крымінальна-следчую камісію пры Сеннескім павятовым ваенкамаце. А з 1919 года ўзялі на службу ў 775-ю роту. У роту ўваходзілі маладыя чырвоныя камандзіры, якія скончылі курсы. Такі строгі падбор быў невыпадковы, бо перад ротай стаяла задача ліквідацыі бандытызму ў павеце.

Праз чатыра гады Сяргея і яшчэ чатырох камсамольцаў накіравалі на вучобу ў Ленінградскае вышэйшае ваенна-інжынернае вучылішча. Пасля заканчэння — служба ў асобным сапёрным батальёне 16-га стралковага корпуса ў Магілёве, потым г. Асцэры на Украіне, будоўля ўмацаванняў на савецка-фінляндскай граніцы і ў Беларусі, каля Полацка. А ў 1939 годзе Гарнак прымаў удзел у вызваленні Заходняй Беларусі.

Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны Сяргей Ігнатавіч служыў на граніцы ў Літве. Сапёрны батальён працаваў у тры змены — будаваў умацаванні, доты. Маральна вайскоўцы былі падрыхтаваны да самага страшнага, аднак вайна пачалася нечакана. Увесь дзень 22 чэрвеня трымалі абарону. У баях знішчылі батальёнам 5 нямецкіх танкетак. Атрымалі загад — адступаць на ўсход праз Каўнас. Адыходзячы, мініравалі дарогі, падрывалі масты. А потым батальён у складзе 11-й арміі абараняў Прыбалтыку. Нашы байцы стрымлівалі наступленне ворага. У няроўных баях не шкадавалі жыцця.

Адступаючы з цяжкімі баямі, Сяргей Ігнатавіч апынуўся на Ленінградскім фронце. Летам 1942 года яго прынялі ў партыю.

Вайна прынесла боль і пакуты ў кожную сям'ю. З першых дзён ваеннага ліхалецця не ведаў Сяргей Ігнатавіч нічога аб сваёй жонцы і траіх дзецях. Апошні раз бачыў іх у Каўнасе, шукаў увесь час. І ў рэшце рэшт прыйшло радаснае паведамленне на фронт, што сям'я эвакуіравалася і знаходзіцца ў Арзамасе.

Былі і незабыўныя, радасныя хвіліны ў тыя суровыя ваенныя гады. Ні з чым нельга параўнаць адчуванне, калі з баявымі часцямі Сяргей Ігнатавіч крочыў на захад, па тых шляхах-дарогах, па якіх даводзілася адступаць. Вызваленне Ноўгарада, Літвы, Латвіі, разгром Курляндскай групоўкі. У Прыбалтыцы С. І. Гарнак атрымаў кантузію. Пасля папраўкі маёр ехаў змагацца на Далёкі Усход супраць мілітарысцкай Японіі. Аднак у Бійску сустрэла вестка аб тым, што Японія капітулявала. Ён застаўся служыць інжынерам дывізіі ў Алтайскім краі. У 1946 годзе дэмабілізаваўся з арміі.

Пасля доўгіх гадоў разлукі з роднымі мясцінамі вярнуўся С. І. Гарнак у Сянно. Працаваў старшынёй планавай камісіі райвыканкома. За заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума — Вялікай Айчыннай вайны II ступені, 6 медалямі.

*А. Бельская.*

## Дакументы сведчаць

### З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ НАЧАЛЬНІКА РАЗВЕДУПРАЎЛЕННЯ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ГЕНЕРАЛ-ЛЕЙТЭНАНТА Ф. КУЗНЯЦОВА НАЧАЛЬНІКУ ГАЛОЎНАГА ПАЛІТЫЧНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ГЕНЕРАЛ-ПАЛКОЎНІКУ А. С. ШЧАРБАКОВУ АБ ГУТАРЦЫ ГАЛАВЫ АНГЛІЙСКАЙ ВАЕННАЙ МІСІІ Ў СССР ГЕНЕРАЛ-ЛЕЙТЭНАНТА БАРРОУЗА З НЯМЕЦКІМІ ВАЕННАПАЛОННЫМІ ПРЫ НАВЕДВАННІ ІМ 3-га БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ

**8 ліпеня 1944 года**

Командир 404 пп 246 пд полковник Карл Фридрих Хойер, захвачен в плен 2.7.1944 г. в районе Сенно, 1897 г. рождения, в армии с 1914 г., награжден железным крестом I и II класса и немецким крестом в золоте.

Вопрос: Как с Вами обращаются в плену?

Ответ: Неплохо.

Вопрос: При каких обстоятельствах Вы были взяты в плен?

Ответ: 246 пд была разгромлена в районе Витебска. Я, являясь командиром 404 полка, был назначен командовать остатками 246 пд — свыше 1000 человек, с которыми должен был прорвать кольцо окружения и соединиться с основными силами германских войск. В районе Сенно остатки дивизии были наголову разгромлены, и я вынужден был сдаться в плен.

Вопрос: Каково было настроение личного состава Вашей части в момент окружения?

Ответ: Вначале — это относится к первым дням окружения — настроение солдат и офицеров было хорошее, большинство находившихся в окружении войск чувствовало себя бодро, но затем, вследствие тяжелых потерь и безвыходности положения, потери связи, управления и взаимодействия войск — моральный дух солдат и офицеров упал.

Вопрос: Известно ли Вам, где теперь находятся германские войска?

Ответ: Я лично ориентировку потерял с 26 июня, когда в районе Островно наши войска были рассеяны, и я утратил с ними всякую связь. 2 июля я был пленен. Как 404 пп, так и 246 пд прекратили свое существование. Уже на 26 июня 246 пд потеряла 50% вооружения и людского состава.

Вопрос: Каков, по Вашему мнению, может быть исход войны для Германии? (Задан генерал-майором тов. Славиным).

Ответ: Ответить на этот вопрос затрудняюсь, так как не знаю, сумеет ли наше командование своевременно подтянуть на угрожаемые участки те резервы, которые еще имеются в Германии. Победить должен сильнейший противник, сильнейшим же, кажется, является Россия.

Вопрос: Что Вам известно о военных действиях в Нормандии?

Ответ: До 26 июня я знал все, что сообщали германские газеты и радио. Мне известно также, что союзники захватили Шербур. С 26 июня никаких сведений о положении на этом военном театре не получал.

Начальник разведывательного управления
Генштаба Красной Армии
генерал-лейтенант Ф. Кузнецов.

*Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 32. Воп. 11309. Спр. 211. Л. 289—290.*

## СА ЗВОДКІ АБАГУЛЬНЕНАГА БАЯВОГА ВОПЫТУ ШТАБА 3-га БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ ПА РАЗГРОМУ ВІЦЕБСКАЙ ГРУПОЎКІ ПРАЦІЎНІКА Ў ЧЭРВЕНІ 1944 ГОДА

**24 ліпеня 1944 г.**

### 4. Овладение Богушевским узлом сопротивления

После прорыва войсками 5-й армии обороны противника разбитые на переднем крае и в тактической глубине разрозненные части 299-й, 256-й пд и подведенные из резерва части 99-й и 14-й пд продолжали отходить в западном и юго-западном направлениях, прикрывая важный узел грунтовых дорог Богушевск.

24 июня, стремительно преследуя противника, 72-й и 65-й стр. корпуса со 2-й гв. танковой бригадой подошли к Богушевску.

Противник, имея вокруг города три линии траншей, оказывал упорное сопротивление нашим частям.

С целью ускорить овладение Богушевском в бой была введена из второго эшелона 144-я стрелковая дивизия 65-го ск, которая начала наступление, нанося удар на восточную окраину города. В направлении северной окраины действовала двумя полками 215-я стрелковая дивизия.

В результате решительного штурма части 144-й и 215-й сд совместно с 2-й гв. тбр к 21.00 24.6.1944 г. овладели Богушевском.

Овладение Богушевском имело большое оперативное значение: оно позволило ускорить ввод в прорыв подвижных соединений, маршрут которых по условиям местности был привязан к этому узлу дорог, и дало возможность силами подвижных соединений нанести удар на юго-запад в направлении Толочина в обход крупной группировки противника, продолжавшей удерживать район Орши.

**5. Перенос усилий операции с Оршанского направления на Богушевское**

По замыслу операции 5-я танковая армия предназначалась для развития успеха общевойсковых соединений после прорыва ими всей тактической глубины обороны противника.

Использование армии намечалось по двум вариантам:

а) на Оршанском направлении, в полосе магистрали Москва – Минск;

б) на Богушевском направлении, в полосе 5-й армии с выходом затем на магистраль в районе Толочина и с дальнейшим движением в полосе магистрали на Борисов.

К исходу 23.6 полностью обозначился прорыв обороны противника на Богушевском направлении, где 5-я армия имела продвижение на глубину до 17 километров. В то же время продвижение наших войск на Оршанском направлении было незначительным.

В соответствии со сложившейся обстановкой Командующий фронтом 24.6 принял решение 5-ю танковую армию использовать по второму варианту и поставил следующую задачу: войти в прорыв в полосе наступления 5-й армии на участке Языково, Высочаны, Бабиновичи и к исходу первого дня ввода в прорыв овладеть районом Коханово, Толочин. Передовыми отрядами в этот же день овладеть м. Бобр.

В дальнейшем, овладеть Борисовом и переправами через р. Березина на фронте свх. Веселово, Борисов, Бол. Ухолоды.

В результате принятого решения основные усилия войск фронта были перенесены на Богушевское направление, где кроме 5-й та действовала конно-механизированная группа. Всего здесь вводилось в прорыв до 1000 танков и СУ.

Начальник оперативного управления штаба
3-го Белорусского фронта генерал-майор Иголкин.

*Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 241. Воп. 2593. Спр. 495. Л. 95–96.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак.*

## Героі-вызваліцелі

**АНІСКІН Міхаіл Аляксандравіч.** Нарадзіўся 18.10.1922 г. у в. Косціна Возера Іглінскага раёна, Башкірыя. Герой Савецкага Саюза (1945). У 1941 г. стаў курсантам Саратаўскага танкавага вучылішча. На фронце са жніўня 1943 г., лейтэнант, камандзір танка разведузвода 44-га танкавага палка 8-й гвардзейскай механізаванай брыгады.

...Пачалася вайна. Курсант танкавага вучылішча Міхаіл Аніскін 9 ліпеня піша дадому, перш за ўсё звяртаючыся да маці: "Мама! За меня не волнуйся, не плачь! Ты же знаешь, что теперь всё для армии, всё для фронта. А то, что могут убить, об этом говорить рано, нужно говорить о жизни, о счастливом будущем".



М. А. Аніскін

А вось крыху пазнейшы ліст, ад 10 жніўня 1941 г.:

"...Сегодняшний день в нашей школе — большой праздник — день принятия присяги. Я еще крепче и настойчивей возьмусь за учёбу, потому что мы приняли присягу на верность Родине. Папа правильно сказал, что у меня силы воли хватит. Что я захочу сделать, то этого я добьюсь и сделаю. Только бы быстрей разгромить врага человечества Гитлера, в этом сомнения нет. Гитлеровцев сотрем с лица земли..."

У лютым 1942 г. здадзены апошнія экзамены, маладыя хлопцы — курсанты — сталі лейтэнантамі і атрымалі накіраванне ў дзеючую армію.

А вось вытрымкі з успамінаў баявога сябра Міхаіла Аніскіна Героя Савецкага Саюза Івана Астапавіча Мазгавога з Чарнігава. "Я ведаў Міхаіла з таго часу, калі ён прыйшоў у нашу 35-ю мехбрыгаду 3-га гвардзейскага Сталінградскага механізаванага корпуса ў жніўні 1943 года. Гэта быў баявы і смелы таварыш... Прыгожы смуглы дваццацігадовы лейтэнант. Ён вельмі любіў жартаваць і весяліцца".

І вось нарэшце настаў чэрвень 1944 года. Ішла ўзмоцненая падрыхтоўка да правядзен-

ня буйной аперацыі па вызваленню Беларусі пад кодавай назвай "Баграціён".

— 12 чэрвеня, — расказвае І. А. Мазгавы, — мы на сваіх танках зрабілі стокіламетровы марш і прыбылі да пярэдняга краю. Міша трапіў у разведузвод Громава. 23 чэрвеня наш корпус быў уведзены ў прарыў. 24 чэрвеня брыгада рухалася на Сянно, вызваліўшы вёскі Кічына і Навасёлкі. У гэтым напрамку немцы трывала ўмацаваліся, і нам давялося весці цяжкія баі. 25 чэрвеня брыгадзе дадзена заданне ісці далей на захад. Але перад вёскай Студзёнка мы сустрэлі моцнае супраціўленне. Адбыўся жорсткі бой".

Ва ўзнагародным лісце сказана:

"Камандзір танка разведузвода гвардыі лейтэнант Аніскін М. А., дзейнічаючы ў разведцы за населены пункт Студзёнка, сустрэў калону больш за 60 аўтамашын і каля роты салдат і афіцэраў праціўніка. Калону пры-крывала самаходная гармата і некалькі гармат. Калі танк гвардыі лейтэнанта Аніскіна з'явіўся ў вёсцы, шлях яму быў адрэзаны. Засталося адно — прыняць бой. За гадзіну бою трапным агнём танкісты знішчылі 60 аўтамашын, больш як 75 салдат і афіцэраў ворага, склад з прадуктамі і іншай маёмасцю. У гэтым баі 25.6.1944 г. лейтэнант Аніскін загінуў. Яго імя носіць Пустынкаўская сярэдняя школа, на месцы гібелі ў вёсцы Студзёнка пастаўлены помнік.

*П. І. Ермашкевіч.*



Помнік Герою Савецкага Саюза М. А. Аніскіну ў в. Студзёнка.

**БАРАДУЛІН Сяргей Дзмітрыевіч.** Нарадзіўся 8.10.1924 г. у вёсцы Лебедзі Унінскага р-на Кіраўскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (1945). Да вайны працаваў у калгасе. На фронце з 1943 г. З чэрвеня 1943 г. на Заходнім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх і 3-м Беларускім франтах, наводчык рэактыўнай мінамётнай устаноўкі ("кацюшы"). Удзельнічаў у баях за вызваленне Смаленска, Невеля, Гарадка і Сянна. Імем С. Дз. Барадуліна названы вуліцы ў г. Сянно і г. Кіраў.

**НАЗАРЭНКА Павел Іванавіч.** Нарадзіўся 24.5.1919 г. у в. Трохсельскае Новакубанскага раёна Краснадарскага краю. Герой Савецкага Саюза (1945). Да вайны працаваў у калгасе. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942 г., вадзіцель рэактыўнай мінамётнай устаноўкі ("кацюша"). Імем П. І. Назарэнкі названа вуліца ў г. Сянно.

**СВЯТЛІЧНЫ Цімафей Іванавіч.** Нарадзіўся 1.5.1917 г. у в. Святлічнае Залачэўскага раёна Харкаўскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (1945). На фронце з 1941 г., сяржант, камандзір рэактыўнай мінамётнай устаноўкі. Імем Ц. І. Святлічнага названа вуліца ў г. Сянно.

26.6.1944 г. батарэя рэактыўных мінамётных установак "кацюша" разам з перадавымі падраздзяленнямі 3-га гвардзейскага кавале-



С. Дз. Барадулін.



П. І. Назарэнка.



Ц. І. Святлічны.



Помнік на брацкай магіле Героям Савецкага Саюза С. Дз. Барадуліна, П. І. Назарэнкі, Ц. І. Святлічнага ў парку г. Сянно.

рыйскага корпуса пераправілася цераз р. Абалянка і завязала каля вёскі Кажамякі бой з пераўзыходзячымі сіламі нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У час бою адна з мінамётных установак, у разлік якой уваходзілі камандзір гвардыі сяржант Ц. І. Святлічны, вадзіцель гвардыі старшы сяржант П. І. Назарэнка і наводчык гвардыі радавы С. Дз. Барадулін, была пашкоджана і акружана гітлераўцамі. 6 гадзін стрымлівалі гвардзейцы шалёны націск ворага, знішчылі больш за 500 салдат і афіцэраў, шмат тэхнікі. Загінулі ў гэтым баі. Званне Героя Савецкага Саюза ім прысвоена 24.3.1945 г.

*В. М. Удальцоў.*

# Яны нарадзіліся на Сенненшчыне

## ГЕРОІ САВЕЦКАГА САЮЗА



А. К. Гаравец.

**ГАРАВЕЦ Аляксандр Канстанцінавіч.** Нарадзіўся 12.3.1915 г. ў вёсцы Машканы. Герой Савецкага Саюза (1943). Скончыў Машканскую сямігодку (1930), Віцебскі аэраклуб, Ульянаўскую лётную школу (1935). Працаваў інструктарам, начальнікам лётнай часці Шахцінскага аэраклуба. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1942 г. на Паўночна-Каўказскім, Варонежскім франтах. Намеснік камандзіра эскадрыллі 88-га гвардзейскага знішчальнага авіяпалка. Загінуў 6.7.1943 г.

### Адзін супраць армады

...На войне выжить хотелось каждому. Это естественно. Инстинкт самосохранения дан человеку природой. Но любовь к Родине, верность идеалам партии Ленина оказались у советского человека выше инстинктов. И это не просто высокие слова.

Когда Александр Горовец поднимался в небо вместе с товарищами и шел сквозь огонь в атаку, ему тоже хотелось жить. Он знал, что может погибнуть в бою. Однако шёл сквозь

самый свирепый огонь, потому что иначе невозможно было уничтожить тех, кто пришел с мечом на родную землю. "Атакую!" — был его девиз. "Атакую!" — в этом слове сливалось всё: ненависть к врагу и ярость, фронтовое братство и твердая вера в победу...

Тяжело загруженные бомбами "юнкерсы" появились в поле зрения лейтенанта Горовца неожиданно. Их было много, очень много. Шли они девятками в кильватерной колонне звеньев на высоте около 2500 метров. Шли на малой скорости, самоуверенно, словно на параде... Прикрытия у них не было. Возможно, истребители проскочили вперед, чтобы расчистить небо для своих бомбардировщиков. Или они опаздывали? "Значит, нужно торопиться. Где же Рекунов? Опять, видимо, подвел мотор, и он отстал".

Теперь сложно установить, почему Александр Константинович не предупредил Мишустина о приближавшихся "юнкерсах". И почему после приказа командира эскадрильи возвращаться он не взял курс на свой аэродром? Вероятно, рация вышла из строя.

Лейтенант Горовец не ушел, не повернул назад. Враг был рядом. Дать противнику возможность отбомбиться, когда в пушках оставались снаряды, а в баках горючее, было не в натуре Горовца.

Движимый высоким чувством долга, он смело пошел навстречу врагу. Боевой опыт, видимо, подсказал ему, что в сложившейся обстановке следовало действовать решительно и быстро. И он, увеличив обороты мотора, ураганом накинулся на ведущего первой девятки. Очередь была точной. "Юнкерс" будто споткнулся. Потеряв скорость, он рухнул на землю.

В перекрестии прицела оказалась новая цель. Атака Александра была такой же стремительной. Самолет закачался и, отваливая от строя, с неистовым ревом понесся вниз.

Внезапные атаки нашего летчика ошеломили врага. Потеряв управление, фашисты стали беспорядочно отстреливаться, сбрасывать бомбы. Горовец не мог не воспользоваться их замешательством. Он снова выполнил заход, нацелился на врага.

Огненная трасса светящихся пуль пронеслась над кабиной "лавочкина": фашисты начали огрызаться. Александр бросил истреби-



А. К. Гаравец (другі справа) з баявымі сябрамі В. М. Рэкуновым, М. К. Шчарбаковым, В. І. Мішусціным.

тель вверх, ушел из-под огня. Затем перевел машину в горизонтальный полет и, выбрав удобный момент, снова устремился в атаку. Вот он, бомбер, прямо в прицеле! Еще секунда, еще... Палец нажал гашетку. Огонь! "Юнкерс" неуклюже опустил нос и, оставляя за собой черную борозду дыма, понесся к земле.

Этого бомбера Александр подстерег на развороте. Он сразил его одной-единственной очередью. Ю-87 вздрогнул, на какое-то время завис в воздухе, затем покачнулся и свалился на крыло. Так, в полуопрокинутом виде, коптя небо, он и падал, пока не врезался в землю недалеко от траншей и окопов наших войск, что оборонялись в районе Зоринских Дворов, Орловки, Ольховатки, Яковлева, Луханина.

Воздушные стрелки "юнкерсов" вели по "лавочкину" яростный огонь, а бомбардировщики продолжали обрабатывать рубеж нашей обороны. Из-за плотной стрельбы сложно было подойти к фашистам поближе, на дистанцию более эффективного ведения огня. Однако Александр, маневрируя, находил уязвимые места, атаковал врага снова и снова. Он заходил на строй бомбардировщиков то сверху, сзади, то со стороны под разными ракурсами. Пушечные очереди его были короткими и точными. Ведь запас снарядов был не беспределен. Их следовало расходовать как можно экономнее.

Когда Горовец врезался в строй бомбардировщиков, воздушные стрелки, опасаясь задеть своих, прекратили огонь, и Александр, не давая опомниться фашистам, уничтожал их поодиночке.

В это время младший лейтенант Борис Артюхин из группы прикрытия изо всех сил отбивался от наседавших на него "мессершмиттов".

Впоследствии он, свидетель последнего боя Александра Горовца, рассказывал о том поединке так:

— Вражеских самолетов было около полусотни, и я, естественно, не знал, что с ними вел схватку Горовец: нőмер его истребителя из-за дальнего расстояния и дымки разглядеть мне никак не удалось.

Снарядов у Горовца оставалось все меньше, и он старался бить по "юнкерсам" с короткой дистанции, наверняка.

Ещё одна атака с высоты. Ещё один Ю-87 четко вписался в прицел, и Александр ударил по нему остатками снарядов. Очередь снова оказалась поражающей. Это был уже девятый "юнкерс", сраженный им в одном бою.

Борису Артюзину все же удалось оторваться от "мессеров". Выжимая из мотора всю его мощь, он бросил свой Ла-5 на выручку товарища. Однако сблизиться с ним не успел. С большой высоты на Горовца свалилась четверка Ме-109. Летчику, правда, удалось увернуться от удара, выполнить разворот и, как показалось Артюхину, самому оказаться в положении атакующего. Но его оружие молчало: боеприпасы наверняка были исчерпаны. Фашисты, видимо, поняли это. Они рассыпались веером и нападали на Горовца с разных сторон одновременно.

— Держись, браток! — шептал Артюхин. — Держись!

Огонь Бориса был точный. С удобной позиции он выпустил в приотставшего "мессера" очередь, и враг, потеряв управление, пошел к земле. Остальные истребители уже сидели на хвосте Ла-5, который пикировал под большим углом.

Высота падала, летчик мог врезаться в землю.

— Выводи же! — бросил Борис в эфир.

Он понимал: голос его никто не услышит. С горечью подумал, что воздушный боец, вероятно, убит. Но ошибся. Перед самой землёй истребитель все же вышел из пике. Какое-то время он шел по прямой. Значит, Ла-5 был управляем. Однако с истребителем происходило что-то непонятное: то он задирал нос, то кренился на крыло. Курс держал в сторону Зоринских Дворов. Большое облако — земли и пыли — последнее, что увидел Артюхин на месте падения нашего истребителя.

Командир 8-й гвардейской истребительной авиадивизии полковник Д. Н. Кириллов, как обычно, находился на пункте наведения авиаторов. Утром 7 июля с ним связался заместитель командира 5-го гвардейского истребительного авиакорпуса генерал А. П. Сухановский, который сообщил, что из штаба фронта пришло донесение. В нем сообщалось о советском лётчике, сбившем в бою девять фашистских бомбардировщиков.

Об этой редкой по напряжению схватке в небе доложили в штаб фронта с НП 1-й танковой и 6-й гвардейской армий, а также из других наземных частей.

Воздушный бой наблюдали и непосредственно с КП генерала М. Е. Катукова, который накануне вечером из Успенова перебазировался в район Зоринских Дворов и находился в четырех километрах от переднего рубежа обороны.

О судьбе лётчика ничего ещё не было известно, но генерал Н. Ф. Ватутин, который тоже видел этот бой, приказал немедленно представить его к званию Героя Советского Союза.

Перед заходом солнца над аэродромом в Долгих Будах появился У-2. Проходя на бреющем, лётчик сбросил кусок килевого управления с красной ломаной стрелой-молнией, которая украшала хвостовое оперение самолетов 88-го гвардейского полка. На втором круге с У-2 посыпались полевые цветы: картина необычная, волнующая. Номера на киле не оказалось, но все — и в первую очередь Артюхин — поняли: это от машины Александра Горовца. Сделав ещё круг и получив разрешение на посадку, лётчик приземлил У-2, подрулил к КП полка. Пилотировал самолет Дмитрий Никанорович Кириллов.

Вскоре по его приказу были созданы команды поиска истребителя и останков А. К. Горовца.

Обнаружить его самолет, однако, в то время так и не удалось: тяжелые бои на обоянском направлении не дали такой возможности.

Утром 8 июля майор С. С. Римша обратился к начальнику штаба А. Е. Клещеву:

— Бери, Александр Ефимович, писарей и диктуй листовку. Это приказ командующего армией генерала Красовского. К вечеру чтобы каждый лётчик знал о подвиге Горовца. И добавь, что гвардии лейтенант Горовец представлен к званию Героя. Звонили из штаба фронта, от самого Николая Фёдоровича Ватутина!

— Гвардии старший лейтенант Горовец, — подсказал Клещев. — Александру Константиновичу присвоено очередное звание. Документы прибыли перед вылетом истребителей в бой.

— Жаль, — тяжко вздохнул Римша. — Так и не удалось моему братке носить погоны с тремя звездочками.

*Друкуецца паводле: Б. Крепак, Л. Крушинская (племянница А. К. Горовца) В поединках на высоте. Мн., 1989*

**КАВАЛЕНКА Сяргей Анісімавіч.** Нарадзіўся 27.11.1921 г. у вёсцы Ульянавічы. Герой Савецкага Саюза (1945). Разам з бацькамі пераехаў у Магілёў. На фронце з красавіка 1944 г., а да гэтага быў у партызанах.



На месцы гібелі А. К. Гараўца каля в. Зорынскія Двары бацька, Канстанцін Іванавіч, і сёстры Героя, Зінаіда і Ніна (на пярэднім плане).



С. А. Каваленка



І. І. Камінскі

## Было дваццаць чатыры гады

...Цудоўная, маляўнічая азёрная Сенненшчына. Ёсць тут вёска Ульянавічы, даволі вялікая, упрыгожаная меднастволымі соснамі. У гэтых мясцінах і прайшло маленства Сяргея Каваленкі. А хлопчыкам ён рос вельмі здольным. Чытаць і пісаць навучыўся ячшэ да школы і маляваць умеў добра.

...У Чырвоную Армію яго прызвалі ў 1940 годзе. На службу пайшоў, маючы сярэднюю адукацыю. І тут не пашчасціла, мабыць, упершыню за ўсё, яшчэ нядоўгае жыццё. У красавіку 1941 года яго камісавалі па хваробе.

У пачатку вайны Сяргей добраахвотна пайшоў на ўзвядзенне абарончых збудаванняў вакол Магілёва.

Не ўдалося Сяргею мінуць нямецкага лагера, які знаходзіўся ў раёне Магілёўскай фабрыкі шаўковых тканін. Яго падазравалі ў сувязі з партызанамі. На вачах Сяргея гітлераўцы расстралялі жонку і дзяцей старэйшага брата Мікалая.

Зімовай ноччу, калі разгулялася завея, Сяргей разам з некалькімі таварышамі ўцёк да партызан. Разам са сваім атрадам народных мсціўцаў трапіў на тэрыторыю Літвы. На фронце з красавіка 1944 года. Восенню сорак чацвёртага быў паранены. Але акрыяў, са шпіталя зноў вярнуўся на фронт. Прыйшло пісьмо ад брата Міхаіла, які некалі на Асінбудзе быў Сяргею за бацьку. Ды толькі пісьмо тое напісана было рукой медсястры са шпіталя, дзе ляжаў брат, гвардзеец-танкіст, з ампутаванымі нагамі, увесь абгарэлы.

Ніяк нельга даравадь ворагу ўсё гэта. А баі вяліся ўжо на чужой зямлі. Ішоў сорак пяты, не так далёка заставалася да Перамогі.

299-ы стралковы полк 255-й стралковай дывізіі, у якой ваяваў Сяргей Каваленка, наступаў на фашыстаў у складзе І-га Украінскага фронту. Неабходна было захапіць Верхне-Сілезскі прамысловы раён. На заходнім беразе ракі Одэр, якую трэба было фарсіраваць, знаходзіліся варожыя абарончыя збудаванні. 5-я стралковая рота 1 лютага ў 13 гадзін 45 мінут атакавала пазіцыі праціўніка на паўднёвы захад ад горада Шургаст. Кулямётны агонь варожага дзота перакрываў шлях. Камандзір роты загадаў групе байцоў знішчыць яго.

Сяргей паўзе наперад. Да дзота, які паліваe агнём, ужо рукой падаць. Ён злаўчыўся, кінуў гранату. Выбух — і цішыня. А ззаду нарастае, грыміць "Ура!" Рота паднялася ў атаку. Ды раптам ажывае, здавалася б, назаўсёды змоўклая амбразура. Зноў свінцовы лівень косіць нашых байцоў. У рашучы момант бою С. А. Каваленка закрыў сваім целам амбразуру дзота. Пазіцыя праціўніка была ўзята. Так 1.2.1945 г. загінуў С. А. Каваленка. 10.4.1945 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імем названа вуліца ў Магілёве.

*І. Е. Лазука.*

**КАМІНСКІ Іван Іларыёнавіч.** Нарадзіўся 8.11.1919 г. у вёсцы Мяккія. Герой Савецкага Саюза (1945). У Чырвонай Арміі з 1939 г. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1939), ваенную школу лётчыкаў у г. Энгельс (1941), Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1948), ВПШ пры ЦК КПСС (1963). У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, вызвалення Беларусі (г. Віцебск, Орша, Магілёў, Мінск, Маладзечна), Літвы, Польшчы, баёў ва Усходняй Прусіі. Старшы лейтэнант Камінскі зрабіў 239 баявых вылетаў, сфатаграфаваў каля 27 тыс. км$^2$ варожай абароны і ваенных аб'ектаў. Да 1947 г. у Савецкай Арміі, капітан. З 1948 г. на партыйнай і савецкай рабоце ў Мінску. За заслугі перад Радзімай узнагароджаны васьмю ордэнамі і медалямі. Памёр 6.10.1974 г. У вёсцы Машканы Сенненскага раёна яму пастаўлены помнік.

**МАЦЮШОЎ Аляксей Дзмітрыевіч.** Нарадзіўся 21.3.1916 г. у в. Оўсішча. Герой Савецкага Саюза (1944). Скончыў Латыгальскую сямігодку, настаўніцкія курсы. Працаваў настаўнікам, сакратаром сельсавета. З 1937 г. у

арміі. Скончыў Харкаўскае ваеннае вучылішча пагранічных войск (1940). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1941 г. У 1943 г. — начальнік штаба 940-га стралковага палка 262-й стралковай дывізіі.

### З кагорты герояў

18 верасня 262-я стралковая дывізія была ўведзена ў прарыў нямецкай абароны ў раёне вёскі Рабышы Дзямідаўскага раёна Смаленскай вобласці. 940-ы стралковы полк атрымаў загад наступаць у авангардзе дывізіі ў напрамку на горад Дзямідаў. На світанні гэтага дня пасля моцнай артпадрыхтоўкі полк перайшоў пярэдні край нямецкай абароны. Потым, не сустракаючы вялікага супраціўлення, воіны працягвалі праследаванне праціўніка. Уперадзе ішла разведка (узвод аўтаматчыкаў) і баявая ахова. Узначальваў атрад начальнік штаба А. Дз. Мацюшоў. За дзень было пройдзена каля 30 кіламетраў. Да канца дня перадавы атрад зайшоў у тыл нямецкага гарнізона ў вёсцы Вераб'і, адрэзаў немцам шляхі да адыходу. Не чакаючы падыходу асноўных сіл палка, маёр Мацюшоў узначаліў атаку і разграміў варожы гарнізон, які быў моцным пунктам нямецкай абароны.

На подступах да вёсак Георгіўскае і Дзмітракі разведкай было ўстаноўлена, што на адной з вышынь немцы паспешліва ўмацоўваюць свае пазіцыі. Маёр Мацюшоў рашыў не даць немцам замацавацца і разбіць іх, не чакаючы падыходу асноўных сіл палка. Начальнік штаба асабіста ўзначаліў атаку. Пад прыкрыццём артылерыйскага і мінамётнага агню байцы з крыкам "Ура!" абрушыліся на ворага. Для немцаў усё гэта было поўнай нечаканасцю. Яны ў паніцы кінуліся наўцёкі. Мацюшоў



А. Дз. Мацюшоў.

у гэтым баі асабіста з аўтамата знішчыў некалькі гітлераўцаў. Але фашысты ў хуткім часе апамяталіся. З боку вёскі Дзмітракі пачаў біць кулямёт...

"У гэтым баі, — пісаў у сваіх успамінах былы камандзір ордэна Кутузава 940-га стралковага палка, палкоўнік у адстаўцы І. В. Арзамасцаў, — наш атрад, які ўзначальваў маёр Мацюшоў, знішчыў больш за сотню нямецкіх салдат і афіцэраў, астатнія выратаваліся ўцёкамі. Было захоплена 4 мінамёты, 27 кулямётаў, 3 рацыі, 12 павозак з маёмасцю і боепрыпасамі, у тым ліку адна со штабнымі дакументамі і многа іншых трафеяў. Гэта перамога дала магчымасць палку з найменшымі стратамі разбіць важныя апорныя пункты ворага і развіць далейшае наступленне. Але сам маёр Мацюшоў 19.9.1943 г. па-геройску загінуў. Яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза".

*П. І. Ермашкевіч.*

**МАШЭРАЎ Пётр Міронавіч.** Гл. у раздзеле "Дзяржаўныя дзеячы".

## ...Той памятны бой

**ПЯТАКОВІЧ Аляксандр Францавіч.** Нарадзіўся 25.12.1914 г. у г. Сянно. Герой Савецкага Саюза (1945). Да 1940 г. працаваў у саўгасе Пухавіцкага раёна, потым інструктарам райкома партыі. На фронце з лета 1941 г. Камандзір танкавага разведузвода. Пасля вайны працаваў у г. Мар'іна Горка. Памёр 9.6.1988 г.

Штурмуючы вельмі ўмацаваную паласу абароны праціўніка за Ковелем, дзе немцы сканцэнтравалі вялікую колькасць танкаў, авіяцыі, нашы войскі сустрэліся з вялікімі цяжкасцямі. Першая спроба авалодаць гэтым раё



А. Ф. Пятаковіч.

нам аказалася няўдалай. Толькі праз 18 дзён, пасля моцнай артпадрыхтоўкі і ўдараў з паветра, нашы войскі прайшлі адну за адной пяць ліній варожай абароны. У гэтым баі асабліва вызначылася танкавая рота, камандзірам якой быў А. Ф. Пятаковіч. Некалькі куль з аўтамата прашылі шлем на галаве Пятаковіча, сарвалі скуру. Але адважны танкіст да канца бою заставаўся ў страі. Гэты прастрэлены шлем ён доўга захоўваў потым як памяць аб тым дні, калі быў літаральна на валасок ад смерці. Ст. лейтэнант Пятаковіч вызначыўся ў баях за расшырэнне плацдарма на левым беразе Віслы і за горад Радам (Польшча): у час баявой разведкі 15.1.1945 г. узвод на чале з Пятаковічам разграміў варожую аўтакалону, зайшоў у фланг артдывізіёну, знішчыў 2 бронетранспарцёры, 3 гарматы і захапіў чатыры гарматы, праследуючы ворага, заняў 2-ю паласу абароны, што спрыяла поспеху наступлення. У баях за Одэр да Берліна экіпаж танка А. Ф. Пятаковіча знішчыў 8 танкаў, 8 гармат, 6 бронетранспарцёраў, 19 кулямётных кропак, узяў у палон 130 гітлераўцаў.

Дзень 2 мая 1945 г. Аляксандр Францавіч адзначаў як дзень свайго другога нараджэння. Непадалёку ад рэйхстага, за гадзіну да капітуляцыі берлінскага гарнізона, у яго танк трапіў фашысцкі фаўстпатрон. Загінуў увесь экіпаж. А яго праз адчынены люк выкінула выбуховай хваляй. Падаспеўшыя баявыя сябры патушылі агонь на камбінезоне, аказалі першую дапамогу.

Дзень Перамогі сустрэў за Берлінам па дарозе на Веймар. Праз год А. Ф. Пятаковіч дэмабілізаваўся ў званні капітана, вярнуўся да мірнай працы. Быў на партыйнай і савецкай рабоце.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі.

*П. І. Ермашкевіч.*

## Подзвіг штурмана



І. Г. Тамашэўскі.

**ТАМАШЭЎСКІ Іван Герасімавіч.** Нарадзіўся 25.11.1918 г. у в. Рудніца. Герой Савецкага Саюза (1943). Пасля школы скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і аднасасова аэраклуб. У 1940 г. заканчвае Мелітопальскае ваенна-авіяцыйнае вучылішча. У чэрвені 1941 г. — штурман звяна 99-га палка начных бамбардзіроўшчыкаў.

24 чэрвеня 1941 года Тамашэўскі і яго таварышы ўступілі ў бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Усім палком узняліся яны ў паветра. Трэба было нанесці бомбавы ўдар па варожых калонах у раёне Маладзечна. Заданне было паспяхова выканана, бомбы, скінутыя з 27 бамбардзіроўшчыкаў, нанеслі вялікія страты захопнікам.

28 чэрвеня звяно бамбардзіроўшчыкаў, штурманам якога быў Іван Тамашэўскі, атрымала загад нанесці бомбавы ўдар па ворагу ў раёне Слуцка. Да гэтага часу авіяполк панёс значныя страты. Вылятаць даводзілася невялікімі групамі і без суправаджэння знішчальнікаў.

— Карыстаючыся хмарнасцю, — расказваў Іван Тамашэўскі, — ляцім на вышыні 600 метраў. Нечакана хмары расступіліся і ўперадзе бачна ўжо цэль. Па дарозе, узнімаючы пыл, імчаць танкі, аўтамашыны, цыстэрны з гаручым. Наводжу звяно на цэль. Але ў гэты час паяўляюцца "месершміты" і атакуюць нас. Стралкі-радысты адкрываюць па іх агонь. Нарэшце цэль у перакрыжаванні прыцэлу. Націскаю кнопку — і бомбавы груз ляціць на галовы ворагаў. Узрываюцца танкі, машыны, дымны след цягнецца ад палаючых бензазапраўшчыкаў. І ў гэтае ж імгненне загарэўся правы матор. Агонь падбіраецца да кабіны. Заціх кулямёт стралка-радыста. Забіты камандзір Мікалай Іванькоў. Самалёт з крэнам падае ўніз. З цяжкасцю адкрываю люк і на вышыні 200 метраў выкідваюся з самалёта. Толькі раскрыў парашут і — зямля. Дакладней, лес. Купал парашута зачапіўся за верхавіну дрэва.

Вызваліўшыся ад парашута, накіраваўся ў лес, далей ад дарогі. На восьмыя суткі дабраўся да свайго палка.

Да студзеня 1944 г. Іван Герасімавіч зрабіў 581 баявы вылет. Вось адзін з іх.

Восенню 1943 года, пасля пераможнай бітвы пад Курскам і Белгарадам, нашы войскі паспяхова развівалі наступленне і набліжаліся да Дняпра. Адступаючы, немцы спадзяваліся замацавацца на правым беразе ракі. На адной з пантонных пераправаў скапілася вялікая колькасць варожых войск. Разбамбіць гэту пераправу — такая задача была пастаўлена перад звяном лёгкіх бамбардзіроўшчыкаў ПО-2, штурманам якога быў Іван Герасімавіч Тамашэўскі. Разлік рабіўся на поўную нечаканасць і пахмурнае надвор'е. Можна ўявіць сабе, якую выключную дакладнасць разлікаў павінен быў вытрымаць штурман, каб праз суцэльную воблачнасць, усляпую, вывесці на цэль тры самалёты, на паўтары-дзве мінуты вынырнуць з-пад хмар якраз над варожай пераправай, разбамбіць яе і зноў схавацца ў гушчы воблакаў.

Пад цяжарам танкаў, гармат, вялікагрузных машын прагіналіся пралёты плывучага маста. З нізка навіслых асенніх хмар церушыў дробны дождж ык, і праз гэта прытупілася пільнасць нямецкіх зенітчыкаў. Ніяк не чакалі яны ў такі час нападу з паветра. Ды пралічыліся. Адзін за адным вынырнулі з-за хмар самалёты з чырвонымі зоркамі на крылах, ад выбухаў бомб ускінуліся фантаны вады ледзь не пад самыя крылы, а ланцужок пантонаў з усім ваенным грузам начаў паволі распаўзацца і зносіцца цячэннем.

У выніку разгрому пераправы вялікая групоўка варожых войск, што не паспела пераправіцца за Днепр, была ліквідавана. За гэты подзвіг, за высокае майстэрства штурману звяна Івану Герасімавічу Тамашэўскаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. А ўсяго ён атрымаў 16 урадавых узнагарод.

Пасля вайны маёр запасу Іван Герасімавіч Тамашэўскі жыў у горадзе Жытоміры, прымаў актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Памёр 12.12.1994 г.

*П. І. Ермашкевіч.*

## Прамой наводкай

Дакументы гэтага чалавека старанна зберагаюць яго родныя. Калі разглядаеш шматлікія падзякі камандавання, ордэнскія кніжкі, пасведчанні да медалёў, то міжволі адчуваеш подых тых грозных падзей.

Увагу прыцягвае звычайны лісток, пажоўклы ад часу. "Баявая характарыстыка" — так называецца гэты дакумент. І дата пад ім — 5 кастрычніка 1944 года. "За час праходжання службы ў 21-м дывізіёне 1015-га артылерыйскага палка на пасадзе камандзіра гарматы паказаў сябе дысцыплінаваным, патрабавальным да сябе і сваіх падначаленых, ведаючым сваю справу, ініцыятыўным. За час баёў з нямецкімі акупантамі вёў сябе мужна і смела, нягледзячы на абстрэлы праціўнікам батарэі. Ён умела камандаваў разлікам і адбіваў контратакі з закрытых пазіцый і прамой наводкай..."

Гэтыя радкі з баявой характарыстыкі Мікалая Нічыпаравіча Рабушкі. Тады ён ваяваў у Прыбалтыцы. Да вайны хлопец з вёскі Зямковічы паспеў закончыць школу малодшага каманднага саставу ў горадзе Горкім і служыў у Арменіі. За ўдзел у савецка-фінляндскай вайне атрымаў сваю першую ўзнагароду — медаль "За баявыя заслугі".

Свой першы бой з гітлераўцамі Рабушка прыняў на Украіне, каля Мелітопаля. У баях за станцыю Ровенькі, што ў Данецкай вобласці, быў паранены. Пасля шпіталя трапіў на Паўночна-Заходні фронт. Удзельнічаў у прарыве блакады Ленінграда. Давялося прайсці і праз полымя Курскай дугі.

У складзе групоўкі праціўніка налічвалася больш за 900 тысяч чалавек, каля 10 тысяч гармат і мінамётаў, каля 2700 танкаў і штурмавых гармат, каля 2050 самалётаў. Нічога не дапамагло гітлераўцам — ні славутыя "тыгры" і "фердынанды", ні жалезабетонныя ўмацаванні. За ўдзел у штурме Арла, за праяўленую мужнасць і гераізм памочнік камандзіра ўзвода Мікалай Рабушка атрымаў другі медаль "За баявыя заслугі".

Удзельнічаў ён у баях за Гомель. А ўжо ў баі пад Сарнамі вельмі нялёгка прыйшлося батарэі. Страляць па праціўніку давялося з пазіцыі, якую бамбілі фашысцкія самалёты. За гэтыя баявыя дзеянні батарэя атрымала падзяку камандавання.

Пад Рыгай вораг супраціўляўся люта. Пазіцыі артылерыстаў атакавалі "тыгры". Узвод Рабушкі прамой наводкай знішчыў два танкі. Мікалай Нічыпаравіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Нашы часці ўвайшлі ў прадмесце Шчэціна. І тут немцы кінуліся ў шалёную контратаку, якую падтрымлівалі танкі і артылерыя. Вораг быў разгромлены. За гэты бой М. Н. Рабушка атрымаў ордэн Вялікай Айчыннай вайны II ступені.

Батарэя, у якой служыў Мікалай Рабушка, пракладвала шлях пяхоце аж да самога Берліна. Было яшчэ шмат баёў, былі ўзнагароды. Вайну ён закончыў на Эльбе.

Грудзі гвардзейца-артылерыста ўпрыгожвалі два ордэны Вялікай Айчыннай вайны I і II ступені, ордэн Чырвонай Зоркі, два медалі "За баявыя заслугі", медалі "За вызваленне Варшавы", "За ўзяцце Берліна", "За перамогу над фашысцкай Германіяй".

Пасля вайны Мікалай Рабушка шмат гадоў працаваў у міліцыі, дзе да яго баявых узнагарод дабавіліся мірныя. Усяго ў ветэрана 21 узнагарода.

*І. Е. Лазука.*

## Лісты з фронту

Гэтае пісьмо, якое прадставіў кіраўнік клуба "Памяць" Аляксандр Жудро, цікавае тым, што напісана 27 чэрвеня 1944 года. А Сенненскі раён быў вызвалены 25 чэрвеня. Ліст ужо выцьвіў, пацёрся, але яшчэ можна яго прачытаць і адчуць атмасферу таго суровага часу, подых баявога сяброўства. Прывядзём яго цалкам:

*"Здравствуйте, уважаемые родители Пети Шубко!*

*Пишет письмо Вам лучший боевой друг Вашего сына Пети, Петя Шкурин. Дорогие родители, сообщаю Вам, что Ваш любимый сын Петя погиб при исполнении служебных обязанностей 24 июня 1943 года в селе Казанка Золотухинского района Курской области. И похоронен в селе Казанка.*

*Дорогие родители! Я с Петей работал вместе с конца 1941 года и до того момента, когда он погиб. Вашего сына Петю все боевые друзья и товарищи очень любили и уважали, как чуткого и честного командира. Петя сделал по бомбардировке врага 270 боевых вылетов. Родина высоко его оценила, наградив орденом Отечественной войны II ст. и медалью "За оборону Сталинграда".*

*Дорогие родители! Я Вас прошу не убиваться, ибо Вы на себе проверили, что такое кровавый Гитлер, и с какой ненавистью мы его бьём. Ваш сын был участником героической битвы под Сталинградом, а затем на центральном участке фронта. Прошел ровно год после гибели Пети, как освободили его родину, село Телешовщина. За этот период утекло очень много воды, но имя Вашего сына Пети, как и прежде, живёт в наших сердцах. Где бы мы ни были, но Петю всегда вспоминаем.*

*Дорогие родители! О гибели Пети я сообщил всем его друзьям, а также и своей мамаше. Они все Вам напишут, адрес Ваш есть у всех.*

*Дорогие родители! Я Вас прошу, как получите письмо, то напишите мне, чтобы я был в курсе дел. Пишите всё, я буду очень доволен. Пишите по адресу: полевая почта 42076, Шкурину Петру Никитовичу. Пишите всё, что Вас интересует, я от всего сердца буду отвечать на все заданные Вами вопросы.*

*С горячим боевым приветом Петя Шкурин. Дорогие родители! Передают Вам привет все лучшие друзья и товарищи Вашего сына Пети.*

*Дорогие товарищи-односельчане! Я Вас глубоко прошу: если кто получит данное письмо, то, пожалуйста, сообщите семье Шубко.*

*Петя Шкурин*
*27 июня 1944 года."*

Вось такі сардэчны ліст прыслаў бацькам баявы сябра іх загінуўшага сына, ураджэнца вёскі Целяшоўшчына, камандзіра эскадрыллі, старшага лейтэнанта, Пятра Рыгоравіча Шубкі.

А вось яшчэ адно пісьмо, нават не пісьмо, а паштоўка. На ёй надпіс "Вперёд, к победе!" і выява атакуючых савецкіх танкаў, самалётаў і байцоў. Адрасавана яна ў вёску Мянюцева Беліцкага сельсавета Еўдакіі Васільеўне Літвінавай ад яе сына Фёдара Літвінава. Указаны нумар яго палявой пошты: 71655-г. Вось што напісана ў паштоўцы.

*"5 октября 1944 г.*

*Здравствуйте, дорогие родители. В первых строках моего небольшого письма я хочу сообщить, что я жив и здоров, и желаю всего хорошего в вашей жизни. Новостей особенных нет. Письма от вас я не получил ни одного. Очень скучаю, потому что не знаю про дом, а еще о погибшем товарище Витьке, который погиб 1 октября 1944 года. Остались мы сейчас втроём: Виталя, Костя и я. Прошу писать письма. Пишите про все новости, сколько получили хлеба на трудодень, кто сейчас находится дома. Пока, до свидания. Привет Володе, бабушке Наталье, Арине и всем родным.*

*Литвинов Фёдор."*

Па зместу адчуваецца, што пісаў хлебароб, для якога вайна — толькі суровая неабходнасць. Ён, Фёдар Ігнатавіч Літвінаў з Мянюцева, таксама загінуў. Загінуў 22 студзеня 1945 года. Колькі іх, нашых землякоў, палягло дзеля вялікай Перамогі!

*Падрыхтаваў да друку І. Е. Лазука.*

## Устаноўленыя імёны

Жыхары гарадскога пасёлка Багушэўск у чэрвені 1944 г. былі відавочцамі гібелі нашых самалётаў-штурмавікоў у час вызвалення раёна войскамі Чырвонай Арміі. Адзін з іх разбіўся на дарозе, другі ўпаў у балота. Хто яны, адважныя пілоты?

Пошукавыя работы пачаліся летам 1970 г. недалёка ад Багушэўска. Для гэтых мэт быў выдзелены экскаватар. Ужо на другі дзень работы экскаватаршчык саўгаса імя Гараўца Мікалай Паўлавіч Андрэсў выцягнуў з глыбіні тарфянога балота абломкі самалёта, буйнакаліберны кулямёт, матор, рэшткі кабіны і астанкі пілота. У кішэнях яго камбінезона знойдзены розныя дакументы, у тым ліку тэхнічныя фармуляры і картка кандыдата ў члены партыі № 4949334. Прозвішча, імя і імя па бацьку лётчыка — Гарбуноў Уладзімір Міхайлавіч. Ён быў камандзірам звяна аднаго з палкоў штурмавой авіяцыі. Прызваны ў армію з г. Саратава.

Крыху пазней былі знойдзены астанкі другога члена экіпажа, паветранага стралка. Устаноўлены яго імя і прозвішча — Іван Ягоравіч Чырвоў.

28 верасня 1970 г. у Багушэўску адбылося перазахаванне адважных лётчыкаў. "Прапалі без вестак", — так паведамлялася родным загінуўшых. І вось праз столькі часу ўстаноўлены імёны і месца гібелі. Удалося хутка адшукаць родных і яны прыехалі на пахаванне — маці, сёстры і дачка Уладзіміра Гарбунова.

У яго гонар вуліца Вакзальная перайменавана ў вуліцу імя лейтэнанта Гарбунова. Пазней з'явілася ў Багушэўску і вуліца імя Чырвова.

*П. І. Ермашкевіч.*

## Клуб "Памяць"

Сенненскі раённы ваенна-патрыятычны клуб "Памяць" уваходзіць у склад Беларускай Рэспубліканскай Асацыяцыі "Пошук". Яго гісторыя пачалася ў 1991 г. Тады ўпершыню ў Беларусі праводзілася "Вахта Памяці". Аддзел адукацыі райвыканкома прапанаваў школам удзельнічаць у той першай вахце. Энтузіясты знайшліся ў Сінягорскай базавай і Какоўчынскай сярэдняй школах. Па пяць вучняў з кожнай школы на чале з выкладчыкамі гісторыі Аляксандрам Жудро і Аленай Сліжовай прыбылі ў вёску Арлова Віцебскага раёна, дзе і праводзілася "Вахта Памяці". Там абодва атрады з Сенненскага раёна аб'ядналіся ў адзін, які атрымаў назву "Памяць". Яго камандзірам стаў А. Жудро, камісарам — А. Сліжова.

У Арлове ўпершыню яны ўдзельнічалі ў пошукавай рабоце, адшукалі і перазахавалі астанкі каля трыццаці загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі.

Вярнуўшыся ў раён, Аляксандр Жудро і Алена Сліжова, а таксама школьнікі, якія з імі былі, разгарнулі прапаганду пошукавага руху. У 1996 г. атрад налічваў семдзесят чалавек з розных школ раёна. 23 лютага 1996 г. быў створаны ваеннапатрыятычны клуб "Памяць". У яго склад увайшлі пошукавыя атрады: "Альфа", які дзейнічаў на базе Сенненскіх сярэдніх і Сінягорскай базавай школ, "Віцязь" — Алексініцкай і "Гром" — Какоўчынскай сярэдніх школ. Члены клуба ва ўрачыстай абстаноўцы прынялі прысягу і атрымалі свой сцяг.

Кіраўніком клуба быў абраны Аляксандр Жудро, камісарам — Алена Сліжова, начальнікам штаба — Аляксандр Рублеўскі.

За час сваёй дзейнасці члены клуба адшукалі і перазахавалі астанкі 356 байцоў і партызан, загінуўшых у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яны таксама выявілі месцы пахавання 369 абаронцаў Айчыны і расстраляных фашыстамі патрыётаў, астанкі якіх у 1998 і 1999 гг., дзякуючы асобнаму пошукаваму батальёну Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, урачыста перазахаваны.

Члены клуба выязджалі ў пошукавыя экспедыцыі ў Расію, удзельнічалі ў міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і раённых "Вахтах Памяці". Кіраўнік клуба Аляксандр Жудро, Максім Бублікаў з атрада "Альфа" і Раман Гут з атрада "Віцязь" узнагароджаны медалямі Расійскай Федэрацыі "За актыўны пошук". Многія ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі і дыпломамі — расійскімі і беларускімі.

Патрыятычны клуб "Памяць" працягвае пошукавую работу.

*І. Е. Лазука.*

# Дакументы сведчаць

## ЖЫХАРЫ ВЁСКІ МАНГОЛІЯ, ШТО ЎНЕСЛІ СРОДКІ Ў ФОНД АБАРОНЫ РАДЗІМЫ

| №№ | Ф. И. О. | Облигации | Деньги | Марки |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Щелкун Я. Я. | — | 30 руб. | 1 |
| 2. | Зарубицкий Ф. М. | 50 | 100 | — |
| 3. | Зарубицкий Я. И. | 25 | — | — |
| 4. | Зарубицкий М. И. | — | 22 | — |
| 5. | Щелкун И. П. | — | 82 | 2 |
| 6. | Деваст Т. С. | — | 14 | — |
| 7. | Зарубицкий И. Е. | — | 50 | — |
| 8. | Зарубицкий С. Е. | 125 | — | — |
| 9. | Петренко И. | 50 | — | — |
| 10. | Споткай М. С. | — | 104 | — |
| 11. | Осиповский С. С. | — | 60 | — |
| | Итого: | 250 | 462 | 3 |

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 312. Л. 301 об.*

## ЖЫХАРЫ ВЁСКІ АБІДАЎКА СЕННЕНСКАГА РАЁНА, ШТО ЎНЕСЛІ СРОДКІ Ў ФОНД АБАРОНЫ РАДЗІМЫ

| Ф. И. О. | Облигации | Деньги | Марки |
|---|---|---|---|
| Порепко И. Т. | — | 4 | — |
| Труханенко А. Т. | — | 10 | — |
| Щелкун С. Т. | 100 | — | — |
| Труханенко Р. Я. | 160 | — | — |
| Труханенко Я. Я. | 95 | — | — |
| Чепуринский И. Д. | — | 27 | — |
| Будная Н. П. | 10 | — | — |
| Щелкун П. А. | 25 | — | — |
| Порепко Н. П. | — | 125 | — |
| Зарубицкий Т. П. | — | 100 | — |
| Гашек Е. И. | 110 | — | — |
| Порепко Е. Н. | 100 | — | — |
| Гашек Г. К. | 75 | — | — |
| Щелкун М. И. | — | 40 | 1 |
| Шебеко Д. Т. | — | 10 | — |
| Труханенко Т. Я. | 100 | — | — |
| Порепка И. И. | 180 | — | — |
| Гашек А. А. | 35 | — | — |
| Порепко Ф. И. | — | 55 | — |
| Труханенко В. Г. | — | 13 | — |
| | 990 | 374 | 1 |

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1336. Воп. 1. Спр. 312. Л. 301.*

*Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак.*

# Толькі два эпізоды

Пра баявы шлях жыхара Сянно Давіда Майсеевіча Кішчыцара можна расказваць бясконца. У свой час загадамі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага яму было аб'яўлена дванаццаць падзяк, аб чым ёсць адпаведныя дакументы, якія ветэран старанна захоўваў, мноства ордэнаў і медалёў. Ваяваў на многіх франтах, вызваляў Беларусь, бамбіў Берлін, удзельнічаў у вайне з Японіяй, здзейсніў 85 баявых вылетаў.

А застала вайна гэтага чалавека ў якасці курсанта Харкаўскага ваенна-авіяцыйнага вучылішча. Тады іх, маладых штурманаў, у хуткім часе выпусцілі. Лёс склаўся так, што Давід Майсеевіч ваяваў паветраным стралком на цяжкім бамбардзіроўшчыку.

Вось толькі два невялікія эпізоды з багатай ваеннай біяграфіі Д. Кішчыцара, пра якія ён расказаў.

## Праз кучавыя воблакі

Летам 1943 года наш полк цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў знаходзіўся на адным з аэрадромаў паблізу Вязьмы. Лёталі мы на Ту-2, лепшых бамбардзіроўшчыках таго часу. Наш экіпаж выконваў заданне па стратэгічнай разведцы для Генштаба. Ляцелі на адзіночным самалёце, у бомбалюках былі не бомбы, а ўстаноўлены фотаапараты. Трэба было сфатаграфаваць аэрадром у Балбасаве, пад Оршай, і чыгунку Орша – Віцебск.

Праляцелі над аэрадромам, сфатаграфавалі яго, нягледзячы на зенітны абстрэл. Маё месца паветранага стралка знаходзілася ў хвасце самалёта. Гляджу, а за намі гоняцца два "фоке-вульфы".

— Камандзір, — крычу ў ларынгафон, — "фокеры"!

Той усё зразумеў і скіраваў самалёт у кучавыя воблакі. Там мы некалькі разоў мянялі курс, каб збіць з панталыку нямецкіх лётчыкаў. Мінут праз пяць вынырнулі з воблакаў.

— Зарыентуйцеся, дзе мы, — загадаў камандзір экіпажа штурману.

А я глянуў уніз і ледзь не абамлеў: возера, астраў, гмах касцёла.

— Сашка, — крычу штурману, — дык гэта ж Сянно!

Што я тады перажыў! Убачыць праз столькі гадоў родныя мясціны.

Потым паспяхова выканалі і другую частку задання.

## Другая сустрэча

Другі раз праляцець над Сянном давялося ў 1944 годзе, праз некалькі дзён пасля яго вызвалення.

Полк перабазіраваўся са Смаленскай вобласці на аэрадром у мястэчку Ула Бешанковіцкага раёна. Узняліся ўсе самалёты і пайшлі строем. А ў нас надарылася непаладка, бортмеханік заўважыў, што выцякае паліва праз няшчыльна закрытую накрыўку бензабака.

Далажылі аб усім, прызямліліся. А полк паляцеў далей...

— Камандзір, — прашу, — усё роўна мы палящім адны. Давайце праляцім над маім родным горадам.

Той крыху павагаўся, але ўсё ж пагадзіўся, чулым быў чалавекам. Тады я з трафейнай авіябомбы выцягнуў стабілізуючы парашуцік, напісаў на ім адрас маці, за стропы прымацаваў гайку з запіскай аб сабе.

І вось мы на брыючым палёце, на вышыні 15 – 20 метраў прайшлі над цэнтральнай плошчай Сянна. Першы раз я выкінуць парашуцік не паспеў. Зрабілі яшчэ адзін заход, і парашуцік паляцеў уніз.

Наіўным я быў, думаў, што маці засталася ў жывых: навошта маўляў, яна, старая, акупантам. Але ўсіх родных фашысты знішчылі. Толькі гэтага я тады яшчэ не ведаў.

Прыляцелі мы ў Улу, пайшоў я да камандзіра палка, растлумачыў яму, што да майго роднага Сянна ўсяго толькі шэсцьдзесят кіламетраў.

— Адпусціце на двое сутак, родных праведаць.

Улічыў камандзір палка абставіны і выпісаў мне дазвол на трое сутак. І падаўся я пехам. Ні спадарожнай машыны, ні падводы. Спёка неймаверная, як назло, і ўсюды сляды вайны.

Ужо недзе паблізу Падворыцы зайшоў у адну вёску вады папіць. А маладая дзяўчына бацьку паклікала. Той выйшаў і пазнаў мяне, бо добра ведаў майго бацьку.

— Сынок, — кажа, — як жа я рады, што ты жывы.

Усё, што было, на стол паставілі. А было ўсяго толькі бутэлька рудога самагону ды чыгунок варанай бульбы без солі. Выпілі мы па шклянцы, закусілі. Смак той нясоленай бульбы на ўсё жыццё запомніў.

Да Сянна падышоў познім вечарам, з боку вёскі Турава. Напаткаў жанок, ішлі з граблямі, мусіць, сена нарыхтоўвалі. Чую, адна спалоха-

на кажа: “Дзеўкі, немец!” Я ж быў прапылены, прапацелы, змораны, не пазналі.

Падыходжу да іх бліжэй і гавару:

— Ніначка, прывітанне!

Гэта была мая аднакласніца Ніна Цікунова. Вось тады я пра ўсё і даведаўся...

На месцы маёй роднай хаты засталося папялішча. Пераначаваў у нейкім будане, раніцой выкупаўся ў возеры і пайшоў назад..

А парашуцік мой аднесла ветрам ад цэнтральнай плошчы, але яго знайшла Васіліса Ерашэвіч і перадала Надзеі Буракoвай, ведала, што да вайны мы сябравалі.

А пасля вайны Надзея стала маёй жонкай...

*Запісаў І. Е. Лазука.*

## Удзельнікі парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года



Удзельнікі Парада Перамогі. У цэнтры У. Ц. Глебка.

**ГЛЕБКА Уладзімір Ціханавіч.** Нарадзіўся 9.5.1926 г. у вёсцы Кругляны ў сялянскай сям'і. З 1943 г. у партызанскай брыгадзе А. Ф. Данукалава. У 1944 г. пасля ранення адпраўлены ў шпіталь у савецкі тыл. Пасля шпіталя ваяваў у Карэліі, вызваляў Венгрыю ў складзе 9-й паветрана-дэсантнай дывізіі.

Пасля вайсковай службы скончыў Лепельскае педагагічнае вучылішча (1957) і 36 гадоў настаўнічаў у Застадольскай базавай школе. Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені і Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**МАТЫГІН Васіль Іванавіч.** Нарадзіўся 14.8.1921 г. у вёсцы Дубаўцы. На фронце з чэрвеня 1941 г. Ваяваў на Калінінскім, Ленінградскім і 2-м Прыбалтыйскім франтах. Пасля вайны працаваў брыгадзірам у калгасе “Сцяг Перамогі”. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

## Яны прайшлі дарогамі вайны

На франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанах з ворагам змагаліся некалькі тысяч нашых землякоў. Многія з іх склалі свае галовы ў барацьбе з захопнікамі. У ходзе працы над хронікай раённая камісія імкнулася выкарыстаць усе магчымыя крыніцы, каб сабраць звесткі як мага паўней і пра загінуўшых, і тых, хто вярнуўся ў родныя мясціны пераможцамі. На жаль, паўнату звестак не даводзіцца гарантаваць, бо занадта позна сталі складацца такія спісы. З-за напластаванняў часу і іншых абставін магчыма не ўсе землякі-франтавікі і партызаны трапілі ў спісы. Камісія просіць прабачэння ў ветэранаў і іх родных, калі яны не знойдуць у гэтым спісе знаёмых прозвішчаў сваіх землякоў, што вярнуліся з фронту. Дадаткова выяўленыя звесткі пра землякоў — удзельнікаў вайны будуць змешчаны ў перыядычным друку.

### АЛЕКСІНЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

